Васіль Жуковіч

# ЯК АДНА ВЯСНА...



ВАСІЛЬ ЖУКОВІЧ

# ЯК АДНА ВЯСНА...

Аповесць

МІНСК
«МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА»
1980

Бел 2
Ж 86

*Для сярэдняга*
*і старэйшага школьнага ўзросту*

МАСТАК В. БАРОЎКА

Ж $\frac{70803-207}{М\ 302(05)-80}$ 146—80 4803010200

© Выдавецтва «Мастацкая літаратура», 1980.

# ВОДГУЛЛЕ

Шчаслівы той, хто вырас у родным краі, увабраў сваёй душою чысціню яго крыніц, пах кветак і зямлі і неба вышыню,— радзіма ў чалавека адна, адвечная, непаўторная, як матчына песня.

Маё Забалоцце — гэта не вёска, а паселішча хутароў у адным з заходніх раёнаў Беларусі.

Я ўдзячны лёсу, што не ведаў панскае ўлады,— нарадзіўся, як казалі ў нас, пры Саветах.

Нашаму пасляваеннаму дзяцінству ніхто не купляў цацак, але мы, дзеці, заставаліся дзецьмі. У лесе і ў полі, пасвячы кароў, знаходзілі патроны. Гэта былі, бадай, самыя маўклівыя «цацкі». Мне і суседскім хлапчукам, маім аднагодкам, пашанцавала: у рукі нам не трапіліся ні міна, ні граната, ні снарад, і ўсе мы засталіся з рукамі, з нагамі, з вачыма.

Забалоцце, як я разумею цяпер, жыло даволі аднастайным, хоць і па-свойму напружаным, жыццём. Свету белага людзі не бачылі за працаю. Кармілі жывёлу, засявалі поле, збіралі ўраджай, здавалі пастаўку, плацілі падаткі, мялі лён, пралі пры газоўках кужаль, ткалі палатно, зноў сеялі, зноў жалі. І нават не ўяўлялі сабе, што недзе ў вясковыя хаты прыйшла электрычнасць, загаварыла радыё...

Калі б сучасны чалавек трапіў у тое дакалгаснае Забалоцце, ён здзівіўся б у лепшым выпадку: «Ціха, як на Месяцы», а то і ўсміхнуўся б гэтак іранічна: «Глуха, нібы ў танку».

Забалоцце... Не шукайце гэтага кутка на зямлі: няма ўжо нават балота, якое аддзяляла хутары ад сяла Дзяніскавічы,— балота асушылі, а хаты перавезлі ў сяло.

Бадай, і не абудзіў бы я сваіх, часам журботных, успамінаў, калі б не ўцалелыя сям-там на месцы былых сядзіб грушы-дзічкі ды кроністыя бярозы — шолах ліствы ахінае мне сэрца, узвышае розум, ачышчае слых і зрок. І новым святлом успыхвае памяць, многае прыгадваецца да драбніц. Памятаю, куды вокнамі выходзіла кожная забалоцкая хата, мог бы паказаць, дзе раслі самыя салодкія яблыкі і дзе чый быў калодзеж, паспрачацца з сябрамі дзяцінства, колькі кругоў было ў тых калодзежах, у глыбокія люстры якіх з захапленнем калісьці мы ўглядаліся.

Хутарскія сядзібы, нібыта разбегшыся наўкола балота, займалі з усходу на захад немалы абшар зямлі — ад Хваінкі, гонкага хвойнага лесу, да старой, з векавымі дубамі, Дубровы. Абодва гэтыя лясы цягнуліся на поўнач ад Забалоцця. Хваінка пераходзіла ў высокі Паплаўскі бор. За Дубровай сінеў Бельскі лес. Далей пачыналася пушча. За палямі і лугамі, за лясамі ды азёрамі жылі вёскі: Асіннікі і Сямісосны, Белая і Каменка, Падлужжа і Заазер'е. А на поўдзень з пушчы, праз сяло Дзяніскавічы, вяла ў горад шаша.

Рэчкі мы не мелі. Але сумаваць па ёй не ставала часу, бо ўлетку нас чакалі ў лесе ягады, пад восень — грыбы, а зімою раку замяняла балота, якое замярзала і вабіла здаля блакітным ледзяным шклом.

Калі снег і лёд раставаў і на балоце ўтваралася сапраўднае мора, тады выручала грэбля, шырокая і высокая насыпная дарога, што пачыналася побач з Адэсішыным хутарам. Праўда, тым шляхам да сяла было далекавата, даводзілася многа траціць часу, даючы кругаля. Але вясна не стаяла на месцы. Яна была рупнай працаўніцаю, хутка праганяла снегавую ваду, падсушвала балота, нібыта дбаючы пра школьнікаў, каб маглі хадзіць да школы напрасткі.

Цяпер тут цэлы год суха. Дзе калісьці вада займала купіны і асаку, зараз раскашуюць буракі, збажына, канюшына. І, прыязджаючы ў Дзяніскавічы, я кожны раз выходжу да сцежак маленства. Але найперш — на могілкі. Тут, пад трыма клёнамі, пахавана мама. Не, не пагаслі, не пацьмянелі словы на сціплым помніку:

Мама,
твае рукі, усмешка і сэрца
свецяць на нашы дарогі.
Твае дзеці

На помніку няма здымка. Маці ніколі не здымалася. Ды вось у вачах маіх паяўляецца яна, жывая, з добрымі, задуменна-пяшчотнымі вачыма, запалымі шчокамі, агрубелымі ад нескончонай працы рукамі. Бачу яе ў будзённым адзенні, звычайным сялянскім, у якім яна тупала ля печы, карміла карову, выходзіла

ў поле. На галаве — выцвілая хустка, на плячах — куфайка, на нагах — гумовыя боты; яе цёмна-шэрая спадніца — саматканая. Мама ўважліва глядзіць мне ў твар і, усміхаючыся аднымі вачыма, вільготнымі ад шчаслівых слёз, кажа:

— Ты, сынок, прыехаў...

...Я стаю на былой сядзібе пад высокаю разгалістаю бярозай, якая калісьці доўгі час сядзела амаль без росту, пакуль я не перанёс яе з палону высокіх дрэў на волю. Бяроза пасля свайго другога нараджэння разраслася. Праз бела-зялёнае прадзіва галін і галінак прабіваецца збуялая блакітная вышыня. Рукі мае ловяць пяшчоту ласкавых лісцяў, туляць іх да вуснаў... І радасна мне і тужліва. Тут прайшлі мае семнаццаць год. Тут стаяла ў зеляніне дрэў хата. Тут жыў агонь, жыло святло — жыла маці. «Няўжо нічога, апроч бярозы, няма! Няўжо і следу не засталося?!.»

У кроне шамаціць мяккі вецер і аціхае ў ёй. Перад вачыма пачынаюць праходзіць забалоцкія людзі: і з тых, што перасяліліся ў сяло, і з тых, што раз'ехаліся па белым свеце, і з тых, каго ўжо няма. Я беспамылкова іх пазнаю — па постацях, па выразах твару, па галасах. А яны мяне — не адразу.

— Чый жа ты будзеш, га? Хіба Яўгенін? — пытаецца цётка Волька, а па-нашаму — Адэсіха.

— Так, так, цётку. Яўгенін я,— адказваю, рады, што зямлячка пазнала мяне.

— Ах, Віцечка (яна блытае мяне з маім старэйшым братам, але я не звяртаю на гэта яе ўвагі, бо ве-

даю: Адэсіха заўсёды гэтак блытае), такі ж я пазнала цябе, Віцечка!

— А што,— пытаю,— хіба век не бачылі?

— Няўжо ж. Гэта й свайго я раз у пяць гадоў бачу, цяпер увесь свет кручаны стаў. Аж у Казахстане, за механіка там. Чуў мо?

— Чаму ж не чуў, ведаю.

— А ты мо да бацькі прыехаў?

— Не, не да бацькі.

— Пастарэў бацька твой.

— Ведаю...

— А за каго ты ўжо вывучыўся? — глыбокімі карымі вачыма цётка Волька глядзіць не мігаючы.

— Журналіст я.— Прачытаўшы па збянтэжаных вачах, што яна не зразумела такое звыклае мне слова, тлумачу: — У газеце працую,— і сам цікаўлюся: — А як вы жывеце?

— Ой, Віцечка, ці ж мне гнявіць бога: калгас хату новую паставіў. Як звон, як лялька хата. Адно няма ў ёй каму жыць. Нам дык хутка ўжо вясёла будзе, старым: ці бачыў, якога клуба супраць могілак ставяць? — жартуе яна, і яе ўсмешка расцягвае і без таго шырокі нос.

...А вось і яны, мае мілыя сябры дзяцінства, мае аднагодкі: Лёнька Саламонішын, Андрэй Міронаў і Толік Вольчын. Яны, хоць і выраслі і пасталелі, застаюцца зараз тымі ж хлапчукамі, і я, чакаючы іх, хачу ўжо абярнуцца такім жа малым, як і яны, каб пазналі, ні з кім не зблыталі і не разгубіліся. І маё жаданне збываецца... А яны бягуць да мяне вузенькаю

сцежкаю праз жыта, адно чубы мільгаюць над каласамі: чорны — Лёнькаў, белы — Толікаў і русы — Андрэеў. Андрэй бяжыць роўна, Лёнька — увагнуўшы галаву, а Толік раз-пораз падскоквае і круціць перад сабою сціснутымі ў кулакі рукамі: як звычайна, сваімі рухамі і голасам ён імітуе грузавік. Гэта ўсё — ад мары стаць шафёрам.

Прыбягаюць хлопчыкі засопшыся. Адтапыраныя Андрэевы вушы аж гараць, а на Лёнькавых шчоках гусцей выступілі вяснушкі.

— Што маеш рабіць? — пытае Толік, прыжмурваючы левае вока, хаця ў твар яму не свеціць сонца.

— Кідаць і лавіць,— бадзёра паўтараю чутае некалі як не ад брата, дык ад сястры.

Бачу, адказ мой падабаецца ім, бо ўсе, як па камандзе, заліліся смехам.

— Давай у хованкі,— прапануе Толік, часта міргаючы амаль такімі ж белымі, як і ягоныя валасы, вейкамі.

Андрэй і Лёнька, паглядаючы то на Толіка, то на мяне, цярпліва чакаюць, што я адкажу.

А я маўчу, бо адазвацца ўжо няма да каго: пабеглі хлопцы жытам, і я не бачу іх, бачу сябе самога, але не таго, малога, а ўжо семнаццацігадовага, упершыню з чамаданам у руках, з чамаданам, напакаваным кнігамі. Вось маці праводзіць мяне за вароты. Каля яблыні я прыпыняюся, не ставячы на зямлю чамадан.

— Шчасліва, сынку! Гэтак далёка едзеш. Глядзі ж, каб усё добра,— матчыны вочы імгляцца тугою.— Хоць не галадай там.

Чаму ж я тады не абняў і не пацалаваў яе! Адно што паківаў галавою: усё будзе добра... А пазней, калі душа парою нямела ад прадчування непапраўнай бяды, чаму я апынуўся за варотамі?.. Не прыйшоў да запаветнага парога, не пачуў апошняга матчынага слова! «Мая ты родная бяроза, ці разумееш ты мяне?» — як да жывой істоты, гарнуся я да дрэва і адчуваю тварам шаўковы халадок бярösты, аж кругам ідзе галава.

Жыве, як і шмат гадоў таму, Забалоцце — мая калыска, мая казка, мая найпершая дарога.



Частка першая

## НАЙДАЎНІЯ ЎРАЖАННІ

...Колькі мне гадоў, я не ведаю. Ведаю, што сядзім мы ў яме, накрытай круглякамі і дзірваном, называецца яна схронам. Няма тут ні аднаго акенца. Ёсць толькі вузенечкі, нібы ў нару, лаз, які добра маскіруецца.

Розумам сваім я не ўсведамляю, што маму, Віцю, Маню і мяне можа нават прываліць у гэтай «пары». А не гром жа грыміць над зямлёю — гарматы, не хмары засцілі сонца — чорны дым вайны. Слова «схрон» для мяне гучыць як паратунак ад бяды. Пазней успомню — у гэтай зямлянцы было цёмна, было цяжка ды-

хаць, хацелася есці. А зараз я гляджу на свечку, якую запальвае мама, радуюся сцвярдзеламу, нібы цагліна, хлебу, што мама дзеліць Віцю, Мані і мне.

...Мы з братам — у сельскай амбулаторыі. Нас, дагала раздзетых, нейкая цётка ў халаце доўга шмаруе чымсьці смярдзючым. Калі пачала пэцкаць, сказала: «Не бойцеся, гэта — прафіластыка (яна хацела сказаць «прафілактыка») ад каросты». Затым нас, голых, ставяць ля гарачае — не даткнуцца — грубкі: мяне далей ад людскога вока, а Віцю — на самым відавоку. Але дужы, даўгалыгі Віця адціскае мяне з майго месца і паказвае рукою на сваё:

— Станавіся там.

Я ўступаю брату, хоць і не разумею яго: хіба не ўсё адно, дзе стаяць?..

...Вечар. Я на возе адзін. Аглоблі выцягнуліся на дарозе. Саламонішанае Манголкі няма. Чаго яна ўпудзілася і гэтак несла нас, гэтак трэсла і нашто выпраглася, дурная? У лесе ўсё абышлося спакойна, а тут спалохалася валуна. Мама пайшла шукаць кабылу.

Я ляжу на саломе ў драбінках. Злева і справа шуміць каласамі жыта. А што, калі з жыта выскачыць воўк? Я акрываюся ледзь не з галавою мамінай куфайкаю, быццам у такім разе мяне воўк не заўважыць.

У небе мігцяць зоры, поўнае неба зор. Жыта і зоры, зоры і жыта! Далёка чарнее лес, які мы праехалі. За тым лесам — вёска Сямісосны, адкуль мы з мамаю вяртаемся. Хутара нашага пакуль не відно. Яшчэ нам

доўга ехаць пад зорамі. Толькі дзе мама? Ці злавіла яна Манголку?..

Гэта ўсё — найпершыя мае дзіцячыя ўражанні. Яны непадуладны зменам часу, іх не могуць сцерці ніякія падзеі, бо там пачынаецца маё чалавечае «я».

Дзіўна, як жа хацелася хутчэй вырасці вялікім! Калі сястра не магла адчапіцца ад маёй назойлівай просьбы, яна ставіла мяне ля вушака і рабіла над маёй галавою новую засечку: падрос!.. Колькі ж было тых метак на старым вушаку!

Выдатная ўласцівасць чалавечае памяці: не ўсё яна ўтрымлівае, не ўсё ўзнаўляе. Сваёй хуткасцю, а часам і нечаканасцю яна падобна да бліскавіцы. Але калі бліскавічнае святло вырывае з цемры найперш высокае і яскравае, тое, што ляжыць на паверхні — для ўсіх,— то святло тваёй памяці, не абыходзячы таго ж высокага і яскравага, пранікае глыбей, выхоплівае з мінулага яшчэ штосьці для цябе аднаго, бо яно, тое штосьці, толькі тваё, у аднолькавай меры — радаснае ці тужлівае. І дзіўная рэч: святло гэтае з бегам часу не слабне, і ты не перастаеш вяртацца да сваіх вытокаў, наадварот, вяртаешся ўсё часцей, бо чым ад іх далей, тым яны табе даражэйшыя. І раптам аднойчы пачынаеш адчуваць: спее неадольнае жаданне — падумаць уголас, падзяліцца з кімсьці ўсім тым, што — гэта ўжо ты выдатна разумееш — ніколі не ўгамоніцца ў табе.

## НАВОШТА САБАКАМ СЕНА?..

Мы з Лёнькам Саламонішыным — суседзі. Нашы хутары злучае адна сцежка, а палеткі падзяляе адна мяжа. Мы з ім пасвім каровы: ён — Пярэстую, а я — Красёху. Лёнька ганарыцца сваёй Пярэстаю. У яе вялікія і вострыя рогі. Падумаеш!.. Праўда, у Красёхі рогі звычайныя, адзін нават збіты. Але такой разумнай каровы ні ў кога няма. Дзіва што! Калі немцы былі забралі яе на мяса, яна на другі дзень вярнулася. Няйначай, уцякла. На шыі ў яе, расказвала Маня, была невялікая рана і засохлая кроў. Пра каровіны ўцёкі ніхто з суседзяў не ведаў, і мама скеміла: загнала яе не ў хлеў, а ў клуню. Віця загарадзіў Красёху ў кутку жэрдкамі, абклаў той куток сенам, саломаю і снапамі, ля сцяны зрабіў патайны ход, які добра замаскіраваў. Кармілі карову і даілі скрытна ад чужога вока. Прыходзіў п'яны стараста, пытаў, ці не вярнулася скаціна, нават у хлеў заглядваў, а ў клуню — не здагадаўся. Мама баялася, каб Красёха не зарыкала. Не зарыкала яна ні тады, ні пасля. Так і засталася, перажыла вайну... Цяпер усе ў Забалоцці ведаюць пра гэта, адно Лёнька не хоча верыць. Падумаеш, яго Пярэстая!..

Да вечара яшчэ далекавата, а пабіцца нам так карціць, ажно рукі свярбяць. І падскочыць, бы тыя пеўнікі-забіякі, адзін да аднаго гэтак жа лёгка, як свіснуць у два пальцы або ляснуць пугаю па вадзе. Сёння ўжо ваявалі. Бойка пачалася сама сабой.

— Думаеш, я цябе не пабару? — сказаў Лёнька.

— Няўжо ж паборaш,— смела запярэчыў я.

— Хто, я? — спадылба паглядзеў на мяне Лёнька.

— Не, свіння твая,— сказаў я абы-што.

Ён ступіў крок да мяне, ужо напружваючы рукі, і я першы кінуўся мерацца сілаю. Нібыта ў вір.

Верх быў мой. Лёньку зрабілася крыўдна, ён вытнуў мяне кулаком у грудзі.

— Ах, ты так! — ускіпеў я.— Ну, тады бараніся...

І мы пачалі частаваць адзін аднаго кухталямі.

Нам перашкодзіла Ветрышына Валька.

— А я мацеры скажу! — крыкнула яна з дарогі, быццам з неба зваліўшыся.

Мы стаялі як варам апараныя. Калі б гэта была не дзяўчынка, то правучылі б, як сунуць носа не ў сваё проса. А дзяўчынку ж біць не будзеш.

— Ну і кажы! — крыкнуў я, запраўляючы ў нагавіцы пашкуматаную Лёнькам сарочку.

— Можаш гаварыць, прыдуркаватая Ветрыха! — яршыўся Лёнька.

Валька пабегла, і нам расхацелася біцца.

Што і казаць, скончылася наша сутычка зусім нецікава. Ніякіх слядоў — ні табе сіняка пад вокам, ні драпіны на руках, ні адарванага ад кашулі рукава...

Каб неяк выправіць становішча, не хапала добрае зачэпкі, і тады прыгадаліся мянушкі.

— Ты — Зорачка,— спакваля, непрыкметна пачаў заядацца Лёнька.

Ён назваў маю мянушку, якая прыйшла ў нашу сям'ю яшчэ ад нябожчыцы бабулі Хрысціны. «Зорачка» — так аднолькава ласкава звярталася яна да ўсіх,

так клікала малога і старога, цётку і дзядзьку, сваіх і чужых — усе былі роўныя перад гэтым звароткам.

Нічога заганнага я не бачыў у мянушцы, таму і сказаў: — Ну і што? Зорачка свеціць.

Аднак Лёнька павярнуў слова так, што ўсё ж вывеў мяне з раўнавагі.

— Зорачка-шморачка,— сказаў ён, крыўляючыся, а пасля яшчэ й дадаў: — Пакацілася з пагорачка.

— А ты — Канакрад! Ага! — не адступіў і я.

Канакрадам Лёнька, вядома, ніколі не быў. Нават ні бацька ягоны, ні дзед не кралі коней. Але прадзед, кажуць, злодзей быў зухаваты. Канечне, насіць такую мянушку не надта і лёгка, я на гэта і разлічваў. Ды Лёнька не дужа збянтэжыўся, а толькі прыжмурыў вочы і пальнуў:

— Канакрад — гэта нічога, а вось твой бацька сабакам сена косіць.

Такое я пачуў упершыню. Дзе і чым быў заняты мой бацька, я не ведаў, але ж маці казала зусім іншае, не тое, што Лёнька.

— Мой бацька хаты ставіць,— цвёрда, не без гонару заявіў я.

— Не, твой бацька сабакам сена косіць,— ён здзекліва паўтарыў сваё.

— А сабакі сена не ядуць, ага!

— У тым жа і справа, што не ядуць,— рагатаў Лёнька і ўжо гатовы быў святкаваць перамогу.

Але як гром з яснага неба прагучалі для яго словы, якія чуў я ад кагосьці на выгане і якія зараз нечакана прыйшлі мне на дапамогу:

— Саламон-брамбабус наступіў сабе на вус.

Гэта, вядома, датычылася Лёнькавага бацькі, які насіў доўгія рыжыя вусы.

Цяпер мы з Лёнькам былі аднолькава зганьбаваныя, і паміж намі ўспыхнуў новы пажар. Пагас ён толькі тады, калі адзін аднаму спусцілі юшку.

Дома, як толькі пераступіў парог, я папытаўся ў мацеры:

— Скажыце мне, мама, нашто сабакам сена?

— Якое сена? Якім сабакам?

— Ну, Лёнька сказаў, што мой тата сабакам сена косіць.

Маці насцярожанымі журботнымі вачыма глянула на мяне, але тут жа схамянулася:

— Абы-што гаворыць твой Лёнька... Ты ж ведаеш, бацька ставіць людзям хаты... Ён цясляр...

— А чаму ён не ідзе дадому?

— Таму, сынку, што надта многа ў яго работы. Ведаеш, колькі за вайну хат пагарэла? І не палічыць!.. А людзям жыць трэба. І кожнаму хутчэй свой куток мець хочацца. Вось бацька твой і закасаў рукавы і будуе людзям хаты.

## ПЯРЭДАДЗЕНЬ ПЕРШАГА ХЛЕБА

...Сонца коціцца за Дуброву. У Красёхі за дзень на пашы пакруглелі бакі і вымя, і я ганю яе ў хлеў. Абмінаю Корчыкі, але вялікае разлапістае хвоі, што стаіць на самым ускраіку, абмінуць не магу. Карова пайшла, лена перастаўляючы ногі, а я падбягаю да

хвоі, кідаю на зямлю сваю доўгую пугу, падскокваю і хапаюся за тоўсты сук, падцягваюся на руках.

«Як тут Маня гупнулася? — здзіўляюся я.— От дурніца!»

Спрытна ўзлажу на сук, пасля павісаю на адных толькі нагах, уніз галавою, як кажан, нібы даказваючы сястры, што няма чаго тут пáдаць. Калі ў вачах пачынае цямнець, саскакваю на зямлю і даганяю карову.

Набліжаючыся да сядзібы, узмахваю пугай і спрактыкавана ляскаю ў паветры, моцна, аж рэха ляціць. Хай ведаюць мама і Маня, хай чуюць і куры на куросенні, і сабака Воўчык, і кот Рыжык, што я вяртаюся дадому.

Вось і наша сядзіба, зялёная і прасторная. На загуменні — лясныя дрэвы: хвойкі, бярозкі, асінкі, дубкі. Злева ад варот — клуня пад саламянаю страхой, справа — склеп і хлеў. На карову ніяк не дзейнічае маё лясканне пугаю, сытая, яна ідзе павольна. Нарэшце пераступае абшморганы капытамі высокі парог хлява. Я зачыняю на засаўку дзверы, кідаю на дровы ў падстрэшшы пугу, мімаходам лашчу Воўчыка і подскакам бягу ў хату. Але што гэта: клуня адчынена, абедзве палавіны дзвярэй — насцеж. Я-то ведаю, што мама з Маняю збіраліся ўмалаціць трохі жыта — для таго і нанасілі з поля першых снапоў,— але чаму цапоў не чутно?

Бягу да клуні і ўжо бачу там сястру і маці.

— Што вы робіце? — аказваюся я ўзбуджаным голасам.

— Тое, што бачыш,— кажа Маня.

— Загнаў карову? — пытаецца маці.

— Загнаў,— адказваю я, а сам разглядваю, што тут да чаго.

На таку зуб'ем уніз ляжыць барана, а пад ёю — намалочанае зерне, побач зрэбная торба, а ўбаку спачываюць расперазаныя абмалочаныя снапы.

Маці з Маняю падымаюць і прыстаўляюць да сцяны барану. Я ўсё яшчэ не магу дайсці да розуму, навошта тут яна.

— Такі, сынку, наш першы хлеб,— тлумачыць маці.— Цэпам малаціць пакуль што нельга — зёрнеткі паб'еш. А калоссем аб барану — можна. Бачыш, колькі наабівалі.

Я позіркам акінуў увесь умалот, але нічога не сказаў, не па-дзіцячы падумаў пра падаткі, пра агента, што днямі прыходзіў да нас, быў ён з прыгожаю даскураною сумкай, даставаў адтуль нейкія паперы, вадзіў, колькі за намі «чысліцца нядоімкі». Аднак нядоўга думаў я пра гэта, бо вельмі захацелася хлеба, і словы вырваліся мімаволі:

— А хлеба спячэм?

— Спячэм, мой саколік, спячэм,— узрадавала мяне маці. Яна выйшла з клуні.— Ну што, дзеткі, будзем веяць? Ветрык е,— сказала, нешта ўспомніла яшчэ і дадала: — Мы з Валодзькам павеем, а ты,— яна павярнулася да Мані,— падоіш карову.

Маня пайшла ў хату па даёнку, а маці — следам за ёй — па рэшата і радзюгу.

Вось ужо і сыплюцца з рэшата на радзюжку ша-

патліва, нібы кроплі дажджу на пясок, першыя зярняты. Пад лёгкім подыхам ветру адлятае ўбок і жаўтаватым пылком церусіцца на траву мякіна.

— Стойце, мамка,— непакоюся я,— на радзюгу ўпаў колас і спарыш паляцеў, чуеце, што кажу?

— То не бяда, на чарэні павыбіраеш. Не валэндацца ж нам тут да ночы,— кажа маці, і рэшата ў яе руках ходзіць яшчэ байчэй...

Ужо зусім сцямнела, калі яна скончыла веяць жыта, а Маня — даіць карову.

— Ну, вось, дзеткі, і ўправіліся з гаспадаркаю,— перавяла маці дыханне.— Астаецца толькі жыта падсушыць. Хадземце.

...У хаце свеціць газнічка, падчэпленая крывенькаю драцінкай да бэлькі. Маці паліць у печы, а мы з Маняю выбіраем з рассыпанага па чарэні жыта пабітыя аб барану каласы і спарышы.

Пацягнула дымам. Ён чамусьці нагадаў мне пах свежага хлеба, спечанага на дубовых лістах. Прыемна закружылася галава, і толькі тады я адчуў стому.

## ЗАМІР'Е

З самага ранку я пасвіў карову на «бровары». Гэтак называецца мясціна каля Ветрышынага, нашае суседкі, поля, мясціна, дзе некалі, вельмі даўно, калі быў цар і прыгоннае права, стаяла вінакурня, у якой прыгонныя людзі гналі душагубу-памешчыку спірт ды гарэлку. Яшчэ ў царскую вайну бровар быў зруйнаваны. Камяні і цэглу людзі расцягнулі на падмуркі і печы.

Засталося толькі месца ад бровара. Яно парасло густой травою, побач падпіраў неба высокі вяз і раскінуліся на бакі два кусты шыпшыны. Па краях зялёнага вострава, які прыкметна ўзвышаўся пасярод поля, засталіся з даўніх часоў вялікія, нібы авечкі, заімшэлыя валуны. Захавалася і назва — «бровар».

Падабалася мне гэтая мясціна, ой як падабалася! Пакуль Красёха скубла росную траўку, я скакаў па валунах, сюд-туд узлазіў на вяз і саскокваў долу, ірваў пругкія аранжавыя ягады шыпшыны, уяўляў, як сустрэну Лёньку і закіну яму за шыю белага, з варсінкамі, насення, як будзе ён злавацца і даганяць мяне, каб адпомсціць за такі «пачастунак». Толькі я так сабе падумаў, як пачуў прарэзлівы Лёнькаў свіст. Узняў галаву — бачу: на самай гары, што падступіла да нашае сядзібы, стаіць Лёнька. І не проста стаіць, а махае кіем да сябе, значыць, кліча. «Нешта хоча сказаць? А можа, паказаць?» — інтрыгавалі мяне Лёнькавы маўклівыя жэсты і той рэзкі свіст.

Гара ад бровара блізка, і я імчуся да Лёнькі.

— Ну, што?

— Што, што! Патроны!..

— Дзе?

Ён дастаў з кішэні цэлую жменю патронаў.

— Дзе ты ўзяў?

— Выменяў у Толіка на грушы, а Толік каля Хваінкі знайшоў.

— Сапраўдныя,— кажу я,— кулі ёсць. І капсулі.

— Гайда пад Корчыкі, агонь раскладзём,— сказаў Лёня,— пастраляем...

Я на імгненне ўспомніў Толю Казачонка, хлопца з Дзяніскавіч, які застаўся без рукі, хацеў разабраць, казалі, гранату. «Дык то была граната,— думаў я,— а гэта — патроны...»

— Ты не хочаш? — спадылба глянуў на мяне Лёнька.

— А як мы вогнішча распалім?

— Распалім,— упэўнена сказаў Лёня.— Я па крэсіва збегаю дадому, а ты пашукай крэмень.

Так і дамовіліся.

Раскласці ў Корчыках вогнішча не адразу ўдалося. Мы залішне мітусіліся: пад ламаччам на пляскатым камені ляжалі патроны. А на распал не знайшлося нічога сухога: у лесе ігліца і ў полі іржэўнік былі вільготныя ад рысы. Давялося з дому прынесці саломы. Але як толькі ўзялося агнём ламачча, мы абодва ўзабраліся на хвою.

Патроны ў агні стралялі дружна і моцна, ажно адскаквалі іскры, вугельчыкі і нават цэлыя ламачыны, ужо на адзін бок абгарэлыя.

Наша рукатворнае відовішча хутка скончылася, полымя аціхла, вуголле пачало тлець.

Мы саскочылі з хвоі і давай шукаць гільзы. Я першы знайшоў адну непадалёк ад прыску.

— Аддай! — крыкнуў Лёня.

— Хітранькі!.. Сам знайдзі.

— Мае патроны і гільза мая. Аддавай!

— І не аддам.

— Аддавай, і ўсё! — на Лёневым твары ўсё большала вяснушак.

— А што, як не аддам?

Лёня падбег да мяне, каб адабраць гільзу, але я паспеў шпурнуць яе ў поле, і між намі завязалася бойка.

Надаваўшы адзін аднаму кухталёў, мы адчулі сябе ворагамі, здавалася, навек. Тым часам нашы каровы пасвіліся, дзе ім хацелася — скрозь былі пожні,— затое пасля бойкі Лёня падбег і прагнаў маю Красёху са свайго поля.

Цяпер нас і нашых кароў падзяляла мяжа. Нейкі час мы з Лёнем нават не пазіралі адзін на аднаго. Але без усякага занятку рабілася сумна. А паабапал мяжы ляжалі сцвярдзелыя за лета грудкі зямлі. Я пачаў імі забаўляцца. Гляну ў, і Лёнька, крокаў за дваццаць ад мяне, тое ж самае робіць.

— Гэй, давай кідацца грудкамі,— парушыў я маўчанне.

— Кідай,— узняў Лёня галаву.

Лёню спадабалася перастрэлка. Але як толькі адна грудка пацэліла яму ў грудзі, ён схапіў камень і кінуў у мяне.

— Ах, ты так! — крыкнуў я і гэтаксама, не зводзячы вачэй з праціўніка, нагнуўся і намацаў рукою камень.

Мы ўсё болей набіраліся злосці. І хто ведае, чым бы скончылася перастрэлка, калі б не здарылася дзіва дзіўнае: нашы камяні сустрэліся ў паветры.

— Ура! Ура-а-а-а! — галёкалі мы на ўсё горла і, падскокваючы з узнятымі ўгору рукамі, пабеглі насустрач адзін аднаму...

Таго дня мы з Лёнькам многа бегалі, скакалі, дурэлі, і сонца па небе спадала на захад, каб ранкам хутчэй узысці нам на радасць. Хацелася нам нейкім чынам паўтарыць цуд: падкідвалі ўгору камень, а другім спрабавалі ў яго пацэліць. Дзівакі! Хіба мы ведалі, што сапраўдны цуд не паўтараецца.

## Я ЧАКАЮ БРАТА

...Над цёмнай сцяною Хваінкі — яснае сонца. Яго промні зайгралі ў шыбінах і на сцяне. Пасвятлела ў нашай хаце. Але не толькі ад гэтага зіхоткага святла. Сёння ма́е прыехаць Віця. З самага ранку я прыліпаю то да аднаго, то да другога акна, што глядзяць на зялёную — як праехаць фурманцы — дарогу, яна полем ідзе да балота, а перад балотам, нібы ручаіна, упадае таксама ў вузкую, але з куды глыбейшымі каляінамі дарогу і цягнецца да грэблі. З акон добра праглядаецца ўся грэбля. І нават сцежку, што вядзе напрасткі да сяла, амаль усю відно як на далоні. І хто б ні выйшаў з Дзяніскавіч, я лячу да мамы, адрываю ад чыгункоў, цягну за руку, бо мне здаецца, што гэта ён, наш Віця.

— Не можа быць,— кажа маці,— на чым гэтак рана ён прыедзе?

— А на грузавіку?..— шморгаю я носам аб рукаў.

— Табе абы толькі тырчаць у акне,— не разумее мяне маці.— Маня колькі работы перавярнула, а ты?.. Чаго ўспароўся без толку?

Успароўся... Паспрабуй не ўспарыся, калі яшчэ звечара пачынаеш чакаць...

Віця вучыцца ў горадзе, у чыгуначным вучылішчы. На канікулах ён там працаваў. І вось — прыедзе! Ён рослы і прыгожы. Такога брата ні ў кога няма. У Лёнькі брат Юзік, дык гэта ж — ну што авечы хвосцік. У Андрэя сястра Каця, а ўсе называюць аглобляю, смех, дый годзе. А вось у мяне брат!.. От прыедзе з горада ў чорным шынялі з бліскучымі, у дзве сцежкі, гузікамі, у кубанцы і ў вялікіх карычневых амерыканскіх чаравіках, хай тады паглядзяць Лёнька, і Андрэй, і Толік...

Хутчэй бы вырасці вялікім! Мяне Віця абавязкова возьме з сабою. А мо не возьме? Возьме, возьме. Ён жа кожны раз, як прыязджае, дае мне панасіць сваю кубанку. Даў бы і шыняля, толькі ж ён на мяне завялікі...

— Колькі ты будзеш там вісець! — маміна цярпенне пераступае першую мяжу.— Збегай у шурык, набяры трэсак і глянь на карову.

Шурык — гэта дрывотня.

Бяру каля пліты кошык і, не чуючы пад сабою ног, выскакваю ў сенцы. Там, за недавершанай перагародкаю, Маня завіхаецца каля жорнаў. Убачыла мяне — перастала малоць.

— Што ты робіш? — пытаюся.

— Сплю і вось цябе прысніла,— кпіць сястра з майго недарэчнага пытання.

«А, што з ёю гаварыць»,— думаю я, бразгаю дзвярыма і ўжо чухаю па трэскі.

Прынёс, падкінуў у пліту, агледзеўся да маці:

— Мама, а што там Маня меле ў жорнах?

— Не ведаеш — што? Жыта.

— Напячэм аладкаў?

— Напячэм, напячэм. Сёння аладкаў, а заўтра — хлеба.

З вясны і да самага жніва пра гэта можна было толькі марыць, і я, здаволены матчыным абяцаннем, кажу:

— Памагу пайду Мані.

— Сама ўправіцца,— пярэчыць маці,— ты будзеш масла біць.

Малоць у жорнах мне было б куды цікавей. Там круціш камень — і з латка ў вядро ліецца мука, усё тваё старанне адразу відаць. А масла пакуль саб'еш, дык сем потаў пральеш. Але я здагадаўся, што гэты раз яно не пойдзе на продаж — маслам і аладкамі будзе адзначаны Віцеў прыезд,— і таму прамаўчаў.

Толькі ўзяўся за работу, як занылі рукі. Да таго ж, раз-пораз на штаны мне плюхала смятана.

— Гадкая! — бурчаў я, выціраючы белыя плямы.

Чым больш злаваўся, тым больш смятаны вылівалася на штаны. Маці доўга трывала маю нязграбнасць, але, калі я заброхаўся па вушы, усё ж не вытрывала, сказала:

— Ідзі пагуляй, я сама...

Выходжу на двор. Але мне не да гуляння: не збіў жа масла. Яшчэ не позна што-небудзь зрабіць у знак прыезду брата. Толькі што іменна?.. Гляджу на гародчык, дзе да вайны ў вуллях вяліся пчолы. Вуллі даўно апусцелі, а дрэўцы вакол шчытнага высокага плота разраслiся. Ліпы, акацыі, ялінка. Мой позірк нядоўга

блукае па гародчыку, бо ўвагу прыцягвае ялінка. Усе дрэвы як дрэвы, а яна — гэта ж непарадак! — аж да зямлі парасла галінамі... Прыдумаў! Трэба падцерабіць яе, каб прыгажэйшаю стала і лепей расла. Дзядзька Чушба калі вясной у садзе абразаў лішнія на яблынях галіны, то казаў, што яны шкодзяць... У кожнага дрэва ёсць такое голле, якое замінае яму расці.

Подскакам бягу ў дрывотню, бяру сякеру і — да ялінкі. Наступаю на ніжняе вецце. Узмах, другі. Зялёныя іголачкі колюцца ў рукі, але хіба гэта перашкода! Адна толькі думка, што Віця пахваліць, прыдае ўпартасці і сілы. Яшчэ ўзмах сякераю, яшчэ, яшчэ — і зямля пад елкаю ўслана колкімі лапінкамі. А я не перастаю завіхацца, мне ўсё зручней махаць сякераю. Нарэшце ад пышнага зялёнага ўбрання застаецца толькі вострая верхавінка. «Во,— думаю я,— цяпер, пэўна, спадабаецца Віцю...»

Братаў прыезд заўсёды быў святам незвычайным, асаблівым. Віця здаваўся мне ўсемагутным. А вырас ён у маіх вачах адразу, раптоўна. Было гэта так. Неяк прынёс я з Корчыкаў яшчарку. Гэтае стварэнне выклікала ў мяне чамусьці агіду. Я думаў, што яшчарак абавязкова трэба знішчаць.

— Віця,— пытаюся я,— праўда, што яшчаркі брыдкія і што іх трэба забіваць?

— Дзівак ты,— кажа брат,— нашто іх забіваць? Хочаш, я зачарую яшчарку?

— Дзіва што хачу. А як ты будзеш чараваць?

Віця дастае складанчык, бярэ з маіх рук няшчас-

ную ахвяру, кладзе яе на зямлю, прытрымліваючы рукою, адсякае хвост і, падміргнуўшы мне (маўляў, глядзі!), гаворыць незнаёмыя і знаёмыя мне словы:

Тур, пур, кост!
Варушыся, хвост!

І я ўласным вачам не веру: адсечаны хвост раптам варухнуўся і аціх. Тады Віця зноў, напускаючы на сябе смугу чарадзейства, насуплівае густыя бровы і паўтарае словы заклінання:

Тур, пур, кост...

І дзіва неўзабаве паўтараецца. Я ад здзіўлення не ведаю, што рабіць, толькі зіркаю то на адсечаны хвост яшчаркі, то на брата, які ўсё яшчэ прыціскае ахвяру да зямлі.

— А зараз,— гаворыць брат,— я адпушчу яе, а ты, далічыўшы да дзевяці, кінеш хвост.

— І што будзе? — згараю я ў палоне братавых чараў.

— Дзівак, не ведаеш, што будзе! Яна знойдзе свой хвост, і ён прырасце.

Віця адпускае бясхвостую ахвяру, я выконваю ўсё, што ён загадаў, і яму нялёгка цяпер адбіцца ад маіх пытанняў:

— Віць, а як яна знойдзе той хвост?

— Яна зіркатая.

— А як так хвост прырасце?

— Вельмі проста.

— Бо ты зачараваў?

— А што ж ты думаў?!

— А дзе ты навучыўся чараваць?

— Ды там... У аднае цыганкі.

— У цыганкі? У якой цыганкі?

— Ты што, і гэтага не ведаеш? Што ж ты ведаеш тады? — папракае мяне брат і дадае: — Ну, як табе сказаць, ну, чорная такая, як ведзьма.

О, пра ведзьму дык я ведаю. Ведзьма — нячыстая сіла. Пра яе Маня нават у кніжцы чытала. Але абуджаныя ва мне пытанні не сціхаюць:

— А ты ўсіх можаш зачараваць?

— Вядома, усіх. А што?

— І мяне?

— А што ж, ты лепшы за ўсіх?

— Віця, зачаруй мяне.

Брат кладзе на маю стрыжаную галаву сваю пяцярню, ціха гладзіць і кажа:

— Шкада, брат, цябе чараваць.

— Віць, а яшчарак знішчаць не трэба?

— Не трэба.

— А чаму не трэба?

— Бо ім, як і нам, жыць хочацца.

— А мы з Лёнькам Саламонішыным забівалі.

— То больш не біце, бо я на вас як напушчу жалобу, дык вы будзеце так доўга плакаць, што з вашых слёз паплывуць не якія там ручайкі, а цэлая рэчка.

— Віцечка, міленькі, родненькі! — прашуся я.— Не трэба. Я не буду забіваць яшчарак. І Лёнька не будзе...

— То-та ж...

Самыя размаітыя выдумкі брату даваліся лёгка, на хаду, і ён карыстаўся імі на кожным кроку, абы толькі абудзіць маю фантазію.

...Мы стаім на панадворку. Віця адчыняе цяжкія дзверы клуні і кліча мяне:

— Воўка, хадзі сюды, штось пакажу.— Ён нядоўга поркаецца ў саломе і дастае адтуль нейкую металічную штуковіну накшталт двухзубых вілаў.— Гэта ад нямецкага самалёта,— гаворыць ён, спрытна кладзе «вілы» на ток, сядае на іх, спрабуе пакруціць за наканечнік і дадае: — Хочаш, я зараз узлячу ў паветра?

— Як так узляціш?

— А вельмі проста: вазьму і ўзлячу. Гэта ж — ад самалёта. А самалёт — не жартачкі...

— І не ўзляціш.

— Хто, я? Жаўтароцік ты,— кажа брат.— Варта мне толькі пакруціць вось гэтую муфтачку (ён зноў бярэцца за наканечнік), і я ў паветры. Толькі, сам разумееш, узляцеўшы высока, я спікірую на цвёрды ток і заб'юся.

Што такое «спікірую», я не ведаю. Але ж Віця сказаў: «заб'юся»!.. Так недарэчна можа загінуць мой брат-чарадзей!.. Я кідаюся да яго, абнімаю за шыю. Сэрца маё калоціцца, ажно чую яго ў вушах і пад горлам. У вачах маіх слёзы. Я прашу:

— Віцечка, міленькі, не трэба, не ўзлятай! Хадзем адсюль...

## УРА: ВІЦЯ ПРЫЕХАЎ!

Вечарэе. Мама падаіла Красёху, працадзіла малако, запаліла газоўку. Я выбег з кошыкам, набраў ля калодкі трэсак, зачыніў аканіцы. Маня пачала лупіць бульбу. Я забраўся з нагамі на лаўку, адгарнуў буквар.

За акном пачуліся крокі, па аканіцы прабег лёгкі пошчак нечае знаёмае рукі. Хто гэта? Мы ўсе пераглянуліся. Мама першая ўсміхнулася ў прыемнай здагадцы: «Віцька!» І вось шырока расчыняюцца дзверы з сенцаў, і парог пераступае наш Віця з чамаданчыкам у руках. Яго вялікія вочы вузеюць ад усмешкі.

— Здрасьце, хутаране! — кажа ён.— Не ждалі?

Адразу ставіць ля парога чамаданчык і зухавата распранаецца.

Мама ідзе ад печы, выціраючы на хаду рукі берагам фартуха. Маня пакідае лупіць бульбу і таксама выцірае рукі, выцірае проста прыполікам сукенкі. Толькі я сяджу, як і сядзеў, на лаўцы і дзівуюся, чаго яны замітусіліся.

— Чаму ж не ждалі, сынку,— кажа мама.

— Чаму ж не ждалі,— паўтарае маміны словы Маня, гладзячы рукаў яго шыняля.

Віця цалуе іх («І нашто гэтыя цмоканні?» — думаю я) ды, не затрымліваючыся, падыходзіць да мяне:

— Здароў, Валодзька!

Я цісну, як магу, яму руку.

— О, ты падужэў! Летам не такі быў.

І я ажно разоў пяць узлятаю амаль да столі на яго дужых руках.

— А я ведала, што прыб'ешся да роднага парога,— кажа мама,— бо сніла, быццам ты біўся.

Яны садзяцца на лаву. З другога боку да брата прыціскаецца Маня. Хітрая лісічка — думае ўгнездзіцца да яго на калені. Я знаю яе.

— І як ты там? Як даехаў? — пытае мама ў Віці.

— Як бачыце, жывы, здаровы,— скупа адказвае ён, устае, бярэ чамаданчык і дастае адтуль прыгожую — кветкамі — матэрыю, падносіць мацеры: — Гэта вам, маці.

— Мой сынок! Нашто траціўся, лепш сабе купіў бы што,— кажа ўсхваляваная Віцевай увагаю мама, вядзе рукою па матэрыі.— Які прыгожы паркаль! Дзякую, сынку!

— А гэта вам,— ён падае мне і Мані па круглай пышнай булцы і па бутэльцы морсу.

Булкі ды морс — найлепшы нам ласунак.

— Мама, пагляньце! — асцярожна, каб не падалі салодкія крошкі, я разламваю булку напалам і кладу адну палавіну маме на стол.

Маня робіць тое ж самае.

— Ешце, дзеткі, ешце, я ж не маленькая,— адмаўляецца яна.

Ад такой смакаты адмаўляецца! Я ўсё ж дамагаюся, каб маці хоць пакаштавала булкі і морсу, падношу ёй да рота.

— У-у-у, смачна! — хваліць яна Віцевы гасцін-

цы.— Але што ж гэта мы?.. Віця з дарогі, а мы ўсе паселі... Хадзем да пліты.

Мама, Маня і я дружна гатуем вячэру. Паступова ў місцы вырастае горка дранікаў, на патэльні ўжо сквірчыць яечня. Неўзабаве на стале яды — як на свята. Пахне і свежы хлеб.

За вячэраю мы вачэй не зводзім з Віктара. Мама, вядома, пытаецца, як там, у горадзе. Віця з апетытам есць і расказвае:

— У горадзе шмат яшчэ руінаў. Работы ўсім хапае, хлеба — малавата. Але кажуць — ужо скора карткі адменяць.

— Дзякаваць богу,— з палёгкаю ўздыхае маці.

Я не ведаў, што азначалі тыя карткі, не ведаў, што па іх размяркоўвалі прадукты, і яны мяне не зацікавілі. Затое, калі брат пачаў расказваць пра банду «Чорная кошка», я адразу навастрыў вушы, бо ўжо чуў ад яго пра тое, як бандыты абкрадвалі ў горадзе людзей.

— Накрылі ў рэшце рэшт,— гаворыць Віця,— амба!

— Каго накрылі? Чым накрылі? — дапытваюся я.

Віця смяецца:

— Малы ты яшчэ, Валодзька. Я кажу, банду злавіла міліцыя.

— А як яна злавіла?

— Злавіла, і ўсё... Яшчэ суда не было. Пачнецца, дык скажуць.

Пасля вячэры мяне чакаў сюрпрыз. Брат узяў свой чамаданчык у рукі і прамовіў загадкава:

— Ведаў бы ты, Валодзька, што я табе прывёз!

Я падышоў да яго, а ён дастаў вялікія — на ўвесь чамаданчык — два кастылі. Гэта пазней я даведаўся, што ім такая назва і што такімі кастылямі прымацоўваюцца на чыгунцы рэйкі да шпалаў. А тады я глядзеў на іх як на штосьці неверагоднае. «Для чаго такія цвікі? — гадаў я.— Цікава...»

Віця зухавата ўзважыў кастылі на далоні і, як звычайна, з выглядам знаўцы, таямнічым голасам сказаў:

— Бачыў?..

Я маўчаў ад захаплення.

— Дык вось,— працягваў брат,— такімі цвікамі неба да зямлі прыбіта. За Дуброваю.

Я стаяў, заварожаны. Маня ад смеху аж трэслася, а мама толькі ўсміхнулася:

— Хацелася табе везці...

— Дзіва што хацелася,— гаварыў Віця, чамусьці падміргваючы маме і, асабліва настойліва, Мані: — Ну, што ты смешнае з'ела?..

Ды я ўжо нічога не слухаў і не бачыў — думаў толькі, як гэта неба да зямлі прыбіта. От цікава!..

## ТУДЫ, ДЗЕ «НЕБА ДА ЗЯМЛІ ПРЫБІТА»...

Хіба можа быць штосьці больш вабнае і таямнічае, чым тое, пра што расказаў брат,— неба, прыбітае да зямлі! Прыбіта яно такеннымі даўжэзнымі цвікамі. Віця, калі б не ведаў, не казаў бы... Ён усё ведае, бо вучыцца ў горадзе.

Злётаць зараз жа да Лёнькі, да Андрэя, да Толіка.

Паказаць ім гэтыя дзівосныя цвікі. Няхай знаюць, які цуд чакае нас за Дубровою! Не, спачатку я павінен усё ўбачыць на свае вочы. Заўтра ж пабягу за Дуброву...

Доўга я не мог заснуць. Мая фантазія малявала таямнічы куток за лесам, за якім недзе далёка адпачывае нават само сонца, той куток, дзе неба злучаецца з зямлёю. У вачах стаяла зелянюткая трава і блакітнае густое неба. Толькі адно ўяўлялася слаба: як неба прыбіта да зямлі і як цвікі трымаюць яго?..

Зручны час для майго падарожжа за Дуброву склаўся назаўтра толькі пад вечар. Раніцай я пасвіў карову. Змяніла мяне Маня. Віцю дома ўжо не застаў — ён паехаў у горад. Папалудні я памагаў мацеры рваць зелле.

— Ну, цяпер ты вольны казак,— сказала мама, давольная маёй дапамогаю.

Сонца было ўжо над Дубровaю, але, па маіх разліках, да яго захаду я мог збегаць за Дуброву і вярнуцца дадому. І я рушыў у дарогу.

Да Ветрышынае хаты сцежкаю з гары нёсся як на крылах, пасля ішоў звычайным крокам, ад Цыгановае сядзібы да Жыгалавае — подбегам, далей — ціхай хадою. Ад апошняга хутара да лесу зноў пусціўся бягом. Толькі ўжо ў лесе адчуў, што злёгку ўзмакрэла спіна.

Калі я выйшаў з Дубровы, то разгубіўся: ніякага кутка з прыбітым да зямлі небам тут не было. Неба злучалася з зямлёй недзе далёка-далёка, за невядомаю мне вёскай, за чужым лесам. І там, за тым далёкім лесам, патанала ўжо сонца.

Пакуль я так стаяў у роздуме, аднекуль узяўся дзядзька Дзяніс, Віцеў хросны. Высокі і плячысты, ён трымаў сваю шапку ў руцэ. На галаве яго свяцілася вялікая, як патэльня, лысіна.

— А куды ж гэта ты, браце, на ноч выбраўся? — спытаў ён, прысядаючы напочапкі. Ягоныя вочы, як і голас, былі строгія. Пасля ён шырока ўсміхнуўся, паказваючы белыя і шчытныя, як долькі часнаку, зубы: — Ці не забыў часам, дзе твая хата, га?

Дзянісава ўсмешка вывела мяне са збянтэжанага стану, і я ўсё расказаў.

— Неба прыбіта да зямлі!.. Хе-хе-хе-хе, так здорава прыдумана! — смяяўся дзядзька Дзяніс.— А я ж, стары дурань, ніколі не мог да гэтага даўмецца! Ну й Віцька, ну й фокуснік! — Ён перастаў смяяцца, накрыў шапкаю лысіну і сказаў: — Ведаеш што? Не трэба шукаць неба на зямлі. Гэта, браце, такая штука, якую не памацаеш рукамі. Колькі б ты ні ішоў да неба, яно будзе аддаляцца.— Ён паклаў мне цяжкую руку на плячо: — Так вось, браце, гэта ўсё Віця прыдумаў, пажартаваў...

Дрыпаў я дадому і ледзь не плакаў ад расчаравання. Мяне ахапіла крыўда. Я думаў пра тое, што, як толькі брат прыедзе другі раз, сустрэну яго пытаннем: «Віця, ты манюка?»

## У СТРАХА ВОЧЫ ВЯЛІКІЯ

А да наступнага прыезду брата не дрэмле і сястрына фантазія. Маня на шэсць гадоў старэйшая за мяне.

Са свае галавы яна прыдумае казку пра дамавіка ды яшчэ сюд-туд прадэманструе ягоныя выбрыкі: то непрыкметна ў хаце паперастаўляе рэчы, то ў сенцах аддзеліць млён ад жорнаў, а то яшчэ, схаваўшыся ў жыце, возьме дый шпурне ў мой бок каменьчык. Пастараецца зрабіць так, каб уцячы непрыкмечанай. А каб як мага больш уразіць мяне, часам каля хаты на пясочку наробіць слядоў, у два-тры разы большых за чалавечыя. Гэта азначае, вядома, што прыходзіў да нас і недзе схаваўся асілак. Вечарам, калі я маме пачну расказваць пра сляды асілка і пра ўсякія конікі дамавіка, Маня будзе пэнкаць ад смеху. Ды я нават не падумаю, чаго ёй так смешна. Адкуль мне ведаць, што ў яе ў галаве. А яна, між іншым, зноў збіраецца разыграць мяне, адно чакае моманту...

І вось ён, нарэшце, той момант. Мама паехала «да места». Местам у нас называюць раённы гарадок, куды завозяць пастаўку і ездзяць на базар, калі трэба штосьці прадаць або купіць, і на завод, каб памяняць ільнасемя на алей. Карацей, мы з Маняю засталіся дома адны. Час ад часу пасыпаем курам, па чарзе пасвім каля хаты Красёху. Зараз — Маніна чарга. А я з букваром у руках залажу на печ. Тут вельмі ўтульна. На чарэні — старая ватоўка. Над запечкам, на гладкім вешале,— вянкі шаматкой цыбулі, пахучых грыбоў.

Раптам з двара ўбягае ў хату Маня, з чырвонымі, як макаў цвет, шчокамі. Узлазіць на ўслончык, і яе галава ўжо вышэй печы — побач са мной.

— Сядзіш? — кажа яна.

— А што, ты мне сядзець не дасі? — падкрэсліваю я сваю незалежнасць.

— Я згубіла грабеньчык,— кажа яна.— Збегай пашукай.

— Ці я ведаю, дзе ты яго згубіла? Ты згубіла, ты і шукай.

— Дык не пойдзеш?

— А чаго я пайду?

— То глядзі, каб не пашкадаваў...

Маня гэтак сказала роблена грубым голасам, а вочы былі добрыя, і я верыў, што яна не напраўду разлавалася на мяне.

Сястра пайшла з хаты, а я пачаў гартаць буквар, па якім некалі вучылася і яна. Мой спакой цягнуўся нядоўга... Адчыняюцца дзверы насцеж, і ў хату ўвальваецца жабрачка. Няхай сабе яна і дзіўна апранутая — на ёй, здаецца, наша старое, зашмальцаванае асенняе паліто, што вісела ў сенцах на ўбітым у сцяну цвіку, а замест каўняра — лісіная шкура, што гэтаксама вісела ў нашых сенцах, на недавершанай перагародцы. Аднак гэта — жабрачка: вунь, нават торба на плячах! І мне робіцца страшна, бо мама зараз далёка. Была б хоць Маня разам са мною ў хаце, але ж і яе няма...

Тым часам «жабрачка» пераступіла парог. У гэтае імгненне яе торба зачапілася за клямку і падралася, а з яе пасыпалася... пер'е. Я яшчэ не бачыў такіх жабрачак, якія бяруць у людзей пер'е. Звычайна просяць хлеб ды капейкі. Але ж, мусіць, нехта ў Забалоцці не меў ні хлеба, ні грошай, дык даў пер'я...

«Жабрачцы», вядома, смешна з таго, што зачапілася торбаю за клямку і што рассыпала пер'е. Аднак яна смех ператварае вельмі лёгка ў нейкія нечалавечыя гукі, падобныя на плач, і я ад страху ні жывы ні мёртвы. Калі б толькі была ў столі дзірка на гарышча, мігам выскачыў бы туды. Але ж такой магчымасці няма, і я з жахам гляджу, як чорнае паліто з лісінаю шкурай замест каўняра соўпае туды-сюды па хаце, зрэдку галёкаючы — як бы кагосьці гукае.

Нарэшце жабрачка выходзіць. «Трэба зашчапіць хутчэй дзверы...» Спяшаюся злезці з печы, бягу ў сенцы. Але толькі я ўзяў у рукі зашчапку, як — дзверы насцеж, і зноў увальваецца тое ж чорнае паліто, тое самае страшыдла, ад якога толькі што мне ажно ў пяткі калола.

Я залямантаваў.

— Валодзька, гэта я, не плач, міленькі! — зашчабятала Маня, скідаючы з сябе торбу з пер'ем, лісіную шкуру і чорнае паліто.

Яна горне мяне да сябе і кажа смеючыся:

— Ты што, дурненькі, не пазнаў сваёй сястры?

— Я думаў спачатку, што гэта не жабрачка, але ж...

— Трошкі спалохаўся... Ну, нічога, нічога, усё прайшло, праўда? Ты толькі не кажы пра гэта маме. Не скажаш?

— Не бойся, не скажу.

Маме я сапраўды не расказаў пра «жабрачку», але пасля гэтага пачаў разумець сэнс мамінай прымаўкі: «У страха вочы вялікія».

# НА ВЯЧОРКАХ

Прыйшла зіма, і ўсё навокал пакрылася бялюткім пухнатым снегам. Зямля адпачывала да вясны. Пачыналіся самыя кароткія — амаль усе без сонца — дні і самыя доўгія ночы. Яны як бы гаварылі людзям: «Адпачніце і вы. Да вясны...» Але як адпачываць, калі трэба малаціць жыта, трапаць лён, прасці кудзелю, ставіць кросны, абшываць дзяцей. І вельмі дарэчы былі цяпер доўгія вечары. Управіўшыся з гаспадаркаю, жанкі бралі з сабою якую-небудзь работу ды ішлі на вячоркі...

...Я залез на печ. Гартаю пашарпаны буквар і час ад часу, як гусак ля карыта, выцягваю шыю, пагля-даю на гасцей. Мяне цікавіць найбольш Ніна Жыгалава, што прыйшла з Лідаю, старэйшай сястрою,— Ніна падабаецца мне: у яе чырвоныя шчокі і доўгая чорная каса, а сама яна стройная, як чарацінка, не тое што Ліда, таўстушка. Добра, што і села Ніна якраз навідавоку — на шырокай лаве, насупраць печы, побач з Лідаю. Шкада толькі — Ніна зусім рэдка паглядае на мяне... Сёстры Жыгалавы разблытваюць ніткі ў матку. Адэсіха і Цыганіха, Жыгалавых суседка, уселіся на лаўцы каля самае печы, абедзве нешта вяжуць з нітак доўгімі пруткамі. Маня побач з Лідаю смыча на калаўроце кудзелю — прадзе кужаль, а мама на ўслончыку, поруч з Адэсіхай, латае старое, паношанае адзенне. На падлозе клубочкам нітак забаўляецца кот Рыжык. Я клічу яго на печ, а ён не слухае...

Пад манатоннае гудзенне калаўротка гамоняць



жанкі — пра надвор'е і хваробы, пра святы і пра свае адвечныя клопаты.

— Казала Ветрыха, што ў Дзяніскавічы прывезлі солі і мыла,— гаворыць, я здагадваюся па голасу, Цыганіха.

— А я чула, што на ве́сну ма́е быць пераацэнка,— кажа Адэсіха.— Усё ў лаўцы падзешавее.

— Каб жа твае словы ды богу ў вушы,— чуецца мамін голас.— Хто табе сказаў?

— Прадаўшчыца з магазіна, яна выдумляць не будзе...

Ліда Жыгалава на вячоркі прынесла сваю навіну. Ёй брат Косця, ён у горадзе за бухгалтара, гаварыў, быццам будзе грашовая рэформа.

Усе гэтыя размовы здаюцца мне звычнымі. Хочацца пачуць ад старэйшых штосьці надзвычайнае. І вось яны, нібыта чуюць мае думкі, пачынаюць расказваць пра ўсякія здарэнні. ... У Ка́менцы пагранічнікі затрымалі шпіёна. А недзе бандыты забілі старшыню сельсавета... Мама гаворыць пра банду «Чорная кошка», якую злавілі ў горадзе і якой, казаў Віця, ужо прысудзілі расстрэл. Мне гэтая навіна здаецца самаю важнай, бо прыйшла яна ад брата.

Далей гамонка ідзе пра ваўкоў. У Сямісоснах воўчая гайня разарвала чалавека.

— І не дзіва,— разважае Цыганіха,— столькі іх развялося за вайну.

— Горай за ўсё,— дабаўляе мама,— ваўкі ў вайну зведалі смак чалавечыны. Тады рвалі трупы, а зараз і на жывых нападаюць.

— І нямашака каму пастраляць іх,— скардзяцца жанкі.

Вечар зімой — вялікі, таму не дзіўна, што на вячорках не абыходзіцца і без нейкіх нерэальных эпізодаў.

...Аднаго разу паспрачаліся мужыкі, хто пойдзе ўначы на могілкі ды ўваб'е цвіка ў крыж. І сказаў адзін з іх, што яму зрабіць гэта — усё роўна што раз плюнуць. І пайшоў ён, дачакаўшыся поўначы (такая была ўмова), і пачаў убіваць цвіка ў крыж пасярэдзіне могілак. Біў, біў, усё ішло гладка. Заставалася яшчэ раз бахнуць малатком па цвіку. Ударыў, а непрыкметна і рукаў прыхапіў цвіком. Рыпнуўся ісці, а крыж не пускае. Тут і разрыў сэрца...

Так расказвала Адэсіха. Яна, як і мая маці, верыла ў бога, думала, што ён сядзіць на небе і спускае адтуль каму долю, а каму нядолю.

— Што ні кажыце, а лёс у чалавека е. Толькі ніхто не ведае свайго лёсу.

У такія мінуты цётка Волька не магла не ўспомніць свайго Восіпа, які падарваўся на супрацьтанкавай міне. Запрогшы каня, спяшаўся ён у поле — было першае пасляваеннае жніво. Сядзеў тады на гэтай жа фурманцы і Толік. Яго абмінула смерць, адно прыглушыла выбухам ды адкінула хваляй. Выбух той быў магутны: у нашай хаце аж задрыжалі шыбы. Калі гэтак нечакана грымнула, маці маёй дома не было, і я выскачыў на двор, каб паглядзець, што здарылася. Бег балотам. Асака рэзала ногі, ды я не зважаў на гэта — глядзеў туды, на грэблю, куды адусюль — з сенажа-

цяў, з поля, з хат — збягаліся людзі. Перамахнуў канаву, абмінуў сажалку, па купінах дайшоў да выгану, яшчэ падбег і апынуўся там, на тым нешчаслівым месцы. Толікаў бацька ляжаў на абочыне забіты, з акрываўленай галавою і разарваным жыватом. Над ім ужо галасіла, заломваючы рукі, цётка Волька. Плакаў Толік, якога вярнулі з непрытомнасці, адлілі вадой. Крыху далей, у калюжыне крыві, ляжаў белы конь з адкінутай назад галавою, побач — воз, заднімі коламі дагары, а пярэднія знайшлі ў ільне па той бок грэблі. Было страшна...

— Хто ж мог падумаць, што мой Восіп, царства яму нябеснае, на гладкай дарозе напаткае пагібель,— кажа Адэсіха.— І ў партызанах быў, і на фронце ваяваў, з пекла вырваўся. А тут на́ табе!.. Ну, хіба гэта не лёс?! — яна плача.

— Каму што назначана, ад таго не ўцячэш,— уздыхае мая маці, спрабуючы суцешыць Вольку.— Але не ў аднае цябе гора — колькі мужчын палягло!

— Дык гэта на фронце,— жаліцца Адэсіха.

— Не трэба і фронту,— у размову ўмешваецца Цыганіха.— А Яўген Краўчук... А Іванка Мардас... А Мышленік...

Цыганіха прыгадвае людзей — і старых і маладых,— што падарваліся на мінах: адны — узнаўляючы над канаваю масточак, другія ў полі, трэція, як і дзядзька Восіп, на дарозе.

— Не плачце, цётку,— суцяшае Адэсіху Жыгалава Ніна, гаворыць яна хутка-хутка, за што яе называюць кулямётам,— добра, хоць Толік застаўся жывы.

Я выцягваю шыю, каб паглядзець на людзей, бачу Ніну, яе шчокі і вусны аж гараць. «Праўду кажа Ніна,— думаю я,— добра, што Толік жывы застаўся».

## ПЕРАД НОВЫМ ГОДАМ

Вечар. На дварэ — завіруха. Шалёны вятрыска гойсае па бляшаным даху, завывае ў коміне, свішча ў аканіцах. А ў нас — цёплая грубка і, галоўнае, зусім незвычайны стол. Сёння будзем вячэраць у другой палавіне хаты, бо прыйшло свята — каляды. На стале — беленькі абрус, а на абрусе ў місках акрамя куцці з макам — грыбы з алеем, капуста, селядцы, дранікі, смажаныя на алеі. Усё такое смачнае, хоць і нескаромнае.

Мама кажа, што калісьці, яшчэ да патопу, у такую ноч нарадзіўся Хрыстос і што ляжаў ён на сене ў яслях. Таму ў нас на стале, пад абрусам, і ў тым кутку, дзе зверху глядзяць багі з абразоў, ляжыць сена.

Вячэраць не спяшаемся, гаворым пра Віцю, ён яшчэ можа з'явіцца. Міжвольна я прыгадваю, што недзе жыве бацька, што цяпер ён мог бы прыехаць дадому, бо ў свята ніхто не робіць, і я пытаюся ў мацеры:

— А чаму не едзе тата?

— Хто яго ведае, сынку. Мусіць, захварэў,— спакойна адказвае маці.

«Напэўна, захварэў»,— пагаджаюся я. Але мне яго чамусьці зусім не шкада. Мо таму, што не помню яго. Уявіць хачу яго, а бачу чужых бацькоў: Лёнькавага, Андрэевага... Я зноў думаю пра Віцю.

Маці ўкленчвае перад абразамі, хрысціцца, моліцца, зноў хрысціцца, устае і кажа:

— Ну, што, дзеткі, Віця, мусіць, не прыедзе, калі да сёга часу не прыехаў. Сядайце, будзем есці.

Вячэраем моўчкі, усё яшчэ прыслухоўваемся да пошуму ветру. Здаецца, зараз вось зарыпяць дзверы і ў хату ўвойдзе Віця.

Пасля вячэры — надта цікавая рэч: кожны сабе выцягвае з-пад абруса былінку сена. Гэта калі хочаш даведацца, якая твая доля. Доўгую травінку выцягнеш — шчаслівая доля, кароткую — нешчаслівая.

І Маня і я выцягнулі доўгія, узрадаваліся ды пачалі мераць, чыя даўжэйшая. Пераможцам, як ні хітравала сястра, выйшаў я. А найкарацейшаю аказалася маміна сянінка. Нам стала маму шкада, і мы прыціхлі. А яна як бы пачула нас і загаварыла:

— Нічога, дзеткі, мне ўжо ад ліхое долі не ўцячы. Я толькі хачу, каб ваша была добраю.

Мы з Маняю ведаем, як прыгожа мама спявае, хоць і рэдка да яе прыходзяць песні, і, па-змоўніцку пераглянуўшыся, у два галасы просім:

— Вы даўно не спявалі, мама...

— І праўда, мае дзеткі, даўно.— Маці ўсміхаецца задумлівай усмешкаю: «Кажаце — песню заспяваць... Але якую?..» — Дый песні пазабывала. Ну, хіба вось гэтую,— гаворыць яна і пачынае:

Ой, пайду я да броду
Па халодную воду,
Стану, гляну дый шчэ падумаю,
Ці я з добрага роду.

Мама пераводзіць дыханне, просіць: — Памагайце,— і працягвае:

А я з добрага роду,
Шчэ й лічэнькам прыкрасна.

Ні я, ні Маня не падпяваем, а толькі слухаем. Мамін голас лагодны, а вочы — сумныя:

Аддала мяне мая матанька,
Толькі доля не шчасна.

Нам яшчэ хочацца слухаць.

— Мама, гэтая песня сумная, заспявайце весялейшую,— просіць Маня.

І зноў вольна, але хутчэй і весялей ліецца матчын голас:

Матуля, кахана,
Аддай жа за пана,
Каб я не хадзіла
З граблямі да сяна;

З граблямі да сяна,
З віламі да гною,
Каб я пахаджала
З кухні да пакою;

З кухні да пакою,
З пакою на ганак,
Каб я выглядала,
Ці едзе каханак.

Мы гэтак уважліва слухаем, пра што гаворыцца ў песні, гэтак сур'ёзна перажываем, чаму мама выйшла замуж не за пана, а яна тут жа і разбурае тое, што збудавала словамі песні, не даспяваўшы яе.

— Хвароба на панства...— усміхаецца яна.— Ведаем мы, як мужычка была патрэбна пану...

Перад сном я падумаў, што добра было б праспаць тыдзень, каб прачнуцца адразу ў навагоднюю ноч.

І нездарма такое прыйшло ў галаву. Пад Новы год прыехаў Віця. Ён прывёз мне чаравікі, і маці дазволіла — мароз быў слабы — пайсці разам з Віцем і Маняю праводзіць стары год і сустракаць Новы.

З усяго Забалоцця сышліся да нас хлопцы і дзяўчаты, парабілі маскі ды пайшлі вычвараць «фокусы». Найперш — да Ветрыхі. Баяліся, што не застанем дома, але засталі. Заспявалі, як вядзецца, пад акном:

Шчадравінка шчадравала,
Пад акенца заглядала.
Давай, баба, каўбасу,
А то хату растрасу.
Ехаць ці ісці?

Ветрыха выглянула з сенцаў:

— А хай на вас халера найдзе, хай на вас!

— Будзеш ты бедная, Ветрыха! — сказаў Віця, калі мы, вялікія і малыя, адбегшыся, усім гуртам спыніліся за яе адрынкаю.

— У каго, хлопцы, дома знойдзецца добры кавалак шыбіны?

Шкло знайшлося ажно ў Казаковіча Колі, што жыў у канцы Забалоцця, у трэцяй ад Дубровы хаце.

А раніцаю Ветрысе давялося вылазіць з хаты праз акно, бо дзверы ёй завязалі. І аж да самага вечара не магла яна прапаліць ні ў печы, ні ў пліце: комін быў

накрыты зверху шклом. Яна ўсё Забалоцце аблётала са сваёю сумнай навіною. Двойчы прыбягала і да нас, скардзілася маме злуючыся:

— Трасцы на іх няма, на тых смердзюхоў! І твае мо лазілі ўчора? І якую наглу ўчвэрылі, гром іх ведае. Адно як зачну паліць у печы, так і валіць дым не ў комін, а на хату. Валька плача, што вочы ёй выядае.

Я прынікаю да акна, малога, падслепаватага, якое глядзіць на бровар, затуляюся далоняю, каб не бачыла Ветрыха, што смяюся.

Затое Віця прытвараецца сур'ёзным і абсалютна спакойна ў яе пытае:

— Што-небудзь здарылася?..

— Няўжо ж не здарылася! Поўна хата дыму...

— У комін заглядвалі?

— Чаму ж не заглядвала, глядзела...

— Дык што, комін у парадку?

— А ражон яго знае!

— Драбіна ў вас е?

— Каб што добрае, драбіна стаіць.

— Ну, хадземце, я пагляджу.

Брат пайшоў з Ветрыхай, узлез на страху па драбіне і скінуў з коміна шкло...

Нялёгка і Лунацік пачаў Новы год. Яму гэтаксама давялося клікаць на помач суседзяў, каб сцягнуць са страхі... воз, які начаваў аж на самым каньку.

Шмат у каго ў навагоднюю ноч вароты і весніцы пазляталі з завесаў і пападалі ў снег, а яшчэ — дровы павыходзілі з дрывотняў і падстрэшшаў ды парассыпаліся па двары.

На дровы варожаць дзяўчаты. Набярэ каторая на руку бярэмка і падумае: «Паленцы, паленцы, за каго я замуж выйду?», пасля па аднаму паленцу скідае з рукі, прыгаворваючы: «Маладзец», «удавец», «маладзец», «удавец». Варажыць трэба адзін толькі раз. Але часам дзяўчыне не да спадобы тое, што атрымалася, дык яна бярэ новае бярэма...

Варожаць не толькі гэтак. Чушбава Каця і Жыгалава Ліда ў нашым двары кідалі цераз хлеў чаравікі: куды наском чаравік упадзе, у той бок, значыць, дзяўчына замуж пойдзе. Кідалі, кідалі, і Кацін чаравік так глыбока закінуўся ў гурбу, што толькі на другі дзень знайшлі. А дадому пайшла яна ў Маніных дзеравяшках. Во смеху было!

А яшчэ навагоднюю ночу дзяўчаты і хлопцы раскладвалі агонь, танцавалі вакол яго ў масках, сігалі цераз вогнішча. Не адганялі і мяне, малога. Адзін раз я не разлічыў і ўскочыў у самае пекла сваімі новымі чаравікамі...

## САПРАЎДНАЯ ЖАБРАЧКА

Яна прыблукала на змярканні. У сенцах доўга вадзіла па дзвярах пальцамі, і маці прыйшла ёй на дапамогу. Парог пераступіла малая згорбленая кабета, з доўгім і тоўстым кіем у руцэ і з торбаю за плячыма. Павіталася хрыплаватым, прастуджаным голасам, пераржагналася і папрасілася пераначаваць.

Маці не адмовіла, яна заўсёды давала прытулак людзям, якіх заспела ў дарозе ноч.

— Раздзягайся ды грэйся,— сказала маці і пачала запальваць газоўку, што вісела над сталом на драціне, прымацаванай да бэлькі.

Святло газоўкі ўпала на незнаёмую постаць і цьмянавата разлілося па хаце.

Кабета ля вушака паставіла кій, зняла з сябе і паставіла на падлогу зрэбную, неахайна напакаваную торбу.

Мы з Маняю выглянулі з-за печы.

— Жабрачка,— сказаў я,— ісцінны бог, жабрачка!

— Яна самая,— пацвердзіла Маня.

— Якая страшная-а!

— Ціха, маўчы,— ушчыпнула мяне сястра за руку.

Тым часам старая пачала распранацца. Найперш развязала і зняла абкручаную вакол галавы канаплянку. На галаве засталася яшчэ адна — тонкая белая — хусціна, насунутая на лоб.

З плеч яна скінула ватоўку і засталася ў сачыку. На нагах былі ў яе буркі, іх добра закрывала доўгая вылінялая, уся ў латках, спадніца, паўзверх якой — сіняваты, з трыма чырвонымі пасачкамі ўнізе, фартух.

Жабрачка нечакана закашляла, ды так моцна, што здавалася, кашаль парве ёй грудзі.

— Зусім як мама кашляе,— шапнуў я Мані.

— Маўчы, бо забярэ да сябе,— сказала сястра, і я зноў пачаў назіраць моўчкі (жабрачак баяўся змалку,— відаць, мяне імі палохалі, калі часам не слухаўся).

Мама пасадзіла жабрачку на лаву па той бок ста-

ла, а сама дастала з печы вараную ў гаршку капусту, наліла ў гліняную міску.

— Пагрэйся гарачанькім,— сказала яна,— лягчэй будзе.

Прыступ кашлю ў старое прайшоў, і, перш чым пачаць есці, яна падышла да сваёй торбы, развязала яе, пакорпалася ды выняла адтуль кавалак хлеба і маленькі кавалачак сала. Паклала на стол, пераджагналася.

Капусту яна сёрбала хутка, а сала з хлебам ела марудна, як старая, нямоглая кошка, старалася адкусіць, а кусаць не было чым, і адагрэты скрылік расцягваўся, бы гумовы.

Твар яе ўвесь быў пасечаны маршчынамі, ніжняя губа абвіслая, як лапаць, а вастры падбародак хадзіў ходырам, калі старая жавала. Вочы і бровы здаваліся выцвілымі.

Пасля вячэры яна зноў хрысцілася і дзякавала нежаночым голасам:

— Дай вам божа здароўечка, людцы добрыя.

Яе зноў пачаў душыць кашаль, і яна папрасілася на печ.

Мы з Маняю паказаліся ёй на вочы.

— Вашы дзеткі? — сказала яна і тут жа дадала: — Хай растуць здаровенькія.

Мама памагла ёй узлезці на печ, а мы з Маняю селі на лаўцы, насупраць.

Жабрачка скінула белую хустачку. Сівыя валасы былі закручаны на патыліцы ў пучок. У валасах тырчаў цёмнага колеру грэбень. Сівізна яшчэ больш пад-

крэслівала выцвілыя вочы і бровы. Цяпер уся яна здавалася нейкай выцвілаю.

Яна марудна расшпільвала і здымала з сябе сачык. Старэчая шыя была такая тонкая, што мяне здзівіла, як на ёй трымаецца галава.

Маці падала ёй лахманоў і посцілку.

— Каб не замерзла,— сказала яна,— пад ранак печ выхалане. Але да ранку яшчэ далёка. Пакуль не спі, я завару маліны.

Маці карміла нас, вечэрала сама, пасля паіла жабрачку малінавым чаем і, стоячы на ўслончыку ля печы, гаманіла з ёю. Жабрачка расказвала пра сябе.

— Людцы мае,— плакала яна без слёз,— усіх пабілі... Я кароў пасвіла, то засталася. Няхай бы і мяне разам... Куды ж цяпер адной?.. Усенькую дзярэўню спалілі...

— Дзяніскавічы таксама хацелі спаліць,— расказвала маці,— ужо й людзей пазганялі на расстрэл, ажно прыехаў нейкі фюрэр і адмяніў загад.

Яны яшчэ доўга гаманілі. Са слоў жабрачкі я зразумеў, што вёска, якую спалілі фашысты, была аж за Мінскам, што ў старой не засталося нікога з родных, і што там, за Мінскам, калгасы, і што ў тых калгасах людзі замест коней, бо іх няма, самі ўпрагаюцца ў плуг і аруць поле.

Мне стала шкада жабрачку. Яе вёска згарэла, а родныя ўсе загінулі... Дагэтуль баяўся я тых, што просяць міласціну, а цяпер маё сэрца апаліла першая спагада, выціснуўшы пачуццё страху. Падумаў я пра тое, што мне кожны раз бывае сорамна, калі маці па-

шле да суседзяў што-небудзь пазычаць. Дык гэта пазычаць. А як жа, мусіць, непрыемна прасіць...

Яшчэ большым шкадаваннем я пранікся да тых людзей, якім даводзіцца ўпрагацца ў плуг. «Плуг такі цяжкі, нават Манголка Саламонішына не хоча яго цягнуць,— разважаў я.— А як жа людзі?» Мімаволі сам станавіўся на іх месца, бачыў сябе запрэжаным, цягнуў такі нялёгкі плуг, спатыкаўся і падаў, уставаў і зноў валачыў нечалавечы цяжар. «Добра, што хоць у Забалоцці ёсць коні,— з палёгкаю ўздыхаў я і тут жа зноў хмурнеў: — Шкада, што ў нас няма каня. За чужога, пазычанага, трэба кожны раз заплаціць або адрабіць маме на жніве, на льне ці на бульбе».

## ЗВЫЧАЙНЫЯ РАДАСЦІ

Маня навучыла мяне расказваць адзін верш. Праз год, калі буду ўжо школьнікам, я даведаюся, што называецца ён «Зімою» і напісаў яго Якуб Колас. А цяпер мне не трэба ні назвы, ні імя паэта, адно знаю, што верш вельмі цікавы, бо як нельга лепш адпавядае майму настрою.

— Мамачка-галубка,—
Просіць сын так міла,—
Можа б, ты на рэчку
Пагуляць пусціла?

У нас няма рэчкі, але ёсць гара, а з той гары санкі ляцяць як страла, і гэта добра ведае мая мама.

— У чым жа ты пойдзеш? — гаворыць яна строга,

але ў яе голасе мне чуецца амаль няўлоўная лагодная нотка.

Я ведаю, што чаравікі трэба берагчы.

— У Маніных дзеравяшках,— адказваю я.

— А калі гэта я цябе даждуся? — Да мамінай згоды застаецца адзін толькі крок.

— Мамачка, я не буду доўга...

— Ну, глядзі, доўга не баўся. І снегу ў дзеравяшкі не набяры.

— Не набяру, не бойцеся.

Лёгка даваць абяцанні, але яшчэ лягчэй забыць пра іх, калі ў цябе пад нагамі ўжо рыпіць снег, а з горкі мала што не да самага балота імчацца санкі. Яны ў нас незвычайныя — прычэп да санак, які называецца «сучкаю». Дзіцячыя саначкі ёсць толькі ў Чушбавага Андрэя, а нас на гары — шасцёра: Лёнька з Юзікам, Андрэй, Толік, я ды Ветрышына Валька. На гэтым прычэпе, які мы завалаклі з нашага двара на гару, з'ехаць можна ўсім адразу. І няма ніякае ў тым бяды, што адзін сядзіць, як пан, другі ледзьве ліпіць дзе-небудзь на полазе. Затое ў вушах аж свішча вецер і ў грудзях ад радасці кудысьці абрываецца сэрца. Санкі імчацца самі, нібы ў той казцы пра Ямелю. Вось ужо і бровар прамінаем, а яны ўсё ляцяць — напрасткі — да зацягнутага лёдам і аснежанага балота... А колькі радасці, калі, разагнаўшыся, санкі знячэўку перакуляцца ў снег! Тады піску і смеху — нібыта поўны мех развязаўся. І дзе там будзеш думаць, асцерагацца, каб не насыпалася ў дзеравяшкі белага пякучага прыску! Хаця б не пазляталі яны з ног.

Вясёлыя, чырванашчокія, усцягваем санкі зноў на гару (нават Валька Ветрышына, заўсёды бледная, і то зарумянілася), зноў імчымся ўніз, як на крылах.

Каб яшчэ ды на гару гэтак жа лёгка! Валачыць за сабой сані што ні раз, то ўсё менш ахвочых. Толькі гэта ўрэшце і дазваляе падумаць, што дома цябе, магчыма, ужо даўно чакаюць.

Вяртаешся ўвесь мокры і — шчаслівы!

— Такі вялікі хлапчыска,— ганіць мяне мама,— у школу пара ўжо, а розуму ніяк не набярэшся, курыца ты мокрая!

Ля гарачае печы яна мосціць мае нагавіцы, шкарпэткі, аблезлы малахай, Маніны дзеравяшкі, якім я даў перцу, а сама вяртаецца да кроснаў, дзе яе чакае Маня. І я — следам за ёй. Там, у другой палавіне хаты, з захапленнем гляджу, як завіхаецца мама. Як набіліцамі ляскае, як прыгожа праз усю аснову прапускае востры і гладзенькі чаўнок з пузатаю ад нітак цэўкай. Я цікую вачыма, чакаю, каб хутчэй скончыліся ніткі ў чаўнаку, тады маці, напэўна, скажа ўжо ласкава,— яна ніколі доўга не гневаецца:

— На, галубок, на, закладзі новую.

Маню дык часам нават пускае за кросны, і тая аруднуе зусім як вялікая: націскае на панажы, ляскае набіліцамі, пракідвае чаўнок праз вузкі «калідор» асновы. Не заўсёды Мані ўдаецца пракінуць яго адным махам, і тады яна дастае пальцамі зверху, каб падштурхнуць. Мне пачынае здавацца, што я зрабіў бы лепей, таму прашу:

— Дайце мне трохі паткаць.

— У цябе на губах малако не абсохла,— кпіць Маня.

Я выціраю далоняю вусны, не разумеючы яе шпілек. Мама і Маня смяюцца з мяне, а я зноў прашуся.

— Табе няможна,— кажа маці,— нітку парвеш.

— Ыгы, хітранькія, ёй дык усё можна...

— Яна — дзяўчына, а дзе ты бачыў, каб хлопцы ткалі? — разважае маці.— Вось пачакай, прыйдзе вясна, я навучу цябе араць, добра?

— Канём?! Плугам?!

— Канём, галубок, і плугам.

— А я Манголкі не хачу. Яна шалёная.

— А мы ў Мірона пазычым,— абяцае мама,— усё адно плаціць трэба.

Душа мая пачынае гарэць ад радасці, і ўжо нават трохі недарэчным пачынае здавацца мне за вокнамі снег, які толькі што дарыў гэтулькі шчаслівых хвілін, хочацца, каб хутчэй прыйшла вясна.

## ВЯСНОЮ

Як добра, што прыходзіць вясна! Вясною канчаюцца завірухі і маразы. Вясною пачынае паціху набіраць сваю вышыню і сілу сонца. Звіняць капяжы, растае ўжо абрыдлы, пачарнелы снег, і мільгаюць, коцяцца з пагоркаў уніз вясёлыя ручаіны.

Насустрач ласкаваму цяплу ляцяць, вяртаюцца з-за мора птушкі, прабіваюцца з зямлі першыя, яшчэ кволыя, травінкі, пяшчотнымі агеньчыкамі загараюцца зорачкі першых кветак: на ўзлеску — сіняватыя

пралескі, на балоце — лотаць, у двары — падбел, весялее ў полі рунь.

Мая маці часта казала так: «Каб толькі можна было, я ўсе свае зімы аддала б за адну вясну».

Мяне вясна гэтаксама чаравала. Чаравала і вабіла яснаю сваёй далечынёю. Я не мог дачакацца, калі падсохне і сагрэецца зямля, каб басанож пабегчы па сцяжынцы, па раллі, па траве...

З-пад хлява і з-пад клуні цяклі і зліваліся каля хаты імклівыя ручаінкі. Зліваліся, каб прабіць сабе дарогу да вялікай вады. Я дапамагаў ім, счышчаў рыдлёўкаю дзе трэскі і смецце, а дзе — пясок. Гэта была добрая забава.

У зіхатлівую ў сонцы ручаінку я кідаў папяровыя лодачкі, мне хацелася, каб мае лодачкі заплылі як мага далей. І зноў — забава, толькі забава, якую мы, дарослыя, маем звычку называць бесклапотнай.

Было мне добра, што маці мая сонечнымі днямі ўсё часцей выходзіла з хаты, каб пастаяць ля прызбы, прытуліцца да першага веснавога цяпла, абагрэць душу.

— Свет які робіцца вясёленькі...— казала яна.— Калі дасць бог, пабудзе цяпло, то, бадай, на Юр'я Красёху пажанем на пашу.

— А калі ўжо тое Юр'я? — пытаўся я.

Пытаўся, бо яшчэ зімою чуў ад мацеры: «Калі на грамніцы нап'ецца певень вадзіцы, то на Юр'я наесца бык травіцы».

А калі яно прыходзіла, тое добрае свята вясны, усе людзі пад вечар ішлі сем'ямі ў поле — да свайго жы-

цейка. Там і святкавалі. І елі і пілі за незвычайным і такім простым сталом — абрусам, разасланым па руні.

Ды самае шчаслівае, самае ўрачыстае, вядома, не ў вячэры, не ў тым, што стаіць на белым настольніку, а ў тым, што чакае нас, дзятву, адразу пасля вячэры. А чакае вось што. Бярэш лыжку, якою толькі што еў, запіхваеш яе за пояс і качаешся па жытнёвай руні, якая ў першы месяц вясны яшчэ не ломкая. Робіцца гэта — каб добра жыта ўрадзіла...

Як жа стараліся мы з Маняю тым надвячоркам, як доўга качаліся! І столькі невыказнае волі, прастору разгортвалася ў тым дзіцячым святкаванні!

Гэта была забава, але непадобная на іншыя, бо асвятляў яе матчын клопат, найвялікшы сялянскі клопат. Калі падрос я, то заўважыў, што ўсё жыццё чалавечае якраз і трымаецца на тым клопаце — каб урадзіла поле ды вырасла жывёле добрая паша. І яшчэ я зразумеў, чаму маці гэтак моцна любіла вясну. З вясной была звязана надзея на ўрадлівае лета, рупную восень і негалодную зіму.

## ПЫТАННЕ, ЯКОЕ ПАЎТОРЫЦЦА

Красавік увайшоў у сваю моц. Ён выдаўся шчодры на сонца і дажджы. Балота зіхацела суцэльнаю паводкай кураслепу. Пры дарогах на цыбатых сцяблінках раскрыліся бухматыя жоўтыя галоўкі адуванчыкаў.

Весела рунела жыта, абяцаючы добры ўраджай.

Апоўдні, калі я прыгнаў з пашы ў хлеў Красёху, маці сказала:

— Пакуль я выдаю карову, збегай, сынку, да Чушбы, пазыч хлеба.

Пазычаць — самая пакутлівая справа. Лепей я рабіў бы найцяжэйшую работу, абы не ісці прасіць.

— Ай, мама...— скрывіўся я,— няхай збегае Маня, яна Красёху не пасвіла...

— Маня пойдзе перабіраць бульбу,— стрыманым голасам тлумачыць мама.

— Я пайду перабіраць,— прашуся я без усякае надзеі на літасць, бо выдатна ведаю, што Маня гэтаксама не любіць пазычаць.

— Бач ты яго,— пачынае злавацца маці,— бульбы захацелася. А можа, крапівы даць?.. Ужо во падскочыла пад плотам.

Ад нашае сядзібы да Чушбавае сцежачка бяжыць праз палоскі жыта, падзеленыя вузкімі межамі. Дрыпаю я гэтай сцежкаю, а сэрца маё ледзь не плача. Але над галавою сіняе неба, а ў тым небе дрыготкаю кропкай — жаваранак. Песня жаваранка ліецца і ліецца, і ўжо мне пачынае здавацца гэтая трапяткая кропка ў небе сярэбраным званочкам. Сэрца маё напаўняецца любасцю да ўрунелага жыта і белае нягладкае сцежачкі, што кладзецца пад мае босыя ногі, да сонца і жаўранка, да сіняга неба над галавою і да тых вунь кучаравых аблачынак над краечкам далягляду, якія, магчыма, пад вечар вырастуць у хмары і прынясуць дождж. І мне хочацца ўзняцца ў неба. «Эх, каб быў такі шар, які часта мне сніцца!» — думаю я ды пускаюся бягом.

У Чушбавай хаце былі адно Мірончыха і Андрэй.

Дзядзька Мірон, як звычайна, майстраваў штосьці ў кузні. Каця даіла карову.

Калі я пераступіў парог, Андрэй канчаў палуднаваць.

Тое, што ў хаце не дзядзька Мірон, а Мірончыха, мяне трохі збянтэжыла, і я падпёр плячыма сцяну.

— Шчо тэ став кулу стынэ? Стына і так ны пуваліцця,— засмяялася Мірончыха. (Мірончыха не з Забалоцця, у яе вёсцы ўсе так гавораць.) — Тэ чугось прыйшов?

Мне стала горача ад яе пытання.

— Тэ хочыш істэ?

Мірончыха ўзяла скібку пірага, пасыпала цукрам, паднесла мне і сказала:

— На во, пудсылкуйся.

Хваля майго сораму трохі адступіла, і я моўчкі ўзяў пірог.

— А шчо трэба сказатэ? — нагадала Мірончыха.

— Дзякую,— сказаў я, зноў адчуваючы, што чырванею.

У роце ў мяне мігам раставаў не толькі цукар, але і пірог.

Цяпер я ніяк не мог прызнацца, што прыйшоў, каб пазычыць хлеба...

Так і вярнуўся дадому з пустымі рукамі.

— З чым жа ты будзеш есці крупнік? — перажывае маці, перабіраючы з Маняю каля склепа насенную, дробную, бы жалуды, бульбу.

Я пахваліўся, што ўжо еў пірог з цукрам, і спытаўся:

— А чаму Чушбаў Андрэй ніколі не пазычае?

— Будзеш многа знаць — састарышся хутка,— умешваецца не ў сваё Маня.

Яшчэ нейкае імгненне я стаю каля склепа, чакаю матчынага адказу. Але маці гаворыць строга:

— Марш да хаты! Пахлёбай, калі хочаш, крупніку і выганяй карову на пашу.

## ВЯЛІКІ ДЗЕНЬ

У звычайных веснавых клопатах нахапілася і велікодная субота. Прыемна аддае свежай сырасцю ад пабеленых сцен і печы, так і ззяюць чысцінёю вымытыя дабяла лавы, дзяжа, падлога. Цёпла пахнуць сонцам, вясною, свежым ветрам навалачкі, бялізна, посцілкі, ручнікі. Мусіць, гэты пах пачулі нават намаляваныя на абразах святыя. Дзіва што! Кажа мама, яны ўсё чуюць і ўсё бачаць, адно што маўчаць; толькі на страшным судзе будуць гаварыць — судзіць стануць грэшнікаў. Таму і грашыць няможна. Пакуль не прыйдзе вялікдзень, нельга нічога скаромнага з'есці. Ды што з'есці — хаця б пакаштаваць! А тут як назло — мне з Маняю выпадае несці да бацюшкі ўсю гэтую смакату ў карзіне. Несці трэба, каб ён пасвяціў. У Забалоцці гэтак робяць усе ў велікодную суботу.

Бацюшка, высокі, у сваёй блішчастай рызе, прыедзе да Сідаравае хаты, што па той бок балота. Нам добра відаць, як туды — хто грэбляю, а хто, падобна нам з Маняю, напрасткі — пачынаюць сыходзіцца людзі.

На балоце сям-там яшчэ стаіць вада, але мы босыя, таму прастуем смела. Уногі халаднавата, ды хіба думаецца пра холад! Нават дробныя — на танюткіх сцяблінках — кубачкі кураслепу не прыцягваюць нашай увагі, мы наступаем на іх, як на звычайную траву. Уся ўвага наша — на карзіне, накрытай белым вышываным ручніком.

— Мань,— кажу я,— давай заглянем пад ручнічок.

— А прасіць не будзеш лыгамэндаў? — папярэджвае Маня.

Лыгамэндамі ў нас называлі ўсё смачнае, ласункавае.

— Ісцінны Хрыстос, не буду,— абяцаю я.

— Ну, глядзі...

Яна падымае крыло ручніка, а там — мамачкі! — і яйкі, і каўбаса, і мяса, і масла, і сыр, і пірог... Як на мой розум, то я дазволіў бы сабе і саграшыць, паскароміцца. Нічога, што ўбачаць тыя святыя. Няхай бы нават судзілі мяне на сваім страшным судзе. Няўжо прысудзілі б лезці ў кацёл, дзе гарачая смала? Так і палез бы я, знайшлі дурня!..

Гэтак пахне з карзіны! Але сястра раптам азмрочвае мой настрой.

— Бацюшку трэба аддаць дзесяць сырых яек,— кажа яна.

— Што ты выдумляеш?! — злуюся я.— Мама не казалі.

— У цябе яшчэ малако на губах не абсохла. А мне сказалі.

— За што яму даваць яйкі?

— А як ты думаў, да Сідаравае хаты бацюшка прыедзе за так?!

— Ого-о-о-о! Хітранькі! — абураюся я ды знаходжу рашэнне: — Маня, давай не пойдзем да бацюшкі, пасядзім за ровам і вернемся.

— Думаеш, мне надта хочацца несці,— прызнаецца сястра.— Але ж нельга не слухацца мамы.

«Нічога не зробіш»,— разгублена я гляджу на Маню. А з карзіны так пахне!.. Але ж мама сказала, сёння нічога нельга каштаваць, а таму мне з Маняй пакуль што не застаецца нічога большага, як панюхаць, ступаць па некалькі крокаў, спыняцца і зноў нюхаць. І так аж да Сідаравае хаты.

Доўгаю будзе гэтая велікодная субота. І цяжка будзе заснуць. Але нарэшце прыйдзе чараўнік сон, які адразу з пакутліва-маруднага вечара перанясе ў белую раніцу. Рана прачнёмся і Маня і я. Глянем, а мама ўжо на нагах. На ёй — вышываная кофта і прыгажуткі андарак. «Ну, дзеці, мыйцеся, адзягайцеся — ды за стол»,— скажа яна і прынясе з сенцаў карзіну.

І надыдзе самае лепшае для нас, дзяцей, свята — свята ласункаў. І кату Рыжыку будзе гэтаксама свята — мы падзелімся ўсімі смакамі з ім. І Воўчыку нешта перападзе. А пасля мы з Маняю набяром пафарбаваных яек і гайда на двор гуляць.

# ВЕТРЫХА

— Кума, каб яна кумкала пад лёдам! Во такусенечкі кавалачак сала дала,— скардзіцца маёй маме Ветрыха.

«Што яна такое гаворыць?» Я выглядваю з-за печы. Мамы не відно, толькі выразна чуваць, што яна завіхаецца ля пліты, бразгае фаеркамі, гаршчочкамі і чыгункамі. А Ветрыха сядзіць на лаве, ля самага акна. Доўгі яе твар бледны, вочы — амаль бясколерныя. Гаворыць яна хутка — вялікі востры падбародак ходзіць часта.

— Во такусенечкі! — абураецца Ветрыха, правёўшы правай далоняю па левай, Ветрышын твар сярдзіты.— Каб на яе халера, каб на яе!

— Сваіх жа дзяцей карміць трэба,— чуюцца маміны словы.— Відаць, больш не магла.

— Не магла!.. Каб яна ўстаць не магла!..— працягвае абурацца суседка.

А ў маёй галаве засела тое: «Кума, каб яна кумкала пад лёдам!» «Што яна сказала, гэтая Ветрыха?» — не магу супакоіцца я, хоць і неаднойчы даводзілася чуць ад яе праклёны, калі яна што-небудзь расказвала маме. Ветрыха заўсёды іх сыпле, як з мяшка — злосныя, нават лютыя: «Што ты кідаеш, кажу, каб табе вочы павыкідала!», «Нясі, каб цябе ўперад нагамі панеслі», «Вешай, каб ты на асіне павесіўся!», «А каб ты свайго ценю баяўся!». Усё гэта было для мяне звыклым. Цяпер жа я думаў пра тое, што так знячэўку запала ў памяць. Пад лёдам крумкаюць жабы. Яны

брыдкія. Мы з Лёнькам, Андрэем і Толікам білі іх. Дык што, выходзіць, Ветрыха жадае сваёй куме, каб яна абярнулася жабай? «Хай табе язык адсохне! — паўтараю ў думках яшчэ адзін яе, Ветрышын, праклён, але тут жа сваю думку папраўляю: — Не, язык няхай не адсыхае. Скулу табе на язык, вось!»

Я выглядваю яшчэ раз з-за печы і заўважаю, што ў Ветрыхі — ці то ад злосці, ці то ад хуткае гаворкі — ажно пена на губах.

— Што ты гаворыш, Шура? — не вытрымлівае мама.— Хіба кума табе чым насаліла? Нашто ты яе клянеш?

— Халера яе не брала! — апраўдваецца Ветрыха.

— Слухаць гідка...

Брыдка і мне слухаць Ветрыху, я шмыгаю з-за печы ў дзверы. Імгненне — і з расчыненых насцеж дзвярэй выбягаю на двор. Раніца пахне травамі. Добра босымі нагамі адчуваць прахалоду белага пясочку, прыемна зазірнуць у глыбокі калодзеж, пастаяць ля напоўненае вадой балеі, паслухаць шпакоў.

Як пайшла ад нас Ветрыха, я не заўважыў. Але аж заскакаў ад радасці, калі мама пад вечар сказала, што ў лесе паявіліся чырвонагаловікі — Ветрыха на свае вочы бачыла — і што заўтра мы пойдзем у лес. Грады нашы папалаты, жыта жаць яшчэ не час. Дык можна сабе дазволіць і такую раскошу — грыбы. Праўда, тут жа мяне збянтэжыла тое, што мама паабяцала зайсці па дарозе да Ветрыхі.

— Не хачу, і ўсё! — заявіў я рашуча.

— Яна заўсёды нас у грыбы,— даводзіла мама.

— Не хачу яе грыбоў, калі яна гаворыць такое. Самі казалі, што слухаць гідка.

— Не бяры ў галаву, сынку, гэта ёй часам язык свярбіць. Памянціць ім трохі — і свярбець перастане. А яна ж нам суседка як-ніяк.

Гэта мяне супакоіла і нават крыху рассмяшыла. Засынаў я з думкаю: «Хутчэй бы раніца!» Прачынаўся часта і трызніў лесам.

— Спі-спі, сынку, яшчэ ноч,— супакойвала мама мяне,— не бойся, не праспім, я разбуджу.

У лес выбраліся мы рана, яшчэ да ўсходу сонца. Не здзівіўся я, а толькі ўзрадаваўся, калі ўбачыў на дзвярах суседчынае хаты вялікі замок.

Мы ішлі Дуброваю на поўнач, у бок пушчы. Перасеклі пясчаную дарогу, якая называецца гранічкаю, падняліся на ўзгоркі, густа пакрытыя брусні́чнікам. Звычайна тут бывае многа падасінавікаў і бабак. Але на гэты раз нас чакалі толькі карэньчыкі — пахадзіла Ветрыха.

— Калі яна паспела? — здзівіўся я.

— І сама думаю пра гэта,— развяла рукамі мама.

Шумела асінка, спакойна стаялі маладыя дубкі. Мы спусціліся ніжэй, пачалі блукаць вакол пагоркаў, хаця і тут ужо была збіта раса з верасоў. Верасовыя схілы і лагчынкі парадавалі нас, узнагародзіўшы пяццю падасінавікамі-мацакамі, з якіх два знайшоў я.

Відаць было, што грыбы ёсць. Мы прыпыніліся ля трапяткой асіны, каб дамовіцца, куды рушыць далей.

— А ці не падацца нам на Пель? — сказала мама.

Гэта не было для мяне нечаканым, бо якраз там, у

тых пералесках паміж Дуброваю і Паплаўскім лесам, збіраў я летась грыбы.

Пель спачатку расчаравала нас. У беразнячках трапілася некалькі бабак. Знайшлі ў траве чародку рыжыкаў, ды ўсе яны аказаліся чарвівыя. Але калі мы зусім выпадкова звярнулі ў асіннік, які нешырокай паласой выступаў у поле, там было падасінавікаў — хоць закладвай касу.

— Мама, давайце нож,— крычаў я раз-пораз, знаходзячы то вялікі, то маленькі грыб, а то і цэлую чародку.

Дадому неслі поўны кошык. А яшчэ добра, што нам не трэба было праходзіць ля Ветрышынае хаты, бо вярталіся з другога боку. «Няхай ходзіць яна ў лес хоць сабе і ўначы, з ліхтарыкам,— думаў я,— а ўсё адно ўсіх грыбоў не забярэ».

## СТРЭМКА

...Я ляжу на ложку. На супрацьлеглую сцяну падаюць сцішана-сумнаватыя промні сонца, якое пайшло ўжо на захад. У хаце чыста вымыта падлога. Ціха. Так ціха, што нават чутно, як дакранаецца лёгкі подых ветрыку да яблыневай лістоты за акном.

Палец мой з вялікай пад пазногцем стрэмкаю баліць, а ўсё ж не так, як у дарозе.

Ад стомы гудуць ногі — імі цяжка варушыць, нібы калодкамі,— злёгку кружыцца галава. Наплываюць лясныя ўражанні.

Летні дзень вялікі. А сённяшні здаецца асабліва

вялікім. Здаецца нават, што ў адным гэтым дні ўмясцілася некалькі дзён: быццам тое, што раніцаю адбывалася, было недзе пазаўчора.

Усталі мы рана-раненька, як і дамаўляліся. Маня пагнала Красёху на расу, а мы з мамай узялі кошык і кошычак, прыхапілі хлеба, малака і вады і пакіравалі на пушчу, у ягады.

Паласавацца першымі суніцамі і чарніцамі забалаччане могуць і ў Паплаўскім лесе і ў Дуброве. Але нам трэба было шмат ягад — поўны кошык і яшчэ кошычак,— і таму наша дарога павяла ажно ў пушчу.

Да пушчы ад нас далёка. Там, дзе канчаецца Дуброва, сінее Бельскі лес. А пушча аж за тым Бельскім лесам.

Мы ішлі на поўнач. Над Хваінкаю толькі-толькі ўзышло сонца. Ад яго промняў пераліўным бляскам ззяла раса, якая спярша студзіла, а пасля саграваль нам ногі. Ласкавая песня жаваранка клалася на душу, абяцала пагодлівы дзень, мякчэйшаю рабіла нашу дарогу.

Лагчынка ля Дубровы сустрэла нас прахалодаю, Дуброва — птушыным шчэбетам. Дарога праз Бельскі лес, заплеценая карэннем старых дрэў, вывела да вёскі Ка́менка. Уся ў садах, вёска гэтая ляжала паміж лесам і рачулкаю. Як толькі мы выйшлі з вёскі да мастка, мама сказала:

— Ну, бачыш пушчу?

— Вось яна,— паказаў я рукою і спытаў: — Але чаму яна не сіняя?

— Таму што зялёная.

— А чаму здалёку сіняя?

— Так толькі здаецца.

— А чаму так здаецца?

— Бо тое, што далёка, вочы кепска бачаць,— як магла, тлумачыла маці.

У пушчы было ціха і ўрачыста. Такога лесу я ніколі не бачыў. Дрэвы высокія-высокія, асабліва яліны, хвоі, бярозы. Нясцерпна хацелася памерацца сілаю з гэтай вышынёй — кінуць угору камень, каб узляцеў ён над верхавінамі дрэў. Але як я ні ўглядаўся ў траву і мох пад нагамі, ніводнага каменьчыка не мог знайсці. Падняў з зямлі некалькі яловых шышак, былі яны надта лёгкія.

Мама вяла мяне ў ягады. Адну за адной міналі мы мясціны з пышным кустоўем сярод дрэў-асілкаў і густою росною травой або высокім — аж да пояса — папаратнікам. Я адшчыкнуў галінку папараці, і мне прыгадалася пачутая ад Мані легенда пра таямнічую кветку, якая цвіце ў купальскую ноч. На імгненне заплюшчыў вочы, і перада мною мільгнуў агеньчык папараць-кветкі.

— Ну, дзе ты там? — гукнула мяне мама.

Я дагнаў яе. Пачыналіся ягады.

— Не будзем лётаць,— сказала мама,— давай збіраць.

Мы спыніліся ля высознае бярозы. Побач з ёю рос малады дуб. На галіне яго начапілі, каб было добра відно, свой вузельчык з хлебам, малаком і вадою. Калі я ўвайшоў у ягаднік, то ўбачыў: чарніц тут столькі, ну што расы.



Спачатку ягады так і скакалі ў рот. Я зірнуў на маму: яна спрытна раз за разам кідае ягадкі ў кошык. Тады і я падумаў пра свой кошычак. Вядома, я не ўмеў збіраць дзвюма рукамі, і атрымлівалася ў мяне куды марудней. Кожную ягаду перакладваў з рукі ў руку, каб спярша напоўніць жменьку, а затым ужо высыпаў у кошычак. У рот цяпер кідаў толькі пераспелыя чарнічкі, якія разлазіліся ў руках.

...Я ляжу на ложку, а ў думках — там, у пушчы. У вачах мігцяць, нібы чорныя бліскучыя кроплі, чарніцы. Ад буйное расы мае ногі, і штаны, і рукавы кашулі — мокрыя. У паветры таўкуцца камары. Маю ўвагу прыцягваюць то пошчак салаўя, то зязюльчына «ку-ку», то трывожныя крыкі пакуль што невядомых мне птушак. Аднак ужо дно ў кошычку запоўнена. Я налаўчыўся збіраць нарэшце абедзвюма рукамі, і да нашага «ляснога» полудня ў мяне быў поўны кошычак. Я высыпаў з яго ў мамін вялікі кош, і ў яе стала паўкаша ягад.

Маме таксама нялёгка даюцца ягады, бо ў яе слабое здароўе. Яна нават летам часам кашляе. Яшчэ пры Польшчы захварэла на запаленне лёгкіх. Трэба было паляжаць у бальніцы, але дома заставаліся малыя Віця і Маня, і яна не далячылася, папрасілася дадому...

Пасля смачнага полудня — хлеба з чарніцамі і з малаком — ды кароткага адпачынку адчулася стома, не хацелася ўставаць. У пушчы зрабілася парка. Я вырашыў назбіраць яшчэ поўны свой кошычак ягад, каб мама не шкадавала, што ўзяла з сабой мяне, а не

Маню. Я завіхаўся, не зважаючы на тое, што балелі ногі і спіна. Але маме стала шкада мяне, як толькі я назбіраў паўкошычка ягад. Яна сказала, каб я адпачыў перад труднай дарогаю.

Дарога дадому сапраўды была цяжкая. Мама назбірала ягад поўны свой кош і яшчэ мой дапоўніла. Да Бельскага лесу мы размаўлялі мала. А там мама спытала:

— Ну, можа, набіў ужо ногі, то перадыхнём.

— І зусім не,— адказаў я, забягаючы наперад.

І ў гэты час не згледзеў, як урэзаўся нагою ў таўшчэзны вытыркнуты корань, які ад дрэва перапоўз на той бок дарогі.

Я без мала чаго не ўпаў. Калі б кошычак не быў абвязаны хусцінаю, то ягады высыпаліся б у пясок.

Моцна забалеў вялікі палец. Я заскакаў на адной назе. Падышла мама, паглядзела:

— Стрэмка.

Мы селі, паспрабавалі выцягнуць, а яна гнілая...

Цяжка даліся ягады, аднак я не шкадую, што хадзіў. Галоўнае, дапамог маме. Яна сказала, што палавіну ягад прадамо, астатнія ссушым на лякарства.

Сонейка заходзіць. Скора Маня прыгоніць Красёху. Узрадуецца, калі ўбачыць столькі чарніц...

Калі я прачнуўся, быў вечар. На прыстаўленай да ложка лаве стаяла газоўка. На маёй назе сядзела Маня і трымала ступню, а ў маміных руках была брытва.

— Во, паглянь, якую мы табе аперацыю робім.

Я сеў і паглядзеў на свой палец: лязом брытвы прарэзаўшы пазногаць, мама ўжо дабралася да стрэмкі.

— Ну, цяпер патрывай хвілінку,— сказала яна, узяла іголку і паціху выкрышыла ўсю стрэмку.

— Як толькі залезла,— дзівавалася мама,— гнілая, а пад увесь пазногаць забілася.

Пакуль мама і сястра аказвалі мне дапамогу, на пліце ў гаршчочку зварылася бульба. Але я так натаміўся за дзень, што і не падняўся вячэраць.

## ШКОЛА

Першага верасня, першага дня маёй вучобы ў школе, я чакаў, бадай, яшчэ з зімы. Хацелася, каб хутчэй міналі дні, хацелася хутчэй расці. І калі неяк летам маці сказала, што ўвосень мне споўніцца сем гадоў, я ледзь не абурыўся:

— Як гэта, мама? Яшчэ да зімы мне споўнілася шэсць гадоў. А ўжо і Новы год быў, і зіма прайшла, і вясна прайшла, а мне шэсць гадоў так і засталося. Чаму?

— Вось паслухай, сынку. Зіма, вясна, лета і восень разам складаюць адзін год. А леты чалавечыя лічацца не ад Новага года, а ад дня нараджэння.

— Мама, а я таксама быў маленькі?

— Быў, а як жа. Усе былі.

— А цяпер ужо вялікі?

— Вялікі, сынку, вялікі,— мама адной рукою гор-

не мяне да сябе.— Вось у школу пойдзеш... Маня таксама хацела б далей вучыцца, але няма ў нас каму працаваць. Скончылася яе навука на трох класах. А ты вучыся.

Да школы мяне няблага падрыхтавалі. Маня дамаглася, каб я вывучыў усе літары. Маці купіла ручку, чарніла, сшыткаў і нават каляровых алоўкаў. Для ўсіх гэтых школьных, як яна кажа, прычындалаў у мяне ёсць торбачка. Яе пашылі з белага льнянога палатна.

Каптан на мне не новы, але не зашмальцаваны і не падраны. На ногі, пакуль цёпла, не трэба нічога — пахаджу босы. На самыя халады ёсць чаравікі — Віця купіў. А ў разводдзе буду насіць дзеравяшкі...

Ну, вось і надышоў верасень. На траве блішчыць раса. Мы з Маняю адпраўляемся з хаты. Мама праводзіць нас да яблынькі, што ўпіраецца галінамі ў акно, дае мне наказ:

— Слухайся, Валодзька, настаўніка, каб ён цябе не біў і каб не скардзіўся на цябе...

Віцю пры Польшчы настаўнік біў, расказвалі, лінейкаю па руках. А Маня ўжо вучылася ў савецкай школе, яе ніхто не біў. Аднак маці зноў хвалюецца.

— Буду слухацца,— абяцаю маме.

Школа наша ў Дзяніскавічах, аж пад канец сяла, там, дзе і бальніца, аптэка, сельсавет. З Забалоцця яе не відно, бо засланяюць высокія кроны ліп ды бацюшкаў сад. Тыя ліпы старыя. Кажуць людзі, што на вяку гэтых дрэў нямала змянілася ўлад, нямала загаралася і гасла войнаў. Тым ліпам гадоў па чатырыста, а мо-

жа, нават і пяцьсот. Вось да якіх дрэў прытулілася наша школа!

Добра Мані. Яна ў школе ўсё ведае, за тры гады вучобы асвойталася. Добра і мне, бо я тэпаю побач з сястрою. Мяккая балотная сцежка змяняецца за ровам утаптанаю, нібы скамянелаю, палявой сцяжынкаю. Я раз-пораз азіраюся: ці не ідуць мае сябры? Але ззаду не відно ні Лёнькі, ні Андрэя, ні Толіка. Няўжо раней прайшлі?

Неўзабаве наша сцежка выскачыць на грэблю, а там і сяло побач. Але хто гэтак шпарка прэ па грэблі? Ну, вядома, Вольчын Толік. Ён звычайна не ходзіць, а бегае. Яго школьная сумка з'язджае з бока на жывот, ды гэта не замінае Толіку на бягу падскокваць на калдобінах. Толік ужо зусім блізка ад нас, але ў наш бок і не глядзіць. На хвіліну прыпыняецца ў пяску, затым рэзка набірае хуткасць, і ўжо не відно яго ў цёмным калідоры дрэў.

У мяне быў добры настрой, і я нават не прыкмеціў, як мы ўвайшлі пад шаты векавых ліп. Позірку адкрыўся вялікі будынак з бліскучым, з цынкавай бляхі, дахам — школа.

Завяла мяне Маня ў школьны калідор і пытае:

— Ну, ці ведаеш, куды табе ісці?

— А як жа, ведаю,— адказваю я,— у першы клас.

— Ну, дык ідзі сам.

— Добра, я пайду.

Іду вузкім калідорам, іду, мінаю адны дзверы, другія, трэція, ужо і апошнія мінаю, а зайсці ў клас так і не асмельваюся.

Падбегла Маня.

— Ну, куды ж ты! — сказала і ўзяла за руку.

У класе было ўжо нямала такіх, як і я, падстрыжаных хлопчыкаў.

— Валодзя! — паклікаў мяне Толік.— Сядай са мною.

Мы селі разам. Ва ўтульным класным пакоі мяне чаравалі вялікая — на паўсцяны — дошка і, вядома, парты, у якіх было месца і для кніжак, і для чарніліц, і для ручак. А яшчэ парты падабаліся тым, што ў іх ёсць вечкі, якімі хацелася паляпаць, асабліва — калі прыйшлі ўсе забалоцкія сябры.

Празвінеў званок. У клас увайшоў чалавек з белай ад сівізны галавою. Нягледзячы на свае гады, да стала прайшоў ён жвавенька, павітаўся і сказаў:

— Дзеці, сённяшні дзень у нас незвычайны. Усе вы спяшаліся на першы званок. А ці не забыў хто з вас паснедаць?

Не пачуўшы адказу, настаўнік тлумачыў:

— Я пытаюся, ці ўсе вы паснедалі?

— Снедалі. Снедалі,— пачуліся галасы.

— Гэта добра. Цяпер будзем знаёміцца. Мяне завуць Іван Іванавіч. А як завуць вас, я зараз даведаюся.

Настаўнік пачаў пераклічку. Рабіў ён гэта, уважліва ўглядаючыся ў твар кожнаму, каго называў.

Я не запомніў ніводнага незнаёмага мне прозвішча, бо ўсё чакаў, калі Іван Іванавіч падніме нас, забалаччукоў. Найперш ён назваў Міронавага (Чушбавага) Андрэя, затым — Вольчынага (Адэсішынага) То-

ліка, затым — Саламонішынага (Канакрадавага) Лёньку. Цяпер я ведаю іх прозвішчы: Андрэева — Казлюк, Толікава — Каралюк, Лёнькава — Мацкевіч. Чаму ж настаўнік не называе мяне? Мо не ўпісаў у сваю кнігу?

Чакаць доўга не давялося.

— Ражэвіч Уладзімір,— выразна вымаўляе Іван Іванавіч.

«Уладзімір» — так мяне ніхто дагэтуль не называў. Звалі ўсе іначай: Воўка, Валодзька, Валодзя. Я ўстаю, сэрца маё пырхае, як верабейка, у грудзях горача. Полымя ўдарыла ў твар.

— У цябе ёсць сястра? — пытае настаўнік, і ўвесь клас паварочваецца да мяне.

— Е,— адказваю я і адчуваю, што яшчэ больш заліваюся чырванню.

— Ражэвіч Марыя добра вучылася,— падбадзёрвае мяне Іван Іванавіч.— З яе можна браць прыклад. Толькі адказваць трэба не «е», а «ёсць». Сядай, калі ласка.

Што яшчэ казаў настаўнік у гэты дзень, прыгадаць не магу. Аднак добра памятаю, што пасля ўрокаў ён праверыў, як хто апрануты. Хто быў расхрыстаны, тым пазашпільваў вопратку. А тым, у каго было абшарпанае адзенне, сказаў, каб дома прывялі ў парадак.

Адразу спадабаўся мне Іван Іванавіч. Ён вясёлы і добры.

Як цікава вучыцца ў школе! Цікава слухаць Івана Іванавіча, сачыць за кожным ягоным рухам, глядзець, як старанна на дошцы выводзіць ён крэйдаю палачкі,

кручкі, літары, і самому выводзіць іх у сшытку. Асабліва руціцца пасля таго, як пад тваімі папярэднімі стараннямі красуюцца радасныя чырвоныя адзнакі — «5» або «4». А як цікава адказваць на пытанні настаўніка!

— Якая гэта літара? — пытае Іван Іванавіч, падымаючы ў руцэ папяровы квадрацік.— Хто ведае, дзеці?

Асаблівы націск настаўнік робіць на слове «хто». У класе становіцца гэтак ціха, што і муху было б чутно, каб праляцела.

— Дык што, хіба ніхто не ведае? — дамагаецца Іван Іванавіч.— Ну, смялей-смялей, нічога, калі хто і памыліцца.

Я добра ведаю, якая гэта літара, а яшчэ адчуваю, што настаўнік у любую хвіліну можа спытаць: «А што скажа Ражэвіч», і таму мне робіцца горача ў грудзях.

Руку паднімае куды смялейшы Толік Каралюк.

— Гэта літра...— бойка выпальвае ён, але тут жа спыняецца, моршчыць лоб, паварочвае галаву да мяне, спадзеючыся, што я падкажу. У класе чуецца смех. На выручку прыходзіць Іван Іванавіч.

— Не літра, а лі-та-ра...— папраўляе ён Толіка.— Ну, якая ж гэта літара?..

— «Б» — шапчу я ціха, каб не пачуў настаўнік.

— Гэта літара «П»,— упэўнена адказвае Толік.

— Якая-якая? Паўтары,— патрабуе Іван Іванавіч, напружваючы слых.

Толік зноў старанна зморшчвае лоб, але на ўсякі выпадак зноў разгублена пазірае на мяне.

— «Бы»,— я рашуча кідаю Толіку выратавальны круг.

— «Бы»,— паўтарае за мною Толік з выглядам пераможцы.

— Гэта літара «б»,— настаўнік нас папраўляе і папярэджвае Толіка: — На падказках далёка не заедзеш, а чужою галавою жыць не будзеш — сваю трэба мець на плячах...

У класе зноўку смех.

Як бы там ні было, а на ўроках ніколі не сумна, бо ўсякі раз Іван Іванавіч нешта дасціпнае скажа, нечаму навучыць, нешта новае пакажа. Вось на ўрок спеваў прыносіў камертон. Стукне камертонам лёгенька і хутчэй табе да вуха падносіць. Камертон тонка звініць, а ты павінен пад гэты ціхі звон «цягнуць» ноту...

Перапынкі паміж званком з урока і на ўрок мы праводзім у прасторным школьным двары, а часам бяжым навыперадкі на стадыён, адкуль не заўсёды чуваць званок на ўрок...

Школьны двор высокім плотам адгароджаны ад бацюшкавага саду. Той сад велізарны, цягнецца ажно да стадыёна. Гэта — спакуса для нас. Там, за высокім плотам, вісяць, здаецца, не звычайныя яблыкі, а залатыя. І гэтак шмат іх, што пад голле, каб не зламалася, пастаўлены падпоркі. На перапынку ў бацюшкаў сад не залезеш. Але і на гэта, бадай, прыйдзе час...

Ідуць дні, і ў школе ўсё цікавей. Мы пачынаем пісаць у сшыткі нават цэлыя словы. І чытаем.

Цяпер для мяне вялікую радасць прыносіць чытанне дома. Узлажу з нагамі на лаўку, што стаіць ля

акна, адгортваю кнігу, і ўжо мяне цяжка адарваць ад яе. Праўда, мама кажа, што я не чытаю, а бэкаю. Вядома, у мяне не так пакуль атрымоўваецца, як у нашае Мані. Але ж я ўжо чытаю без яе дапамогі.

## ПАД ВЕЧАР

З Міронавым Андрэем мы ішлі да Лёнькі. Калі звярнулі з вузкай сцяжынкі да расхрыстаных насцеж варот, то ўбачылі ў двары воз. З ганка сышла Саламоніха, мажная, чырванашчокая жанчына, а на ганак з хаты разгублена выбег Лёнька. Маці яго ўзяла ў рукі лейцы, што былі накінуты на слупок побач з калодзежам, нязграбна пачала залазіць у драбінкі. Убачыла мяне з Андрэем, павярнулася да Лёнькі.

— Вось і кумпанія твая ідзе,— сказала, а тады і да нас: — Пабудзеце з маімі хлопцамі?

Мы пераглянуліся з Андрэем:

— Пабудзем.

— Толькі не начвэрце чаго,— папярэдзіла нас Саламоніха.

Яна свіснула пугай над малой, нібы вослік, Манголкаю і, па-мужчынску цмокнуўшы губамі, сказала кабылцы ўладна: «Но-о-о!», і фурманка патарахцела да грэблі.

Мы ўвайшлі ў хату. Там за сталом сядзеў Юзік і церабіў мяса — відаць, маці вырашыла смачным кавалкам задобрыць яго, каб не зважаў на тое, што яна ад'язджае. Юзік пляткаў губамі, ад чаго мне і Ан-

дрэю стала смешна. Малы не звяртаў на нас ніякай увагі, а хацелася, каб звярнуў. Тады я шапнуў на вуха Андрэю:

— Давай скажам, што ён не мяса есць, а жабу.

І мы дружна засмяяліся:

— Ха-ха-ха! Ха-ха-ха! А Юзік жабу есць. Ха-ха-ха! Жабу-рапуху...

Юзік шпурнуў мяса на падлогу, а сам у плач. Мы з Андрэем аж за жываты ўзяліся ад смеху: такі ж дамагліся свайго!

Лёнька падбег да брацік, супакоіў, аднак Юзік мяса больш не ўзяў.

Нам стала няёмка перад сябрам.

— Лёня, а куды маці паехала? — спытаў Андрэй.

— У бальніцу да бацькі,— адказаў ён.

— А калі вернецца? — падтрымаў я распачатую Андрэем гаворку.

— Сказала, што ўвечары.

— Дык ужо й вечарэе,— смяецца Андрэй, смяюся і я.

Лёнька маўчыць, утаропіўшыся ў акно.

З кухні выходзіць Юзік, які не толькі супакоіўся, але і ажыў пасля нядаўняе непрыемнасці, цягне Лёню за рукаў і просіць:

— Хачу глушу.

Лёня вядзе брацік ў кухню, бразгае там заслонкаю, і вось ужо нам казыча ноздры пах прыпечаных груш.

— Лёнька, дай груш,— просіць у яго Андрэй.

Каму, як не нам, ведаць, што ў Лёнькавага дзядзь-

кі ў сяле дужа салодкія ў садзе грушы. Вось дзядзька і дае гэтую слодыч Лёньку.

Хоць Лёнька і пабойваўся матчынай лаянкі, але ж, паколькі папрасілі сябры, ён усё-такі вынес і даў нам па адной грушы.

Хутка пачало цямнець, заімжыла. Заслязіліся аконныя шыбы.

— Ну, трэба ісці,— сказаў Лёньку Андрэй.

— Трэба ісці,— паўтарыў я.

— Пабудзьце...

— А чаго мы тут не бачылі? — адказаў Андрэй на Лёнькаву просьбу.

— Яшчэ дам груш.

Лёня — шусь на кухню і дастаў нам з печы дзве вялікія салодкія грушы. Але як толькі мы іх умянцілі, адразу падаліся зноў да дзвярэй.

— Пабудзьце, яшчэ дам...— не ведаў, як нас затрымаць, Лёнька.

Так і «расталі» ў Саламонішынай печы ўсе грушы. А калі яны расталі, мы з Андрэем пакінулі адных Лёньку і Юзіка. Не паспелі вышмыгнуць з двара за вароты, як Лёнька стаў на падаконнік, адчыніў акно і адчайна, як плачуць па нябожчыку, загаласіў:

— Ой, куды ж яна паехала!.. Шчэ й не даехала!..

Нам было смешна з Лёнькі. Мы пабеглі, кожны ў свой бок. Мы, на жаль, не ведалі, што Лёнька ў той вечар не мог запаліць газоўку, бо выйшла газа. А ў цемнаце было няўтульна і страшнавата.

## ПАКВАПІЎСЯ НА ЧУЖОЕ

...Дагэтуль, казала маці, я быў залаты хлопец. І раптам мяне як падмянілі. Я апынуўся ў кутку. Тоўк голымі каленямі грэчку... Вядома, не было б ні таго агіднага кутка, ні той праклятае грэчкі, каб не прыйшоў да мяне Лёнька Саламонішын і не дастаў з-пад крыса каптана сшыткі ў клетачку, якіх якраз не было ў продажы.

— Дзе ты іх узяў? — здзівіўся я.

— Можаш і ты ўзяць, абы толькі хацеў.

— Дзіва што хачу, але дзе?

— Дзе, дзе! У Адэсіхі! Хадзем са мной.

— А што, Адэсіха прадае?

— Адэсіхі няма дома... І Толіка няма.

— А хто нам адчыніць?

— Хто, хто! Самі адчынім. Хадзем!

Я падумаў, што, вядома, лепш было б купіць хоць адзін сшытак у Адэсіхі або пазычыць у Толіка. Але ж Лёнька не купіў і не пазычаў, а проста ўзяў. Вось яны, прыгожанькія сшыткі ў клетку, пад крысом у Лёнькі. Яму больш не трэба, а ён вось дзеля мяне зноў пойдзе... Гэта падкупіла, спакусіла мяне, і я вырашыў:

— Хадзем.

Па дарозе збочылі да Міронавага Андрэя. Расказалі пра свой намер і яго пад'юдзілі пайсці разам з намі.

Абшарпаныя дзверы старэнькае хаты, у якой жылі цётка Волька і Толік, без намаганняў адчыніў Лёнька. З халодных сенцаў у хату дзверы не замыкаліся.

Як толькі ўлезлі ў хату, Лёнька ўпэўнена рушыў

да стала, а мы за ім. Ён выцягнуў шуфлядку. На маё здзіўленне, сшыткаў там не было. Тады мы ад няма чаго рабіць пачалі поркацца ў шуфлядзе, дзе ляжала ўсякая ўсячына — ад бруска, аб які вострацць нажы, да іголак і нітак. Відаць, нічога б там мы і не ўзялі, калі б не кінуліся нам у вочы каляровыя алоўкі. Іх было шэсць штук. Шэсць лёгка дзеліцца на тры, і мы падзялілі. Мне дасталіся жоўты і чырвоны.

Дадому я ішоў спакойна, не адчуваючы як належыць сваёй віны. Праўда, крадзеныя алоўкі мацеры не паказваў — паклаў у сваю палатняную сумку, а сам пайшоў гуляць. Быў упэўнены: Адэсіха не бачыла нас, дык і не даведаецца, хто «пагаспадарыў» у яе стале. Але як толькі я нагуляўся і ўбег у хату, маці сказала:

— Ану, расказвай, дзе гэта ты сёння быў!

Па строгаму голасу я зразумеў, што яна ўсё знае. Аднак адразу ж усумніўся: «Але адкуль яна знае пра тое, чаго не бачыла?» І, чырванеючы, прамовіў:

— Дзе я быў?.. Здаецца, па двары хадзіў.

— Па двары? А мо па чужых зашчапках?! Вось паглядзі, па табе ажно куток засумаваў.

Я павярнуў галаву і ўбачыў у куце густа рассыпаную па падлозе грэчку. «Так, мама ўсё ведае»,— падумаў я, чырванеючы як мае быць.

— Смехалюднік, гіцаль! — ганіла мяне маці.— Я з ім цацкаюся: «Мой Валодзька, мой памочнічак...», а ён во што ўчвэрыў!.. Ды як жа ты зараз будзеш Толіку ў вочы глядзець?! Пакваліўся на чужое, бессаромнік, зладзюга ты!

— Я больш так не буду,— прамармытаў я, апусціўшы галаву і адчуваючы, як гараць у мяне вушы.

— Ты больш не будзеш... А ці думала твая даўбешка, як тваёй мацеры будзе на свет выйсці?! Усе стануць пальцам тыцкаць: «Глядзіце, маці злодзея пайшла!..» — Яна зрабіла кароткую паўзу, пасля якой голас яе трохі памякчэў: — Гавары... Калі раскажаш, як усё было, меней прастаіш на каленях.

Я расказаў усю праўду, пасля чаго і ўліпнуў каленямі на грэчку. Маці строга сачыла, каб не выгарнуў востранькія зярняты, якія балюча ўядаліся ў калені. Я згараў ад сораму і думаў: «Цікава, дзе зараз Лёнька? Ці адбывае ён кару?»

## ЗАІНЕЛАЯ КЛАДКА

Ішлі доўгія, нудныя дажджы. Балота зусім раскісла. Потым злёгку падмарозіла. Вада пакрылася тонкім лёдам. І, пакуль лёд не трымаў, мы рабілі кругаля, агінаючы балота грэбляю.

Наша грэбля — гэта высокая і шырокая насыпная дарога. Паабапал яе — крывыя, з патрэсканай карою, вербы. У адным месцы грэбля разгаліноўваецца — ад яе цягнецца дарога да трох наводшыбе хутароў, дзе жывуць сваякі Архіпчыкі, і далей — цераз поле — у лес. Тут, ля развілкі, стаіць вялізны крыж, перавязаны ручніком, такі самы, як і на пачатку сяла. Стаяў ён тут, ля дарогі, і тады, як мінай забіла Толікавага бацьку.

Страшна робіцца яшчэ і цяпер ля гэтай мясціны.

Асабліва — цёмначы або калі зямлю ахінае туман. Так і лезуць у вочы ўсякія прывіды. І крыж тады страху наганяе, і нават вербы. Пачынае здавацца, што і яны, старыя дрэвы, уражаны тым жудасным здарэннем, памятаюць усё і шапочуць пра тое, што бачылі.

Да школы мы зараз ходзім разам. Я адпраўляюся раней за ўсіх, бо мне найдалей да грэблі. Па дарозе заходжу да Лёнькі, з Лёнькам ідзём да Андрэя, а тады ўсе ўтрох — да Толіка. Ад яго да грэблі зусім недалёка.

...Цёмная, хоць выкалі вока, ноч. У маіх руках, апроч палатнянае сумкі, тонкі снапок наколатай лучыны. Лучыну мы падпалім — сёння мая чарга — ля самае кладкі, што ляжыць над канавай, падпалім, каб відно было пад ногі.

— Гайда бягом! — я падаю каманду, прагнучы хутчэй самага цікавага — убачыць, як перад агнём адступіць цемра.

І ўся наша дружная чацвёрка бяжыць да павароту. А на павароце грэблі якраз кладка — два доўгія круглякі. Я чыркаю запалкай, падпальваю шматок паперы, ад яе лёгка загараецца лучына. Глядзім на кладку, а яна ўся абрасла інеем. Узнімаю факел — Лёнька, Андрэй і Толік адзін за адным узыходзяць на кладку. Апошні іду я, трымаючы над галавой ахоплены вясёлым полымем снапочак смаляных трэсак. Вось ужо на тым баку кладкі Лёнька і Андрэй. Я вышэй узнімаю лучыну, затуляючы яе сумкаю, каб не згасла полымя, падсвечваю Толіку, але сам неасцярожна ступаю на край коўзкага бервяна і з усёю «гас-

падаркаю» лячу ў канаву. Тонкі лёд праламваецца, і я па вушы ў ледзяной вадзе. Паплыла мая лучынка, паплылі з сумкі алоўкі і цэлая сотня выструганых палачак,— гэта Іван Іванавіч сказаў прынесці іх на ўрок арыфметыкі. Я вылажу з канавы, мокры і брудны, па мне ручайкамі збягае вада. Лёнька і Андрэй смяюцца, хіба яны разумеюць, што я не сабе свяціў пад ногі, а ім, і што ў чаравіках на гумовай падэшве мне цяжка было ступаць па кладцы. З хвіліну яшчэ стаю, разгублена думаючы, куды ісці — да школы ці дамоў. Але чаравікі на нагах — пудовыя, паўпалітко пудовае і штаны ўжо робяцца як бляшаныя. Я рашуча паварочваю дадому. Бягом, бягом, бягом! Вецер, якога дагэтуль не адчуваў, усё больш і больш пячэ. А маё адзенне ўсё больш змярзаецца. Ужо і рукі ў локцях сагнуць не магу.

Раніца бярэ сваё, пачынае развідняць. Канчаюцца вербы, канчаецца грэбля. Не шукаючы сцежкі, напрамкі — па застылых хвалях раллі — дабягаю да хаты. І толькі тады, калі ледзьве адарваў ад клямкі задубелыя пальцы і на парозе сустрэў усхваляваную маму і пачуў яе словы, мне нясцерпна захацелася плакаць. І я заплакаў, усё яшчэ ляскаючы зубамі ад нечалавечага холаду. Але плакаў, бадай, не ад таго, што змерз, і не таму, што прамачыў паўпалітко і чаравікі,— вельмі шкада было каляровых алоўкаў, якія засталіся ў канаве.

— Ліха іх бяры, сынку, не шкадуй, вось паеду да места — новыя куплю, яшчэ лепшыя,— суцешыла мяне мама, распранаючы і ўкладваючы на цёплую печ.

Яна заадно «скланяла» забалацкіх мужыкоў, якія не могуць зрабіць масток цераз канаву...

А пасля быў гарачы малінавы чай. Нават грудка цукру знайшлася ў мамы на гэты выпадак. Доўга я не мог сагрэцца, а калі сагрэўся, адразу заснуў.

## РОДНАЕ СЛОВА

Пасля Новага года замест «Буквара» мы, першакласнікі, чытаем ужо «Роднае слова». Гэтых кніжак усяго тры на ўвесь клас. Нам, забалаччукам, Іван Іванавіч дае адну. Даўжэй за ўсіх трымаюць падручнік Лёня і Толік. А мне ў «Родным слове» шмат што знаёма, Маня навучыла. Ну хіба мог я забыцца верш, які пачынаецца так:

Не сядзіцца ў хаце
Хлопчыку маламу:
Кліча яго рэчка,
Цягнуць санкі з дому.

Вядома, не мог, бо напісаў яго Якуб Колас нібыта пра мяне. А хіба можна не адгадаць загадку: «На двары гарою, а ў хаце вадою»? Канечне, гэта снег. А як не ведаць казку пра коціка, пеўніка і лісіцу, калі ты чуў яе хоць раз, або тую, у якой дзед вёз рыбу, а ліса, прытварыўшыся на дарозе мёртваю, у рэшце рэшт абхітрыла дзеда.

Але ж і лішні раз прачытаць такую казку не пашкодзіць. Чытаеш — і прыпамінаецца што-небудзь сваё, напрыклад, як Маня, пераадзеўшыся ў жабрачку, напалохала мяне да паўсмерці.

А многа ў кнізе і такога, пра што я нават не чуў.

— Да рэвалюцыі,— чытае Іван Іванавіч,— свет быў падзелены на багатых і бедных: памешчыкі і капіталісты жылі вельмі багата, а рабочыя і сяляне — вельмі бедна. Уладзімір Ільіч Ленін быў таварышам усяго беднага люду, ён хацеў, каб усе, хто працуе, сталі жыць добра.

Яшчэ настаўнік расказвае, як Леніна лавіла царская паліцыя, судзіла, ссылала ў далёкую Сібір, і як ён падняў працоўных на рэвалюцыю, і як рабочыя і сяляне спачатку прагналі цара, а затым памешчыкаў і капіталістаў.

Я слухаю настаўніка, і мне Ленін уяўляецца асілкам, з пудовымі, як у нашага каваля Чушбы, кулакамі. Напэўна, ён велізарны, напэўна, яму даводзіцца прыгінацца, каб увайсці ў хату...

— Уладзімір Ільіч упершыню ў свеце заснаваў Савецкую ўладу ў нашай краіне,— працягвае Іван Іванавіч.— Але ворагам рэвалюцыі ўдалося падарваць яго здароў'е, і ён заўчасна памёр.

«Як гэта — памёр? — засмучаюся я.— Хіба не было доктара? Маме ж маёй доктар не даў памерці. А мо настаўнік памыліўся і Ленін зусім не памёр?..»

Але Іван Іванавіч расказвае далей:

— Леніна няма, ды справа яго жыве. Справу Леніна вядзе...

Не хачу, каб паміраў Ленін. Хачу, каб ён жыў і жыў. Навошта паміраюць людзі?..

Рой маіх думак разлятаецца ад рэзкага металічнага голасу званка. Кліча двор: там яшчэ поўна снегу і добра лепяцца снежкі — адліга.

## КРЫХУ ГІСТОРЫІ

Вясна. Увачавідкі растае снег. Развідняе рана, і да школы ісці светла. А дні займаюцца сонечныя, таму пасля вучобы ў хату і заходзіць не хочацца. Маці сварыцца, калі я дзе ўлезу ў ваду, а мне і ў мокрых дзеравяшках добра. Здаецца, гуляў бы ды гуляў.

Вучыцца мне лёгка: і ў сшытках, і ў журнале — добрыя адзнакі. А падабаюцца мне найбольш урокі малявання, фізкультуры і, вядома, чытання.

Учора наш настаўнік расказваў пра тое, як Чырвоная Армія вызваляла Заходнюю Беларусь ад польскіх памешчыкаў. Пасля чыталі ўсім класам пра дзяўчынку з рабочай сям'і.

...Зося цэлы дзень адна ў хаце. Бацьку паны забралі на вайну, маці пайшла шукаць работы. Зося нічога не ела — няма хлеба...

Гэта апавяданне я ведаю на памяць. Яно мне вельмі спадабалася, бо ў канцы прыходзяць бальшавікі.

«Ці выкліча мяне настаўнік расказваць? От, каб выклікаў!..» — думаю я, мінаючы на грэблі кладку.

Дзень пабольшаў, і цяпер мы ходзім да школы часам і паасобку. На дарозе яшчэ ляжыць, як каша, снег, справа, на балоце, паблісквае вада, а злева, у полі, чарнеюць плямы раллі. Вясна!..

Настаўнік не выклікаў мяне расказваць апавяданне пра Зосю. Але інтарэсу да новай тэмы я не страціў, бо чыталі пра вясну, сяўбу ў калгасе.

«Зямлю калгаснікі аруць трактарамі, а зерне высяваюць сеялкамі,— чытаў Іван Іванавіч.— Роўнень-

кімі радочкамі кладуцца важкія зярняты ў пульхную раллю».

«Зямлю калгаснікі аруць трактарамі...» — паўтараў я ў думках настаўнікавы словы. І ўспомнілася мне жабрачка, якая расказвала, што ў калгасе людзі самі запрагаюцца ў бароны і ў плугі. «А што, калі сказаць гэта Івану Іванавічу?» — падумаў я. Пабароўшы хваляванне, падняў руку.

Настаўнік паглядзеў на мяне.

— Калі ласка, Валодзя.

Я ўстаў і, зноў хвалюючыся, пачаў:

— А жабрачка казала...

Настаўнік выслухаў мяне ўважліва.

— Сядай, Валодзя, я растлумачу,— сказаў ён.— Слухайце мяне, дзеці, уважліва. Тое, што пачуў Валодзя ад жабрачкі,— праўда. Вайна была лютая. Загінулі мільёны савецкіх людзей. Разбураны тысячы гарадоў і вёсак. Яшчэ не ўсе адноўлены заводы...— Іван Іванавіч зрабіў кароткую паўзу.— Але ж праўда і тое, што на калгасныя палеткі ўсё больш выходзіць трактароў, сеялак, камбайнаў. Уявіце сабе машыну, якая жне, малоціць і вее. Гэта і ёсць камбайн. І яны ідуць ва ўсе куткі краіны...— Настаўнік зноў зрабіў паўзу, паглядзеў у акно, нібыта жадаючы там нешта ўбачыць.— Вось і ў Дзяніскавічы прыйдуць, як толькі ўтворыцца калгас.

Я слухаў, затаіўшы дыханне. Хацелася хоць адзін раз глянуць на дзівосную машыну, якая жне, малоціць і вее, бо я ўволю нагледзеўся, як мама жне сярпом, малоціць цэпам, а вее толькі з дапамогаю ветру.

— Вы ўсё зразумелі, дзеці? — пытае настаўнік.

Адусюль пачуліся галасы:

— Усё.

— Усё.

— Усё.

— А ці ведаеце вы, што такое — калгас? Калі хто ведае, няхай падніме руку.

У класе стала ціха-ціха — рукі ніхто не падняў.

— Нічога дзіўнага, што не ведаеце,— працягваў Іван Іванавіч,— гэтае слова для вас новае. Утварылася яно з двух слоў: «калектыўная гаспадарка». У калектыўнай гаспадарцы ўсе работы выконваюць разам, талакою, бо і зямля, і машыны, і жывёла — усё агульнае, сумеснае, значыць.

Іван Іванавіч даў нам хатняе заданне, я запісаў тое заданне нібыта чужой рукою, бо стараўся ўтрымаць у галаве ўсё, што сёння пачуў. «Калектыўная гаспадарка, а скарочана — калгас,— гаварыў я сам сабе.— Як цікава! Два словы, злітыя ў адно. Дзіва што там, у калгасе, усё сумеснае. І нават тыя цудоўныя машыны, якія жнуць, малоцяць і веюць...» Паланёны думкамі і марамі, я нават званок нібыта не сваімі вушамі пачуў. І толькі Толікавы словы: «Чаго сядзіш?» — вярнулі мяне ў свет школьнага жыцця.

## АБ'ЯВІЎСЯ БАЦЬКА

Аднаго разу, было гэта апоўдні, набегаўшыся ў Толіка з сябрамі — гулялі ў чыжыка,— я, узбуджаны, уварваўся, нібы скразняк, у хату. За сталом, над апа-

рожненай міскаю, сядзеў барадаты чалавек, побач з ім — Маня, яна прыбегла з бровара, дзе пасвіла карову, а насупраць, па другі бок стала,— мама. Мне не спадабаўся барадач, а яшчэ больш — тое, што поруч уселіся мама і Маня. Я скасавурыўся на іх, нічога не сказаў, а слізгануў да канапы, што прытулілася ў кутку, воддаль ад стала і непадалёк ад печы, з незалежным выглядам сеў і закалыхаў нагамі. У хаце мне зрабілася душна, і я шмаргануў рукавом кужэльнае кашулі па ўзмакрэлым лобе.

— Валодзечка,— раптам павярнулася да мяне мама,— ці ведаеш, хто да нас завітаў?

Я позіркам акінуў барадатага. Не падабаліся мне яго чорная шырозная барада, чорны пінжак і шэрая кашуля, расшпіленая пад горлам. Я маўчаў, пазіраючы спадылба на незнаёмага чалавека, які здаўся мне сумным, хаця ён і зрабіў спробу ўсміхнуцца. Маўчанне цягнулася нядоўга, з-за стала матыльком выпырхнула Маня, падбегла да мяне і казытнула ў саменькае вуха цёплым стрыманым выдыхам, быццам адкрыла невядома якую таямніцу:

— Гэта наш бацька.

Я не міргаючы глядзеў на высокага і плячыстага барадача, які ўжо адарваўся ад лаўкі, марудна і паважна вылез з-за стала і гэтак жа марудна, як бы неахвотна, набліжаўся да канапы. Я зноў працягнуў рукавом па ўсё яшчэ распараным лобе.

— Ты не помніш мяне, Валодзька? — ніякавата спытаўся ён, усміхнуўшыся, калі можна назваць усмешкаю штучна расцягнутыя губы.

Я працягваў маўчаць, нібы акамянелы ад такой нечаканасці, хаця і дужа хацелася папытацца, дзе ён быў дагэтуль і адкуль прыйшоў.

Мне спадабалася, што ён не пацалаваў мяне: я не хацеў, каб да мяне датыкалася тая барада. Яшчэ болей спадабалася мне, як яго тоўстая далонь нырнула ў неглыбокую кішэню пінжака і дастала адтуль нешта загорнутае ў газету. Ну, вядома, гэта былі цукеркі. Ён сказаў: «Давай далоні» — і высыпаў мне ў прыгаршчы тую жаданую слодыч — карамелькі-падушачкі. Я падзякаваў бацьку за гасцінец і не адразу пачаў ласавацца. Глытаючы сліну, я асцярожліва нібы ваду, якую нельга разліць, або агеньчык, які не павінен згаснуць, нёс цукеркі, частаваў маму і Маню, а сам зноў і зноў круціўся ля канапы, браў і еў рагаценькія салодкія падушачкі.

Бацька, сеўшы побач са мной, неяк разгублена, з паўзамі, распытваў, як я скончыў першы клас, кім хачу стаць, калі вырасту. Ён нават пагладзіў мяне па галаве сваёй халоднаю і цяжкаю, нібы каменнаю, рукой за тое, што я пажадаў стаць настаўнікам, як Іван Іванавіч.

Радасць мая расла ўвачавідкі. «У мяне ёсць тата! Саламонішын Лёнька больш не будзе выскаляцца, што мой бацька сабакам сена косіць,— думаў я.— Вось убачыць сам...» Мне ўжо нават пачынала падабацца бацькава барада, нават хацелася яе пакратаць рукамі.

Тым часам Красёха ўлезла ў Ветрышыну бульбу, па той бок бровара. Гэта ўбачыла мама з акна, яна і паслала мяне пасвіць карову. Я ўзяў у рукі пугу і па-

бег. Са шкоды Красёху выганяў пад Ветрышыны праклёны.

— А каб ты на асіну скакала, жабяня! — крычала яна.

Аднак там, ля бровара, мне было добра. Я гойсаў на гару і з гары, страляючы пугай у паветры, пасля кідаў угару каменьчыкі,— здавалася, вось-вось ажно да воблакаў дакіну, пасля мне захацелася як мага вышэй залезці на вяз. Але толькі я падскочыў і ўхапіўся пальцамі за ніжнія сукі дрэва, як убачыў: да мяне бяжыць Маня.

Сястра мяне засмуціла, сказаўшы:

— А бацька пайшоў...

— Як пайшоў? — не мог уцяміць я.— Куды пайшоў?

— Куды, куды,— дражнілася Маня.— Можа, на кудыкіну гару.

— Паглядзі за каровай, я зараз...— крыкнуў я сястры і пасыпаў да хаты.

Мяне здзівіла, што і мама, падобна Мані, была абыякавая да таго, што здарылася.

— Занадта спяшаўся, ён жа на рабоце, сынку,— сказала яна і, відаць, каб я дужа не перажываў, тут жа знайшлася: — Неўзабаве зноў прыйдзе, казаў.

Радасць вярнулася да мяне. «Мой тата — цясляр, хаты ставіць,— думаў я.— Цясляр — яшчэ лепей, чым каваль. Скажу гэтак і Лёньку і Андрэю, няхай ведаюць».

## НАВІНЫ, ПЕРАМЕНЫ

Прабеглі неўпрыкметку лета і восень, лёгкай сняжынкаю растала зіма, кветкаю адцвіла вясна, яшчэ адно прамільгнула лета.

Весела, нібы жаваранак на пачатку вясны, празвінеў школьны званок, заклікаючы ў новыя класы. Як заўсёды, клопатам і строгай любоўю сустрэў сваіх вучняў Іван Іванавіч.

— Якія вы малайцы! — усклікнуў ён, як толькі ўвайшоў у клас, павітаўся і павіншаваў нас з новым навучальным годам.— Падраслі за лета, загарэлі.

Жвава, але немітусліва падышоў ён да стала, паклаў журнал, адгарнуў яго і сказаў:

— Ну, дык з новымі сіламі — у дарогу!

У школу я кожны раз іду як на свята. Нават рэдка калі даводзіцца мацеры катурхаць мяне раніцай — сам прачынаюся. Як добра, што ўжо не трэба насіць у сваёй палатнянай торбачцы, дзе кнігі і сшыткі, бутэлечку з чарнілам — цяпер яго хапае і ў школе. Сёлета ўсім дзецям, у каго няма бацькі або мацеры, школа купіла нават чаравікі. Атрымаў і Толік Каралюк.

Мяне абуў Віця. Ён ужо скончыў вучылішча і працуе ў паравозным дэпо. У Андрэя Казлюка таксама чорныя чаравікі, як і ў Толіка, як і ў мяне. А Лёньку Мацкевічу пашанцавала найбольш: яму бацька ажно з Карэліі, куды завербаваўся на лесараспрацоўкі, прыслаў боты. Карычневыя, прыгажусенькія, а галоўнае — не прапускаюць вады. Гэта ўжо дасканальна і не раз праверана. Заўсёды, калі падыдзем да рова, то

варта толькі закрануць Лёнева самалюбства: «А вось тут ты і не пройдзеш, каб не па кладцы», як ён зараз жа нахмурыць бровы («Хто, я не прайду?!.») і шыбуе бродам, ледзь не набіраючы халявамі вады. Калдобіны, каляіны і барозны, запоўненыя дажджавой вадою, яны нават не вартыя ўвагі — іх Лёнька і без нашага падбухторвання бярэ з ходу.

У Дзяніскавічы цяпер усіх нас як магнітам цягне. З раёна ў клуб кожны тыдзень прывозяць кіно. А яшчэ ў сяло правялі радыё. Яно ўстаноўлена ў самым цэнтры — дзе сельсавет і клуб, магазін і бальніца. Гэта зусім непадалёк ад школы. На перапынках мы бегаем слухаць радыё. Калі на першы погляд, то ўсё ў ім вельмі проста: стаіць слуп, да якога падцягнуты правады, да слупа прымацавана цёмна-шэрая талерка рупара. Здаецца, мы і самі гэтак змайстравалі б. Але паспрабуй зрабі: з рупара разносіцца сапраўдны чалавечы голас!

— Можа, там, усярэдзіне, ёлкі-палкі, сядзіць жалезны язычок,— кажа Толік Каралюк, задраўшы ўгору галаву і прыплюшчыўшы левае вока.

— Сам ты жалезны язычок,— пярэчыць больш дасведчаны ў тэхніцы Андрэй Казлюк: як-ніяк кавалёў сын.— Голас ідзе па правадах ажно з Масквы і з Мінска.

Лёгка сказаць — з Масквы і з Мінска, але як праляцець за адно імгненне такую адлегласць?.. Нездарма з захапленнем глядзяць на радыё і старыя людзі, якія ў нядзелю валам валяць у сяло, каб паслухаць навіны.


СЕЛ

— От дык штука: і гаворыць, і спявае, і грае,— пакручваючы пшанічныя вусы, паважна кажа сельскі вясёлы дзед Цімафей Хрушч.— Гэта ж не жыццё пачынаецца, а рай, жыві, не памірай... Праўду я кажу, жэўжыкі?

Апошнія словы ён скіроўвае, вядома, да нас, школьнікаў.

Старыя цяпер як толькі бяруцца пра што расказваць — адразу і спасылаюцца: «радзіва надавала...» Нават амаль перасталі бажыцца.

Навін і чутак багата: будзе «суполка», будзе «алякрычаства», будуць зносіць хутары ў сяло. Як і раней, нястомна «працуе» языком Ветрыха. Праўда, яе навіны не супадаюць з тымі, пра якія гаворыць большасць людзей, аднак гэта Ветрыху не бянтэжыць.

Тым часам, падбаўляючы людзям клопатаў, усталёўваецца восень. Яркімі фарбамі ахапіў верасень дрэвы. На загуменні ў золата ўбіраюцца бярозкі, барвянымі хусцінамі ўпрыгожылі сябе асінкі. Пад плотам, што цягнецца ад хаты да хлява, аж да болю ў вачах свецяцца золатам клёны і ясені. Як намалёваныя, вісяць на рабінах чырвона-аранжавыя гронкі ягад. У садзе за хатаю дзе-нідзе на яблынях-дзічках трымаюцца яблыкі. Яны нясмачныя, усё яшчэ гаркавыя, таму і вісяць. Затое на грушы, той, што расце пры самай хаце, ажно кратаючы дах сваімі галінамі, няма ўжо ні адной грушкі. Салодкія пятроўкі я пазнімаў у кошык адразу, як толькі даспелі.

Дзіўна, што акацыі вакол гародчыка, як і дубкі на загуменні, усё яшчэ стаяць зялёныя. Сярод акацый і

пажоўклых ліпаў няма ўжо той ялінкі, якую я абцерабіў некалі ў знак Віцевага прыезду,— засохла яна, і на яе месца перанёс я з загумення бярозку.

Ялінка загінула не адразу.

— А вось і не засохла! — суцяшаў я сябе перад братам, дачакаўшыся вясны.

— Яшчэ засохне,— казаў Віця.

Да мяне тады не даходзіла, што дрэўца памірае запаволенай смерцю. Трымаючыся карэннем за зямлю, яно вясной яшчэ жыло, летам і восенню ўжо толькі існавала, а наступнаю вясною пачало чэзнуць. Спачатку я спадзяваўся, што ялінка ажыве, але калі пачалі асыпацца долу іголачкі, зразумеў, што цуд не адбудзецца. Давялося яе спілаваць. Тады і прыйшло ў мае думкі: «На загуменні цесна бярозцы. Трэба перанесці яе сюды...»

Блукаючы штодня па двары, мой позірк міжвольна зноў і зноў прыпыняецца на абваленым склепе. Яшчэ вясною, як раставаў снег, абсунулася з аднаго боку зямля ў склеп. Трэба капаць ямку, рабіць пограб, каб было куды ссыпаць бульбу на зіму. Яна яшчэ ўся ў зямлі. Чушбавы, лічы, скора і ўправяцца з бульбаю. І Саламоніха шмат выграбла, а мы толькі пачалі: няма пограба.

— Давайце самі капаць ямку,— кажу я мацеры.

— Мой сынок, што мы з табою вартыя,— гнілое ды малое.— Яна гаркава пераводзіць дыханне і тут жа дадае: — Але неяк жа будзе, і яму зробім, і бульбу выкапаем: Віця прыедзе і Маня адпросіцца з работы на які тыдзень, то памогуць.

Маня разам з Жыгалавай Лідаю ўладкаваліся на будоўлю да ваенных. Кожны панядзелак раненька яны ідуць за сем кіламетраў — да пагранічнае заставы, дзе салдаты муруюць цагляныя дамы. Дадому вяртаюцца толькі ў суботу вечарам. Я вельмі чакаю сястру кожную суботу.

— Мама, а Маня сахарыну прывязе? — часта вечарам я назаляю мацеры сваім адным і тым жа пытаннем.

Мне здаецца, што сахарын — гэта нешта цудадзейнае, бо толькі адзін крышталік кінеш у кубак — і поўны кубак вады робіцца салодкі. А маці часта кажа:

— Цыбулю трэба есці, а не сахарын, то здаровы будзеш.

— Ай, цыбуля горкая,— аспрэчваю я,— а сахарын сало-о-дзенькі.

Каб хутчэй прыйшла жаданая субота, я днём, як вярнуся са школы, памагаю мацеры і ў полі, і на таку, і ля жорнаў,— Красёху восенню пасвіць не трэба, сама пасвіцца, бо шкоды нідзе ўжо няма,— а вечарам раблю ўрокі. Вялікі там клопат, тыя ўрокі: задачу рашыў, практыкаванне зрабіў, чытанку адгарнуў... А чацвёрты ўрок калі не спевы, то фізкультура або маляванне. Да вячэры ўсе заданні пароблены. А павячэраўшы, калі добра сцямнее, пры лямпе чытаю ўголас, каб і маці чула. Найперш, вядома, што-небудзь адпаведнае асенняму настрою:

У бязмежным небе
Роўненькім шнурочкам
Жураўлі на вырай
Мкнуцца над лясочкам.

Меншыцца шнурочак,
У паднеб'і тае,
Вось ледзь-ледзь чарнее,
Міг — і прападае.

Чытаю, і лагодны, цёплы смутак агортвае мне сэрца. І чамусьці ўспамінаюцца і Віцева «неба, да зямлі прыбітае», і Маніны казкі, яе «жабрачка», якая (смяхоцце, дый годзе!) зачапілася торбаю за клямку...

## АЛЮМІНІЕВЫЯ НОЖЫКІ І ДРАЎЛЯНЫЯ ШАБЛІ

Усе мы — і Лёнька, і Андрэй, і Толік, і я — любім майстраваць. Не бывае такога дня, каб у нашых руках не танцавала сякера, не пела піла, не бахаў малаток. Сёлета кагалам, з дапамогаю каваля, зрабілі мне драўляны вазок. Ён нам спадабаўся. І мама пахваліла за работу, сказала, што мы медаля з рэдзькі вартыя. Ну, гэта яна пажартавала. А вазок, што ні кажы, атрымаўся зграбны. Мы рабілі яго, каб з горкі катацца, а ён і ў гаспадарцы спатрэбіўся, бо на ім можна што хочаш падвезці. Адных толькі дроў з лесу я нацягаў гэтым вазком цэлую гару. З мамай іх папілавалі, я пакалоў і склаў у падстрэшшы. Дровы падсохлі і сталі жоўтыя, як свечкі. Цяпер і зіма не страшная.

А на двары — верасень. Хоць і ніжэй цяпер ходзіць сонца, неба застаецца яснае, яго не ўсцілаюць ні шэрыя хмары, ні белыя воблакі, і дні стаяць цёплыя, нібы ўлетку. Часам здаецца, што на зямлі затрымалася і ўсё яшчэ пануе лета. Але выцвілыя пожні, пажухлы

бульбоўнік ды пяшчотная пазалота, уплеценая ў косы бяроз, і пачырванелыя гронкі рабін — яскравыя прыкметы новай пары года.

Зараз можна было б ужо нават брацца за канькі, пакуль не надышлі халады, ды не для нас, забалоцкіх дружбакоў, прыдумана прымаўка: «Рыхтуй летам сані, а зімой — калёсы». Мы пра канькі пачнём дбаць толькі тады, як блісне балота першымі люстэркамі лёду. А пакуль што хвалюе адно — ножыкі-складанчыкі. Кожнаму з нас трэба такі ножык, не толькі каб вастрыць алоўкі, але і каб вырэзваць свісткі, рэвальверы, а самае галоўнае — кавалерыйскія шаблі. Адным словам, нам без ножыкаў — што без рук.

Дамовіліся: майстраваць пачнём у Андрэя ў кузні, калі не будзе дома яго бацькі. Там ёсць мех, які расцягваецца, нібы гармонік,— бяры ды раздзімай распаленае вуголле. А колькі там разнастайных інструментаў! Пасярэдзіне кузні — кавадла. Мы не раз бачылі, як каваль дастае кляшчамі з горна напалены дабяла пруток жалеза, кладзе яго на гэтае кавадла, гахкае молатам, аж іскры сыплюцца ва ўсе бакі, і пад цяжкімі ўдарамі пруток паслухмяна расплюшчваецца і набывае тую форму, якая патрэбна кавалю. А мы ўсе — Андрэй, Лёнька, Толік і я — пад кожны ўдар молата толькі лыпаем вейкамі.

Часам каваль бярэ да сябе ў памочнікі Андрэя. Тады Андрэй трымае клешчамі жалязяку, а ён ужо дзвюма рукамі ўскідвае молат і з усяго маху апускае на вогненна-яркі метал, які ўвачавідкі гасне. Дзядзька Мірон жалеза куе са смакам. Апусціўшы молат, ён

звычайна прыгаворвае: «Гах! І-і-і гах! І-і-і гах!» А як перастане гахкаць, то абавязкова скажа, нібыта падбадзёрваючы самога сябе:

— Так бо, чуеш бо, жалеза трэба каваць, пакуль гарачае.

У адным, вольным ад жалеззя, кутку кузні стаіць невялікая бочка з вадою. Нам вельмі падабаецца, як каваль апускае туды — для загартоўкі — падкову, або серп, або нарог для плуга. Вада шыпіць, і пара віецца аж да столі. Тады дзядзька Мірон здаецца сапраўдным чарадзеем.

Ёсць у кузні і наждак. Каваль на ім вострыць сякеру, і з-пад яе вылятае цэлы сноп іскраў, яны ляцяць імкліва, нібы стараюцца дагнаць адна адну. Любата!..

Дзень, калі нам можна ў кузні вольна майстраваць, надышоў зусім нечакана. Неяк у школе Андрэй сказаў, што бацька і маці паедуць у лес па дровы. Урокі да таго дня цягнуліся бясконца доўга, затое дарога дадому зрабілася вельмі кароткаю. А пасля мы, не марудзячы, сышліся да Андрэя. Я знайшоў дома і прынёс тонкі алюмініевы ліст. Спрачаліся мала — усе пагадзіліся, што ў нас атрымаюцца з яго самыя прыгожыя ножыкі.

Мы ведалі, што алюміній — метал мяккі, а таму не распальвалі горан. На чале з Андрэем — ён жа кавалёў сын! — пасеклі ліст на восем кавалкаў. Шырэйшы з іх пагнулі ў дзве столкі, падагналі дзе трэба наждаком — і ў нашых далонях заблішчала нешта падобнае на тронкі. А з вузейшых кавалкаў павыточвалі лязо. Засталося ўставіць нажы ў тронкі, прасвідраваць на-

вылёт і ўзяць на заклёпку. Неўзабаве мы былі ўзброены бліскучымі алюмініевымі ножыкамі-складанчыкамі. Праўда, у Толіка і ў Лёнькі яны не складваліся — не там стаялі заклёпкі.

— Гэта — дробязь,— супакойваў Андрэй.— Абы добра рэзалі.

Яшчэ і яшчэ раз точым іх на наждаку. Застаецца толькі праверыць, ці вострыя. Але ўзяць у рукі ламачыну і пастругаць — занадта проста.

— Я ведаю, як праверыць,— рашуча заяўляе Толік, пачухаўшы ўказальным пальцам пераносіцу.— Трэба брытва!

— Навошта брытва? — здзівіўся я.

— Не ведаеш навошта,— сказаў Толік.— А лязо на лязо: чык!.. Калі знак застанецца на ножыках — значыць, ножыкі тупыя, а калі на брытве — ножыкі вострыя.

Толік пераможна цыркнуў слінай праз зубы, і ўсе нашыя позіркі сышліся на Андрэю: ён павінен узяць бацькаву брытву.

— Зараз я прынясу,— сказаў Андрэй і пабег у хату.

Неўзабаве мы ўжо даставалі з кардонкі, на якой стаяла незнаёмае нам нямецкае слова, новенькую брытву, трымаючы напагатове ножыкі.

— Хто першы? — азартна спытаў Толік.

— Няхай Андрэй,— сказаў Лёнька, і мы пагадзіліся.

Андрэй нават размахнуўся, затым рэзка цюкнуў ножыкам па брытве.

— Ура! Ура! Ура-а-а! — закрычалі Толік, Лёнька і я, калі ўбачылі шчарбінку на брытве, нібыта гэта было немаведама якое дасягненне.

Не радаваўся толькі Андрэй. Ён панік галавой.

— Што я татку скажу? — зірнуў спадылба.

— А ты схавай брытву,— параіў Лёнька.

— Ага, схавай! — ледзь не заплакаў Андрэй.— А чым тата брыцца будзе?

Усе змоўклі, Андрэй паклаў брытву ў кардонку і панёс дахаты.

Мы свае ножыкі пахавалі ў кішэні.

З хаты Андрэй выйшаў ужо весялейшы, ён павёў нас пад грушу-дзічку шукаць у траве гнілкі. Груш на зямлі было мала, і мы вырашылі ўзлезці на дрэва, але раптам пачулі: «Но, чуеш бо, но-о-о!» Зарыпеў воз. Гэта Андрэевы бацька і маці прывезлі дровы.

Мы дружна скатвалі з воза тонкія сасновыя кругләчкі. Стараліся ўсе, бо адчувалі сваю віну за шчарбінку на брытве.

— Паглянь бо ты на іх,— радаваўся дзядзька Мірон, паказваючы кіўком галавы на нас,— памочнікі растуць, чуеш бо.

— То ходымо ўжэ, батько, дохатэ, дадут самэ радэ,— казала Міпончыха.

— Ідзіце, мама, ідзіце, мы самі,— завіхаўся ля воза Андрэй, стараючыся дагадзіць бацькам.

Пакуль мы склалі каля плота кругләчкі, распрэглі і адвялі на выган каня, з хаты выйшаў дзядзька Мірон. Ён дастаў з кішэні кісет і люльку, набіў яе тытунём, запыхкаў дымам.

Мы ўсе стаялі каля кузні.

— Ну што, падшыванцы, пасталі, як свечкі, чуеш бо,— сказаў ён павольна, але падкрэслена голасна.

Мы пераглянуліся: а раптам ён ужо бачыў тую шчарбіну на сваёй брытве? Але тут жа павесялелі, бо дзядзька Мірон загаварыў куды цішэй.

— Мо хочацца ў кузню, га? — сказаў, выпускаючы з рота блакітна-шэры дым.

Тыя словы падбадзёрвалі, і мы, зноў пераглянуўшыся, зусім пасмялелі.

— А мы, тату, ужо былі ў кузні,— адказаў Андрэй бацьку, зрабіўшы націск на слове «былі», і дастаў з кішэні ножык, каб пахваліцца сваёй работаю.

Каваль узяў у рукі бліскучы алюмініевы ножык, паклаў на далонь, быццам узважаючы, і ўсміхнуўся:

— І што будзеш гэтаю цацкай рабіць?

— Стругаць,— упэўнена адказаў Андрэй.

— Э-э-э, брат, гэтым нажом хіба што паветра ці ваду можна стругаць, ён жа як пятка тупы.

Мы засмяяліся.

— Дзядзька Мірон, гэты ножык вастрэйшы за...— З Толікавага языка ледзьве не сарвалася слова, якога мы баяліся. Але Лёня так моцна ўшчыпнуў сябра за руку, што той ледзьве не падскочыў ад болю.

— Марная работа, чуеш бо,— растлумачыў каваль нашу няўдачу.— Нажы трэба рабіць са сталі. А з алюмінію нож — гэта што з гразі куля, чуеш бо...

Расчараванне да нас прыйшло гэтак жа імгненна, як і захапленне...

А ранкам, ідучы ў школу, Андрэй дастаў з кішэні і паказаў нам сапраўдны складанчык. Калодачка касцяная, а лязо — са сталі.

— Бацька падарыў,— з гордасцю, але без фанабэрыі заявіў Андрэй.

«Мусіць, яшчэ не бачыў сваёй брытвы»,— падумаў я.

У Толіка, як і заўсёды ў падобныя хвіліны, прыплюшчылася адно вока. Але толькі быў рукою пацягнуўся ён да Андрэя, як яго апярэдзіў Лёня. Лёнькава рука накрыла ножык, што красаваўся на Андрэевай далоні, а вочы загарэліся іскрынкамі зайздрасці:

— Андрэй, дай патрымаць.

— Патрымай, калі табе так хочацца,— спакойна сказаў Андрэй.

Лёнька гэты скарб хацеў бы нават пакласці сабе ў кішэню. Дзіва што! Але хто яму дазволіць, пакуль ножык не пабыў у Толевых і маіх руках.

...Урокі Івана Іванавіча не лезуць у галаву, хоць ты іх калом заганяй, усе думкі круцяцца вакол Андрэевага складанчыка. Толькі б дачакацца апошняга званка, і нашай задуме аніхто не перашкодзіць — мы пойдзем выразаць драўляныя шаблі ды гуляць у казакоў. У грудзях уздымаецца і не ападае высокая хваля радасці, яна ажно прыспешвае сэрца, яго ўдары я чую ў вушах...

...Нарэшце мы бяжым па вуліцы, мінаем сельсавет. Будынак і двор абнесены невысокім плотам. На рагу збочым з вуліцы ўніз — туды, дзе над плотам густа навісаюць кусты шаўкоўніцы.

Першы бяжыць Толік. Ён «завёўся», гэта значыць, круціць перад грудзьмі сціснутымі ў кулакі рукамі. Зараз ён нават рэдка «пераключае хуткасць», хоць і трапляюцца калдобіны. Імчыцца, толькі пыл з-пад ног курыць ды злёгку пагойдваецца на спіне палатняны ранец. Голас яго вельмі спраўна замяняе гудзенне матора і дакладна перадае высокую хуткасць. За Толікам лячу я, за мной — Лёня, апошні бяжыць Андрэй. Насустрач нам ідуць людзі, але ўсе — незнаёмыя. Вось мы апынаемся ў засені шаўкоўніцы. Выглядваем з-пад галін, ці нікога няма паблізу. Няма. Ну, тады — налятай!.. Кожнаму трэба вырваць штыкеціну, інакш можа не атрымацца чатыры шаблі.

Штыкеціны ў сельсавецкім плоце тонкія, але не вельмі падатлівыя, не кожнаму ўдаецца адарваць з першага разу. І ўсё-ткі справіліся... Схапіўшы іх пад пахі, панесліся ўніз, у бок школьнага стадыёна. Мігам яго перасеклі. Узбеглі на земляны вал па той бок стадыёна, азірнуліся — ніхто за намі не гоніцца, спусціліся ўніз да сажалкі і зашыліся ў лазнячку. Паклалі на зямлю сумкі з кнігамі, расселіся на траве і ўзяліся за работу. Яна аказалася не самай лёгкаю, бо нас было чацвёра, а нож — адзін.

Першы пачаў стругаць Андрэй. Мы набіваліся да яго ў памочнікі, кожны стараўся даваць парады, але ён спраўляўся і сам. Нож быў востры, як агонь, і Андрэева штыкеціна набывала абрысы шаблі.

І тут здарылася неверагоднае — нас застукаў участковы міліцыянер. Ці то ён сам заўважыў, як мы за гэты вал беглі, ці то яму хто сказаў. Мы нават не заў-

важылі, як ён падышоў да нас. Толькі сэрца ў пяткі ўцякло, калі пачулі яго бас.

— Сядзець! — сказаў участковы.

Мы разгублена паглядзелі на яго. Не паспелі і вокам маргнуць, як міліцыянер даў новую каманду:

— Бярыце манаткі і ў школу марш!

Толькі гэтага нам не хапала! Давядзецца, лічы, пад канвоем, ісці праз увесь стадыён, школьным садам і дваром, а хто-небудзь убачыць і пакпіць: «А, папаліся, так вам і трэба!» Вядома, даведаецца Іван Іванавіч, і яму будзе непрыемна. А нас, можа, і засудзяць...

Мне зрабілася горача ад сораму. Я першы падняў сваю сумку, а за мною — адразу ўсе. Толькі хацелі ісці, як участковы суровым голасам разануў:

— А гэта каму пакінулі? Ану, жыва!..

Мы падхапілі свае штыкецiны і, нібы мокрыя куры, папляліся паперадзе ўчастковага.

У школьнай канцылярыі ўсё абышлося добра, калі не ўлічыць, што дырэктар (Івана Іванавіча ўжо не было) забраў Андрэеў ножык:

— Кажаш, бацькаў? То няхай бацька і прыйдзе па яго...

Андрэй не плакаў, толькі ягоныя адтапыраныя вушы густа пачырванелі і таму здаваліся яшчэ больш адтапыранымі.

У школе знайшліся цвікі і малаток, і нас павялі, каб мы залаталі дзіркі ў плоце.

Прыбіваць штыкеціны было не менш цікава, як і адрываць, адно прыкра было за свой учынак і што

Андрэеў ножык забралі. Гэта ж яму ад бацькі падарунак.

«Бедны Андрэй! — пакутаваў я.— Што ж яго чакае дома?»

А на другі дзень нам Андрэй кляўся, што бацька не біў яго ні за брытву, ні за ножык.

«Мірон такі дабрызны, хоць і багаты»,— падумаў я мамінымі словамі.

## РЭХА ПАНШЧЫНЫ

Як звычайна, са школы дадому мы — гэта, вядома, Лёня, Андрэй, Толік і я — ішлі сялом разам з дзяніскаўцамі. Спрачаліся, а пасля — праз нейкую дробязь — пасварыліся. І тады яны, сельскія, абазвалі нас хутаранцамі-галадранцамі. За гэта мы іх пачаставалі снежкамі. Яны не ўцякалі, бо іх было столькі ж, як нас. Але мы болей мелі злосці: помсцілі за крыўду.

Хіба забудзеш тыя два словы, якія трапна білі ў самае балючае! Праўда, Андрэю дык што: ён — не бядняк, ён кавалёў сын; Чушбаў, наадварот, хто-ніхто заве багатырамі, багатымі. Добра яшчэ хоць, што Андрэй нос не дзярэ. А вось я ды Толік — сапраўдныя галадранцы. І ў Лёнькі не пірагі вароты падпіраюць...

Пра сельскіх я расказваў дома, як толькі мама дастала мне з печы таўканіцу на патэльні і наліла ў міску квасу.

— Клопат вялікі...— Маці мне здавалася абыякавай, рабіла курам мешанку і працягвала, паглядваючы на мяне: — Карона з вашых галоў не зляцела.

— А што яны брэшуць?! — не мог супакоіцца я.

— Вы таксама не цацы,— маміны вочы не ўсміхаліся, а выпытвалі.— Вы ж на іх таксама нешта сказалі?

— Мы ім далі снежкамі.

— Гіцлі вы, гіцлі,— мама перастала замешваць, села на лаве.— А што, калі ў вока запусціш каторому?.. Рукі вам свярбяць...

Нейкае імгненне я маўчу, апусціўшы галаву. Але ў вачах паўстаюць яны, задзіралы.

— Няхай не распускаюць языкі, асабліва гэты Хамяк,— упэўнена заявіў я, умінаючы таўканіцу з квасам.

— Лёгка, сынок, смяяцца з чужое беднасці, толькі такі смех нікога яшчэ не красіў,— маці раптам асуджае забіякаў.— Сельскім што: яны пажару як след нават не панюхалі. А мы ледзьве жывыя выскачылі.

Пра тое, што пры Польшчы, калі мяне яшчэ не было на свеце, у Дзяніскавічах згарэла многа хат, у тым ліку і наша, я ўжо ведаў, але пра гэта ніхто ніколі падрабязна не расказваў, і я папрасіў:

— Раскажыце мне, мама, пра пажар.

І яна расказала.

У тое лета стаяла такая суша, што не было чым дыхаць. Ад сонца аж лісты на дрэвах скручваліся, а на кругляках смала выступала. А тут уначы загарэлася, невядома з чаго, Саламонава, крайняя з таго канца, хата. Успыхнула, нібы салома, і пайшла агнём. Усе хаты стаялі шчытна, не так, як цяпер. А тут яшчэ, на тое ліха, з захаду пацягнула ветрам. Дык агонь, бы

звяруга, хутка перакідаўся з двара ў двор, з будынка на будынак.

— Ад Саламонавае сядзібы наша была пятая,— уздыхнула мама.— Што ні рабілі — і вадой пазлівалі сцены і стрэхі (з калодзежа ўсю ваду вычарпалі), і пяском пасыпалі — нічога не памагло. З'еў агонь хату. Хлеў хаця, богу дзякаваць, астаўся, бо стаяў трохі наводшыбе... Агонь пайшоў далей, больш як паўсяла тады згарэла.

А далей мама расказвае, як па сялу бегла з іконаю ў руках і з малітваю на вуснах цётка Міхаліна. Яна раз-пораз махала на пажар іконаю і ўсё гаварыла малітву. Была Міхаліна голая, іначай, як лічыць мама, не памагло б. Калі Міхаліна абабегла толькі што ахопленую полымем хату Лёневага дзядзькі, дык вецер павярнуў у друг бок, і ненажэрнае полымя нарэшце задыхнулася.

— А дзе, мама, раней была цётка Міхаліна? — пытаюся я.— Чаму яна не выбегла адразу, як толькі загарэлася Саламонава хата?

— Яна, сынку, начавала ў сваёй сястры ў Асінніках. Сястра жаніла сына. Ужо й былі паснулі госці. І Міхаліна спала. Адно што моладзь гуляла доўга. І калі выйшлі дзяўчаты і хлопцы за вёску, каб праветрыцца, то па жоўтаму небу зразумелі, што Дзяніскавічы гараць. Ну, вядома, усе, хто быў на вяселлі з нашага сяла, і іх сваякі з Асіннікаў кінуліся на пажар.

Тое, пра што расказала маці, усхвалявала мяне. Праўда, я не паверыў, што цётка Міхаліна спыніла

пажар, бо калі б можна было малітвамі ці іконамі адвесці бяду, то ніякае бяды ў людзей і не было б. Але з мамай спрачацца не будзеш: яна верыць у бога, кажа, што без веры цяжка жыць.

— Мамка, — цікаўлюся я, — а дзе жылі пагарэльцы?

— Ах, мой сынок,— уздыхае яна,— хіба то было жыццё?! Не жылі, а толькі існавалі. Ну, вядома, найперш прытулак шукалі: хто ў сваякоў, а хто і ў чужых людзей. У нас, ты знаеш, сваякоў няма. Прынялі суседзі. Віця тады быў меншы, чым зараз ты, а Маня і з рук не злазіла. І што ты думаеш, пачалі будавацца. У сяле — гміна не дазваляла. Хто тое ведаў, што прагоняць паноў. Пачалі ляпіць гнёзды там, дзе сказалі польскія ўлады. Так мы і сталі хутаранцамі. Ты нарадзіўся ўжо ў новай хаце. Усё было б добра, каб не селі на каменне і пясок.

— Як так селі на каменне і пясок? — не разумею я.

— А так і селі, бо занадта мондры твой бацька быў. Можна было ўзяць пару дзесяцін урадлівае зямлі. А яму захацелася больш, пайшоў да пана раіцца. А той і кажа: «Як возьмеш два гектары, то дзе ты каня падзенеш. Вазьмі, браце, блажэйшае, але каб і лонка была, і гарод». Вось твой бацька і паслухаў яго. Дарваўся, як кажуць, сабака да блох. Поля шмат, але якое — пясок ды каменне. А яшчэ гара колькі займае. І бровар.

— Мама,— пытаюся я,— а чаму вы не пярэчылі?

— Чаму ж не пярэчыла, сынку, яшчэ як пярэчыла. Фігу даў пад нос, на тым і скончылася.

Маці ўстае, бярэ вядро з мешанкай, выходзіць на двор. І я ўжо чую такое ласкавае:

— Цып-цып-цып-цып-цы-ы-п. Цыпачкі.

Я гляджу ў акно, як на мамін голас злятаюцца куры і як яны навыперадкі дзяўбуць бульбу з вотруб'ем. Маці вяртаецца ў хату, і я зноў гавару да яе:

— А чаму, мама, у Чушбаў усё ёсць?

Спытаў, і ў вачах паўстала высокая сцяна іхняе пшаніцы. Калоссе буйнюе, аж гнецца, спелае, да зямлі. І грады вялікія, а на іх — гуркоў, як на нашым полі камення. А морква там якая — аж выпірае з градак! І ў хляве такія раскормленыя свінні, што ўжо і рохкаць лянуюцца.

— О, сынку, да іх не драўняешся. У іх заўсёды зямля была харошая. Мірон — гаспадар! Ён і пасля пажару выгадаў. Шмат не браў, але ўсё чарназём. А чарназём супраць нашае — гэта што скібка з маслам супраць сухара. Каб расло што на нашым пяску, трэба богведама колькі заараць гною. Гэта каб цэлы статак кароў трымаў... Дый без свайго каня — марны лёс.

Вядома, хіба чужым канём у час вывезеш на поле гной ды заарэш? У нас няма каня, таму і ў полі мы ўпраўляемся найпазней за ўсіх. Толіку і яго мацеры таксама цяжка даецца гаспадарка, у іх таксама, як і ў нас, няма каня, але ім дапамагае хоць зрэдку Толікаў дзед, а нам памагаць няма каму. Наадварот, яшчэ даводзіцца за пазычанага каня капаць бульбу ў Саламоніхі або ў Мірона. Мне шкада маму: бясконцая работа цягне з яе жылы. Як ні стараюся я пама-

гаць, а сюд-туд схопіць на плечы што-небудзь цяжкае. А потым зойдзецца кашлем.

Мамін расказ пра мінулае выклікае мае думкі пра будучыню.

— Хутчэй бы зрабілі калгас,— зусім як дарослы разважаю я.— Іван Іванавіч казаў, што ў калгасе ўсе будуць роўныя.

— Каб жа так яно было,— кажа маці.

«Значыць, яна за калгас»,— у мяне ажно гарачэе ў грудзях ад радасці.

— А ведаеце, мама, што такое калгас? — хочацца мне пахваліцца.

— А хіба ты ведаеш? — пытаннем на пытанне адказвае маці.

— А як жа, нам Іван Іванавіч казаў. Калгас — гэта калектыўная гаспадарка.

— Пэўна, што калектыўная,— пазяхае маці.

Я думаю пра тое, што калгас нам — як паратунак, што зямля будзе ўся агульная, як, напрыклад, бровар ці наша гара, дзе часта мы з сябрамі гуляем у вайну, катаемся на санках. Падабаецца мне наша гара, і сядзіба падабаецца, уся ў вянку дрэў, і бровар, і вялізны вяз каля бровара. Лаўлю сябе на думцы: «Выходзіць, добра, што бацька пасадзіў нас на каменне ды пясок?» Я ўсміхаюся, бо ўжо галоўнае зусім не тое, што ў нас неўрадлівая зямля, а тое, што мы будзем жыць як людзі...

# ІВАН ІВАНАВІЧ І ЎРОК МАЛЯВАННЯ

Я любіў маляваць, і Віця прывёз мне з горада прыгожы альбом ды цэлы пачак каляровых алоўкаў.

Тры ўрокі — мова, літаратура і арыфметыка — прайшлі як адзін. Самым апошнім было маляванне.

Празвінеў званок, і ў клас борздзенька ўвайшоў Іван Іванавіч з нейкім інструментам у руках. Мы ўсе, павітаўшыся з настаўнікам, утаропіліся на гэты інструмент. Па сваёй форме ён быў падобны на палавіну ўдоўжкі разрэзанай грушы.

— Сённяшні ўрок мы прысвяцім маляванню з натуры,— сказаў настаўнік.— Вось гэта — струнны інструмент мандаліна.— Іван Іванавіч лёгенька правёў пальцамі па струнах, і па класе прайшло ціхае і тонкае рэха. Настаўнік павесіў мандаліну на цвік і растлумачыў нам заданне: — Кожны з вас павінен намаляваць яе так, як сам бачыць. Гарцэвіч Ніна і Скіндар Вера, напрыклад, бачаць яе прама, а Ражэвіч і Каралюк — збоку. Падумайце, калі ласка, якія вам спатрэбяцца алоўкі. Прыгледзьцеся, куды падае святло і дзе самае зіхоткае месца. Зразумелі?

— Зразумелі,— пачуліся бадзёрыя галасы.

Руку падняў Толік Каралюк.

— А чыя гэта балалайка? — раптам пацікавіўся ён.

— Я вам казаў, дзеці, што інструмент называецца мандаліна. Гэта мой інструмент.

— А вы ўмееце іграць? — папытаўся, лыпаючы белымі вейкамі, Толік.

— Умею,— адказаў настаўнік і, пэўна, адчуваючы, што Толікавай цікавасці не будзе мяжы, дадаў: — Сядай, калі ласка.

Толік сеў, але адразу некалькі галасоў зліліся ў адзін:

— Зайграйце.

— Дамовіліся,— пастражэў Іван Іванавіч,— я вам зайграю на перапынку, а зараз адгарніце свае сшыткі (альбомы былі толькі ў мяне ды ў Андрэя Казлюка, у астатніх вучняў — сшыткі) і малюйце.

Мы пачалі. Іван Іванавіч спачатку нешта доўга пісаў за сталом, потым прайшоўся па класе паміж парт, глядзеў, як малюем, зрэдку даючы заўвагі, потым зноў вярнуўся да стала.

Калі празвінеў званок, мы здалі свае малюнкі і акружылі настаўніка. І яму цяпер не заставалася нічога іншага, як зняць з цвіка інструмент, сесці ў крэсла і зайграць — паабяцаў жа.

Ён нават не глянуў на струны, а толькі ўпэўнена ўдарыў па іх, і яны ажылі, зазвінелі. Вочы Івана Іванавіча іскрыліся, ён глядзеў на нас, а мы — больш на ягоныя рукі. Настаўнік не называў песень, струны самі вымаўлялі — пра няпоўную рэчаньку, пра камсамольцаў, што адпраўляліся на грамадзянскую вайну, пра дзяўчыну, якая любіла байца, і яшчэ шмат пра што. Атрымаўся амаль цэлы канцэрт.

Калі Іван Іванавіч скончыў іграць, ён позіркам сваім акінуў нас і запытаў:

— Хто з вас хоча навучыцца?

Усе, хто стаяў побач, крыкнулі пра сваю згоду.

Настаўнік задумаўся:

— У нашай школе ствараецца музычны гурток. Што ж, пачнём з вас.

## ЗАХАПЛЕННЕ

У музычны гурток Івана Іванавіча запісацца пажадаў ледзь не ўвесь клас. Многім давялося перажыць пакутлівае расчараванне адразу. Настаўнік перш-наперш правяраў музыкальны слых, а ён, той слых, быў не ва ўсіх. Больш за іншых, хоць і нядоўга, перажываў Толік Каралюк. Не трапіў у гурток і Лёня Мацкевіч, але ён анікольку не шкадаваў, бо падаваўся ў музыку на ўсякі выпадак — усе ішлі...

З Забалоцця толькі Андрэй Казлюк ды я паказалі сваю схільнасць да музыкі. На першых занятках настаўнік вучыў, як трымаць інструмент, медыятар, як націскаць на струны, каб гучалі яны мякка і звонка.

Але сапраўднае выпрабаванне яшчэ чакала нас. Ноты! Іван Іванавіч ужо на трэціх занятках пастанавіў:

— Сёння знаёмімся з нотамі. Без іх не можа абысціся ні адзін музыка, як не можа абысціся без азбукі ні адзін вучань.— Настаўнік узяў крэйду, правёў на дошцы роўныя, нібы ў школьных сшытках, пяць ліній і змацаваў іх скрыпічным ключом. І на гэтых лініях размясціў падобныя, але не аднолькавыя значкі.— Перад вамі — нотаносец. Усе вы ўмееце спяваць гаму: до, рэ, мі... А вось гэтыя значкі...

Пакуль настаўнік тлумачыў, здавалася — усё зразумела. Але як толькі ён сціхаў, усё забывалася.

На наступныя занятк і гуртка з нашага класа мала хто з'явіўся. Не прыйшоў і Андрэй Казлюк. Назаўтра я пацікавіўся, чаму ён так хутка ахалодаў да музыкі.

— Мне бацька фотаапарат купіць,— сказаў ён,— буду вучыцца здымаць.

Хто ведае, можа, і ў мяне знайшлася б прычына, каб пакінуць музыку, але ж я адразу палюбіў ноты: лінейкі мне здаваліся то звонкімі струнамі, то нацягнутымі на марозе спеўнымі правадамі абапал гасцінца за сялом, а значкі на лінейках — жывымі ластаўкамі.

## ЗА ЦАРСКІЯ ГРОШЫ — КІНО

Гэтага дня была ў нас, трэцякласнікаў, незабыўная падзея: прымалі ў піянеры. Перад усёй школаю мы далі на лінейцы ўрачыстае абяцанне піянера Савецкага Саюза...

А пад вечар я пачуў Толікаў голас. Глянуў у акно — ён ужо тут.

Я хуценька выйшаў на ганак. Толік падбег да мяне і закамандаваў:

— Гайда на бровар!

— Чаго?

— Нешта пакажу.

— Чэснае піянерскае?

— Няўжо ж нячэснае.

З ганка да варот — пяць крокаў. Уздоўж агароджы з голых жэрдак, якою абняты садок, мы імчымся на гару. Толік першы, я за ім. Мы босыя і без пінжакоў, у адных кашулях. Вось і бровар.

— Сюды,— камандуе Толік, і мы сядаем каля парослага аксамітным мохам валуна, у неглыбокай ямінцы.

— Ну, што? — згараю ад цікавасці я.

— А вось што! — Толік лезе рукою за пазуху ды выцягвае адтуль... грошы. Многа-многа. І ўсе нейкія дзіўныя. На кожнай паперыне — двухгаловы арол. На некаторых значыцца — аж робіцца страшна! — сто тысяч, а на некаторых нават — пяцьсот.

— Дзе ты ўзяў? — здзіўляюся я.

— У дзеда.— Толік прыплюшчвае вока.

Толікаў дзед Анісім з бабаю па мянушцы Рохля жывуць не ў Забалоцці і не ў Дзяніскавічах, а ў невялічкай вёсцы Анучкі, што непадалёк ад Дзяніскавіч. Дзед Анісім стары, гады высушылі яго ў трэску, увесь ягоны твар пасечаны глыбокімі маршчынамі. Толік кляўся, што дзед ваяваў з японцамі ў 1905 годзе і што яго ўзнагародзілі Георгіеўскім крыжам.

Я разглядаю і складваю Толікавы грошы ў стос.

— А дзе яны ў дзеда ляжалі? — дапытваюся.

— Пад бэлькаю.

— Дзед сам табе аддаў?

— Аддаў.

— І не пашкадаваў...

— Дзед сказаў, што з іх кашы не зварыш. Гэта ж царскія грошы. А цара больш не будзе.

— А што ты будзеш рабіць з грашыма? — пытаюся я ў Толіка.

— Нешта прыдумаю, ёлкі-палкі,— гаворыць Толік.

— Давай пакажам Андрэю і Лёньку.

— Калі?

— Зараз.

— Пабеглі.

Дзве хвіліны — і мы ў Андрэя, яшчэ хвіліна — і ў Лёні. Пашыраная сустрэча адбылася таксама, як і наша з Толікам, на бровары. Тон задаў Лёня. Ён прыгледзеўся да сіняватых пяцірублёвак.

— Зусім як нашы,— сказаў ён, і яго тонкія чорныя бровы падскочылі, зморшчыўся лоб.

— Ага,— пацвердзіў Андрэй.— Вось толькі арол...

— Арла можна схаваць,— сказаў Лёня і паказаў, як гэта робіцца, склаў у дзве столкі.

Яшчэ не ведаючы навошта, мы пачалі асобна адкладваць пяцірублёўкі. Іх аказалася дванаццаць.

— Во, накупляем цукру! — сказаў Лёня.

— Ты што! — запярэчыў Толік.— А піянерская клятва?..

Лёню не падтрымалі ні Андрэй, ні я. Але нейкім чынам пакарыстацца царскімі грашыма хацелася ўсім.

— Дурні мы,— сказаў Лёня.— Сёння ў Дзяніскавічах — кіно...

Раіліся нядоўга. Хоць і стрымлівала піянерскае сумленне, але ў нас быў важкі аргумент: кінамеханік Грыцук калі прапускае ў кіно, грошы бярэ з усіх, а білеты не ўсім дае...

Заставалася толькі вырашыць: хто будзе разлічвацца. Мы пераглянуліся.

— Давайце я,— рашуча сказаў Лёня.

Толік даў яму царскую пяцірублёўку, і Лёня склаў яе ў дзве столкі, каб не відно было арла.

Хоць і ляцелі мы ў сяло як на крылах, у кіно прыпазніліся. У прачыненых дзвярах стаяў Грыцук. Лёня смела падаў яму грошы. У калідоры не настолькі было цёмна, каб не разгледзець іх.

— Пяць рублёў,— сказаў кінамеханік і папытаўся, ахапіўшы нас позіркам: — За ўсіх?

— За ўсіх,— адказаў Лёня.

Мне стала горача. Гэта ж звычайна плацяць яму паасобку, прытым — дробнымі грашыма, а тут раптам пяцёрка... Аднак Грыцук спакойна паклаў паперку ў адну кішэню, а з другой дастаў трохі капеек. Мы ўжо, вядома, не глядзелі, як ён лічыў тыя капейкі, бо на экране быў легендарны Чапаеў.

Радасць наша не ведала мяжы. І калі вярталіся дадому, і назаўтра, калі елі цукеркі (кінамеханік даў з пяцёркі цэлы рубель здачы), мы абмяркоўвалі свой поспех, хвалілі Толіка, а ён — Лёню.

— Пойдзем яшчэ...— пагадзіліся ў адзін голас.

Як лёгка мы ашукалі Грыцука, так лёгка ён наступны раз выкрыў нас. Траха паспеў Лёня падаць яму заламаную пасярэдзіне пяцёрку, як той і разгарнуў яе на далоні.

— Бандзіты! — зароў на ўсё горла кінамеханік і працягнуў руку, каб схапіць Лёню, але той спрытна выслізнуў з праёма дзвярэй, і мы ўсе чацвёра падмазалі пяткі...

Грыцук яшчэ доўга бег за намі, пасля спыніўся і прыгразіў:

— Я дырэктару скажу!

Не трэба было і дырэктара — мы самі пакаралі ся-

бе: на экране ў клубе ішоў славуты па тым часе «Тарзан», а нам, ашуканцам, туды дзверы былі зачынены.

## «БЯРОЗКА» НА СЦЭНЕ

Мая дарога ў таямнічы свет музыкі была амаль што трыумфальная. Нават строгі Іван Іванавіч дзівіўся і прарочыў мне вялікую будучыню. Усю зіму, пачынаючы з зімовых канікулаў, я займаўся музыкай. Школа купіла ўсё для струннага аркестра, найбольш здольным вучням кіраўнік гуртка дазваляў браць інструменты з сабою дахаты.

— Колькі можна брэнькаць? — часам не вытрымлівала маці.— Выйдзі пагуляй, гара па табе плача.

— Зараз пайду,— казаў я, а сам і не заўважаў, як падкрадвалася сутонне.

Я ўжо колькі вывучыў кароткіх і нескладаных песень! Па нотах выконваў вальс «Бярозку» і прыступіў да марша «Развітанне славянкі».

Іван Іванавіч усё часцей гаварыў нам, гурткоўцам, пра тое, што набліжаецца свята Міжнароднага жаночага дня, і пра наш канцэрт на гэтым свяце.

— Ты будзеш выступаць таксама,— сказаў ён мне,— рыхтуй свой нумар.

— А можна «Бярозку»? — спытаў я.

— Чаму ж не, можна,— падтрымаў настаўнік.— У цябе яна добра атрымліваецца.

Ледзь не ўсю ноч паўтараў я вальс «Бярозку». А ў школу прыйшоў без нотаў — забыў іх дома.

Адразу пасля ўрокаў нас, школьных артыстаў, павялі ў клуб. Пакуль збіралася публіка, мы ў бібліятэцы праводзілі рэпетыцыю. Мой нумар і без нотаў атрымліваўся.

І вось я на сцэне. Сяджу на табурэтцы, узрушаны: дзіва што — зараз мяне пачуе ўсюткае сяло! Напэўна, і з Забалоцця прыйшлі... Ад людскога мора, што плешча ў далоні пасля кожнага ўдалага выступлення школьных артыстаў, мяне пакуль што аддзяляе фіялетавая плюшавая заслона. Дзве старшакласніцы выконваюць песню. Нарэшце песня канчаецца, дзяўчаты пад несціханыя воплескі бягуць са сцэны, памочнікі вядучых рассоўваюць заслону.

— А зараз выступіць самы малады ўдзельнік нашага канцэрта,— гаворыць адзін з вядучых.

Яго змяняе другі:

— Уладзімір Ражэвіч. Сола на мандаліне.

— Валодзя, давай! — крычыць аднекуль з глыбіні залы Толік Каралюк.

Я пазнаю ягоны голас. Сэрца маё забілася часта-часта, яго я адчуваю ажно пад горлам, мне робіцца душна. Але вядучыя сыходзяць, і я пачынаю.

Гукі паліліся плаўна, хораша. Паўнюткая зала сціхла, і сэрца маё пацiху апала. Медыятар усё больш упэўнена кратаў струны, і пальцы спрактыкавана хадзілі па грыфу. Ды раптам да майго слыху даляцелі словы нейкае кабеты:

— От, жабяня, глядзі ты на яго!..

Яна гэта сказала з захапленнем, а я падумаў, што ганіць, і збіўся, у галаве ў мяне як нешта заткнулася.

На сходках, што са сцэны вядуць у бібліятэку, стаяў, хваляваўся Іван Іванавіч.

— Соль! Соль! Соль! — ён ведаў, на чым я спатыкнуўся, і стараўся мне падказаць.

А дзе тую «соль» шукаць, я ўжо нічога не памятаў. Яшчэ нейкі момант мае пальцы бездапаможна блукалі па грыфу, але ў гуках, што высякаў медыятар, не было ніякага ладу. Нарэшце да мяне дайшло: гэта — правал, і я ўцёк са сцэны.

Мяне даганяла хваля апладысментаў, узнагароджваючы за тое, што іграў, а мне здавалася — воплескі няшчырыя, насмешлівыя. Настаўнік спрабаваў затрымаць і суцешыць, але я гатовы быў праваліцца пад зямлю. «Хутчэй дадому,— думаў я,— каб толькі нікога не бачыць».

## БЕЛЫЯ-БЕЛЫЯ ВОБЛАКІ

...У маі канчаюцца клопаты школьніка і пачынаюцца турботы пастушка. Кароткія ночы не даюць выспацца.

— Сынок, сонейка ўжо ўстае, а карова ў хляве мычыць, на пашу хоча,— катурхае маці.

Яна памагае мне, санліваму, адарвацца ад падушкі. Але падушка ўладна цягне да сябе, як бы стараецца ўзяць у свае нябачныя абдымкі. І здаецца, усё аддаў бы за адзіны міг — толькі б не будзілі, толькі б далі павярнуцца на другі бок.

— Ай!..— яшчэ не помню сябе спрасонку.

— Уставай,— патрабуе мама.— Сонца ўзышло.

— Сам знаю!..— расплюшчваю вочы, але павекі, цяжкія, нібы свінцовыя, так і зліпаюцца.

Яшчэ нескалькі хвілін кідаюся з боку на бок, потым пацягваюся ў пасцелі. І толькі ўжо зусім свядомае: «Трэба ўставаць» — вырывае мяне з палону падушкі.

Ганю Красёху на пашу, апусціўшы галаву, і пакуль што ўвесь белы свет здаецца мне непрыязны...

...У маі ткуцца дзівосныя ранкі — калі на траве ляжаць буйныя кроплі расы, калі яны загараюцца ўсімі колерамі вясёлкі, як толькі да іх дакрануцца промні сонца. Стаіш у гэтым хараστве, слухаеш, як карова захоплівае языком траву, бачыш, як ажно пара валіць з расы ад цёплага дыхання жывёліны, і ніколечкі ўжо не холадна ў ногі — яны ажно гараць,— а яшчэ зусім нядаўна стаяў, нібыта бацян, на адной назе, каб сагрэць другую...

А над полем вісіць дрыготкім камячком і заліваецца песняю нястомны жаўранак.

За гарою, паміж сядзібаю Цыгановых і Корчыкамі,— Антонаў Гай. Кажуць, калісьці жыў тут дзядзька Антон, які ўвесь свой век садзіў дрэвы, даглядаў іх. Нават размаўляў з імі, як з жывымі. У першую сусветную вайну дзядзька Антон выехаў бежанцам у Расію. На радзіму не вярнуўся, там і памёр. Хату яго нехта з родзічаў перавёз у вёску, а на месцы старой сядзібы разросся гай. Прыслухаешся — нават чутно, як лёгка шапоча лісце. А закукуе зязюля — і пачынае здавацца: гэта не птушыны голас, а голас самога Антонавага Гаю.

...У маі ў небе растуць белыя воблакі. Зранку іх звычайна не бывае, яны ідуць найчасцей папалудні. Я люблю белыя воблакі, асабліва — калі яны велічна плывуць і бясконца перабудоўваюцца. Гэта — фантастычнае відовішча.

«І што ты там не бачыў?» — гледзячы на мяне, часта дзівіцца Саламонішын Лёнька.

Я не крыўдую на яго за недарэчнае пытанне. Разумею, што і на зямлі хораша. Але ж дзівак Лёнька, ён не глядзіць на воблакі. У тым і радасць, што ты слухаеш, як скубе траву карова, ці як шуміць лістота ў гаі, куе зязюля, ці як стракочуць, нібы пераклікаюцца, недзе зусім побач конікі ў траве, а сам лунаеш там, у паднябессі. І чаго толькі не пакажуць табе воблакі! Вось ляціць самалёт. Вялізны, бухматы. Такіх, канечне, не бывае. Калі б нават і быў, то, падняўшыся ў неба, ён здаўся б не большы за птушку. Гэта я добра ведаю па тых, з чырвонымі зоркамі, самалётах, якія ляцелі на немцаў, калі наша армія гнала іх туды, адкуль яны прыйшлі. Глядзіш на металічную птушку і думаеш: няўжо ў ёй лётчык і парашутысты! Яна ж такая маленькая...

А воблачны самалёт велізарны. Толькі ён нядоўга цешыць твае вочы. Вось паціху адвальваецца правае крыло, а левым крылом і носам ён ужо ўразаецца ў агромністую воблачную скалу і зліваецца з ёю. Але ж неба вялікае. Толькі сачы за ім, і ты ўбачыш яшчэ больш дзівосныя карціны. Там мядзведзь на фурманцы едзе, а там воўк апускаецца на парашуце. І адкуль гэта ён? І куды?..



Паблукаўшы позіркам, напаткаеш нават ката ў ботах. І танкі знойдзеш, і караблі...

А як нечакана адна карціна пераходзіць у другую, трэцюю! Вось воблака нагадвае табе агромністую чалавечую руку з выцягнутым указальным пальцам. А праз хвіліну гэты велізарны палец ператвараецца ў выцягнутую шыю і дзюбу жураўля. Яшчэ праз хвіліну ты ўжо бачыш ніякага не жураўля, а ведзьму з даўжэзным гарбатым носам, якая ляціць чамусьці ўніз галавой. Бясконца плывуць і бясконца мяняюцца, перайначваюцца карціны, быццам гэта не воблакі, а воўна, з якой нябачная рука вырабляе ўсё, што ёй захочацца.

Дзіўна, часам плывуць і плывуць воблакі, і ўсё міма сонца. Нават прыткнуўшыся да яго, так і прахо дзяць побач, не закрануўшы. Але бывае, што воблакаў і не шмат, ды ўсё імкнуцца яны засланіць сонца. Падабаецца мне сачыць за аблачынкаю, якая толькі што наплыла, шукаць, дзе зараз сонейка і дзе яно вынырне.

А іншы раз воблакі зусім не плывуць у бясконцым акіяне неба — цалюсенькі дзень стаяць на месцы, нагадваючы астраўкі. І я ўжо блукаю па гэтых астраўках, то ўзбіраючыся на ўзгоркі, то спускаючыся ў лагчыны. Блукаю да той пары, пакуль вочы не напаткаюць пад самымі воблакамі белага бусла. Прыгожа плыве ў небе бусел. Махне разы два крыламі і доўгадоўга ляціць, як самалёт. Вольны бусел пад белымі воблакамі!.. Гэтак робіцца радасна ад яго птушынае вышыні.

І ўспомняцца раптам дзівосныя сны: то лячу на вялікім паветраным шары, а то падскокваю, узмахваю рукамі, бы крыламі птушка,— і я ў паветры! І гэтак лёгка мне, лёгка! Плыву над полем, над сенажацямі, над люстэркам сажалкі, над стужкаю сцяжынкі ў жыце, над людзьмі. Лячу і думаю: «Эх, вы! Не лятаеце, баіцеся. А мо не ведаеце, колькі радасці ў вольным палёце!» Шырока ўзмахну рукамі — і лячу-лячу, аж займае дух.

Маці кажа: сніш такое, таму што расцеш.

Гэта, мабыць, праўда, бо адчуванне тады, у сне,— быццам на ляту падрастаеш.

Калі я гляджу на веснавое неба, мне хочацца нейкім цудам узняцца і ляцець. Доўга-доўга, высока-высока, аж за белыя воблакі.

## ТОЛІКАЎ ПАРАШУТ

...Летні вечар. Маці толькі што падаіла карову.

— Паглядзі, гіцлю ты, усё адно што ад казы,— яна ўшчувае мяне, паказваючы вечаровы ўдой, падымае ледзь не да самага майго носа даёнку, добра такі нахіліўшы, і я разумею, чаму я гіцаль: малака, сапраўды, мала.— Як ты напасвіў карову?!

— Я вінаваты, што яна не напасвілася? — хачу апраўдацца я.— Няхай бы пасвілася.

— Зноў, нябось, ганяў на бубен. Толькі знаеш лётаць, а пра малако табе галава не баліць!

Вінавата апускаю галаву, маўчу, бо маці ўсё ведае. Вядома ж, я быў на бубне,— гэтак у нас называ-

юць поплаў, вытаптаны ўшчэнт каровамі ды авечкамі. Ён каля самае Хваінкі.

Маці па выгляду Красёхі, па надоенаму малаку адразу пазнае́, з якой пашы карова прыйшла. Вось толькі шкада, што па майму настрою і выгляду мама не пазнае, як весела, як добра было мне разам з усімі забалоцкімі пастухамі! А можа, нават і гэта ёй вядома. Можа, якраз таму і не распытвае пра мае забавы.

— Ідзі ўжо спаць,— кажа яна,— а то рана не ўстанеш.

Я плятуся на другую палавіну хаты. Збіраюся спаць, а ў вачах стаіць вогнішча, раскладзенае намі на поплаве, у вушах раздаюцца разрывы і ціўканне куль, якія мы знайшлі ў лесе і пакідалі ў агонь, пазалазіўшы на хвоі. Аблізваю вусны і адчуваю смак падпаленых на агні жытніх каласоў. Распранаюся, а ў думках бягу з хлопцамі навыперадкі... «Першы на фінішы быў Валодзя,— абвяшчае «атаман» Саня Тхор і дае мне свежы гурочак.— Другі быў Толік». Саня дае Толіку ў жменю ягад. Толік, не гледзячы, кідае ягады ў рот, але тут жа іх выплёўвае. Усе смяёмся, бо выяўляецца, што Толік клюнуў на ядлаўцовыя ягады... «Нічога,— кажу я Толіку,— мы падзелімся». Разламваю гурок, а ўсярэдзіне — пясок. «Вось табе!» — запускаю тым гурком у атамана, а сам — наўцёкі...

Толькі лажуся ў пасцель, чую: прыйшла Ветрыха.

— Ці чула,— кажа яна да мацеры гучна, як заўсёды,— ужо ў халгас заганяцьмуць, каб на яго халера, каб на яго!..

«Ніколі не скажа як трэба,— думаю я,— усё «хал-

гас» ды «халгас». Ну, вядома, хіба Ветрыха ведае, што гэта такое...»

— Калі? — пытае маці.

— У сяле казалі: як не ўвосень, то пад весну, напэўна.

— Неяк жа будзе...— гаворыць маці.

— Гэта ж канец свету! — адчайваецца Ветрыха.— Будзем з кацялочкамі ў руках ісці да аднаго катла і прасіць: «Цётачка, дайце вару...»

«Смех, дый годзе. Што яна чаўпе, гэтая Ветрыха! Працаваць не прывыкла, дык і пляце лухту...»

Я ўстаю і зачыняю дзверы...

Раніца.

— Менш таўчыся на бубне,— нагадвае маці ўжо з ганка, выпраўляючы мяне пасвіць карову.— Чуў?

— Чуў, чуў,— кідаю я цераз плячо на хаду, а сам думаю пра Лёню, Андрэя і Толіка.

Вось мы ўжо і разам. І гонім сваіх кароў якраз на той самы «бубен». Узышло сонца. На зямлі ззяе раса, у небе пяюць жаўранкі. У мяне, Андрэя і Толіка ў руках пугі, толькі ў Лёні — кій дубовы. Ён, Лёня, сваю Пярэстую, калі ўлезе ў шкоду, лупіць кіем.

Я прыгадваю Ветрышыны словы пра калгас і кажу:

— Лёня, ты хочаш, каб быў калгас?

— А ты? — пытаннем на пытанне адказвае ён.

— Я дык хачу, а вось ты шкадуеш сваёй Манголкі.

— Адкуль ты ведаеш?

— Ведаю.

— Я свайго Беляка і то не шкадую,— гаворыць Андрэй да Лёні,— а ты сваёй натурлівай шкадуеш?

— Ну, няхай будзе — шкадую,— злуецца Лёня.

— Глядзі, каб яшчэ ўзялі тваю Манголку,— кажу я,— яе ж нават немцы ў свой задрыпаны абоз не ўзялі.

— Не ўзялі, бо не думалі браць,— агрызаецца Лёня.

— Не думалі!.. Сам ты не думаў,— кажу я.

— Я хачу, каб быў калгас,— парушае нашу спрэчку Толік.— Добра будзе: на машынах будзем катацца.

...На поплаве нас сустракае Саня Тхор, «бамбіза», як яго называюць старыя. Сустракае ўрачыста, узняўшы на дубчыку ліст лопуха — гэта ягоны сцяжок.

— Слухайце маю каманду! — аб'яўляе Саня.

Размяркоўваюцца заданні.

— Толя — па каласкі,— кажа «атаман»,— Валодзя і Лёня — па яблыкі. Андрэй з Архіпчыкам будуць наглядаць за каровамі і цягнуць з лесу ламачча. Усё ясна?

Агрызацца з Санем, а тым больш зневажаць яго мянушкаю не будзеш, хай ён і нічога не робіць, а толькі ляжыць пад кустом. Бо «пачастуе» порхаўкай, а то й запусціць чым-небудзь цяжэйшым. Ён, праўда, няспрытны, але дужы, як конь. І высокі... Яго немагчыма паваліць. А калі ён на цябе наваліцца, дык і дыхнуць няма як.

Мне з Лёнем не першы раз лезці ў чужы сад, і кожны раз мы адчуваем сябе разведчыкамі.

Самы вялікі сад у Лунаціка. Ад поплаву гэта зусім блізка. Вось і прытойваемся мы пад плотам Лунацікавай сядзібы, цікуем, ці няма каго ў двары. Там ціха. Па той бок плота вісяць яблыкі. І гэтак многа — як лісця! А блішчаць — ну што раса!

— Шукайма дзірку,— кажа Лёня.

Вялікае дзіркі і не трэба, абы пралезла галава. Галоўнае — застацца непрыкмечаным.

— Вось яна,— адхінаю я адарваную знізу штыкеціну.

— Палезлі! — гаворыць рашучы Лёня.

— А сабака? — вагаюся я.

— Спіць яшчэ ў будзе.

Мы лезем. Лёня першы, я — за ім.

Усюды ціха. Узбіраемся на разгалістую яблыню. І вось ужо гайдаюцца яблыкі ў нас перад вачыма і пачынаюць пад кашуляю казытліва студзіць жывот. За пазухай не змяшчаюцца, коцяцца за спіну. Ну, цяпер досыць. Застаецца саскочыць з дрэва і выбрацца з сядзібы. Выбіраемся! Ужо цераз плот, бо праз дзірку ў плоце не праціснуцца з такою ношай. Бяжым узлескам, і нечага нас апаноўвае смех. А за пазухай рыпяць яблыкі. І радасна, што ты не падвёў сяброў...

— Малайцы! — хваліць «атаман», ацэньваючы лёгка здабыты «ўраджай».

А вось і Толік, ён прыносіць поўную кепку жытніх каласкоў.

Застаецца толькі раскласці вогнішча.

Тхор падпальвае ламачча і, каб мы не спалілі каласкі, сам бярэцца іх падсмальваць.

— Трымай! — кожнаму выдае ўжо гатовую «порцыю».

— Смаката! — паспытаўшы зернетка, кажа Толік.

— Не смаката, а цымус,— вучыць Тхор.— А вы чаго маўчыцё,— звяртаецца ён да астатніх.— Падабаецца вам?

— Ага,— адказваем дружна.

— То-та ж!

Ламачча крыху прагарэла, і «атаман», зноў нікому не даяраючы, кладзе ў прысак яблыкі...

Печаныя яблыкі, хоць яны і кіслыя, як воцат, усе ядуць і хваляць.

— Хопіць аб'ядацца! — дае новую каманду Тхор.— Час і пра кароў падумаць.

І мы гонім сваіх згаладнелых кароў у шкоду — на загоны бульбы, гароху, канюшыны, вікі. Палеткі суседняе вёскі Клепачы. Вёска за горкаю. Не выключана, што хто-небудзь можа наскочыць знянацку. Таму для большай пэўнасці з верхавіны самай высокай бярозы пазірае на горку Саня Тхор. Калі што якое — ён свісне ў тры пальцы, і тады мы не будзем глядзець, дзе Красёха, дзе Пярэстая, а дзе Чарнуха, пачнём хвастаць, хто бічом, хто дубцом. Жывёла адчуе небяспеку і, няхай сабе не адразу адарваўшыся ад шкоды, пярэйдзе ўрэшце на галоп.

Але на гэты раз усё абыходзіцца без прыгод. Напасвіўшы, кароў пераганяем у Хваінку, на вялікую паляну, дзе нас ужо не так і проста абвінаваціць... Пакуль каровы жуюць жуйку, мы вывучаем у бярэзніку гнуткія бярозкі, бо ў кожным з нас пасяліўся дух Тар-

зана. Залазіш на бярозку, бярэшся рукамі за ствол — і ты ўжо спускаешся на бярозавым «парашуце» на зямлю або пералятаеш на другое дрэва. Праўда, пасля гэтага бярозка некаторы час стаіць згорбленая. Ды столькі таго клопату, калі, нагледзеўшыся ў кіно на Тарзана, мы ўяўляем сябе дзікунамі...

Лазім гэтак, лазім, ажно чуем побач трэск і адначасова Толікаў голас:

— Э-э-эй!

І нешта гупнулася вобзем. Збягаемся хто адкуль на гэты глухі гук — бачым: ляжыць Толік з верхавінай асіны ў руцэ. Побач дрыготкай лістотаю шамаціць абламанае дрэва. Усё тут зразумела: Толіку захацелася даўжэй спускацца, аблюбаваў высокую асіну, і вось...

Мы схіляемся над сябрам, каб пераканацца, ці хоць дыхае. А ён паціху ачомаўся і кажа:

— Ёлкі-палкі, дзе я?

— На зямлі. Каля самае гнуткае асіны,— смяёмся мы, радыя, што ў яго хоць мову не адняло.

Толік спрабуе варушыць рукамі і нагамі, і гэта яму ўдаецца. Тады ён прыўстае, абапіраючыся на рукі, і, выціскаючы з сябе ўсмешку, кажа:

— Я хацеў упасці.

— Хацеў? То яшчэ палезь...— смяецца Андрэй.

— Хітранькія,— разважае Толік,— тады хацеў, а зараз не хачу.

## НЕСПАКОЙНЫ ГОД

Прайшоў яшчэ цэлы год. У нас, забалаччукоўскіх сяброў, ён адзначыўся першымі школьнымі экзаменамі, а ў жыцці бацькоў — экзаменам куды больш складаным: у Дзяніскавічах утварыўся калгас. Назвалі яго «Перамогаю», за старшыню паставілі (такая для ўсіх навіна!) каваля Мірона Чушбу.

— Нездарма першы заяву падаў — вока далёка бачыла цёплае месца,— з адкрытай зайздрасцю гаварыла Саламоніха.

— Чорт яго бяры, да нас мо будуць меней чапляцца,— раптам разважыла не схільная да разваг Ветрыха.

Непрыхільна сустрэлі калгас нашы хутаране. Невядома адкуль і хто прынёс і пусціў на людзі яхідную прыпеўку:

У калгас дарожка проста,
А з калгаса — ко́сая.
У калгас ідуць абуты,
А з калгаса — босыя.

Паўзлі чуткі, нібыта людзі нідзе не хочуць калгасаў.

Мы, школьнікі, пачыналі ўжо ўлазіць у размовы дарослых, але тут жа нам затыкалі рот: «Многа вы знаеце, смаркачы!..»

Хіба што адзін на ўсё Забалоцце Чушба Мірон, дзякуючы яго прыроднай кемлівасці, зразумеў, што і нашаму цёмнаму люду, які заблытаўся ў частых зменах улады і ў якога ў крыві засела прывычка трымацца

за ўласную зямельку, няхай яна і нікчэмная, але ж свая, за гаспадарку, якая яна ні ёсць задрыпаная,— і яму, гэтаму люду, усё ж такі настаў час жыць супольна, сям'ёй. Але яго, Мірона Чушбу, пакуль ніхто не слухаў. Адны не хацелі так «з трахты-барахты» рызыкаваць, асабліва калі пачулі, што іх ніхто не вывезе ні на якія там Салаўкі, і заставаліся верныя адвечнай сялянскай логіцы: не вытыркайся ўперад, хамут, маўляў, на шыю надзець за́ўшы паспееш, была б толькі шыя. Другія зусім не збіраліся лезці ў «хамут», іх нельга было нават зацягнуць на сход, уцякалі хто ў поле, хто ў лес, абы толькі заўважылі, што па хатах ходзяць незнаёмыя людзі, бо разумелі: зноў агітуюць...

Знянацку актывісты з сельсавета былі засталі дома Лунаціка. Дык ён вырваўся з хаты ды — наўцёкі. «Я здурнеў! Я здурнеў!» — крычаў ён, уцякаючы ў Хваінку.

Мая маці таксама, як і нашы суседкі — Ветрыха, Саламоніха, як і шмат хто яшчэ, сыходзіла з хаты. Не ад страху, напэўна, а таму што так рабілі іншыя. Вешала на дзверы замок, калі мяне не было дома, а калі заставаўся я ў хаце, заяўляючы мацеры адкрыта і дзёрзка: «Нікуды я не пайду», яна наказвала мне, каб хаця не сказаў тым начальнікам, што прыйдуць, дзе яна падзелася, і ўсё роўна сыходзіла, каб быць заадно з суседзямі.

Тыя з забалаччан, што нейкім чынам часова адарваліся ад зямлі, ад гаспадаркі, цяпер дадому не вярталіся — недзе кожны прыладкоўваўся. Так і Сала-

мон пасля Карэліі асеў у горадзе. На вучобу, на будоўлю — хто куды мог — раз'язджаліся хлопцы і дзяўчаты. Мала хто асядаў на радзіме і адслужыўшы армію.

Забалаччанам, якія трымаліся свайго кутка, асабліва далася ў знакі першая вясна калгаса, калі ён рыхтаваўся да сяўбы...

Вядома ж, адрэзалі і зямлю аднаасобнікаў. Заставалася адно сядзіба. Зямля каля гары — пясок ды каменне. Толькі добра ўгноіўшы яе, можна было садзіць бульбу і спадзявацца, што і тут, на гэтых шматках, нешта вырасце.

Аднаасобная наша гаспадарка, якая даўно не апраўдвала сябе, цяпер канчаткова страціла сэнс. Зляжалую ў двары і ў садочку зямлю нельга было ўкапаць. Як ні папярэджвала маці, каб капаў асцярожна, я ўсё-такі паламаў рыдлёўку.

Лета прынесла новыя клопаты. Найперш — дзе купіць хлеба? Такіх, як мы, было многа, і нашы інтарэсы ўсё часцей пачалі сутыкацца каля хлебнага магазіна ў горадзе. Відаць, людзям, што ніколі не ведалі голаду, цяжка ўявіць, якая крыўда, які боль пяклі сэрца, па сутнасці яшчэ дзіцячае, калі ў чарзе часам перад самым носам канчаўся хлеб.

Дадому вяртацца было куды лягчэй з боханам, няхай сабе і цяжкага, як гліна, а ўсё адно такога смачнага хлеба. На пятнаццаці кіламетрах дарогі, калі не траплялася ні адной машыны або траплялiся, ды не бралі, я мог бы непрыкметна з'есці цэлы бохан. Прынамсі, тады я меў такі апетыт. Але мне хацелася па-

радаваць маці, і я трываў. Каб хоць трохі ашукаць голад, чытаў на памяць вершы, напяваў песні.

— Нічога, сынку, не прападзём,— суцяшала мяне маці,— толькі б карову пратрымаць.

А тут за пашу сказалі аднаасобнікам плаціць. З горам напалам разлічыліся, а ўжо й час пра сена дбаць. Зрэдку дапамагала Маня, але ёй і самой трэба было і пракарміцца і не абы-як адзецца — дзяўчына ж... Віця і зусім памагчы не мог — пайшоў у армію, трапіў аж у Маскву.

— Адзін у нас выхад, галубок мой,— не надта гублялася маці,— будзем ірваць і сушыць зелле.

— Пішыся ў калгас,— шчыра раіў мацеры старшыня Чушба.— Дам табе сенакосу. Соткі палучыш, чуеш бо, як людзі...

— Ды якая з мяне работніца, Міроне,— апраўдвалася маці.

— Работнік у цябе расце, чуеш бо. Праўду я кажу, Валодзька?

— Праўда, дзядзька Мірон. Я хадзіць буду ў калгас на працу.

— Во, бачыш, і хлопец твой — за калгас... Не разумею: што ты губляеш і чаго баішся?

Яна не губляла нічога, нічога не баялася, але ў той год так і не пайшла ў калгас, хоць і я ўгаварваў, і Віця з арміі, з Масквы, пісаў, каб уступала.

— Можа, дзеткі, я ўжо дажыву так, як жыла,— казала маці ў роздуме.

І колькі ж было гаркаты ў тым матчыным сумненні!..

# БАЦЬКАВЫ ПАДАРУНКІ

Бацька дадому не ўчашчаў. Зімою зусім не паказваўся. Затое летам заяўляўся на веласіпедзе. О, як жа запаў мне ў душу той веласіпед, з аранжавымі апонамі, белым бліскучым балотнікам, сіняю рамай і сярэбраным званком! Не, гэта была не цацка, а тая зручная рэч, якая не раз магла скараціць мне дарогу да школы. А ці толькі да школы... Выязджай грэбляю на гасцінец і каці сабе хоць у райцэнтр, а хоць нават і далей.

Бацька абяцаў, хітра ўсміхаючыся: «Ты толькі перайдзі ў чацвёрты, і ровар (у нашым краі веласіпед усе называюць роварам) будзе твой». Гэта пакуль я не скончыў тры класы, а як скончыў, дык ён пачаў цешыць наступным годам. Але так і не купіў, не адарыў мяне, свайго сына, той вялікай радасцю, якая надае плячам крылы, рукам — сілу, а вачам — агню. Не купіў, хаця я пад матчыну дыктоўку пісаў яму не раз такія ласкавыя пісьмы, што нават на мяне самога набягала хваля пяшчоты, пакідаючы на вейках слёзы, калі перачытваў толькі што напісанае: «Дарагі татачка, на двары сапраўдная вясна. Снег сышоў. Прыляцелі жаўранкі. Але ў нашай хаце няма вясны, бо не хапае вас...»

За такую любоў бацька, як і раней, зрэдку плаціў пячэннем або цукеркамі-падушачкамі. Ды аднаго разу я адмовіўся ад яго ласункаў. Гэта было таго дня, калі я добра набіў ногі, ідучы пехатою з гарадка, дзе хацеў купіць хлеба, аднак не купіў — на ўсю доўгую

чаргу яго не хапіла. І ў чарзе, і ў дарозе, гарачай і пакутлівай, і дома хацелася хлеба. А тут якраз бацька, прыкаціўшы на веласіпедзе, тым самым, з аранжавымі апонамі, белым бліскучым балотнікам, сіняю рамай і сярэбраным званком, паднёс мне ў пакуначку цукеркі.

— Не трэба, я не хачу,— сказаў я, праглынуўшы сліну,— з'ешце самі.

Бацька адчуў маю крыўду, адышоўся да плота, дзе стаяў ягоны веласіпед, прызадумаўся, пасля выцяг з кішэні штаноў кашалёк і, пакорпаўшыся там, дастаў грошы, зноў падышоў да мяне, угінаючы галаву, падаў цэлую дзесятку і сказаў як бы заклапочана:

— На, купіш сабе кніжкі для пятага класа.

Я ўзяў, але не падзякаваў.

— Глядзі, каб стараўся,— папярэдзіў ён, потым зняў з багажніка гаспадарчую сумку, уваліўся ў сенцы і, не заходзячы ў хату, палез па драбіне на гарышча.

Там стаяў куфар, а ў тым куфры пад замком бацька хаваў свае рэчы. І гэтак ён рабіў кожны раз: дабіраўся да куфра, кешкаўся там, штосьці браў у сумку, сядаў на веласіпед і зноў ціха спускаўся ў бок балота.

Праз месяц бацька прывёз шахматы. Паклікаў мяне не ў хату, а ў садочак. Там, у засені дрэў, ён аддаў падарунак, растлумачыў правілы гульні, і дзве партыі мы нават згулялі. Мне спадабалася ў шахматах усё — і кантраст чорных з белымі клетак на дошцы, і шарэнгі прыгожых фігур, і, галоўнае, сама гульня: кожная

фігура ходзіць па-свойму і кожная — нават пешка — можа аб'явіць яго вялікасці каралю працаўніка не толькі шах, але і мат.

Аднак жа і шахматы ненадоўга патушылі маю тугу па веласіпедзе, абяцанаму мне, ды не падаранаму, і я асмеліўся папрасіць:

— Тату, а ровара дасце?

Бацька ніякавата адвёў вочы, але тут жа хітра ўсміхнуўся:

— Замалы ты для ровара, яшчэ падаць будзеш. Трэба трохі падрасці.

Ён паехаў, а шчасце мне ўсё-такі ўсміхнулася неўзабаве. Спачатку, праўда, убачыў я чужое шчасце, калі Андрэеў бацька купіў адразу два веласіпеды, адзін сабе, другі — сыну; яно патроху грэла і мяне, як грэла Толіка і Лёньку: Андрэй не толькі сам вучыўся катацца... А маё шчасце далося мне ў суботу пад вечар, калі Маня дадому ўпершыню не прыйшла, а прыехала. Яе веласіпед у вечаровых промнях сонца ззяў, як люстэрка.

— Купіла,— гаварыла Маня да мацеры, паказваючы пакупку.— Такі файны.

— Добра, што купіла,— казала маці,— не будзеш больш трапаць пяшком.

У нядзелю — вольны ад працы Манін час — я ўжо асвойваў яе «тэхніку». Усё пачалося з таго, што, спускаючыся з гары, не абмінуў першага ж валуна, які ляжаў у баку ад сцежкі. Падаючы з веласіпеда, я, напэўна, зрабіў у паветры немалую дугу, бо кінула мяне цераз руль і скурчыўся я пад бярозаю, што стаяла на

загуменні, метры за два ад валуна. Балелі адразу і рукі і галава. Калі, накульгваючы, падняўся, то пачаў хутчэй абмацваць веласіпед: «Ці хоць не паламаўся?» Веласіпед быў цэлы.

Пра тое, як спусціўся я з гары, ні Маня, ні маці не ведалі, бо не бачылі маіх сінякоў і драпін. І сам я толькі на раніцу пaглядзеў на свае калені і локці і ўбачыў, што яны добра такі паразмалёваны...

## СПРОБА

Хто ў свае школьныя гады не спрабаваў складаць вершы! Меў такую радасць і я. Новае пасля музыкі захапленне прыйшло да мяне ў пятым класе. Прыйшло разам з настаўнікам рускай літаратуры. Ён, Леанід Мяфодзевіч Крыжановіч, быў з выгляду самы звычайны чалавек. Невысокі, непаспешлівы, у меру акуратны. У натоўпе на яго, бадай, і не звярнуў бы ўвагі. Але калі ты пачуў ягоны голас і глянуў яму ў вочы — то ўжо не выходзіў з яго настаўніцкага гіпнозу, пакуль не канчаўся ўрок. Прырода адарыла яго прыгожым, хвалюючым голасам, а галоўнае — талентам. І ўсе ведалі: тое, што ён раскажа, у кнізе не заўсёды вычытаеш. Было ўражанне, быццам Леанід Мяфодзевіч падручнікам і не карыстаецца, бо не толькі вершы, але і цэлыя паэмы, асабліва пушкінскія, ведаў на памяць. Пра Пушкіна ён гатовы быў расказваць бясконца.

Ну, і плакалі многія мае навукі з таго дня, калі пачуў я Крыжановіча. Я стаў запоем чытаць Пушкіна. Каб жа толькі чытаць... Сам пачаў складаць вершы.

Лета, восень, раніца, вечар цяпер пасяляліся ў мой сшытак. Тайком усё часцей я прападаў у лесе, каб назіраць прыроду, прыглядацца, як цвітуць верасы, як заходзіць сонца, як зямлю ахінае туман, прыслухоўваўся да шолаху лісця, шчабятання птушак, шуму дажджоў.

Сваіх сачыненняў ні сябрам, ні мацеры не паказваў. Але і хавацца не ўмеў. Ды і як тут схаваешся, калі новае захапленне не толькі ўзвышала настрой, забірала нямала часу.

Маці ведала, што дагэтуль вучоба давалася мне лёгка, таму адразу заўважала мой неспакой, аднак апраўдвала яго: «Што ні кажыце, пяты клас...» Але аднойчы вечарам яна заўважыла, што я не чытаю і не пішу, а заклапочана вішу над нейкім скрэмзаным лістом паперы.

— Над чым гэта ты квокчаш? — нечакана пацікавілася маці, латаючы старое адзенне.

— Вершыка напісаў,— не без гонару адкрыўся я.— Хочаце — прачытаю.

— Ну, прачытай.

І я стараўся не менш, чым на ўроку Леаніда Мефодзевіча:

> Уж солнце село за деревней,
> Дохнуло свежестью вечерней.
> Уж не пылит совсем дорога,
> И даль темнеет понемногу,
> Ложится на луга легонько
> Туман, как облако, густой,
> Вокруг становится тихонько
> Да всходит месяц золотой.

Маці слухала, здавалася, абыякава, але, калі я скончыў, спытала:

— І гэта са свае галавы?

— Няўжо ж не,— ганарыўся я.

— А забадай цябе камар,— па-свойму хваліла маці.

Радасць першых крокаў дзіцяці, хіба што з табою магу параўнаць той творчы неспакой! «Значыць, я — паэт»,— разважаў я, і струны юнай душы звінелі, і свет адкрываўся для мяне ўсімі колерамі вясёлкі.

## МАГІЯ ДРУКАВАНАГА СЛОВА

Паступова апаноўвала неадольнае жаданне: каб мае вершы прачыталі ўсе. Але ж не менш востраю была і боязь, што, можа, напісаў я не так, як належыць паэту, і з мяне пасмяюцца.

«А што, калі паказаць Валянціну Фёдаравічу?» — падумаў я.

Валянцін Фёдаравіч Камінскі, настаўнік беларускай літаратуры, быў нашым класным кіраўніком. Яго, вясёлага і справядлівага, мы ўсе любілі і паміж ім і сабою не адчувалі той велізарнай дыстанцыі, якая звычайна існуе паміж настаўнікам і вучнямі.

Я выбраў дзень, калі ўрок Камінскага быў па расkладу апошні, каб падысці, калі ўжо нікога не будзе ў класе.

— Дык, значыць, ты пасябраваў з музаю,— прыветліва ўсміхнуўся класны, прачытаўшы мае вершы.— Ну, малайчына, з гэтай сяброўкай не прападзеш. Пі-

шы, у цябе будзе мэта, а з ёю цікавей у жыцці. Але ці ведаеш, што я заўважыў? У вершах многа беларусізмаў. Думаю, па-беларуску ў цябе лепей атрымалася б.

— А хіба...— сумеўся я,— хіба цяпер пішуць па-беларуску?

— Дзівак ты, Валодзя,— усміхнуўся настаўнік.— А Якуб Колас, а Кандрат Крапіва, а Міхась Лынькоў, а Янка Маўр, што, па-твойму, яны па-турэцку пішуць?

— А хіба яны жывыя?

— Дзякаваць богу, жывыя.

Валянцін Фёдаравіч смяяўся, а я чырванеў. Гэта ж мяне збіла тое, што і Пушкін і Лермантаў загінулі на дуэлі, што і Максім Багдановіч і Янка Купала памерлі.

— Пішы, брат, на языку тому, які бліжэй дому,— сказаў ён ужо зусім сур'ёзна.— Зразумеў?

— Зразумеў,— прамармытаў я.

— Ну, дык поспехаў табе! — пажадаў настаўнік.

Цяпер я вершаваў з патроенай энергіяй. Рыфмы нібыта самі прасіліся на кончык пяра, каб закрасавацца ў маім вучнёўскім сшытку, на вокладцы якога я траха не ўсімі каляровымі алоўкамі намаляваў такое чароўнае слова: «Вершы»! Сюды пераносіў «самыя сур'ёзныя» сачыненні. Пра што напісаць — такога пытання не існавала. Масква, Радзіма, подзвігі Савецкай Арміі, камунізм... Я ж так хацеў быць на вышыні ў вачах настаўніка! Чырванеючы, я прынёс яму новыя вершы, напісаныя па-беларуску.

Валянцін Фёдаравіч, прачытаўшы іх, заўважыў:

— Усё гэта правільна. Толькі пастарайся яшчэ пісаць пра тое, што ты найлепей ведаеш,— пра маці, пра сваё сяло, напрыклад, пра лес, пра снежную горку... Адным словам, пра ўсё, што ты бачыш і чуеш, і паспрабуй паслаць сёе-тое ў рэдакцыю.

Ну, калі настаўнік загаварыў аб рэдакцыі, то за мной затрымкі не будзе! Я пішу і верш за вершам дасылаю то ў адну, то ў другую газеты. І колькі ж радасці і спадзявання было ў чаканні адказу на тыя лісты!..

Пісьмы з рэдакцый чаравалі вогненнымі літарамі на канверце і зверху на самім лісце. Змест іх быў розны. Адны кансультанты заўважалі мае недасканалыя рыфмы, каструбаватыя фразы, банальныя думкі, другія заклікалі пісаць заметкі, трэція абнадзейвалі: «Чакаем новых твораў». Хто-ніхто раіў больш чытаць і вучыцца ў майстроў мастацкага слова.

Вучыцца ў майстроў... Каб жа гэта можна было ў каго навучыцца — усе паэтамі былі б.

Я ведаў шчаслівы палон Пушкіна і Някрасава, Купалы і Багдановіча. Але як навучыцца, не пераймаючы іх саміх, пісаць пра нешта сваё?.. Пра што?..

Шукаючы выйсця, я пачаў удумвацца ў словы настаўніка: «...пастарайся пісаць пра тое, што ты найлепей ведаеш...» І ўжо за вечар склаў:

Люблю сяло на касагоры
І аксамітныя лугі,
На дрэвах яркія уборы,
Люблю пахучыя стагі;
Люблю я лес, куды нярэдка

Хаджу з матуляй па грыбы,
Люблю дарогай бегчы ўлетку
Пад шум бярозы і вярбы.
Люблю ўсё горача, бясконца,
З адценнем светлае тугі.
Красуйся ж ты пад ясным сонцам,
Мой край любімы,
дарагі!

Лісток паклаў у канверт, а на канверце зверху напісаў адрас — «Піянер Беларусі». Адказу чакаў месяц. А пасля ў школу прыйшло пісьмо з рэдакцыі з нумарам газеты, дзе змясцілі мой верш пад назвагю «Родныя мясціны».

Пра гэта хутка даведалася ўся школа. Валянцін Фёдаравіч перад класам павіншаваў мяне з творчым поспехам. Але самым радасным і нечаканым было тое, што і Леанід Мяфодзевіч, які ў маіх вачах быў першай зоркаю і да якога я не асмельваўся падысці, нават ён не застаўся абыякавым. Прачытаўшы ў газеце верш, сказаў,— вядома ж, гэта была добрая ўсмешка педагога:

— Складна, як у самога Коласа.

...Зіма. Моцны вецер свішча ў кронах дрэў, коціць па ўмерзлай зямлі снегавыя крупы. Ён і газету гатовы вырваць з рук — толькі разгарні. Але навошта разгортваць, калі я склаў яе так, што зверху — мой верш. Вецер зусім не шкодзіць мне раз за разам выцягваць з кішэні газету і перачытваць роўненькія радкі, сабраныя ў прыгожыя слупочкі. Пад вершам — маё прозвішча, а пад прозвішчам — мой адрас: вобласць, раён, школа.

Сёння дарога ад школы дадому — найкарацейшая. І сённяшні вечар будзе самы кароткі. Сваім шчасцем дзяліцца буду з мамаю. І калі яна зноў папытае: «І гэта са свае галавы?», я адкажу: «А навошта мне з чужое».

## У ЗАВІРУХУ

Пад вечар наляцела і расхадзілася завіруха. Спачатку паваліў снег. Пасля ўзняўся моцны, парывісты вецер, і мяцеліца завіравала ў паветры, завіхурыла. Рухомая снежная заслона стала такая густая, што з акна відаць было адно калодзеж ды плот каля яго. Клуня здавалася вялікай шэрай плямаю.

Я стаяў ля акна, пакуль мама не зачыніла аканіцы. А тады ўзяў кнігу казак, якую прынёс з бібліятэкі, узлез з нагамі на лаўку насупраць прыпечка і пачаў чытаць. З акна цягнула холадам, і мама накінула мне на плечы паўпалітко, усміхнулася:

— Дзьме вятрыска, дзьме, каб яму губы папухлі!

Я чытаў, мама слухала, шчыруючы каля пліты. На вячэру была зацірка з соевай мукі, смачная, як ніколі, бо доўга мукі не было і раптам Маня купіла.

Пасля вячэры мама пачала прасці кудзелю, а я зноў чытаў казкі, слухаючы, як цяжка ўздрыгваюць складзеныя крылы аканіц ды як вятрыска гойсае па бляшаным даху.

Раптам пачулася, як нехта на ганку пацягнуў да сябе дзверы за ручку.

— Мама, хтосьць да нас ідзе, здаецца.

Маці выйшла ў сенцы, адкінула зашчапку.

У хату ўвайшла і павіталася Адэсіха. Яе галава была захутана цёплай хусткаю, адно засталася шчылінка для вачэй. На сабе Адэсіха прынесла столькі снегу, што нельга было зразумець, у чым яна прыйшла, што на ёй за адзенне.

— А ці то ўжо канец свету будзе? — сказала яна.

— Хутчэй раздзягайся і грэйся,— мама спяшалася ёй памагчы.— Адкуль ты?

— З дому, Яўгенька, з дому, і ведаеш, чаго прыйшла? — прамовіла цётка Волька, распранаючыся.— Прасіцца ў вашу хату нанач. Страшна ў сваёй — так трапеча яе, так шкуматае, хай бог крые!

...Уяўляю старэнькую Адэсішыну хатку з абшарпанаю саламянай страхой. Стаіць яна на высокім месцы, на скрыжаванні ўсіх вятроў. І хаця б якія дрэвы затулялі яе! Голая, як бубен, зямля. Робіцца да слёз шкада цётку Вольку, і Толіка, і тую хацінку, у якой яны жывуць.

— Праходзь, месца ў нас хопіць, і нам весялей будзе,— сказала мама і тут жа схамянулася: — Пастой, пастой, а дзе ж твой хлопец?

— Ці паверыш, не ўгаварыла. Я і так, я і гэтак, а ён адно: «Не пайду са свае хаты».

— Волька, як ты магла? — стала ўшчуваць Адэсіху мама. — А калі і праўда — бяда?!

— А што яму зробіш, сілай не возьмеш: хлопец даўжманы ўжо.

— Як магла ты пайсці адна? Ідзі і прывядзі яго, скажы, што я прасіла і што Валодзька чакае.

— Напраўду, я чакаю, прыйдзіце з Толікам да нас,— папрасіў я.

І яна зноў апранаецца, абкручвае, як можа, хусткаю галаву, бярэцца за клямку, аглядаецца:

— Ну, пайду, мо як і выцягну.

Адэсіха пайшла, і мы чакалі. Доўга не клаліся спаць, усё хацелася пабачыць Толіка. Калі і леглі, то газоўку не гасілі, а толькі ўкруцілі кнот, каб паменшаў агеньчык.

Я сагрэўся ў пасцелі і непрыкметна заснуў. А калі прачнуўся, мамы не было. Я паклікаў, яна не адказала, пачакаў, яна не ішла.

А вецер ніколечкі не сціх — скуголіў у коміне, высвістваў за акном. Па даху, здавалася, лётаў дымавік.

Я падумаў, куды магла пайсці мама, і здагадаўся — да Адэсіхі. Але ж такі вецер! Можа, дзе ўпала ў глыбокі снег і не здужае падняцца? Чаму ж не сказала мне? Пайшлі б разам. Я ўскокваю з пасцелі, падкручваю ў газоўцы кнот, каб святлей было, шукаю адзежу. Хату добра прасвістаў вецер, холад хапае за ногі і плечы. Я нацягнуў штаны, кашулю, пачаў шукаць чаравікі і тут прыслухаўся: «Так і ёсць, кашляе мама». Праз свіст ветру — пачуў.

Адчыніліся і зачыніліся на засаўку дзверы, і з сенцаў пераступіла парог уся ў снезе мама.

— Што ж ты сабе надумала, дзіцятка?! — неяк лагодна абураецца яна.— Чаму не спіш?

— Ну, што там, у Толіка?

— Заснуў твой Толік як пшаніцу прадаўшы, і маці пашкадавала будзіць.

— А хата?..

— Хата стаіць, адно вокны звіняць ды ляскаюць дзверы,— кажа маці, вытрасаючы з гумовых ботаў снег, і цяжкі кашаль зноў душыць яе, гне да зямлі.

Прыступ кашлю праходзіць не адразу. Пасля мама, адпачыўшы колькі хвілін, песціць мяне голасам:

— Ну, лажыся спаць, мой гаротнічак.

Перад сном я выказваю маме тое, што засела ў думках:

— А я так баяўся, каб не ўпалі вы ў снег.

— Не бойся, сынку,— супакойвае яна,— рыпучае дрэва доўга стаіць. Спі, поўнач ужо.

Я змаўкаю, слухаю завіруху. Сон мяне не бярэ. А мама, чую па яе дыханні, засынае.

«Рыпучае дрэва доўга стаіць»,— паўтараю моўчкі яе словы. Поўны іх сэнс зразумею пазней. А цяпер словы гэтыя для мяне — як паратунак ад трывогі, якая ўжо была закралася ў сэрца. Здаецца, усё будзе вечна. Як паўтараецца ўзыход сонца і цяпло, будуць паўтарацца маміны словы, маміна ўсмешка. Вечна будуць маміны рукі. Вядома, яна слабая. Вядома, спатрэбіцца ёй дапамога. Але яна будзе і будзе. Хіба можа не быць мамы?!.

## У БЯСКОРМІЦЫ

Даўно мінуліся тыя святы, калі за цэлы дзень карове перападаў шматок сена. Яго мы з мамаю нарыхтавалі гэтак мала, што ледзьве на паўзімы хапіла.

Цяпер усё больш рэжам салому на сечку. Але пус-

той сечкаю жывёлу не накорміш. Трэба яшчэ і бульба або буракі. І я радуюся, калі мама нахіліць над цэбрыкам кошык і з яго пасыплюцца, забабахаюць па дне дробныя, бы жалуды, бульбінкі. Хутчэй бяру ў куточку ля печы сякач і пачынаю іх старанна цахаць, пакуль мама не загляне ў цэбрык і не скажа: «Ну, будзе ўжо». Красёха прагна есць мешанку, а пасля ахвотна п'е — вядро вады, часам вядра і мала.

Але што ні дзень, то ўсё меней бульбы падае з таго самага кошыка ў той самы цэбрык.

— Чаму гэтак, мама?

— Да дна дабіраемся, сынок.

— А як жа будзе?

— Бог ведае, сынку. Мо як дацягнем да вясны...

Да вясны дацягнулі. Ды прыйшла яна не так, як звычайна. Леташняя была з цёплымі вятрамі, з туманамі і дожджыкамі. Тады ручаямі збягаў з поля і лугоў снег і ўсё дружней наўкол зеленела трава. А цяпер на зямлі ляжыць снег, халодны вецер раз-пораз прыганяе табуны цёмных хмараў, падсыпае снегу.

— Божа мой, божа! — усё часцей уздыхае мама.— І дзе тая вясна затрымалася?

Мінуў халодны сакавік. Пачатак красавіка выдаўся цёплы. Адразу пачаў хутка раставаць снег, пабеглі раўчукі, неўзабаве крануўся на балоце лёд. Пасвятлела на двары. І ў маміных вачах пасвятлела — абудзілася ў сэрцы надзея. Надзея на пашу як на блізкую дапамогу... У хляве стаяла карова худая-худая — скура ды косці.

Зрэдку прыходзілі суседзі.

— Старая ўжо ваша Красёха,— гаварыла Ветрыха.— Калі выхецкаеш, прадавай ды гадуй це́лятко.

— Бадай, праўду кажаш,— адказвала маці.

Адэсіха шчыра спачувала нам, выказвала трывогу.

Зазірала ў хлеў і Саламоніха. Яе поўныя шчокі гарэлі, як півоні.

— Няма бяды,— казала яна.— Вось пойдзе на пашу і ўвачавідкі на́дзьмецца.

А бяда была зусім побач. Мы адчувалі яе, баяліся, ды рабілі, здаецца, усё, каб адвесці. Калі скончыліся вотруб'е, буракі і салома, пачалі секчы насенную бульбу, а на сечку ўжо ішлі кулі з саламянае страхі клуні.

— Не шкадуй, сынку, усё адно клуня пустуе,— гаварыла мама, пасылаючы мяне па новыя кулі.

Здавалася, можна было ўжо радавацца, бо дацягнулі да пашы. У красавіку толькі раз халаднела, а пасля раптоўна прыйшло і ўсталявалася цяпло. Маладая трава мігам адскочыла, зазелянела. Толькі радавацца нам не давялося. Пайшлі выганяць Красёху з хлява, а яна не ўстае. Карова яшчэ доўга сілілася (відаць, і жывёліне цяжка змірыцца з уласнаю знямогай), але дарэмна: яна толькі прыўставала на пярэднія ногі і зноў падала.

Я пабег у сяло па Віцевага хроснага. Прыйшоў хросны Дзяніс на параду. Разгублена зазірнулі ўсе ў хлеў. Дзядзька Дзяніс падрабязна распытваў, калі і як гэта здарылася, а пасля, пашкрабаўшы пад шапкай лысіну, сказаў, што трэба будзе падняць карову, падважыць і падвязаць да столі. Маўляў, так было ў

Данілы Галубовіча. Ачомалася карова на вяроўках, а там і пайшла сваім ходам.

Ледзь назбіралі мужчын. Прынеслі старыя лейцы, папругу, вяроўкі, пазвязвалі рамяні. Падважылі, паднялі Красёху, прымацавалі вяроўкі да бэлькі. Падкармілі аслабелую жывёліну свежай травою, бульбаю, нават мукою. Думалі, акрыяе і пойдзе. А яна зноў упала.

— Няма чаго скаціну мэнчыць,— сказалі мужыкі.— Трэба паклікаць конскага доктара.

Прыехаў на веласіпедзе ветэрынар, высокі і кучаравы. Агледзеўшы карову, сказаў:

— Жывёліну нельга трымаць у такіх умовах, неабходна выцягнуць на двор.

Вывалаклі.

— Доктар,— прасіла мама, ловячы яго позірк,— скажыце, ці ўстане карова?

— Усё будзе залежаць ад вас,— прамовіў той, праехаўшыся пяцярнёй па кучаравай шавялюры.— Надзея адна: корм і догляд.

Доктар паехаў. Памагатыя разышліся па хатах. І зноў мы з мамай засталіся ўдваіх з нашым горам і нашай надзеяй — Красёхай.

## ПАСВЕДЧАННЕ

Верш, надрукаваны ў газеце, зацікавіў аднакласнікаў. Хадзіў па класе з рук у рукі агульны сшытак, куды я занёс ужо дзесяткі тры сваіх твораў. Камусьці прыйшло ў галаву паставіць пад імі адзнакі, каб паказаць сваю неабыякавасць і ацаніць маё натхненне.

І пайшлі, і пасыпаліся ў сшытак пяцёркі ды чацвёркі — сябры былі шчодрыя на ўзнагароду. А на апошняй старонцы нехта нават усклікнуў: «Якія выдатныя паэты растуць у Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспубліцы!» І гэтае захапленне, вядома, я цалкам адносіў да сябе...

На перапынках у наш клас заходзілі старшакласнікі.

— Дзе тут ваш вундэркінд? — пыталі яны.

Ад такой увагі я, здавалася, падрастаў. Адно не падабалася мне: малыя часта на ўсю вуліцу галёкалі:

— А во паэт пайшоў! Гэй, паэт!..

У такую хвіліну хацелася пусціцца за гарлапанам, злавіць яго і хаця добра прыгразіць, каб не ляпаў лішняга сваім агідным языком. Але я нікога не лавіў, бо разумеў — гэта не паможа.

Тым часам мяне абралі адразу ў дзве рэдкалегіі — класнай і школьнай насценгазет.

А неўзабаве я атрымаў незвычайнае пісьмо. Па канверце — зваротнага адраса не было — не мог зразумець, адкуль яно прыйшло. І почырк, чаканны і ўпэўнены, быў не знаёмы мне.

Якое ж было здзіўленне, калі ў тым загадкавым канверце аказаўся маленечкі прамавугольнік паперы, акуратна выразаны з вучнёўскага — у клетачкі — сшытка. Я ўзяў паперку ў рукі, а ёй цаны няма: выходзіць, што мяне прынялі ў СППВ. Балазе, хаця расшыфравалі: СППВ — Саюз пачынаючых пісьменнікаў вобласці... Яшчэ і яшчэ раз паглынаю вачыма кожную літару — пасведчанне аформлена як мае быць;

вось подпіс старшыні, а вось — сакратара, праўда, па іх цяжка зразумець сапраўдныя прозвішчы, але ж гэта — звычайная рэч, і пячатка стаіць. Пячатка як пячатка — круглая. Адно шкада — не разабраць, што на ёй напісана: расплылося чарніла...

Таго дня і яшчэ колькі дзён запар я перачытваў дасланае мне пасведчанне. «Цікава, колькі ўсіх чалавек у СППВ,— думаў я,— і хто яны такія, яго кіраўнікі, тыя, што паставілі подпісы. Мабыць, вядомыя пісьменнікі... Ва ўсякім разе, заслужаныя людзі...»

Я паказаў пісьмо спачатку маме, а калі прыехала Маня, то і ёй пахваліўся. Ні маці, ні сястра асаблівае ўвагі не звярталі на паперку, якая мне была каштоўнаю і дарагою.

Праз некалькі дзён я атрымаў два пісьмы: адно ад «старшыні» СППВ — Алеся Мілейчука, другое — ад «сакратара» Сцяпана Юшчыца. Разам з кароткімі лістамі, у якіх Алесь і Сцяпан пісалі пра сябе, пра вучобу ў школе, яны прыслалі выразкі сваіх вершаў, надрукаваных, як і мае «Родныя мясціны», у «Піянеры Беларусі» і ў раённых газетах. Алесь, акрамя таго, даслаў і фотакартку, на якой зрабіў вясёлы надпіс: «Прабач, што я тут рагачу, як конь, і маю выгляд ганарыстага пеўня».

І прыйшла да мяне новая радасць — недзе ў свеце ёсць харошыя, неабыякавыя да маіх спраў хлопцы, такія ж у чымсьці, як і я, толькі куды большыя выдумшчыкі, фантазёры: узялі ды стварылі, няхай сабе на паперы, Саюз пачынаючых пісьменнікаў вобласці. І сябе не пакрыўдзілі — зрабіліся «кіраўнікамі»...

# БЯДА

Красёха не ўставала, як ні стараліся мы з мамаю памагчы ёй. Не хапала корму. З дня ў дзень цярпліва хадзілі ў поле па зелле, а яно ўсё цяжэй нам давалася — слаба расло: стаяла спёка. Днём не сядзелася нам, а ўначы не спалася, лезлі ў галаву думкі, што могуць падкрасціся ваўкі і зарэзаць карову. Потым прывыклі — пачалі спаць больш-менш спакойна. Пасля нам яшчэ палягчэла: пасадзілі бульбу. Прайшлі дажджы, і ў полі прыбавілася травы. Да таго ж, у мяне пачаліся летнія канікулы, вольнага часу пабольшала, але яго і спатрэбілася больш. Карове сталі назаляць мухі і авадні. Я адганяў іх бярозавай галінкаю, падсоўваў пад пысу зелле, прасіў яе, каб ела...

Бяда не адступала, яна пагражала ўсё больш яўна: у Красёхі адкрыліся пролежні.

Ветэрынар сказаў, што раны трэба рэгулярна прамываць. Мы варылі дубовую кару і прамывалі свежыя раны, спадзеючыся, што яны неўзабаве загояцца.

Карова чэзла ўвачавідкі. Яна ўжо слаба ела нават канюшыну. Але маці, мне на дзіва, перастала бедаваць, не бэжкала, як раней. Я пачаў здагадвацца: змірылася з тым, што пасылае нам марны лёс.

Мне ж было вельмі шкада Красёхі. Аднаго разу я не вытрываў і заплакаў.

— Не плач, сынку,— сказала маці.— Шкада толькі, што Красёха прахадзіла ялаўкаю. Нічога, купім цёлятко і выгадуем карову.

Але я плакаў не таму, што мы застанемся цяпер



11. Зак. 752

без малака — шкадаваў жывёліну, да якой прывык з маленства. І не губляў надзеі,— раптам усё пераменіцца: загояцца ў Красёхі раны, яна акрыяе і ўстане. Здавалася, гэтак жа думаў і сабака Воўчык, паклаўшы сваю галаву на выцягнутыя пярэднія лапы, і кот Рыжык, што часта прыбягаў да мяне, калі я адганяў ад каровы мух і аваднёў.

Настаў дзень, калі Красёха ўжо не падняла галавы, і ветэрынар вынес свой няўмольны прыгавор:

— Карову трэба прырэзаць і закапаць...

На конскіх могілках было да жудасці ціха, і гэтая цішыня паглыбляла мой смутак.

Тады здавалася, большага гора не бывае. Пра гэта мне гаварыла ўсё навокал — і цяжкая жарства, і трапяткія асінкі, і журботныя перад сваім захадам промні сонца, што падалі на медныя сасновыя ствалы.

## НА КАЛГАСНЫМ ПОЛІ

Ішла трэцяя вясна калгаса «Перамога». Там, дзе яшчэ нядаўна спрадвечныя межы падзялялі зямлю на вузенечкія палоскі і сяляне, заціснутыя тымі межамі, калупаліся, як краты, не бачачы белага свету, цяпер гаспадарылі трактары і сеялкі. І гэтак хораша стасаваліся машыны-працаўніцы да раздольнага — без межаў — поля. І да поля таго, і да тых машын мелі дачыненне як паўнапраўныя члены калгаса і мы, Ражэвічы, і Мацкевічы, і Каралюкі. Прыгледзеліся забалаччане да сваіх сельскіх суседзяў, тых, што даўно развіталіся з аднаасобнымі гаспадаркамі, і зразумелі:

калгас не толькі ніякі не канец свету, але і зручная рэч. Ніхто з калгаснікаў не скардзіцца, нікому з іх не пагражае суд, калі часам няма як выйсці ў поле. І каня брыгадзір дае пасадзіць бульбу ці прывезці дроў, а галоўнае — падаткаў калгаснікі ўжо не плацяць. Праца? Працы дык хапае, але дзе і калі яе бракавала? Прыгледзеліся дзікуны хутаранцы — і пачалі падавацца ў суполку. І, што цікава, першы адважыўся Лунацік, той самы, які калісьці — памятаеце? — уцякаючы ад прадстаўнікоў улады ў лес, крычаў: «Я здурнеў...» Калі Лунаціку цяпер хто-небудзь напамінаў пра тое, ён толькі ўсміхаўся і жартаваў:

— Усё бывае, часам і каўбаса страляе.

Следам за Лунацікам наважылася і мая маці занесці заяву, каб прынялі ў калгас. Пэўна, надакучыла ёй адно і тое ж пытанне, якое не сыходзіла з маіх вуснаў. Дзіва што карцела мне, каб маці запісалася ў калгас: я з Чушбавым Андрэем толькі і гойсаў па калгасным двары, дзе вабілі нас і кузня, і мноства вазоў, плугоў, барон, і, галоўнае,— канюшня, там Віцеў хросны працаваў конюхам. У яго, мудрага і добрага дзядзькі Дзяніса, не трэба было клянчыць, ён і сам выдатна разумеў, чаго мы пачыналі яму мазоліць вочы.

— Ну што, падшыванцы, Беляка захацелася? — усміхаўся ён двума радкамі белых і шчытных зубоў.

— Няўжо ж не,— шморгалі мы носам аб рукаў, адчуваючы блізкую радасць.

— Бярыце, жэўжыкі, бярыце, толькі па разу — да млына і назад, згода?

— Згода,— крычалі мы і, нібы вецер, урываліся ў канюшню, Андрэй — першы, я — за ім.

— Косю-косю,— яшчэ здаля гаварыў Андрэй да Беляка, і той пазнаваў яго, бо адказваў іржаннем.

І вось ужо, узбіваючы капытамі пыл, імчаў Бяляк Андрэя да млына, што стаяў наводшыбе ад сяла, а пасля — мяне. Як толькі ўзлазіў я на каня, у грудзях ад шчасця ўзнімалася сэрца. Насустрач ляцелі дарога, поле, млын, і вецер матляў лёгкі лён маіх валасоў — пасля пятага класа ўсім нам бацькі ўжо дазвалялі насіць «польку».

— Ну як?..— пытаўся дзядзька Дзяніс, калі я злазіў з каня.

— Так мала,— скардзіўся я, шчасліва ўсміхаючыся.

— Скажы мацеры, няхай пішацца ў калгас, то будзе многа.

Дома я ўсё, канешне, расказаў.

— Запісацца, сынку, не штука,— выказвала ўжо згоду мама,— але з чым ісці? З голымі рукамі? Ні каня, ні воза... З Чушбам параіцца, ці што?

— Дзядзька Мірон добры,— толькі і сказаў я.

Маці збіралася ў нядзелю пайсці да старшыні на добрую раду, а ён і сам заехаў да нас на веласіпедзе па дарозе з сяла дадому.

Мама якраз выйшла на ганак, а я даставаў з калодзежа ваду.

— Ну, калі заява будзе, чуеш бо? — папытаўся дзядзька Мірон, злазячы з веласіпеда і ставячы яго ля плота.

— То мо ў хату заглянеш на хвіліну? Бачыш, Валодзя з поўным цябе сустракае.

— Дзякую, насядзеўся, цяперычка ў канторы... Я набраў вады, але вядро паставіў ля калодзежа, а сам падаўся да плота, каб было чуваць.

— Ведаеш, Міроне,— хвалявалася маці,— заяву падаць лёгка, але куды вочы падзець: гаспадарка мая, сам знаеш, хоць шаром пакаці.

— Вось і добра, што так думаеш,— сказаў Мірон, шырокаю далоняю накрываючы званок веласіпеда.— Слухай, што я табе скажу...

— Што, Міроне?

— Клуня нам твая спатрэбілася, бракуе матэрыялу. Мужчын мала, няма каму лес валіць.

— Кажаш, клуня? — маці на імгненне апусціла вочы.

— Клуня, кажу. На якое ліха цяперычка яна табе, вунь, страха ўся як рэшата свіціцца,— ён галавою кіўнуў на клуню.— А нам яна — знаходка: мужык твой глядзеў далёка, вялікую збудаваў.

— Мне-то яна не патрэбна, але ж дзеці?..

— А што дзеці, яны ж прыладкаваны ў горадзе, чуеш бо? Думаеш, твой Віця павязе яе ў армію? — Мірон усміхнуўся.— Дроў там хапае. А калі трэба, то і вугалёк знойдзецца.

— Табе жарты, а мне ўсядно сказаць дзецям трэба.

— Ну, скажы, скажы, толькі не доўга цягні, добра?

— Добра, Міроне, добра.

— Сёння ж няхай Валодзька напіша,— крыкнуў Мірон, ужо асядлаўшы веласіпед.

Усё атрымалася выдатна. Ні Віця, ні Маня не пярэчылі, каб маці аддала клуню калгасу. А на другі ж дзень пасля нашае заявы, якую напісаў я, а занесла ў кантору маці, да нас наехалі падводамі цэлы панадворак рабочых, каб перавезці клуню. Дружна, як мурашы, узяліся за работу. Пакуль я прыйшоў са школы, на месцы будыніны ляжалі толькі дзве горкі — дошкі з кроквамі ды салома.

— Гэта на дровы пакінулі,— сказала маці.

Я стаў паміж горкай дошак і кучай саломы. Неяк нечакана ўбачыў на зямлі разбуранае ластаўчына гняздо, і сэрца маё напоўнілася журбою: колькі ж пад страхой, пад латамі і кроквамі, было ластаўчыных і вераб'іных гнёздаў! Я прайшоў на ток, прыгадаў, як маці тут малаціла цэпам жыта (пачынала здавацца, што гэта было толькі ўчора) і як яна ўвогуле цяжка працавала... Туга па разбураных птушыных гнёздах паціху адступала.

— Ну, што ты звесіў галаву? — парушыла мае думкі маці.— Шкадуеш клуні? Не шкадуй, усядно згніла б. Ідзі еш, павучы ўрокі, а пасля мы з табою папілуем дошкі.

І тут да мяне прыйшло азарэнне: мы сталі калгаснікамі!..

Пасля нас нядоўга ўпіраліся Саламоніха і Адэсіха. Адно Ветрыха засталася зацятаю аднаасобніцай.

— Мне з таго халгасу толку — што з казла малака,— даводзіла яна.— Каровы няма, то і сотак не трэба. Колькі нам з Валькаю трэба тых картопляў, пад плотам раслі і будуць расці.

Ветрышына ўпартасць, аднак, не замінала яе Вальцы разам з Саламонішыным Юзікам бегчы свежай баразною за трактарам — як утрымаешся супраць такой спакусы! Пра нас, Лёню, Андрэя, Толіка і мяне, гаворка іншая — мы ўтрымліваліся. Не таму, што лічылі сябе дарослымі,— была ў нас куды большая спакуса: ужо ўпадабалі працу на калгасным полі. Разам з дзядзькамі і цёткамі кожны ранак ішлі на нарад. Атрымаўшы ад брыгадзіра заданне, імчаліся на выган, дзе пасвіліся коні. Коні ў калгасе былі ўсякія. Нам падабаліся вялікія, дужыя. З такімі коньмі можна горы варочаць. Але нам не трэба было варочаць горы — хацелася баранаваць поле, бо налаўчыліся кіраваць коньмі, седзячы на іх верхам, калі, вядома, ніхто не бачыць. Накатаемся за дзень колькі ўлезе. А пасля ў сажалку — бултых...

Аднаго разу трапіўся мне трохі натурлівы конь, скінуў мяне. Некалькі дзён балела плячо, але мацеры не скардзіўся, гэта адразу абгаварылі ўсім кагалам.

— Толькі скажы,— павучаў Лёня, на твары ў якога ярка ўспыхнулі вяснушкі,— то заўтра ўбачыш каня, як свае вушы.

— Чаму ж, у люстры ўбачу,— стараўся я смяяцца, хаця смех той прабіваўся скрозь слёзы.

— Плячо пабаліць і перастане, ёлкі-палкі,— прыжмурваўся, як заўсёды, на адно вока Толік.

— Затое зноў пойдзем на нарад і зноў брыгадзір дасць каня,— не маўчаў і Андрэй.

І я трываў, часам сціскаючы ад болю зубы. А калі пад вечар прылёг на канапу, маці заўважыла:

— Штось ты прыхірэў...

— Спаць захацелася,— не прызнаўся я.

Плячо маё, і праўда, як казаў Толік, пабалела і перастала. Толькі тады я расказаў пра ўсё маме. Пачаў, вядома, здаля:

— А ведаеце, мама, у калгасе ёсць такі натурлівы конь...

Маці выслухала мяне спакойна. Адно калі скончыў расказваць, пераняла дыханне.

— А калі б што ліхое? — сказала яна, памаўчала, пасля ўсміхнулася адным і вачыма: — Гіцаль ты, гіцаль!..

## ГОРКАЕ РАСЧАРАВАННЕ

Як толькі падсохла пасля веснавога разводдзя дарога, пачаў да нас наведвацца бацька. Аднаго разу заспеў яго дождж. З дробнае, як пылота, імжы дождж вырас буйны і порсткі. І па густых на небе хмарах, і па бурбалках на паверхні лужын, і па тым, што куры не хаваліся ў падстрэшша, а блукалі, мокрыя, па двары,— па ўсім было відаць: задажджыла не па-летняму. Змрок хутка гусцеў, і сінія шыбіны акон, што слязіліся халоднымі дажджавымі кроплямі, пачыналі чарнець. «Трэба зачыніць аканіцы»,— падумаў я ды выйшаў на ганак. На двары ўсё шумела — і дрэвы, і дождж, і плынь вады, што ўтваралася ў нізінцы паміж плотам і хатаю і вырывалася за вароты.

У тым руху стыхіі, у велічным яе пошуме было

штосьці таямнічае і страшнаватае. Прытуліўшыся да сцяны, я пастаяў і паслухаў.

Калі вярнуўся, то пачуў абрывак нейкае гаворкі.

— Дурная, клуню магла не аддаваць...— данеслася з другой палавіны хаты бацькава бурчанне.

Маці маўчала. Змоўк і бацька.

Я зазірнуў да яго. Ён ужо распранаўся — збіраўся адпачываць. Неахайна паклаўшы на лаву адзенне, улёгся на маім ложку. Неўзабаве і захроп.

Ні маці, ні я спаць яшчэ не лажыліся. Пакуль мама завіхалася каля печы, пераглядала і — дзе трэба — пераварочвала на саломцы зморшчаныя шапачкі і карэньчыкі грыбоў, тых, што ранкам ажно гарэлі ў маім кошыку, я ўзяў у рукі «Маладую гвардыю» Аляксандра Фадзеева — Манін падарунак — і чытаў вачыма: «Мама, мама! Я помню рукі твае з таго імгнення, як пачаў заўважаць самога сябе на свеце. Летам іх заўсёды браў загар, ён ужо не сыходзіў і зімой, ён быў такі пяшчотны, роўны, толькі трошку цямнейшы на жылачках...»

— Будзе ўжо, будзе чытаць, лягай і ты,— непакоілася маці.— Вачэй сваіх пашкадуй.

— Ай, мама, гэтак цікава! — прасіўся я ды зноў вадзіў вачыма па радках: «А можа, яны былі і грубейшыя, рукі твае,— на іх жа столькі легла ў жыцці работы,— але яны заўжды здаваліся мне такімі пяшчотнымі, і я гэтак любіў цалаваць іх прама ў цёмныя жылачкі!..»

Алег Кашавой успамінаў сваю маці... Я адвёў вочы ад кнігі, падумаў пра тое, што і мая маці чымсьці па-

добная на Алегаву. Толькі мая — хворая. Мяне агарнула пачуццё хваляванні: «Чаму я ні разочку не пацалаваў маміны рукі! Чаму ніколі не ўбачыў іх пяшчотнымі?» Але маці не чула, пра што я думаў.

— Лягай, лягай, хопіць кешкацца, заўтра пачытаеш, пры сонцы,— казала яна.— У бога больш дзён, чым каўбас.

Я паклаў кнігу на падаконнік, прайшоў на другую палавіну хаты і пачаў распранацца, каб легчы каля бацькі. Ён працягваў храпці, заняўшы ледзь не ўвесь ложак, таму побач з ім лажыцца не хацелася, і я марудзіў. Прайшоўся па хаце, пастаяў, зноў паглядзеў на соннага бацьку, затым на лаўку, дзе цямнела ягонае адзенне. Знячэўку мой позірк слізгануў па падлозе і намацаў пад лаўкаю танюткую шэранькую кніжачку. Я крадком падышоў, падняў яе і прачытаў: «Ашчадная кніжка».

— Мама, а я штосьці знайшоў, во падзівіцеся.

— Як табе не сорамна лазіць дзе не след! Зараз жа пакладзі на месца!

— А яна пад лаўкаю была.

— Няхай сабе і пад лаўкаю. Не клаў — не бяры. Палажы, дзе была.

Перш чым пакласці поўную таямнічасці кніжачку, я адгарнуў яе. Там стаялі нейкія лічбы. Мне запомнілася апошняя ўнізе лістка: двойка з чатырма нулямі. «Дваццаць тысяч,— падумаў я.— Што тут да чаго?»

— Паглядзіце, мама, што за такая «Ашчадная кніжка» і што гэта за лічбы ў ёй? — пацікавіўся я.— Во, бачыце, дваццаць тысяч.

Маці паглядзела ўважліва-доўгім позіркам, але сказала:

— Нічога, сынку, пакладзі і спі.

Я лёг, хацеў заснуць, ды сон не даваўся мне.

— Мама, а чаму вы не хочаце сказаць мне?

— Ну, што ты прыліп як смала. Спі!

Я разумеў, што цяпер трэба маўчаць. Калі б маці сказала: «Многа будзеш ведаць — рана пастарэеш»,— тады б зусім іншая справа. А так — трэба маўчаць...

Пра тое, што азначае ашчадная кніжка, я дазнаўся ўжо назаўтра, калі паехаў бацька. А зрабіў ён гэта пасля сваркі. Да яе быў адзін крок пасля таго, як, памацаўшы сябе па кішэнях і ліхаманкава палазіўшы па іх, бацька не знайшоў там грашовага дакумента, а праз момант угледзеў яго пад лаваю...

— Мама, а чаму бацька нам не памагае? — дапытваўся я.

— Мо табе і паможа. Ты толькі маўчы, не ўмешвайся, калі ён пачне сварыцца,— суцяшала маці.

— А ведаеце, мама, пра што я зараз думаю? — працягваў я пасля хвіліны роздуму.— Дзе бацька ўзяў столькі грошай?.. Можа, украў?!

— Не, сынку, твой бацька не злодзей. За крадзеж садзяць у турму... Твой бацька — працавіты, а яшчэ і майстар, памятаеш, я табе казала?

— Гэта я памятаю. Але чаму ён не жыве дома?

— Бо няма для каго тут хаты ставіць. Забалоцце і Дзяніскавічы ў вайну не гарэлі, то ён ходзіць па суседнім раёне. Там яго за ўмелыя рукі і кормяць і гро-

шы даюць. Ці ведаеш ты, што можна купіць за дваццаць тысяч, якія ён назбіраў? Добрую хату!

— А карову?

— Цэлы статак кароў.

— Ого-о-о! Дык ён — багацей,— сказаў я,— але чаму ён не купіць нам карову, каб у нас было малако?

— Ён скупы, сынку, скнара,— уздыхнула маці.— Думала, перамяніўся, палепшаў. Папрасіла, каб хоць пазычыў. Дулю паказаў.

— А навошта яму столькі грошай?

— Хто яго ведае, можа, збіраецца два вякі жыць. А можа, залатою жонкай абзавёўся ды адкладае грошы на палац.

— Дык гэта праўда, што ён...— запнуўся я,— што ён сабакам сена косіць?

— Праўда, сынку, праўда. Як прыйшоў з вайны, так і пайшоў блудам... Не хацела я табе казаць, галубок мой, душу тваю раніць, думала ўсё, наладзіцца, а цяпер самой цяжка ўтойваць. Не надта патрэбныя мы яму сталі...

Я заплакаў.

— Не плач, сынку,— суцяшала маці мяне і сама ражком хусціны выцірала слёзы: — Нічога, неяк і самі адужаем гора. Вось адслужыць армію Віця, наберацеся сілы ты і Маня, а я падлячуся — больніца цяпер бясплатная, і мне будзе добра пры вас.

— Мамачка, вось выраслу вялікі і...

— Вырасцеш, сынку, вырасцеш. І шчаслівы будзеш. Не ты адзін расцеш без бацькі. Многія загінулі на вайне. Твой астаўся жывы і здаровы...

## РАНІЦА ВЫЙШЛА З ТУМАНУ

Пасля ўсяго, што пачуў ад мацеры пра бацьку, я ўпершыню стаў адчуваць да яго не абыякавасць, не адчужанасць, а варожасць. Я папракаў сам сябе за тое, што прасіў у яго веласіпед. Цяпер нават шахматы не хацелася браць у рукі, таму што іх падарыў ён. Калі нам з Чушбавым Андрэем дужа хацелася памерацца сілаю за шахматнай дошкай, я казаў:

— Хадзем да цябе, твае шахматы навейшыя.

Маю былую радасць («у мяне таксама ёсць татка») і надзею («у нас усё можа пайсці, як у людзей») ён, бацька, разбурыў нечакана, адным прыездам. Расчараванне яшчэ гарчэла таму, што якраз пачаўся галодны для нас — без малака і амаль без хлеба — год. Аглухла была мая муза, прапаў да ўсяго — нават да калгасных коней — інтарэс. Але неўзабаве лёс як бы павярнуўся да нас сваёй літасцю: з арміі, з Масквы, на пабыўку прыехаў Віця. У вайсковай форме. Адна спражка на шырокім рэмені чаго вартая — вялізная, з зоркаю, ды яшчэ й бліскучая, нібы сонейка. А гімнасцёрка з жоўтымі гузікамі, а пагоны!.. На пагонах тры лычкі, тры вузкія беленькія пасачкі ўпоперак,— сяржант.

Толькі хутка Віця скінуў гімнасцёрку, сцягнуў майку, зняў цяжкія боты, прайшоўся, босы, па цёплым пясочку да балеі, што стаяла з вадою на траве непадалёк ад калодзежа.

— То ли дело!..— усклікнуў ён па-руску, выліваючы з балеі цёплую ад летняга сонца ваду, каб наліць

туды халоднае, а затым, ужо спрытна абмываючыся да пояса, гаварыў па-свойму, па-забалоцку:

— Файнецка вада! Ты любіш халодну ваду?

— Дзіва што. Хто яе не любіць...

— Ану, дай мне на спіну.

Маці, шчаслівая, ужо несла з хаты белы льняны ручнік, усміхалася да Віці:

— Прыехаў, мой саколік. Надоўга?

— Пабуду...— няпэўна адказаў Віця.

Пасля абеду маці прапанавала Віцю адпачыць з дарогі, але ён хутка знайшоў сабе работу — стаў матычыць бульбу ў двары і ў садочку, якая ўжо, хоць і позняя, зацвіла.

Пад вечар брат адзеў мяне ў сваю гімнасцёрку. Атрымалася смешна: яна мне даставала амаль да каленяў, плечы і рукавы звісалі, а рэменя мала не хапіла, каб двойчы абкруціць вакол пояса.

— Паглядзі, маці, чым не салдат,— усміхаўся Віця.— Зараз мы гэта дзела аформім, пачакай.

Ён пабег, узяў у рэчавым мяшку фотаапарат і доўга здымаў мяне, браў то ў профіль, то анфас, камандуючы пры гэтым: «Ану, вышэй нос! Вось так!» або «Весялей, весялей! Увага!.. Парадак».

Назаўтра мы з братам ужо працавалі ў калгасе. Ён касіў з сельскімі дзядзькамі, а я разам з такімі ж, як сам, падлеткамі зграбаў сухое сена ў валкі.

Зграбалі і куляліся ў свежым, духмяным сене, скакалі цераз валкі, бегалі басанож па казытлівай пакошы.

А паслязаўтра мы з Віцем вазілі з лесу дровы.

Там, у зялёным моху, знайшлі першыя сямейкі лісічак. Наступнага дня ішлі ў Хваінку ўжо з кошыкамі.

І скрозь Віця расказваў мне. Пра сваю службу, пра Маскву. І пра тое, як ля Маўзалея Уладзіміра Ільіча Леніна салдаты нясуць ганаровую варту, пра Барадзінскае поле і музеі сталіцы, пра метро і выстаўку.

А калі прыйшоў час збірацца ў дарогу, ён сказаў мне:

— Вось канчай школу і прыязджай у Маскву. На Ленінскіх гарах ёсць універсітэт, паступіш — вучоным будзеш.

Не ведаў брат, як закарцела мне паехаць разам з ім, каб хоць разочак глянуць на ўсе тыя дзівосы, не здагадаўся, а я сам не пасмеў прасіцца...

Развітвацца з Віцем не хацелася. Мы з мамай на світанні праводзілі яго да аўтобуса. Пакуль ішлі пакошаю і полем, стаяў туман, а ўжо ў сяле нам усміхнулася сонца.

Раніца выйшла з туману, абяцаючы ясны дзень.



Частка другая

## АД РОДНАЙ ХАТЫ...

Прайшло чатыры гады. Я скончыў школу. І так вырас, што касцюм, які мне купляў бацька пад час майго заканчэння сёмага класа, стаў караткаваты, асабліва ў рукавах. Тады я не толькі не прыняў касцюма, але нават і не прымераў яго. Не таму што бачыў: ён завялікі,— не прайшла мая крыўда. Напэўна, дашчэнту касцюм той зрашаціла б моль, калі б не выпускны вечар,— бацька пасля яшчэ адной сваркі больш не прыязджаў, і куфра на гарышчы ніхто не адмыкаў, над яго запыленым векам адно снавалі павукі.

Жылі мы тады ўсё яшчэ бедна. Без хлеба, праўда, не сядзелі, а пад Новы год у хаце заводзілася і скварка. Кепска толькі было без малака — каровы пасля Красёхі мы ўжо не мелі. Разлічваць на Віцеву або Манiну дапамогу цяпер не маглі. Віця пасля арміі асеў у Маскве. Там ён абзавёўся сям'ёю, з якой жыў на прыватнай кватэры. Маня выйшла замуж і, калі нарадзіла дачку, работу кінула — гадавала дзіця.

Ту́га ў нас было з капейкаю, таму з адзежы амаль нічога не куплялі. На ўсе выпадкі жыцця меў я саматканы касцюм. У той час шмат хто з нашых школьнікаў хадзіў ужо ў шарсцяным касцюме. Маці гэта ведала і таму перад маім вечарам сказала:

— Палезь на гарышча і дастань з куфра гарнітур.

— Ай, мама...— ніякавата перасмыкнуў я плячыма.

— Бацька ж табе яго прыдбаў.

Адамкнуць куфар не было чым, і прыйшлося сарваць замок.

У куфры спачывала ўсякая ўсячына: і лахманы, і цяслярскае начынне, і нават польскія, пажоўклыя ад часу, кніжкі. З адзежы там ляжалі дзве пары галіфэ, ватовыя штаны і памянёны касцюм.

Маці launch ператрэсла «скарб». На штанах сям-там угледзела дробныя, нібы ў рэшаце, дзірачкі.

— Дажыўся да пролежняў, бедны,— яна гаркава ўздыхнула і дадала: — Бачыш, моль пагаспадарыла, але ніц то, дамо рады.

А калі падабрала шэрыя ніткі і зацыравала, у вочы мне глянула неяк вінавата:

— Які ні ёсць, а куплёны.

— Адно што...— пагадзіўся я.

— Адгарну во рукавы,— працягвала яна,— падпрасуеш, то і ў Мінску фарсіць будзеш.

Мінск, пакуль я канчаў школу, зрабіўся маёй марою. Там — універсітэт, дзе ёсць факультэт журналістыкі...

Стаць журналістам закарцела даўно. У восьмым класе я ўжо цвёрда вырашыў, кім быць. Тады перастаў клапаціцца, каб лірыка ў мяне сябравала з фізікай, паэтычныя вобразы — з сухімі, як мне здавалася, формуламі і ўраўненнямі. Чым гэта скончылася? А тым, што па алгебры, фізіцы і хіміі да атэстата сталасці я ледзьве даехаў на троечках. Затое па літаратуры і гісторыі красаваліся пяцёркі. Вядома, справа не ў адзнаках, а ў любові і антыпатыі. Любоў мая да тых навук, якія абуджалі ўяўленне, зрабілася ўсеабдымнаю, як і антыпатыя да тых, якія патрабавалі логікі. Гэта не магло ўтоіцца ад старанных настаўнікаў, але перайначыць я ўжо нічога не мог.

Маці вельмі радавалася, што я пасля школы наважыўся падавацца вышэй.

— Вучыся, сынок, вучыся,— казала яна.— Невучоны чалавек цёмны.

Яна, непісьменная сялянка, якая ўсё жыццё ведала нястачу, на маю вучобу глядзела не толькі як на дарогу да надзейнага кавалка хлеба, а як на штосьці куды больш важнае. У нашых мясцінах многія ставіліся да навукі з павагаю, але маім равеснікам часцей за ўсё бацькі дыктавалі, кім быць. Ну, яшчэ То-

ліку Вольчынаму пашанцавала: яго жаданне супала з матчыным — пасля сямі класаў паступіў у вучылішча механізацыі. Скончыў, папрацаваў трактарыстам ды паехаў на цаліну. А Лёню, можна сказаць, сілком увапхнулі ў чыгуначны тэхнікум. Ён жа марыў толькі пра мараходку. «Яшчэ дзе ўтопіцца пад халеру»,— не магла змірыцца з сынавым выбарам Саламоніха, бо і Саламон адмоўна круціў рыжай галавою. Пасля Карэліі знайшоў нішто сабе работу ў горадзе, то і Лёню хутчэй захацеў уладкаваць побач, каб давучваўся пад яго наглядам. У Чушбавых было ціха. Андрэя спасцігла гора: хварэў на менінгіт, таму сядзеў два гады ў восьмым класе. Калі і палепшала яму, вучоба ўсё адно не давалася.

Сёй-той з бацькоў унушаў сваім дзецям, што найлепш быць доктарам або настаўнікам,— гэтыя прафесіі ў нас былі, бадай, у найвялікшай пашане. На шчасце, я ад мацеры не чуў нічога падобнага. Яна з восені яшчэ берагла грошы мне на дарогу і ніколі не скардзілася, што мы, дзеці яе, нібы птушкі, пакідаем роднае гняздо, што гэтак далёка Віця, што Маня, хоць, здавалася б, не так і далёка, а ўсё адно прыязджае рэдка і што вось ужо і я, найменшы, выпраўляюся ў першы свой шлях.

Шлях мой пачынаўся з чамадана. У Дзяніскавічах у лаўцы выбару не было,— стаялі чырвонага колеру, што мне не надта падабалася, але даволі зручныя і танныя чамаданы, а гэта здавальняла мяне.

Вечарам папрасаваў я касцюм, прышпіліў да яго камсамольскі значок. Сабраў дакументы. Потым на-

пакаваў чамадан падручнікамі, каб правяраць свае веды перад кожным уступным экзаменам, і газетамі, у якіх былі змешчаны мае вершы, заметкі. Наіўнасці маёй не было мяжы: я думаў, што пакажу там, у Мінску, газетныя публікацыі і што, безумоўна, іх прачытаюць шаноўныя экзаменатары і ацэняць як належыць...

Наступнага дня выйшаў я з хаты з нялёгкаю ношай — кнігі абрывалі мне рукі. Маці праводзіла за вароты. Я прыпыніўся, павярнуўся, не ставячы на зямлю чамадана.

— Шчасліва, сынку! Гэтак далёка едзеш. Глядзі ж, каб усё добра,— сказала мама, вочы яе заімгліліся тугою.— Хоць не галадай там.

Я не кінуў чамадана, не абняў і не пацалаваў яе, у нас не было звычкі да сантыментаў,— відаць, спрадвечная галеча атручвала пяшчоту і ласку, толькі ў глыбіні душы магло захавацца сапраўднае пачуццё. Я адно паківаў галавою і паабяцаў:

— Усё будзе добра.

— Зайдзі па дарозе да Мані,— сказала яна і амаль непрыкметна змахнула няпрошаную слязу.

Я пайшоў. Праз колькі крокаў азірнуўся: маці стаяла на тым самым месцы. Я развітальна памахаў рукою. Яна адказала мне і ўсё яшчэ стаяла каля ябліні, пакуль я не прайшоў лугавой сцежкаю праз крыніцу ажно да рова. Яна і да самага сяла правяла б мяне позіркам, толькі, напэўна, пашкадавала, што часта буду абарочвацца ды — чаго добрага — спазнюся на аўтобус. А я ўжо не мог не аглядвацца. Ду-

маў усхваляваны: «Гэта матчына пачуццё самотнасці перадаецца мне».

Быў сонечны дзень. Белы, з цынкавай бляхі дах нашае хаты ярка ззяў у зеляніне дрэў. Аднак і гэтае халоднае ззянне, і няроўная сцежка пад нагамі, і нават само сонца здаваліся мне журботнымі...

У горадзе сядзеў я нядоўга. З аўтастанцыі пад'ехаў маршрутным аўтобусам да чыгуначнага вакзала, а там якраз да адпраўлення цягніка паспеў купіць білет.

За вагонным акном мільгалі тэлеграфныя слупы, кустоўе і дрэвы, прабягалі пералескі і лясы, вёскі і хутары, воддаль велічна праплывалі жытнёвыя палі з камбайнамі дзе-нідзе, карычневымі, нібыта загарэлымі пад ліпеньскім сонцам, з вялізнымі сціртамі саломы, ды пяшчотна-зялёныя лугі з частымі чародкамі стажкоў. Прасторна было маім пачуццям і думкам. Так натуральна, як сонца асвятляе наваколле, мая надзея на блізкі поспех асвятляла мне дзень, якім я жыў, і дарогу ў новы дзень. І толькі зрэдку, нібы аблачынка на сонца, на маю надзею наплывала сумненне: ці паступлю? Аблачынка сыходзіла, далягляд летуценняў і думак яснеў, але на яго краечку ўзнікала смуга новых пытанняў: а што, калі паступлю? З чаго тады жыць? Пад сцвярджальны перастук імклівых паравозных колаў прыходзіў і адказ: абы толькі паступіў — працаваць буду ўсе канікулы. Дый стыпендыя...

У думкі раз-пораз вярталася маці. Як будзе дома яна адна?..

А ў сталіцы зусім нечакана атрымалася асечка. Ва універсітэце вісела аб'ява прыблізна такога зместу:

«У сувязі з тым, што ад воінаў Савецкай Арміі і асоб з рабочым стажам заяў паступіла больш чым чакалі — выпускнікі школ гэтага года не будуць прыняты незалежна ад вынікаў уступных экзаменаў». Унізе справа стаялі два словы: «Прыёмная камісія», напісаныя моцна нахіленымі, нібы яны стаміліся, літарамі.

Перад зрокам памяці чамусьці прамільгнуў далёкі, з самага дзяцінства, эпізод — маё падзенне ў ледзяную ваду з заінелае кладкі. Тады я выбраўся на сухое і першае імгненне не ведаў, што рабіць. Зараз, ужо дарослы, быў амаль такі ж разгублены. Доўга стаяў перад вялікімі — на ватманскай паперы — агністымі літарамі, з якіх, напэўна, можна было б скласці нашмат цяплейшыя словы. Яшчэ і яшчэ раз прабягаў позіркам па акуратных і такіх бязлітасных радках. Потым пайшоў да прыёмнай камісіі, і мне растлумачылі, што не ад іх гэта залежыць, што гэткі парадак увялі па ўсёй краіне.

«Горш за ўсё, што без усякай спробы»,— думаў я і пачынаў гарэць ад сораму за свой чамадан, за яго бессэнсоўны цяжар, нібыта ў ім ляжалі цагліны...

У агульным вагоне, людным і цесным, на трэцяй, самай верхняй, лаўцы не было чым прадыхнуць. Але я ляжаў нерухома і ўжо амаль не адчуваў духаты. Хацеў заснуць, аднак сон не браў. Крыўда і маральнае прыніжэнне, выкліканыя той нечаканай аб'явай, прымушалі думаць пра бязглуздую маю дарогу. Нейкі час душу працінаў боль, не столькі ад няздзейсненага,

колькі ад неспасцігнутага, непаспытанага, ды раптам заявілася і пругкая ўпартасць: «Папрацую, тады і паступлю». І зноў я наблізіўся да сваёй мары, якая ўжо не лунала ў небе, а рабілася датыкальнай, зямною.

Каб не глядзець на нізкую столь вагона — яна пры цьмяным святле (быў позні час, і пасажыры, хто як, адпачывалі) чамусьці нагадвала той схрон за клуняю, дзе мы хаваліся ў вайну,— я заплюшчыў вочы. Перада мною паўсталі універсітэцкія карпусы, высокія жылыя гмахі, прасторныя вуліцы, вакзал, дзе я, згаладнелы, зара́з улажыў шэсць порцый марожанага (і тым быў сыт), заззялі яркія электрычныя агні. Усё гэта прыцягвала ўладна і арганічна. Нават шорганне шынаў, лёскат цягнікоў і трамваяў, паравозныя і заводскія гудкі здаваліся прыемнымі. І цяпер, пад самаю столлю вагона, ужо недзе далёка ад сталіцы, я чуў той гарадскі шум, ён прабіваўся да майго слыху праз суцэльнае грукатанне энергічных колаў.

Я супакоіўся і гадзіны паўтары паспаў. Паспаў бы і даўжэй, калі б не такі пранізліва-зычны голас правадніцы, што порсткай хадою, нібы па асфальце, шыбавала па вагоне і галёкала, як завадная:

— Баранавічы! Станцыя Баранавічы!..

Калі цягнік спыніўся і некаторыя пасажыры выйшлі з вагона, сюды рушылі новыя, хутка, нібы вада, запаўняючы свабодныя на лаўках месцы, грукаючы і голасна, нібы ў лесе, гамонячы. Я наслухаўся гэтае валтузні і гаманы і болей ужо не спаў...

Да сястры пайшоў пешкі, хаця чамадан і адцягваў

рукі. Маня жыла непадалёк ад вакзала. У трохпакаёвай кватэры пяціпавярховага дома адзін пакой займала яна з мужам і дзіцем. І пакой і агульная кухня вокнамі выходзілі ў двор. Было яшчэ рана — ледзьве пачынала днець, і я сеў на лаве, ля высокае таполі. Мог узняцца па лесвіцы, знайсці патрэбныя мне дзверы, лёгенька ў іх пастукаць, і гэтага было б дастаткова, каб прачнулася Маня і адчыніла, але я саромеўся турбаваць людзей, няхай сабе і родных, у такую рань, таму сядзеў і глядзеў, ці не адчыніцца ў кухні акно або не ўспыхне святло ў тым акне. Зашчабяталі птушкі, лёгка зашумела пад свежым ветрам таполя, і пад бойкую птушыную гамонку і пошум лістоты добра драмалася.

Акно адчынілася нечакана, якраз тады, калі я, пачуўшы рэзкі і працяглы сігнал пажарнае машыны, што пралятала па вуліцы, падняўся з лаўкі.

На пляцоўку чацвёртага паверха ўзбег, нягледзячы на сваю ношу, ціха пастукаў у дзверы, не апранутыя ў дэрмацін і не ўзброеныя «вочкам». Неўзабаве двойчы ў замку шчоўкнуў ключ, і на парозе з'явілася Маня.

— Валодзечка, брацік! — нараспеў сказала яна, выхапіла з рук маіх чамадан, і мяне апаліла хваля сораму, што ўзнялася ад сэрца да твару: у цяжэннай маёй ношы няма ніякусенькае цацкі для малой Любачкі.

Сястра пацалавала мяне, падышла да дзвярэй, шчоўкнула ключом ужо адзін толькі раз, вярнулася, цёплай далоняю датыкнулася да маёй рукі. Было пры-

емна чуць падобоны да матчынага, з дрымотнымі ноткамі, голас сястры і адчуваць дотык яе далоні.

— Маладзец, што прыехаў,— сказала Маня, адчыніла дзверы ў пакой і ціха, паўшэптам дадала: — Любачка яшчэ спіць, Сярожа ў камандзіроўцы.

Я за ёю ўвайшоў у пакой, невялікі, але ўтульны. Праз лёгкія фіранкі даволі ўжо смела прабівалася ранішняе святло. Злева, ля сцяны, стаяў нікеляваны ложак, а ля яго — дзіцячы, дзе спала Маніна дачка. Я падышоў, нахіліўся над малою. Вольна распасцёртыя пухлыя ручаняты, круглы тварык, румяныя шчочкі... Сэрца напоўнілася замілаваннем.

Я адступіўся да канапы, акінуў позіркам сестрыно жытло. Насупраць, ля сцяны, стаяла старамодная шафа з люстрам, ля акна — стол, ад якога да самых дзвярэй даставала дывановая дарожка.

Сястра пасадзіла мяне на канапу і сама прысела поруч, але тут жа падхапілася і, ледзь дакрануўшыся далоняю да майго пляча, сказала:

— Калі пачне малая круціцца, ты, гэта самае, пагушкай, а я зараз...

Яна жвавенька выйшла.

Сядзець мне не хацелася. Падышоў да акна, адхінуў край фіранкі, паглядзеў на бліскучую ўнізе паласу асфальту. З прачыненае форткі ледзь прыкметна цягнула свежым паветрам, чуўся перарывісты, нясмелы шолах лісця ў таполевай кроне.

Пляменніца мяне не патурбавала, ціха спала. Тым часам зрабілася зусім светла — узышло сонца. Я падышоў да шафы, паглядзеў у люстра і толькі цяпер

заўважыў, што касцюм на мне добра такі пакамечаны. «Што, не салодка было ў вагоне пад бокам! — нібы да жывое істоты, звярнуўся я думкаю да яго.— А ўсё ж, мусіць, не горш, чым на гарышчы ў старым бацькавым куфры...» Неўзабаве прачыніліся дзверы, і Маня кіўнула мне.

На кухні так смачна пахла! На стале злёгку параваў чай, румянілася на патэльні падсмажаная каўбаса, ляжаў белы хлеб.

— Сядай, брацік,— запрасіла сястра снедаць.— Выбачай, гэта самае, за такое ядзэнне. Зараз во адчыніцца магазін, схаджу, тады буду варыць, а пакуль закінь за шчаку што ёсць.

Мне спадабалася і падбадзёрыла гэтае «закінь за шчаку» — такое мог пачуць хіба што ад мацеры,— і я налёг на яду, нібы кідаючы за плечы. Раптам схамянуўся, няёмка стала, што снедаю адзін. Паглядзеў на Маню:

— А што ж ты не ясі?

— Еш, еш, Валодзечка, на мяне не глядзі, я дома, а ты з дарогі.— Памаўчала і ўсміхнулася: — І маладзенькі зусім, яшчэ расцеш, табе трэба часцей есці.

Я апаражніў патэльню, узяў у рукі шклянку з чаем.

У кухню ўвайшла, перавальваючыся, як качка, з нагі на нагу, мажная, але малога росту кабета, Маніна суседка па кватэры, трымаючы ў руках савочак, напоўнены смеццем. Павіталася, высыпаючы смецце ў вядро. Пасля маўкліва прайшоў дзед, худы і ссутулены, у кальсонах і расхрыстанай ледзь не да пояса

сарочцы, кінуў у тое ж вядро недакурак, кашлянуў і пашлэпаў да свайго пакоя.

Маня нядоўга моўчкі радавалася, гледзячы, як прагна я сёрбаю чай.

— Гэта самае...— пачала яна,— адкуль ты едзеш так раненька? Хіба з дому?

Я расказаў сястры пра сваю дарогу.

— Дык што далей рабіцьмеш? — занепакоілася яна.

— Паступлю праз два гады, а зараз — у калгас.

— На халастыя працадні?

— Чаму ж, кажуць, што будуць плаціць. І хлебам і грашыма.

— Абяцанка — цацанка... Заставайся ў горадзе, га? Тут у нас, у трэсце, акурат набіраюць рабочых. Папрацуеш — прыадзенешся, яшчэ і мацеры паможаш.

— Як жа яна там адна?..

— А калі ехаў паступаць, думаў пра гэта?

— Чаму ж не. Аж галава пухла ад тых думак.

— Ну, і што прыдумаў?

— А што прыдумаеш!..

— Ты не надта хвалюйся,— Маня пасвятлела з твару.— Нам паабяцалі асобную кватэру — забяром маму да сябе.

Ці то ад гарачага чаю, ці то ад слоў сястры ў мяне адлягло на сэрцы. А Маня працягвала, усміхаючыся вачыма і ловячы мой позірк:

— Ну, што скажаш?

— Дай падумаць...

## «САЦЫЯЛЬНАЕ СТАНОВІШЧА — РАБОЧЫ»

Начальнік аддзела кадраў будаўнічага трэста, брытагаловы і дзябёлы Шурыга, быў чулы, спагадлівы чалавек. Ён прыняў мяне на работу без пашпарта. Сказаў толькі, што трэба будзе прывезці з дому метрыку, узяць даведку з месца работы, і ў міліцыі пашпарт выдадуць. Я прамаўчаў, не прызнаўся, што ў мяне і метрыкі няма, бо не без падстаў баяўся: могуць не прыняць, а хацелася хутчэй уладкавацца. Вырашыў, дакументамі займуся крыху пазней — калі атрымаю першую зарплату, каб заадно што-небудзь купіць і завезці мацеры. Ведаў (пра гэта ўжо заходзіла дома гаворка): каб выклапатаць метрыку, прыйдзецца ўзяць для натарыуса распіску ад трох чалавек, што я, Уладзімір Ражэвіч, нарадзіўся ў адна тысяча... Год ні ў кога, відаць, не выкліча сумнення. Але ці зможа хто прыгадаць чысло, дзень, калі нават родная маці не памятае. Дапытваўся калісьці, дык яна казала толькі, што тады якраз капалі бульбу. Рабілася балюча і крыўдна за такую прыблізнасць. «Выходзіць, дзень майго нараджэння нічагуткі не значыць»,— думаў я, падлетак. Цяпер жа з усмешкаю ўспамінаў тую амаль дзіцячую крыўду. Э, клопат вялікі, ці не ўсё адно, якога дня нарадзіўся. Я сам выберу чысло, і яно ўсё жыццё будзе стаяць у пашпарце. Ну, напрыклад, семнаццатага верасня. І зусім падобна на праўду: у сярэдзіне верасня сáма капаюць бульбу... Адным словам, як скажу, так і напішуць...

Халасцяцкі корпус рабочага інтэрната стаяў аку-

рат ля скрыжавання Паркавай і Новакаштанавай вуліц. Камендант Астравухаў, малы і хударлявы, з вострым, але добрым позіркам чалавек, пасяліў мяне на другім паверсе, сказаў, што мне пашанцавала: у гэтым пакоі буду я ўсяго трэці жылец, тут спакойна і ўтульна. А яшчэ і свежага паветра — «хоць сто порцый», варта толькі адчыніць дзверы на балкон.

Пакой спадабаўся мне. І з ложкам сваім жалезным я звыкся адразу — панцырная сетка прагіналася, нібыта гумовая, спружыніла, было на гэтым ложку куды мякчэй, чым на старым драўляным дома, дый месца, якое ён займаў, найбліжэй да балкона, прыйшлося мне даспадобы.

Як толькі акінуў я позіркам суседнія сяк-так засланыя ложкі (адзін з іх стаяў у лінейку з маім, даходзячы ледзь не да самых дзвярэй, а другі — насупраць, ля процілеглае сцяны), то міжвольна падумаў пра тое, хто іх гаспадары, якія яны. Хацелася, каб былі маладыя і прылюдныя...

Старажылы пакоя, пераспелыя халасцякі — Фама з крыху незвычайным прозвішчам Стараселец і Рыгор Верхавец,— сустрэлі мяне, навічка, як падалося мне, з радасцю, прынамсі, неабыякава.

— О, у нас папаўненне! Прывецік! — выпаліў Стараселец.

Ён шырока ўсміхнуўся, яго роўныя зубы бялютка заззялі.

— Салют! — эфектна, нібы артыст, падняў руку ўгору Верхавец, з-пад шапкі якога выбіваліся залацістыя, як салома, хмеліста-кучаравыя валасы.

Я падышоў да іх. Павіталіся за руку, пазнаёміліся. Мыліся і пераапраналіся хлопцы хутка...

Ранкам уставаць не хацелася. Але горад патрабаваў дысцыпліны.

На супрацьлеглым ад інтэрната баку брукаванае дарогі, што злучала ўскраіну горада з цэнтрам, пачынаўся завод жалезабетонных вырабаў, дзе лёс наканаваў мне працоўную, як сказалі б журналісты, вахту. Ён займаў немалую плошчу, быў абнесены высокаю дашчанаю сцяной, якая надавала яго тэрыторыі акрэсленую круглую форму. Паўднёвым полюсам завода была кантора — аднапавярховы белы будынак, паўночным — растворны вузел, дзе пачынала свой рабочы дзень наша брыгада бетоншчыкаў. Ад цэнтральных варот і прахадной будкі туды вяла пасыпаная гравіем дарога. Злева ад яе размяшчаліся доўгі і пляскаты арматурны цэх і цэментавы склад, справа — спецыяльная пляцоўка, куды падавалі раствор і дзе рабочыя ўкладвалі яго ў апалубкі; побач з гэтаю пляцоўкай цягнуліся прапарачныя камеры, куды апускалі на цэлую ноч пліты і перамычкі, балкі і каркасы — усё, што за дзень стваралася людскімі рукамі з дапамогаю рыдлёвак, вібратараў, кельмаў. Уздоўж даволі прымітыўнае гаспадаркі праходзілі бліскучыя, як струны, рэйкі, па якіх рухаўся пад'ёмны кран.

Дашчаная сцяна аддзяляла завод, з аднаго боку, ад нафтавай базы, а з другога — ад жылых дамоў мікрараёна. Зрэшты, з мікрараёнам, а дакладней — з яго

магазінам падтрымлівалася самая непасрэдная сувязь — праз дзірку ў сцяне.

Адразу за растворным вузлом праходзіла чыгунка...

Брыгадаю бетоншчыкаў кіраваў Дранчук, з выгляду прыгажун, а на справе грубіян і хам. Ён меў звычку пакрыкваць на рабочых, у тым ліку і на жанчын, сюд-туд перасыпаючы сваю мову паскуднымі словамі. Асабліва быў вынаходлівы пасля чаркі, якую браў звычайна з майстрам, валюхаватым і чырвоным, нібы звараны рак. Лічыў ён сябе вельмі разумным і гаспадарлівым.

Мяне разам з Сашкам Баркоўскім і Славікам Вераб'ём брыгадзір пасылаў грузіць шчэбень, падвозіць тачкаю бетон туды, дзе не даставаў пад'ёмны кран, і найчасцей — пералапачваць цэмент. Як і мае таварышы, грузчык быў я зухаваты. Між тым перавальваць цэмент з вагона ў склад энтузіязм памагаў мала, асабліва першыя разы, пакуль бракавала звычкі. У брызентавай спяцоўцы было душна, а цяжкі пыл прыліпаў да шыі, забіваўся ў валасы, у вушы, нос, забіваў дых. Даводзілася зрэдку рабіць перакур. А тады, як віхор, налятаў Дранчук. Яшчэ здаля брудна лаяўся, спяшаўся, аж варушылася на галаве па-цыганску чорная і кучаравая чупрына.

— Сімулянты! — вызвераўся ён.

— Мы ж дзеткі-мавbooветкі,— спрабаваў парыраваць лаянку самы смелы з нас, весялун Слаўка Верабей.

А гэта яшчэ больш злавала брыгадзіра.

— «Мававеткі»! — дэманстратыўна перакрыўляў, перадражніваў ён Славу (той не мог вымавіць літары «л»).— Нябось, над міскаї забываеш...

Але і тут наш таварыш не лез па слова ў кішэню.

— Міска не міска, абы стаява бвізка,— на той жа вясёлай ноце сыпаў ён словы, у якіх не-не дый тырчала гэтая праклятая непадатлівая літара...

— Ты ў мяне даквакаешся,— на ўсё горла пагражаў Дранчук, пераможаны Славікам.

Ён злаваўся, а нам рабілася смешна.

Яшчэ брыгадзір не мог змірыцца з тым, што ўсіх, каму не споўнілася васемнаццаці гадоў, трэба адпускаць дадому на дзве гадзіны раней, называў лайдакамі.

У інтэрнаце кожны раз шмат часу траціў я, каб дамыцца. Калі гэта не ўдавалася там, то ішоў у лазню, але і яна, гарадская лазня, была бяссільная за адзін раз адмыць цэмент.

Фама і Рыгор працавалі ў арматурным цэху. Былі яны ўжо кваліфікаваныя рабочыя, асабліва Фама. Я не раз назіраў за ягонымі рукамі, калі ён вязаў арматуру. Рукі лёгка арудавалі інструментам, нават калі яго гаспадар глядзеў убок. А яшчэ Фама Стараселец быў спраўны электразваршчык.

Мяне ён называў студэнтам. І пытаўся звычайна: «Ну, як справы, студзент?» Шчыра вучыў:

— Ты не бойся Дранчука. Ён табе слова, а ты яму — два. Бяры за жабры, патрабуй, каб ставіў на вырабы. Дадуць разрад, то будзеш кум каралю, а інакшай прынясеш не грошы ў кішэні, а слёзы.

Усю праўду Фомкавых слоў я адчуў у дзень зарплаты. Толькі змог купіць мацеры прыгожую кашміроўку. Астатнія ж грошыкі пабеглі на ўсякую драбнатэчу і кнігі. Колькі загадваў сабе нават не заходзіць у кнігарню, ды спакуса была ўсё ж занадта вялікая. Купляў кнігі і заносіў да сястры. Маня заўсёды запрашала палуднаваць, што было так дарэчы, хоць і адчуваў сябе пакутліва-няёмка.

Бацька не аказваўся. І я не шукаў яго. Сам з сябе дзівіўся, які стаў абыякавы да таго, ёсць гэты чалавек на свеце ці няма яго.

У хуткім часе маё фінансавае становішча палепшылася, бо стаў хадзіць вечарамі на таварную станцыю, дзе за разгрузку вагонаў плацілі адразу ж на другі дзень. Прыдбаўшы сёе-тое на плечы, я дазволіў сабе ўзяць за свой кошт тыдзень адпачынку. Нішто сабе — дазволіў, калі патрабавалася гарадская прапіска, а для прапіскі — пашпарт, а для пашпарта — метрыка.

І я пагнаўся за трыма зайцамі: праведаць маці, дакапаць дома бульбу і зрабіць метрыку.

Маці да слёз узрадавалася сустрэчы. А калі я разгарнуў кашміроўку, сказала:

— Ах, сынок, нашто траціўся? Лепей купіў бы што сабе.

Гэтак жа, успомніў я, гаварыла яна і Віктару. Але калі накінула хустку на галаву і аберуч прыціснула канцамі да шыі, то пайшла на другую палавіну хаты, дзе на сцяне вісела ў рамцы люстра, зазірнула ў яго і дадала:



— То ўжо й пахаваеце ў ёй, мае дзеткі.

— Ну, што вы, мама,— сказаў я,— мы вас у горад забяром, будзеце жыць, як пані.

Таго ж дня мы з ёю капалі на сотках бульбу, якую цягаў я мяшэчкамі да пограба. Маці ўсё не давала цяжка падымаць, а мяне ж падмывала пахваліцца сілаю: як-ніяк я рабочы.

Яна не скардзілася, і я не бачыў нават ценю папроку, што вось застаўся ў горадзе, хоць і не паступіў вучыцца. Толькі распытвала, як жыву, дзе і што ем. Сама за мяне адказвала:

— Часам хлеб з квасам, парою з вадою, так?

— Не, мама, не так, усё ў горадзе е.

— Усё е, але ўсё трэба купіць,— разважала яна.— А за кукіш не купіш.

— Працуем жа, зарабляем,— бадзёрым голасам адказваў я, каб не сумнявалася маці ў маім дабрабыце...

Назаўтра ж пад вечар я крочыў дадому з трыма распіскамі, каб ранкам паехаць да раённага натарыуса па метрыку. Хадзіў да Саламоніхі, Адэсіхі і да Віцевага хроснага. Да Чушбы хацеў, але не адважыўся, саромеўся яго, старшыні калгаса...

Натарыяльная кантора выдала мне метрыку. А праз тыдзень ужо ішоў я з пашпартнага стала гарадскога аддзялення міліцыі і бясконца, бы некалі газету з упершыню надрукаваным вершам, вымаў з кішэні і на хаду гартаў толькі што атрыманы пашпарт. Мяне зачароўвала гэтая кніжачка з гербам, з пячаткамі, нейкаю ўрачыстай свежасцю. Я чытаў скупыя

радкі сваёй біяграфіі і радаваўся: у мяне ёсць дзень нараджэння. І які дзень: семнаццатага верасня!..

А на другой старонцы зверху гэтак выразна значылася: сацыяльнае становішча — рабочы.

## МАЛАДЫЯ ГАДЫ...

Каторы дзень не псаваў мне настрою брыгадзір. Прыціх, як мыш пад мятлою, бо ў трэсце памянялася начальства, і майстра нашага скінулі. Спалохаўся Дранчук, што і да яго дойдзе чарга... Нездарма кажуць, што нахабныя паважаюць сілу.

Прыязджала нейкая строгая камісія, аглядала прадпрыемства, цікавілася гэтаксама, у якіх умовах працуюць непаўналетнія рабочыя. Назаўтра ж Слаўку Вераб'я і Сашу Баркоўскага перавялі ў арматурны цэх, а мне далі заданне на кваліфікацыю — рабіць бардзюркі. І я не адгінаў спіны. Пад канец дня завітала на пляцоўку нарміроўшчыца. Прыглядалася да маіх вырабаў, падлічвала.

Неўзабаве мне прысвоілі разрад бетоншчыка. Гэта акрыліла мяне. Цяпер я ўжо не шукаў дадатковай нагрузкі мускулам на таварнай станцыі.

Праца не стамляла. Уся мая істота кудысьці парывалася, чагосьці шукала. Я пачаў займацца лёгкай атлетыкай, з якой звязваў нямала спадзяванняў. Быў дужы, але не надта спрытны. Часта нязграбным рухам мог штосьці скінуць або перакуліць, часта саромеўся сваіх вялікіх доўгіх рук. Аднаго разу ў парыве ласкі падкінуў Маніну Любачку, ды знячэўку

нарабіў бяды: малая вытнулася галавою аб электрычную лямпачку, аж тая рассыпалася... Неяк вычытаў у Джэка Лондана, што такі, нязграбны, быў і Марцін Ідэн. З таго дня пастанавіў: буду змагацца з няўклюднасцю. Таму і прыйшоў у спорт.

А яшчэ вельмі любіў шахматы, ведаў усіх чэмпіёнаў свету, іх бліскучыя партыі, камбінацыі з практыкі Алёхіна і Капабланкі. На шахматы я глядзеў як на творчасць, як на мастацтва.

Фаме і Рыгору не падабалася ўсё гэта.

— Да дзевак трэба табе,— гаварылі жартам.— Давай завядзём, мо якую і палюбіш. Выбар багаты, вунь цэлы інтэрнат насупраць.— І расказвалі ўсялякія гісторыі пра жанчын.

Я слухаў іх моўчкі, ды і выгляду не падаваў, што слухаю, ні пра што не пытаў, нічым, здавалася, не цікавіўся...

— Што ты на гэта скажаш, студзент? — да адкрытае гаворкі выклікаў Фама.

— У мяне ёсць дзяўчына ў вёсцы,— адбіваўся я. У вачах у мяне паўставаў блізкі вобраз Гэчі Парафенюк. Чарнюткія, ажно з сінявым адлівам, косы, тонкія бровы. Вясёлая, спраўная і сціплая. А голас — звонкі і чысты. Як хораша спявала яна песні народныя! І смелая, у мяне дык сэрца ад хвалявання выскачыла б і голас прапаў бы, а яна — хоць бы што: пяе на сцэне перад поўнай залаю, толькі шчокі трошкі заружавеюцца.

Мы з Таняю займаліся ў розных класах: яна ў дзевятым, а я ў дзесятым. К таму часу я няблага гуляў

у шахматы, яна іграла на гітары, і мы ўзаемна дзяліліся ўмельствам.

Усё часцей заходзіў я па дарозе са школы да Тані. Яна расла без мацеры. Сёстры, Волька і Ніна, павыходзілі замуж. Бацька працаваў на калгаснай ферме. Таня сама ўпраўлялася з гаспадаркаю. Увішная, паспявала скрозь: гатавала абед, мыла падлогу, дабяла вышароўваючы дзеркачом шырокія маснічыны. Яе, гаспадыньку, упрыгожвалі гэтыя клопаты. Лёгкаю, у блакітныя гарошыны, хусцінаю падвязвала, каб не заміналі, валасы. Шчокі яе ўспыхвалі. Але не гэты агонь саграваў мяне — хапала палымянага позірку, якім Таня мімалётна адорвала.

Пакуль дзяўчына прыбірала ў хаце, я здымаў гітару, што вісела над яе ложкам на сцяне. Калі чыста браў акорды, мая сяброўка не шкадавала пахвалы і, робячы сваё, падпявала мне: «Ніч така місячна, зоряна, ясная...»

Аднаго разу Таня рыхтавала свой нумар на вечар мастацкай самадзейнасці.

— Паслухай, як у мяне атрымліваецца,— казала яна і пела:

Низко тучки проносилися
Темно-синею грядой.
Избы снегом запушилися,
Был морозец небольшой.

Таня расказвала песняю пра тое, што, здавалася, бачыла сама ў жыцці, і быццам усё тое, што яна бачыла, адбывалася зусім нядаўна. Усё ў ёй спявала:

і звонкі ручай голасу, і высокая хваля дзявочых грудзей, і бровы, і косы, і чароўныя вочы.

Вярнуўшыся ад Тані дадому, я браў на этажэрцы самы прыгожы, у чорным плюшавым пераплёце, «Альбом для стихов», які надарылася купіць у горадзе, і на яго блакітных старонках пісаў:

Я не магу табой не захапляцца,
Я пра цябе і думаю і мару.
Таму так часта, ледзь пачне змяркацца,
Хачу паслухаць я тваю гітару.

Да Тані цяпер хацелася мне ісці і ўдзень і ўвечары, па глыбокім снезе і па марозе, праз імглу і завею. І я ішоў, чаго толькі не выдумляючы маме, каб апраўдацца... ішоў, і вершы ў галаве складаліся самі:

Вечар. Снег. Вецер свішча ў дарозе.
Вырастаюць сумёты ў полі пустым.
Ды чаму сёння зноў я ў цябе на парозе?
О, няўжо майго сэрца не ведаеш ты!..

Неўзабаве падкраўся і смутак. Я падумаў, што дзень да дня, дзень да дня — і праляціць зіма, а за ёю вясна; пройдуць выпускныя экзамены, і хто ведае, куды павядуць нас дарогі. У мяне з'явілася неадступнае жаданне — напісаць так, каб у вершы засталося яе імя, і я прыдумаў чатырохрадкоўе:

Ты мая чараўніца, мая таямніца.
Ах, як будзе ў разлуцы душа бедаваць!
Не спаткаў бы цябе — ты працягвала б сніцца,
Я працягваў бы свой ідэал будаваць.

Першыя літары кожнага радка ўтваралі — зверху ўніз — яе імя. Колькі ж радасці прынёс мне гэты поспех! Я чытаў і перачытваў толькі што складзеныя радкі. Але хацелася, каб нехта дасведчаны пацвердзіў іх дасканаласць. «Цікава, што скажуць у рэдакцыі?» — падумаў я. Перапісаў, паклаў у канверт і даслаў у раённую газету. А там узялі ды надрукавалі. Яшчэ і загаловак паставілі не абы-які. Над вершам буйным шрыфтам набралі такое гарачае слова: «Кахай». Мая таямніца раскрылася ўраз: уся школа загудзела пра нас з Таняю, бо акраверш быў куды прасцейшы за рэбус.

І як назло, толькі цяпер, нібы мяне падмянілі, нібы знялі з мяне чары, я пачаў заўважаць, што Таня не ўдалася ростам, поруч са мной выглядае зусім малою. Да таго ж у яе кароткая, як у Мар'і Балконскай, верхняя губа. Захапленне Таняю імгненна пачало чэзнуць. Мне стала шкада яе, але я падумаў, што лепш горкая праўда, чым салодкі падман, і знайшоў мужнасці ў сабе, каб сказаць ёй гэтую праўду...

Я прыгадваў цяпер Таню і думаў: «Як добра, што не скрывіў душою!» Не скрывіў, бо хацелася спаткаць лебядзінае — на ўсё жыццё адно — каханне, якое б азарыла дарогу і дало шчаслівае адчуванне: за яго ты гатовы на смерць.

Верыў, што такое каханне ёсць, яно толькі шукае вартых...

Неяк нечакана мяне прывабіла Марыська, якое доўгі час не прыкмячаў. Жыла яна ў трэцім — дзявочым — корпусе, дзе быў рабочы клуб.

Каб кінуцца ёй у вочы, я купіў белую шаўковую кашулю і модны гальштук. Касцюм вісеў у шафе адпрасаваны як мае быць. Гарэла мая душа — не мог прычакаць свята, уяўляў, як на танцах, перамагаючы хваляванне, падыду да Марысі і — запрашу. А яна хораша ўсміхнецца, даверліва пакладзе мне на плячо сваю далонь, і нас падхопяць імклівыя крылы музыкі. І на ўвесь белы свет будзем толькі мы і музыка. Шчаслівы, я не стамлюся заўважаць, як усё пасуе Марысі, як не лішнія нават шчодра рассыпаныя па ўсім твары вяснушкі.

Але, каб адолець хваляванне і запрасіць дзяўчыну на танец, трэба смеласць. Не мужнасць, не, яе, пэўна, хапала,— бракавала звычайнае смеласці. А тут якраз, калі надышоў перадсвяточны вечар і людзі валам павалілі на канцэрт, Фама адзначаў свой дзень нараджэння. Ні ён, ні Рыгор у клуб не спяшаліся. Мне ж не цярпелася сустрэцца з Марысяю. Але адразу пакінуць мужчынскую кампанію было няёмка.

Тым часам у клубе скончыўся канцэрт і пачаліся танцы. У зале не было дзе яблыку ўпасці. Пары пад музыку злёгку пераастаўлялі ногі, ціха пакалыхвалася людское мора. У тым моры мой позірк хутка знайшоў Марыську побач з нейкім чарнявым хлопцам. Яе залатыя хвалістыя валасы, што спадалі на плечы, прыгожы профіль, блакітная суконка — усё чаравала і прыцягвала, і я адчуў сябе цвярозым і скаваным. Пастаяў крыху, пазайздросціў незнаёмаму хлопцу, у чыёй далоні ляжала яе рука, праціснуўся да выхада і паваліўся ў свой інтэрнацкі пакой.

— Ну, дзе ты бегаеш? — паклікаў мяне Фама, ён з хлопцамі ўсё яшчэ шчыраваў за святочным сталом.— Сядай, пагаворым пра жыццё...

Калі я другі раз пацялёпкаўся ў клуб, ён быў ужо зачынены — танцы даўно скончыліся. А ў галаве ў мяне цвіком засеў намер сустрэцца з Марысяю. І я пацёгся пад яе акно — пастукаць у шыбіну. Прыйшла блазенская задума — зламаць ад дрэва галіну (побач стаялі ліпы), прасунуць у фортку руку і адчыніць акно. Відаць, мне не прыходзіла тады ў галаву, што тут не акно вясковае хаціны і не зашчапка, якую часам можна адкінуць чарацінкаю. Падышоў да ліпы, адламаў галіну, зрабіў з яе пруток, затым узлез на падмурак і, нібы кот лапу, запусціў у фортку руку. З падаконніка на стол перакуліўся графін. У пакоі перапалохана прахапіліся дзяўчаты.

Прамень ліхтарыка, слізгануўшы па маіх вачах, прымусіў мяне аглянуцца. Перада мной як з-пад зямлі выраслі дзве постаці. «Міліцыя»,— беспамылкова вызначыў я. Саскочыўшы, кінуўся ўцякаць...

А назаўтра мяне ў інтэрнаце сустрэў участковы міліцыянер, ён спытаў з мяккаю ўсмешкай на твары:

— Ну, што, хлопец, пазнаеш мяне?

Я ўцяміў, чыё добрае сэрца зразумела і пашкадавала дурня...

— Дзякую вам...— прамармытаў я.— Так атрымалася...

— Глядзі, хлопец,— строга сказаў участковы,— больш не пападайся.

Я згараў ад сораму, аж хацелася вочы пазычыць.

Імгненна ўявілася такое: ідзе сход, абмяркоўваюць мае паводзіны, і слова просіць Марыся... Якое ж недаравальнае глупства ўчоўп я ў той вечар! Канечне, я папрашу ў Марысі прабачэння. А як толькі пачнуцца ў клубе танцы, самы першы падыду да яе і запрашу танцаваць. І буду п'янець ад гукаў музыкі, ад чароўнае ўсмешкі задумлівых вачэй.

## ТРАЎМА

Аднойчы на пачатку зімы падышоў да мяне брыгадзір.

— Семянюк, такелажнік, ідзе ў адпачынак,— сказаў ён.— Падменіш?

Падабалася мне гэтая справа — хадзіць за кранам, падчэплівацъ грузы, голасам і рукамі даваць каманду кранаўшчыку: «Майна!», «Віра!», адчуваць сябе дырыжорам на ўчастку, таму і пагадзіўся на падмену. Тым болей што выпадала працаваць з Семянюковым напарнікам — Сярожам па прозвішчы Кузьміч, якога ў брыгадзе, аднак, найчасцей называлі аргенцінцам (яго бацькі пры Польшчы ездзілі па шчасце ў экзатычную Аргенціну, дзе ён, Сяргей, і нарадзіўся),— з ім заўсёды было цікава пагаманіць.

Зіма ўсталёўвалася. Не надта халодная, але снежная, што ў нашых умовах усё адно прыдавала клопату: звычайна, перш чым атрымаць заданне на цэлы дзень, даводзілася пачынаць з ранішняе «зарадкі» — размятаць снег каля растворнага вузла і склада, каля прапарачных камер.

— От жа надзьмухала, каб на яе зламанне,— бурчаў стары гарбаты Маркевіч, праклінаючы завею, бо нават праз вузкія шчыліны будынка растворнага вузла пранікала яна ўсярэдзіну і цэлымі фігурнымі сумётамі разлягалася каля бетонамяшалкі.

— Брыгада ух, адзін за двух,— жартаваў дзядзька па прозвішчы Барадзей.

— Хіба гэта работа — мокрае гарыць. Зноў паўдня сабаку пад хвост паляціць,— злавалася прагная да працы, мо таму і худая, як дошка, Ганна Булацкая.— Гэтак і заробіш дулю з макам.

Яе сёй-той падтрымліваў.

Але знаходзіліся і весялейшыя.

— А што ўжо ты з грашыскаў тых рабіцьмеш? — кпіла Моця Феранец.— Хіба што хату будзеш аклейваць.

— Дурная ты, прывыкла век на марозе,— не адступала Ганна.— Маглі б як людзі ўжо... Ды, папытай у Дранчука, завод замарозілі. І зноў, як жукі, калупаемся...

Новы, па апошнім слове тэхнікі завод, які будавалі за горадам, вярсты за тры ад нашага, маральна састарэлага прадпрыемства, сапраўды, меліся здаць да зімы. Тады ўжо ўся наша брыгада працавала б пад надзейным дахам. Але новабудоўля зацягнулася, і мы засталіся пад адкрытым небам.

А я дык знаходзіў нейкую апантаную радасць у гэтых цяжкасцях, у гэтай прымітыўнай, хоць і гарадской, гаспадарцы, якая тулілася пад адкрытым небам, пад вятрамі і завеямі. Падабаўся мне і такі пачатак

працоўнага дня — з размінкаю, з чыімсьці бурчаннем і чыімсьці добрым жартам. Я з задавальненнем счышчаў свежы пухнаты снег, пакідаючы на ім сляды кірзавых ботаў.

Падабалася і нічога не прадказвала мне адна з многіх блакітна-белых раніц, калі мы з аргенцінцам адкрывалі прапарачныя камеры. Велізарныя шчыты складвалі штабялямі. Пад нагамі было слізка, і я, кладучы новы шчыт, увесь час абапіраўся адной нагой на штабель. Здарылася так, што, калі мая нага апынулася ў прамежку паміж цяжэннымі шчытамі, якраз тады некалькі шчытоў з'ехала з петляў мне на нагу.

Я нават не крыкнуў, толькі адчайна пацягнуў нагу і лёг ад болю рукамі на штабель.

Падбег аргенцінец.

— Што? Што здарылася? — крыкнуў ён.

— Нага! — заходзіўся я ад болю.

— Майна! Майна! — крычаў напарнік.

Сталёвыя тросы былі ўжо дастаткова расслабленыя, таму кранаўшчык чакаў каманду: «Віра».

Падбеглі рабочыя і, разгубленыя, марна тужыліся з ломікамі ў руках ля такога цяжару.

— Майна! — адчайна крычаў аргенцінец, задраўшы ўгору галаву.

І толькі тут кранаўшчык уцяміў, што да чаго, і магутныя тросы з вялізнымі крукамі на канцах выратавальна апусціліся да зямлі.

Вызваленая нага ўвачавідкі распухла. Я хацеў зняць бот, але не змог. Ступня смылела, здавалася, пячэ агнём.

Пакуль усе мне спачувалі, Моця Феранец ужо дабягала да канторы — там быў тэлефон...

«Хуткая дапамога», сапраўды, хутка завезла мяне ў больніцу. Рэнтген паказаў: трэшчына ў касці.

У траўматалагічным аддзяленні боль не даваў заснуць. Забінтаваная нага пацяжэла, як калода, здавалася чужою. З гаркотаю думаў я, што не хацеў бы, каб прыходзілі да мяне знаёмыя, глядзелі спачувальнымі вачыма, пра ўсё распытвалі. А яны пачалі аказвацца.

Першымі, на маё здзіўленне, былі Стараселец і Верхавец. З'явіліся ў белых халатах, і адразу шчодра пасыпаліся жарты. У палаце павесялела ўвачавідкі.

— Галоўнае — не падай духам,— казаў Стараселец.— Пакуль жаніцца — усё загаіцца. Вяртайся хутчэй — дзеўкі па табе сохнуць, ад ветру ўжо валяцца...

Следам за Старасельцам і Верхаўцом прыйшла сястра з мужам і дачушкаю, прынесла ў каструльцы, абкручанай ручніком і газетамі, гарачанькіх дранікаў са смятанаю.

— Мама наказвалі, каб да каляд прыехалі, гэта самае, свінчо калоць,— гаварыла Маня.— Я па цябе заходжу ў інтэрнат, а хлопцы кажуць, гэта самае: «Ён у больніцы...» Іду дадому, а ногі падкошваюцца. «Што там з брацікам маім?» — усё думаю.

— Было перапалоху, дальбо,— уставіў свае слова швагер.— Ё-маё, думаю, хлопец толькі ўладкаваўся на работу, ужо і ў больніцу трапіў.

Яны распытвалі, што са мной здарылася. Я расказваў неахвотна, потым папрасіў:

— Паедзеце ў Забалоцце — маме пра мяне не кажыце... Чаму я разам з вамі не прыехаў?.. Ат, нешта прыдумаеце...

Праз некалькі дзён завітала Маня зноў, на гэты раз адна.

— Паклон табе ад мамы,— казала сястра, дастаючы з авоські перадачу.— Прывезла тут сёе-тое, еш, папраўляйся хутчэй. Мама душой балеюць па табе, дапытваліся, як ты, дык мы сказалі, што паехаў на спаборніцтвы. Яны паверылі, адно ўздыхнулі, што нешта даўно не паказваешся.

Навіны з завода прыносілі мне аргенцінец, Моця Феранец і Слава Верабей. Ад іх я даведаўся, што брыгадзір ужо да новага начальства падлізаўся.

— Таму і зноў выча задраў,— весела пра гэта гаварыў Слава.— Мне дык ён цяпер да вампачкі, у мяне свой бог...

«Ну, вось, хлопча, дарма ты баяўся людзей»,— я зноў як бы глядзеў на сябе збоку. Лежачы на нізкім бальнічным ложку, з цеплынёю думаў пра сястру і таварышаў, пра шчасце адчуваць людскую дабрыню і падтрымку.

Не так і доўга — каля месяца — праваляўся я ў траўматалогіі, аднак гэтага тэрміну хапіла для таго, каб Марысін зямляк, з якім яна разам вучылася ў школе і да якога была неабыякавая, вярнуўся з арміі і прапанаваў ёй руку... Марысю ў інтэрнаце я ўжо не застаў — пераехала да свякрухі.

Пасля бальніцы яшчэ доўгі час я накульгваў, пабольвала нага, таму лісток непрацаздольнасці хірург

не закрываў, вольнага часу было процьма, і маё зба-
лелае па дзяўчыне сэрца пачало шукаць занятку.

Першым гаючым глытком сталі кнігі. Я чытаў не ўсё, што траплялася ў рукі, але тое, што выклікала інтарэс, прачытваў, не прапускаючы ніводнага слова міма душы. Купленых кніжак, якія стаялі ў кватэры сястры, хапіла ненадоўга, бо многія з іх былі мне добра знаёмыя, і я запісаўся ў гарадскую бібліятэку. Яна размяшчалася ля скрыжавання цэнтральных вуліц — Савецкай і Маскоўскай. З Новакаштанавае аўтобус «пяцёрка» туды курсіраваў не часта, ды і не тырчаў я на прыпынку — карыстаўся, як у нас, у рабочых, прынята было называць, адзінаццатым нумарам. Хадзіць пяшком заўсёды любіў, а цяпер, у дадатак да сваёй звычкі, выконваў волю доктара, які ўнушаў, што аніякія лекі не заменяць мне зараз прагулак на свежым паветры і трэніровак для хворай нагі.

Лёс мяне ўзнагародзіў нечакана і шчодра: у гарадской бібліятэцы ў рукі трапіў томік прозы Івана Буніна. Чытаць пачаў яго днём, пакуль не вярнуліся з работы Фама і Рыгор, а працягваў ужо крадком ад іх. У Буніна я знайшоў тое, чаго не знаходзіў ні ў кога. Пра самае патаемнае, самае інтымнае — так адкрыта і так далікатна, глыбока і паэтычна!.. Часам меў я адчуванне, быццам гэты пісьменнік напісаў свае творы сёння, быццам падслухаў ён сэрцам мае думкі, хваляванні і пачуў Фомкавы і Рыгоравы расказы пра жанчын.

На скупой плошчы старонак убачыў я зусім побач шчасце і гора, жыццё і смерць, у шматгранным і, ча-

ста, драматычным сутыкненні — шчырае і падманлівае, святое і грэшнае, безабароннае і жорсткае. Шчымела ўся мая душа, калі перажываў я трагічны лёс герояў, з якімі толькі што пазнаёміўся і якіх палюбіў за іхнюю чысціню — не анёльскую, а чалавечую, тую, што ходзіць па зямлі, не лунае ў небе і застаецца часам на бруднай мяшчанскай глебе... Я мімаволі ставіў сябе на месца гэтых герояў. Гімназіст Міця, закаханы горача, глыбока, да самазабыцця... Я пачынаў ужо праклінаць сваю непаваротлівасць, сваё блазенства і ў чымсьці нават зайздросціў Міцю. Ён быў рашучы, а я?.. Марыська нават не ведае пра мае цяперашнія пакуты... Аднак ва мне абуджаўся іншы голас. «Эх, Ражэвіч, да чаго ты дакаціўся! — папракаў ён.— Гэта ж эгаізм. Ці падумаў ты, як там яна?» І пачынала ўжо Марыся ўяўляцца мне вялікаю пакутніцай, якая выйшла замуж, вядома, за пачвару і, вядома, не кахаючы... «Рана ці позна яна скажа пра гэта яму ў вочы,— я спальваў сябе трывогаю,— і загіне гэтак жа недарэчна, як бунінская Оля Мяшчэрская...» І ўжо як эпілог пасля жахлівага фіналу бачыўся мне надмагільны помнік з партрэтам Марыські...

Кнігі не дапамагалі забыць яе.

Як толькі перастаў я накульгваць, пайшоў на аўтавакзал і ўзяў білет да Дзяніскавіч. На гэты раз у маім чамаданчыку акрамя ласункаў, якія вёз мацеры, ляжаў у чорным футляры зусім яшчэ новы фотаапарат. Купіў — даўно збіраўся — і апошнімі перад гэтай дарогаю днямі асвоіў яго. Жаданне зрабіць матчын здымак у мяне з'явілася разам з жаданнем на-

быць фотаапарат: я добра ведаў, што ў мацеры не было ні адной за ўсё жыццё фотакарткі, калі не лічыць бляклае пашпартнае.

Быў высокі зорны вечар, калі ішоў я сялом. Пад нагамі рыпеў снег — трымаўся мароз. Як толькі выйшаў з Дзяніскавіч, сухі гарачы вецер пачаў апякаць мне твар.

Удалечыні на белым снезе цямнеў хутар. Цяпер хацелася мне, каб аканіцы не закрывалі акон і каб на гэтай палавіне хаты, што ажно двума вокнамі на сяло, гарэла газоўка, як і тады, калі, бывала, маці чакала мяне, а я затрымліваўся на школьным вечары або на занятках гуртка, у сяброў ці ў Тані Парафенюк. Тады святло, запаленае матулінымі рукамі, свяціла здаля мне маленькаю кропкай, нагадваючы зорку.

Радасцю і трывогаю адначасова стала для мяне гэтая зямная зорка, асабліва пасля таго, як маці праляжала два тыдні ў бальніцы. На гэты час прыязджала дадому Маня, яна акурат была ў дэкрэтным адпачынку. Тады я адчуваў сябе амаль спакойным за маці. А толькі сястра ад'ехала — спакою як і не было. Маці кашляла, часам аж да крыві. Аднаго разу пасля такога прыступу яна сказала суседцы Ветрысе,— тая, як звычайна, забегла да нас, каб пабавіць час: — «Божа мой, божа! І дзе тая смерць падзелася?..» Сказала ціха, сама да сябе, не думаючы, што я пачую. І як жа я пачаў тады баяцца, вяртаючыся часам вечарам з сяла, што невымоўна дарагі агеньчык у родным акне аднойчы не запаліцца...

Калі я ўваішоў цяпер у хату, маці прала кудзелю.

— Мой саколік! Прыехаў! Такога холаду...— захвалявалася яна, ідучы мне насустрач.

Свяціла газоўка, падчэпленая, як заўсёды, доўгім крывенькім дротам да бэлькі. Трохі грэла печ. На печы муркаў кот.

І таго вечара, і назаўтра маці старалася трымацца бадзёра. Радавалася, што я здаровы, жартавала са мною.

А дзень выдаўся непаўторны — як у пушкінскім вершы: мароз і сонца... І я сказаў:

— Хадземце, мама, здымак зраблю на памяць.

І мы выйшлі пад зіхатлівае зімовае сонца. Я ўпрасіў матулю, каб скінула куфайку і надзела на плечы маё паўпаліто, і яна была шчасліваю, усміхалася, што поруч са мною, сынам сваім, выглядае малою, што маё паўпаліто ёй зусім як паліто, і гэтай усмешцы не шкодзілі ні запалыя шчокі, ні бяззубы рот, ні твар, маршчыністы і жаўтаваты. Я стараўся не прамарудзіць, спяшаўся, бо толькі картачка магла захаваць гэта імгненне. Ці то ад сонца, ці то з радасці яе глыбокія вочы ззялі блакітам, і я пашкадаваў, што ў мяне ў фотаапараце не каляровая плёнка...

Гэтае шчымліва-светлае ўражанне ад сустрэчы з маці не пакідала мяне і ў дарозе і ў горадзе.

Боль, прычынёны Марысяю, прыціх.

## БЛУКАННІ, ВЫБАР МЭТЫ, ЭКЗАМЕНЫ

— Ну, як лапа? — выскаляўся брыгадзір Дранчук, калі я выйшаў на работу.— Цяпер будзеш ведаць, як сунуць куды не след.

За час лячэння я зусім адвык ад такіх павучанняў, мая да яго антыпатыя перайшла ў варожасць, таму я наважваўся звольніцца — уладкавацца ў горадзе было куды. «Калі брыгаду здавальняе Дранчук (маўчаць жа ўсе), то няхай сабе...— разважаў я.— З мяне досыць...» Я пачаў шукаць другое месца, дзе б можна было без нерваў зарабіць на хлеб.

Ва ўсіх астатніх адносінах жыццё маё цякло ў спакойным рэчышчы. Пра паступленне ва універсітэт пакуль не думаў, збіраўся яшчэ год аддаць будоўлі — усе казалі, што паступаць трэба з двухгадовым стажам.

Ішла вясна, і кнігі сталі здавацца нуднымі. Калі часам і браў якую ў рукі, тады не Фама, дык Рыгор пасмейваліся:

— Кінь мазгі сушыць, там бабы сохнуць па табе. Хадзем на вечар.

І я хадзіў. У клуб і ў дзявочы інтэрнат, у кінатэатры і парк. Вясна абудзіла ва мне пакутлівую любоў да музыкі. Калі часам у кіно або на эстрадзе чуў я голас гітары, шчымліва-радасна замірала сэрца. У той час у горадзе славіўся самадзейнасцю Дом культуры, які называлі — «Прамбочка». Я пачуў, што там ёсць струнны аркестр, мне дужа закарцела іграць, і я абзавёўся гітараю.

Струннага аркестра ў «Прамбочцы» не было, быў духавы. Але Наталля Орра, гаспадыня мастацкай самадзейнасці, дакляравала, што мне тут сумаваць не давядзецца. Яна якраз пачынала рэпетыцыю музычна-танцавальнай сюіты, дзе для адной ролі не хапала, выходзіць, мяне. Трэба было ў танцы прайсціся з дзяўчынаю па сцэне ўсяго адзін толькі круг. Дзяўчына не спадабалася мне, але адступаць не выпадала: праз тыдзень мы ўжо танцавалі ў абласным драматычным тэатры.

Гэта быў першы і апошні мой поспех на сцэне.

У тым жа клубе трэніраваў шахматыстаў майстар спорту Сайгін. Я школьнікам яшчэ ведаў, што ён — яркая зорка на шахматным небасхіле, і цяпер мяне запаланіла новая стыхія. Пад «крыло» да майстра Сайгіна ў «Прамбочку» збіраліся шахматысты адусюль. Тут я неўзабаве ўбачыў нават крыху знаёмых мне хлопцаў — Алега Блакітнага і Сяргея Уткова.

У Сайгіна была звычка пасля тэарэтычных заняткаў праводзіць бліц-турнір. На ўсю партыю партнёрам давалася па пяць мінут. Я не прывык да такой хуткасці і пацярпеў паражэнне ад Блакітнага. Пераможца чэмпіёнскім тонам сказаў:

— Слаба, навічок, слаба.

— А ты прыгадай, як прасіў у яго нічыю,— нечакана ўмяшаўся Уткоў.

Гэтак, сапраўды, было на першынстве вобласці, куды я прывозіў зусім яшчэ нявопытную школьную каманду і сам выступаў за яе на першай дошцы.

Блакітны замітусіўся, палез у кішэню, дастаў за-

пісную кніжачку, хуценька пагартаў яе, паварушыў бровамі:

— Ражэвіч?

— Ён самы.

Мне прыўзняла пастрой смелая рэпліка Уткова, і наступны раз ужо я перамог Блакітнага.

Засумавалі мае альбомы для вершаў, прыціхла гітара. Цяпер свой вольны час я аддаваў новаму заняткy: разглядаў запар дэбюты і партыі ўсіх чэмпіёнаў свету, складаў задачы. Мае кампазіцыі паявіліся ў газетах. Я выходзіў пераможцам на турнірах у гарадскім парку.

Новае захапленне па-свойму ацэньвалі Фама з Рыгорам.

— Прапашчы чалавек,— жартавалі яны,— зусім ад рук адбіўся. І чарка па табе плача, і дзеўкі сохнуць. Прайсці не даюць, дапытваюцца: «Дзе гэта той светленькі гітарыст?»

— Патрываюць,— жартам адказваў я,— гарачэй любіцьмуць.

— Глядзі, перагарадь,— весела заўважаў Фама, ружавеючы ад смеху.

— Не перагараць — ты не дасі.

Цяпер мне лёгка было адбівацца — да падобнае гамонкі прывык...

Адшумела вясна. Дайшлі чуткі, што ў нас будзе новы брыгадзір, што Дранчука збіраюцца павысіць. Чуткі чуткамі, але брыгадзір нешта палагаднеў. Тады, як мянялася ў трэсце начальства, быў прыціх, а зараз раптам падабрэў...

З гэтымі ўражаннямі я ўзяў ды напісаў першы ў сваім жыцці фельетон, у якім Дранчука назваў хамелеонам. Я перадумаў уцякаць на іншую работу або чакаць, пакуль з'явіцца новы брыгадзір, і паслаў свой фельетон у газету. Чакаў, што будзе. Хваляваўся, ці надрукуюць. Цэлы месяц хваляваўся.

У газеце фельетон не з'явіўся, але рэдакцыя накіравала маё пісьмо ў будаўнічы трэст, і — таму ці не толькі таму — кар'ера Дранчука стала на тормаз. А неўзабаве я зразумеў, што брыгадзір даведаўся пра маё пісьмо. Цяпер ён дзейнічаў хітра: не паказваўся ў брыгадзе п'яны, не пакрыкваў на падначаленых, адно стараўся адпомсціць мне найцяжэйшаю работай. А яшчэ, як стаў я здагадвацца, вопытны Дранчук шкоднічаў заніжаным улікам,— біў рублём. Я зразумеў, што голымі рукамі Дранчука не возьмеш. Каб змагацца з ім, трэба падлавіць яго на нейкім жульніцтве.

Тым часам залёг мне ў душу вялікі клопат. Усё пачалося як бы выпадкова. Аднаго разу сустрэўся я ў шахматным павільёне гарадскога парку з Алегам Блакітным. Абодва да ачмурэння нагуляліся ў бліц-турніры. Разам, калі змяркалася, выйшлі з парку, разам ішлі добры кавалак дарогі. Ні ён, ні я нікуды не спяшаліся. Пасля дзённае спёкі лягчэй дыхалася. Стомлены вецер-пастух гнаў па небе вялікія чароды леных кашлатых хмараў.

Мне хацелася памаўчаць, паслухаць, як стрымана шапочуць кроны каштанаў, паглядзець, як растуць і набліжаюцца хмары. Але мой спадарожнік быў занад-

та гаваркі. За некалькі хвілін выклаў усё: і што ён — студэнт педінстытута, і што там, у інстытуце, адна з мацнейшых у горадзе каманда шахматыстаў, і што ён, Блакітны, яе капітан, марыць зрабіць каманду ўвогуле непераможнаю.

— Слухай, а куды ты думаеш паступаць? — знячэўку папытаўся ён.

Я зразумеў, што яго, капітана «Буравесніка», я цікаўлю як патэнцыяльны пастаўшчык ачкоў.

— Ва універсітэт хачу,— прызнаўся я.

— А ты на сто працэнтаў упэўнены, што паступіш? А ці не пастукацца табе ў наш пед? Чуеш? Давай да нас, і не марудзь. Паступай сёлета. Ну, што ты маўчыш?

— Трэба ж два гады стажу, а ў мяне толькі год.

— Глупства, можна і з адным.

— Хіба можна?

— І не сумнявайся.

— Ды я ж не гатовы.

— Паступіш: ты — спартсмен, спартсменаў бяруць у першую чаргу. Асабліва хлопцаў,— пры святле ліхтара была добра відаць яго ўсмешка,— нашага брата ў настаўнікі ідзе мала, адны інстытуткі.

На скрыжаванні вуліц Алег паціснуў мне руку:

— Ну, вырашыў?

— Падумаю.

Тратуарныя пліткі ўздоўж Паркавай вуліцы нядоўга напаміналі мне клеткі шахматнай дошкі. Я паглыбіўся ў свае думкі і не заўважыў, калі вуліца з яе будынкамі, асфальтам і тратуарам скончылася

і пачалася звычайная дарога — з цэнтра ў мікраён.

Тое, што сказаў Блакітны пра інстытут, з'явілася для мяне нечаканым. Я ж увесь час марыў пра універсітэт, хацелася вывучыцца на журналіста. Але зараз упершыню варухнулася ў душы сумненне: ці атрымаецца з мяне журналіст? Фельетон жа не надрукавалі, значыць, не атрымаўся. І вершы нешта не пішуцца... У думкі мае прыйшоў няпрошаны ўспамін пра тое, як з перапоўненым кніжкамі чамаданам у руках вазіў я дакументы ва універсітэт, як нечакана спасцігла мяне там расчараванне. Пры тым успаміне мімаволі паўсталі ў вачах вучэбныя карпусы універсітэцкага гарадка, шматпавярховыя дамы, шырокія вуліцы сталіцы, прывакзальная плошча, дзе я купляў марожанае. Але чамусьці ўсё гэта ўжо не хвалявала, пачужэла, як і мая вучнёўская мара. А з горадам, дзе атрымаў работу і прытулак і дзе зведаў радасць першых поспехаў,— з гэтым горадам развітвацца не хацелася.

Блізкай, рэальнаю стала магчымасць паступлення ў інстытут. Адно стрымлівала — я за цэлы год не адгарнуў падручніка. Але ж знайшлося і суцяшэнне: яшчэ толькі пачатак ліпеня — можна падрыхтавацца.

У роздуме заспеў мяне магутны грукат грому. Я схамянуўся. Здалося, што праграмела над самай галавою і што недзе зусім побач уляпюшчыла маланка. Прыслухаўся. Па кронах каштанаў штосьці зашапацела. На твар мне і на рукі ўпалі шчодрыя кроплі дажджу.

Я пабег не ў інтэрнат, а да сястры.

— Брацік! — усклікнула яна.— Адкуль ты? Што, дождж пайшоў?

— Як бачыш,— сказаў я, выціраючы мокры твар, і папытаўся па звычцы: — А Любка заснула?

— Спіць.

— То я кнігі вазьму.

— Гэта самае, якія кнігі? — не зразумела Маня.

— Паступаю ў інстытут.

— У які інстытут? Ты ж не збіраўся.

— Не збіраўся, дык збяруся.

Мы прайшлі ў пакой. Там, на канапе, насупраць дзіцячага ложка, спаў адзеты Сяргей.

— Прэмію атрымаў, гэта самае, то набраўся...

Я знайшоў на этажэрцы патрэбныя мне падручнікі і праграму.

— Дык ты зноў будзеш паступаць у Мінску?

— Не, у наш інстытут.

— Малайчына, Валодзька, маму заўтра парадую. Мы з Любачкай паедзем, пажывём там.

На другі дзень я занёс дакументы ў педагагічны інстытут.

З тыдзень хадзіў яшчэ на работу, а навуку грыз вечарамі. Дні мае мільгалі, як спіцы ў колах, а толку з падрыхтоўкі было мала. Вачэй не хапала прачытваць сотні старонак. Я ўзяў водпуск. Папрасіў камендантa Астравухава, каб перасяліў мяне часова ў пусты пакой. Такі пакой знайшоўся. Калі застаўся ў ім адзін, павярнуў у замочнай шчыліне ключ і, нібыта



паглядзеўшы на сябе збоку, падумаў уголас: «Ну вось, дружа, давядзецца папацець».

За сталом, заваленым кнігамі, добра працавалася. Перапынкі былі кароткія. Калі пачыналася неадступная нудота ў страўніку, толькі тады ішоў у сталоўку. Наплывала першая цёпла-млявая хваля сну — рабіў зарадку. Змена дня ноччу і ночы днём не мела для мяне істотнага значэння. Здаралася так, што ўначы я працаваў, а раніцай або ўдзень адпачываў.

І калі прыслалі з інстытута выклік на ўступныя экзамены, я заўважыў фантастычную, як тады здалося мне, рэч: чалавек можа спаць столькі, колькі загадае сабе. Каб не заспаць, мне дастаткова было, уладкоўваючыся на спружыністай сетцы і кладучы кнігу пад галаву, засяроджана паглядзець на тыя рыскі ручнога гадзінніка, за якія не павінны перайсці стрэлкі, перш чым я прачнуся. Вядома, зручней было б з будзільнікам, але яго я не меў, а ехаць спецыяльна ў цэнтр, блукаць па магазінах не хацелася, шкадаваў часу. Кожны раз, прачынаючыся, знаходзіў вачыма стрэлкі на запаветных рысках. Нейкае імгненне не мог паверыць вачам (секунднае стрэлкі на цыферблаце не было), падносіў гадзіннік да вуха, каб пераканацца, ці часам не спыніўся ён. І пераконваючыся, што цікае — у тыя хвіліны гэтае ціканне нагадвала мне тахканне ўсхваляванага сэрца,— я ўжо не мог не здзіўляцца нечаканаму адкрыццю: калі раней толькі ведаў, як цяжка выконваць уласныя загады, то цяпер спасціг яшчэ і тое, як радасна атрымліваць перамогу над самім сабою, набліжаючы запаветную мэту.

У памяці хутка ўзнаўляліся прызабытыя за год тэмы. Нават нямецкая мова крыху стала бліжэйшаю. Найбольш рыхтаваўся я да сачынення. Памяць мая найлепей засвойвала паэтычныя творы — «Новую зямлю» Якуба Коласа, «Янука Сялібу» Максіма Танка, «Сцяг брыгады» Аркадзя Куляшова. Яскрава ўявіўшы сабе вобразы паэмы «Сцяг брыгады», падумаў аднойчы, што нічога б не хацеў, каб надарылася шчасце пісаць сачыненне на гэтую тэму.

Ранак першага жніўня быў сонечны, а высозныя дубовыя дзверы педінстытута нязвыкла цяжкія.

Калі я ўвайшоў у аўдыторыю, яна ўжо была запоўнена такімі, як я, шукальнікамі шчасця. Незанятымі заставаліся толькі першыя сталы.

Экзаменатараў доўга чакаць не давялося. Як жа ўзрадаваўся я, калі на дошцы з'явілася тэма па паэме Аркадзя Куляшова «Сцяг брыгады»!..

Пасля першага поспеху — чацвёрка, пяцёркі не атрымаў ніхто — мякчэй неяк пачалі адчыняцца мне цяжэнныя інстытуцкія дзверы.

## НЕЗВЫЧАЙНЫ СОН

І толькі калі здаў апошні экзамен і выйшаў на залітую сонечным святлом вуліцу, я адчуў, што вочы смыляць ад частага недасыпання, галава ідзе кругам, як гэта бывае, калі з бальнічнае палаты выйдзеш на свежае паветра.

Вечарам я шчасліва заснуў. Прахапіўся, калі Фама з Рыгорам збіраліся ўжо на работу. Павярнуўся на

другі бок і зноў заснуў. І тады, на досвітку, убачыў я сябе дома. Быццам іду з вядром да калодзежа, каб вады набраць, аж бачу — божа! — маці мая ўся ў калодзежы, толькі яшчэ пальцамі рук трымаецца за верхні круг. Я кідаю вядро на зямлю, бягу да яе, каб хутчэй ратаваць, але — як гэта ў снах бывае — ногі не слухаюцца мяне: я апынаюся не ля калодзежа, а за варотамі. Крычу: «Мама», але голасу майго не чутно, тады крычу штосілы, нібы ў лесе: «Ма-а-ма-а-а!» — і прачынаюся. Чую, як моцна калоціцца сэрца, цямлю: нешта прыснілася. Успамінаю, маці прысніў. «Халя б нічога не здарылася,— непакоюся я.— Трэба збегаць да Мані, мо вярнулася ўжо...»

— Не, пакуль што не прыязджала,— літаральна з парога адказала Маніна суседка па кватэры, калі я папытаўся ў яе пра сястру.— А Сяргей, твой швагер, сам ведаеш, на рабоце.

У мяне быў яшчэ цэлы тыдзень адпачынку, і я, не марудзячы, заскочыў у інстытут, пакінуў там свой вясковы адрас, каб паведамілі аб выніках, ды патрухаў на аўтастанцыю.

Мама з Маняю і нават малая Любачка — усе ўжо выглядвалі на дарогу, чакаючы мяне. Ці паступіў, вядома, было найпершае пытанне.

— Праваліўся,— пажартаваў я.

— Не муці,— глядзела мне ў вочы Маня.— Падманваць не ўмееш. Хутчэй кажы, паступіў?

— Здаў. Адна пяцёрка, адна тройка, астатнія — чацвёркі,— хваліўся я.— Сказалі, што магу лічыць сябе студэнтам.

Слёзы радасці набеглі на матчыны вочы.

— Богу дзякуючы, дачакалася. Цяпер можна і паміраць.

— Ну што вы, мама,— казаў я з той трывогаю, якая прыходзіць да сына за лёс маці,— толькі й пажыць цяпер. Дзеці выраслі...

— Як скажуць, гэта самае, то слухаць няма чаго! — абуралася Маня.— Не сёння-заўтра нам кватэру новую дадуць, гэта самае, будзеце жыць з намі.

А маці так задумліва ўсміхалася і, нібыта ўжо аднойчы спасцігла тое непазбежнае, што чакае ўсіх, спакойна і нешматзначна сказала:

— Ужо для мяне, дзеткі, адна кватэра...

Ёй нездаровілася. Часцей і цяжэй, чым звычайна, кашляла. Акрамя таго, пачыналі пухнуць ногі. Але ў больніцу яна не хацела, прасіла, каб не аддавалі. Бачыла, што і мяне і Маню гэта непакоіць, таму калінікалі паўтарала сваё даўняе:

— Не бойцеся, дзеткі, рыпучае дрэва доўга стаіць.

Яна ўсё яшчэ парывалася да працы, хаця каля пліты патупаць. І Маня і я сварыліся на яе, як на непаслухмянае дзіця, прасілі, каб паляжала, адпачыла.

— Яшчэ наляжуся, дзеткі,— адбівалася яна.

Ішлі дзень за днём. Мы з Маняю нарыхтавалі і навазілі дроў,— каня даў калгас. Пілавалі. Я калоў вагкія чуркі — яны пахлі смалою і сонцам,— складваў у падстрэшшы.

Скончыўся мой адпачынак, але я не хацеў спецыяльна ехаць у горад, каб звольніцца з работы, а рашыў пачакаць. Часам падумваў, што па конкурсу магу

і не прайсці, і нават гэтая думка зараз не бянтэжыла мяне. Бянтэжыла іншае — што Мані тут з малою цяжка, нават малако даводзіцца купляць у калгаснікаў. Я пра гэта сказаў сястры. Але яна супакоіла мяне:

— Дурненькі ты, гэта самае. Нам тут добра. І Любачка, сам бачыш, прывыкла. А клопату зараз ніякага. Гаспадарка — сам знаеш: свінчо, гэта самае, ды куры. Дровы ўжо ёсць. А картоплі Сяргей паможа капаць. У верасні ў яго водпуск. Едзь і не перажывай, абы толькі прыйшоў, гэта самае, выклік.

Выклік неўзабаве прыйшоў.

## ЗНАЁМСТВА

Студэнцкае жыццё — гэта перш за ўсё інтэрнат. Не той гмах, у вокны якога на апошнім паверсе могуць заглянуць хіба што цыбатыя таполі, дый то стаўшы на дыбкі,— там, у тым новым будынку, жывуць старшакурснікі. Жывуць, як тузы — па тры-чатыры чалавекі ў пакоі. А калі ты яшчэ не нюхаў студэнцкага хлеба, то за раскошу прымеш пакой на семнаццаць чалавек у старэнькім, як свет, аднапавярховым, без усякіх выгод, будынку, з акна якога трэба задзіраць угору галаву, каб паглядзець на агністыя гронкі рабін.

Сказаць шчыра, мала раскошы ў перанаселеным пакоі старой будыніны, але хто думаў пра жыллёвы камфорт, калі ў грудзях кіпела радасць, што і ты не якая там бяздарнасць (былі ж завалы на кожным экзамене), што ты вытрымаў выпрабаванне і трапіў у студэнцкую сям'ю.

Каго толькі не было ў гэтым пакоі: хлопцы з усіх факультэтаў. Нам, філфакаўцам, пашанцавала — нас набралася ажно шасцёра, прычым палавіна Міхасёў: разважлівы і сарамлівы Тачыла — з добрымі сінімі вачыма, шырокаю ўсмешкай; Ціханчук — самы спакойны і самы высокі, крыху сутулаваты, з прадаўгаватым тварам; Носік — усявед, з белымі прылізанымі і толькі на скронях ненатуральна кучаравымі валасамі і светла-блакітнымі, амаль бясколернымі вачыма. Тройка даволі стракатая. Яе дапаўнялі Сяргей Зайко, дасціпны і начытаны («хадзячая энцыклапедыя»), Павел Панчук, малы, з пышным вожыкам валасоў, залішне акуратны і роўны, нібыта адпрасаваны гальштук, і я.

Мне пашанцавала больш як каму, бо маёй раскладушкаю стала першая ад акна, а суседам — Міша Тачыла. Ён быў асаблівы не толькі той натуральнаю і невычэрпнаю дабрынёй у позірку, на дзіва пявучай размоваю, а найперш — любоўю да літаратуры. Тую любоў я заўважыў, калі яшчэ здавалі экзамены. Чуў яго адказ. Як падрабязна і з якім захапленнем ён расказваў, амаль выспеўваючы, біяграфію Янкі Купалы! Пасля гэтага мне захацелася з Мішам пазнаёміцца, і я падышоў да яго. У калідоры інстытута гаварылі мы шмат пра што, але найбольш — пра экзамены і кнігі.

— Ты любіш Кузьму Чо-ор-нага? — неяк знянацку пацікавіўся ён.

Мне сорамна было прызнацца, што я не ведаў Чорнага і што ўвогуле малавата чытаў. Міхасёвы дапытлі-

выя вочы і ягонае пытанне не давалі мне спакою і на адлегласці — там, на хутары, дзе я чакаў выклік з інстытута...

За вокнамі — радочак рабін, а ў пакоі — шчытныя, нібы на вадзе плыты, рады раскладушак. Іх шчаслівыя гаспадары на цэлы дзень — хто дзе — растварыліся ў горадзе: пакуль не пачаліся заняткі, можна вольна пагойсаць па парку, па кіно.

Вечарам, калі ўсе сышліся, накрылі на стол, гаварылі тосты, жартавалі. Калі, парыпваючы раскладушкамі, палеглі спаць, доўга яшчэ дурэлі, як дзеці, кідаліся падушкамі, смяяліся.

Пасля паступова ўсталявалася цішыня.

— Вало-о-ддзя, ты не спіш? — мякка і плаўна спытаў Міхась Тачыла.

— Не, а што?

— А ты мне на экзаменах ведаеш кім паказаўся?

— Кім?

— Шафёрам.

— Чаму?

— Не ведаю. Можа, што быў у летняй ку-уртачцы.

«Сімпатычны хлопец»,— падумаў я і адчуў, што гэтая прыхільнасць — на ўсё жыццё. Не паступіў бы — не ведаў бы зусім... Дзіўна неяк!

А ў інстытуце назаўтра найпершае знаёмства пачалося з нашым куратарам Андрэем Андрэевічам Каленікам.

Глыбокія залысіны, хударлявы твар, засяроджаны позірк рабілі яго чымсьці падобным да саракагадовага Якуба Коласа. Прыгожую — палоскамі — кашулю

ён насіў на-юнацку наросхрыст, выкладваючы буйны шырокі каўнер на пінжак. Седзячы за сталом насупраць аўдыторыі, ён называў нашыя прозвішчы, і мы расказвалі пра сябе. Гаварыў куратар ціхім голасам — напэўна, таму, што дужа ўнікнёна слухаў і глядзеў. Яго карыя вочы, здавалася, бачылі цябе наскрозь. Тым, хто пра сябе расказваў стрымана і мала, Андрэй Андрэевіч задаваў пытанні. Паколькі ён падымаў нас у алфавітным парадку, я паспеў заўважыць, што найбольш яго цікавіць, з якой хто сям'і і як мы забяспечаны матэрыяльна,— якраз самае балючае для мяне. Вось ужо амаль паўгрупы дзяўчат «адстралялася», і ў кожнае дома бацька, маці, жывуць у дастатку.

— Зайко,— нарэшце Андрэй Андрэевіч называе першага з нашай хлапечай шасцёркі, якая раніцай захапіла «камчатку» — самы апошні рад сталоў.

У Сяргея няма мацеры — памерла. Гарачая хваля спагады апякае мяне. Але толькі на адно імгненне, бо ягоны бацька, выяўляецца,— настаўнік...

Наступны пасля Зайко падымаецца, азіраючыся па баках, Міша Носік. Бацька — вартаўнік на заводзе, маці — прадаўшчыца.

Затым важна ўстае Панчук. Яго бацькі і абодва браты жывуць на Гомельшчыне.

— Чаму ты выбраў наш інстытут? — пытаецца куратар.

— Цётка параіла,— адказвае Панчук, і цішыня аўдыторыі ўзрываецца смехам.

— А дзе працуе твая цётка? — пытаецца Андрэй Андрэевіч.

— У жаночай кансультацыі,— адказвае Панчук.

Цяпер узлятае новая хваля смеху,— з намі разам, ажно да слёз, рагоча Андрэй Андрэевіч,— і гэтая хваля ўзнімае ўжо і самога Панчука, якому хоць і няёмка, але нічога не застаецца, як стаяць і ўсміхацца.

Мне дык не да смеху, бо ўжо вушы гараць ад напружання: зараз буду і я стаяць, як раздзеты, перад усёй групаю. І што скажу пра бацьку?.. Дзіўна, дагэтуль ніколі мне не было так сорамна за яго. Я згодны на ўсё, абы толькі не дапытваліся.

— Так, добра,— гаворыць куратар.— А зараз паслухаем...

Сэрца ў мяне ў грудзях — як параненая птушка. Мая чарга прыйшла. Я ўстаю, коратка расказваю, дзе скончыў школу, дзе працаваў, гавару пра маці, сястру і брата.

— Бацькі няма ў цябе? — пытаецца куратар.

Што ж мне сказаць, калі ён нібыта ёсць. Ад уласнае паўзы, хоць і нядоўгае, я збянтэжыўся яшчэ больш.

— Ён пакінуў нас...

Дзіўна, чамусьці ў аўдыторыі ціха, ніхто не смяецца.

— Трохі памагае? — працягвае Андрэй Андрэевіч.

— Не.

— А хто памагаць будзе? Сам грошай зарабіў?

Я прыкінуўся, маўляў, так яно і ёсць, зарабіў, а сам падумаў, што, напраўду, мог трохі сабраць, каб думаў пра вучобу.

Усе аглядваліся і пасміхваліся, калі пра сябе пачаў

расказваць Міхась Тачыла. Быў нязвыклы ўсім яго мяккі пявучы басок. Словы, асабліва доўгія і асабліва калі хваляваўся, ён вымаўляў нараспеў, а яны, тыя словы, як назло, трапляліся доўгія.

— Нара-ддзіў-ся ў Варанні-лаа-вічах,— заліваўся чырванню ён.— Школу скончыў у Аляхно-о-вічах.

На дапамогу прыйшоў Андрэй Андрэевіч:

— Бацькі працуюць?

Міхась кіўнуў галавой.

— Дзе?

— У саўга-асе «Ка-а-стры-ыч-ніцкі».

— Сям'я вялікая?

— Аддзі-наа-ццаць...

Усе пераглянуліся: вось гэта, маўляў, сямейка!

Я пранікся да яго яшчэ большай сімпатыяй, бо адчуў, што і ён не ў раскошы рос.

Але сэрца маё скаланулася, калі пачуў, што Міша Ціханоўскі — сірата, яго бацьку і маці расстралялі фашысты, а ён, калі вайна скончылася, трапіў у дзіцячы дом.

## З'ЯЎЛЕННЕ АФРАДЗІТЫ

Маё студэнцкае жыццё ў самым пачатку азарылася шчаслівым пачуццём. У кожнага кахання — свой непаўторны лёс, і часта я думаю, няўжо для мяне Афрадзітаю магла стаць іншая дзяўчына, калі б не выпадак...

На адным з перапынкаў у нашу аўдыторыю зазірнуў Алесь Міляйчук, той самы, што прысылаў мне,

калі я быў школьнікам, пасведчанне члена СППВ, а пасля і пісьмо з фотакарткаю — для знаёмства.

— Хто тут Ражэвіч? — запытаўся ён.

Я падышоў да яго. Мне ў вочы кінуліся яго пышная вогнена-рыжая, амаль чырвоная, шавялюра і вялікія акуляры.

— Вось ты які,— сказаў Алесь, хаця іменна такія словы павінен быў сказаць я.— Здагадваешся, хто я?

Я пазнаў Алеся, бо мне помнілася ягоная картачка, але тады, школьнікам, ён яшчэ не насіў акуляраў,— пазнаў і паціснуў яму руку.

— Вершы пішаш? — пацікавіўся ён.

— Не, перастаў.

— Гаручае скончылася? — усміхнуўся Алесь.

— Можа, і скончылася.

— Пабудзеш рэдактарам, то знойдзецца,— сказаў ён і, не паспеў я падумаць, што тут да чаго, дадаў: — Скора камсамольскі сход. Да сустрэчы.

А праз некалькі дзён мяне выбралі рэдактарам газеты «Студэнт».

Калі я паспрабаваў даць самаадвод, дык той жа Міляйчук, член камітэта, кінуў рэпліку: «Справішся». А з прэзідыума нехта дадаў: «Паможам...»

— Хто за тое, каб...— вёў сход камсамольскі сакратар.— Аднагалосна!..

«Толькі гэтага мне не хапала...» — падумаў я, расчараваны, бо хацелася мець многа вольнага часу, каб чытаць кнігі, хадзіць у кіно, гуляць у шахматы. На Мілейчука я ажно быў узлаваўся: чаму не пацікавіўся, ці хачу я стаць рэдактарам? Але як жа хутка змя-

ніўся мой настрой! Варта было толькі паклапаціцца пра выпуск газеты, зайсці ў новы корпус інтэрната да машыністкі і сустрэць у яе пакоі дзяўчыну, без якой ужо не ўяўляўся мне белы свет...

Яна, здавалася б, нічым не магла зачараваць. Вочы ў яе былі ніякія там не сінія і не карыя, а зеленавата-шэрыя (раней і не сустракаў я ні ў кога такіх вачэй), і бровы не надта тонкія, і валасы на плечы ёй спадалі не чорныя, не каштанавыя, не залацістыя, а проста русявыя,— ні фантастычна тонкаю таліяй, ні грацыёзнаю паходкай яна таксама не вылучалася. Але як толькі ўвайшла ды ўсміхнулася: «О, у нас госці!» (яна не сказала «госць», хаця госцем у іхнім дзявочым пакоі быў я адзін),— у дзяўчыне ўбачыў я столькі ваб-нага. І свежасць юнага твару з лёгкім румянцам на ім, і тыя непадробныя шчырасць і пяшчота, з якімі яна вымавіла свае словы, і мяккая пасма, што выбілася з-пад берэта, і ярка-блакітны плашч (ён надта пасаваў ёй) — усё міжвольна захапіла маю ўвагу: седзячы за сталом, я павярнуўся да яе і доўга не мог адвесці вачэй. Гэта заўважыла мая субяседніца машыністка Галя Шуляк. Галя чамусьці не пазнаёміла нас, і калі дзяўчына, зняўшы плашч (цяпер на ёй была бэзавая кофтачка і гафрыраваная спадніца), падышла да крэсла, што стаяла каля ложка, і села, я прамовіў, абы не маўчаць:

— І вы тут жывяце?

— І я тут,— усміхнулася дзяўчына.

«Чаму яна мне такая знаёмая? — падумаў я.— Няўжо недзе бачыў яе?»

Між тым пачаты дыялог перабіла Галя.

— Ну, што ж ты, Надзечка, не пайшла з дзяўчатамі на танцулькі? — спытала яна, смеючыся.

«Якое харошае імя — Надзя!» — думаў я, не зважаючы на Галін смех.

— Так сабе, нешта расхацелася,— адказала Надзя.

«Як добра, што яна не пайшла на танцы!» — радаваўся я гэтай нечаканай сустрэчы і таму выпадку, які прывёў мяне сюды.

— А мы з Валодзем будзем заўтра газету выпускаць,— як бы пахвалілася Галя.

Побач з Надзяю мне хацелася пабыць як найдаўжэй, з ёю прыемна было нават памаўчаць, але Галіна раскаванасць і мая да яе антыпатыя, якую я раптам зараз адчуў, бянтэжылі мяне, і я толькі чакаў зручнага моманту, каб устаць і развітацца.

На другі дзень, як і было дамоўлена, Галя Шуляк прыйшла ў інстытут друкаваць тэксты. Маё да яе пачуццё непрыязі не прайшло, таму, пакуль яна друкавала, я надоўга выходзіў з кабінета. Аднак яна знайшла некалькі старонак, напісаных неахайным, неразборлівым почыркам, і паклікала мяне, каб прадыктаваў.

Цяпер мы сядзелі побач. Ад Галі патыхала рэзкім адэкалонам. На галаве ў яе ўзвышалася шматпавярховая прычоска.

Як ні суха трымаўся я з Галяю, яна неяк знянацку спытала ў мяне:

— Табе падабаецца Надзя?

— А што?

— Яна ж хворая.— Галя глядзела на мяне крыху прыжмуранымі вачыма, у тую хвіліну яна выглядала як бы пастарэлаю.

— Хворыя ў больніцы ляжаць,— паказаў я нежаданне размаўляць.

— Ты не знаеш, яна хворая...

— Нічога,— сказаў я цвёрда, і Галя змоўкла.

З інстытута выходзілі моўчкі. Ісці нам было ў розныя бакі: мне ў адзін корпус інтэрната, ёй — у другі.

Што значылі для мяне нейкія там нагаворы на Надзю, калі белы свет сышоўся на ёй і ўсё маё жыццё набыло, здавалася, адзіны сэнс. Назаўтра я даведаўся, што Надзя вучыцца на фізмаце. Я знайшоў яе ў інстытуце, запрасіў на канцэрт, у праграму якога ўключылі і маё выступленне — чытаць вершы Блока.

Была субота. На калідоры, побач з дэканатам, тоўпіліся студэнты ля першага нумара вывешанай газеты. А я ўжо толькі і марыў пра вечар, пра той канцэрт... Дзіва што! Паабяцала прыйсці Надзя!

І раптам аб'явілі: з панядзелка едзем у калгас на бульбу. Як толькі стараста змоўкла, я задумаўся. Нас з Надзяю павязуць, напэўна, у розныя бакі, і цэлыя два тыдні мы не будзем бачыцца. Гэта ўяўлялася неверагодным няшчасцем. Цяпер інстытуцкі вечар набываў асаблівы сэнс, чаканне яго станавілася пакутлівым, і сустрэча з Надзяю чамусьці бралася пад сумненне. У рэшце рэшт я збег з апошняе пары лекцый, абы толькі не размінуцца з Надзяю, бо ведаў, што ў яе заняткі канчаліся раней...

Да інтэрната ішлі скверам. Быў незвычайна светлы і па-летняму цёплы верасень. Уздоўж асфальтаваных алеяў пышным залатым полымем палалі клёны, арапжавым агнём чаравалі душу рабіны.

— Пасядзім,— ласкава сказала Надзя, калі мы параўняліся з лавачкай.

Мы селі. Нібыта вясною, наўкола, над кронамі клёнаў, стаяла чыстае, без ніводнай хмурынкі, неба. I золата клёнаў, і зіхоткае сонца, і сінеча — увесь навакольны свет зліваўся з маёй радасцю: поруч, у блакітным плашчы, была дзяўчына, што прынесла мне свет любві, якога я так чакаў, і забрала маю апошнюю рашучасць.

Аднак у мяне хапіла смеласці ўзяць Надзю за руку. Рука была цёплая і пакорлівая, і я спытаў:

— На вечар пойдзем разам?

Яна смела глянула мне ў вочы. I здзіўленне, і разгубленасць, і радасць улавіў я ў тым позірку.

— Зойдзеш па мяне? — адказала яна.

Цяпер магчымае расстанне не засмучала — сэрца поўнілася гэтай сустрэчаю. Вясёлым бачыўся мой першы студэнцкі вечар. Думалася і пра заўтрашні дзень, пра тое, што ён, пэўна, будзе такі ж пагодлівы.

## САМАЯ ЧОРНАЯ ВЕСТКА

— Валодзя, будзь мужны...

Так была ўручана мне познім лістападаўскім вечарам тэлеграма. Два гэтыя суровыя словы вымавіў мой аднакурснік Міша Носік. Сказаў нягучна, але трохі

артыстычна, як бы выконваючы ролю ў спектаклі. Пра тое падумалася пазней, а тады ў свеце стала жудасна ціха — аглушыла страшная вестка.

Пасля апошняе паездкі дадому я ўжо адчуваў, што непазбежна страшнае зусім блізка. Ды ўсё ж кволілася надзея: маці яшчэ пажыве. Прадчуванне бяды межавала з надзеяй нядоўга — прыйшло непапраўнае. Цяпер уся драбната маіх клопатаў адступіла далёка-далёка, і толькі тэлеграма, лаканічная і суровая — МАЦІ ПРЫ СМЕРЦІ ПРЫЯЗДЖАЙ — расплывалася ў маіх вачах.

Толькі пад ранак дабраўся я да Дзяніскавіч. Калі ішоў сялом ад прыпынку, сустрэў бацьку. Ён ехаў на веласіпедзе. Пазнаў мяне, спыніўся.

— Здрастуй,— сказаў ён і, усплакнуўшы, дадаў: — Можаш ужо не спяшацца...

Быў ён гладка паголены і меў свежы выгляд.

Я не заплакаў — гора сціснула сэрца, і слёзы мае як закамянелі,— я толькі сказаў:

— Дайце ровара.

Не плакаў я і тады, як ішоў за трунай побач з бацькам, сястрою і братам, і ў час апошняга развітання, і нават тады, як першыя грудкі зямлі глуха ўпалі на труну. Адно быў зарыдаў адразу, калі дакрануўся вуснамі да нежывых, складзеных на грудзях яе спрацаваных рук. І яшчэ даў волю слязам, якія душылі, назаўтра, рана-раненька, на халодным жвіры магілы... Там, у цішыні лістападу, сэрца маё дало клятву, што я ніколі ў жыцці не дарую бацьку і што ніколі-ніколі не пакрыўджу жанчыны. Падняўшыся з курганка ма-



гілы, нечакана для сябе адчуў нейкую палёгку: боль не сціскаў скроні, як у дзень пахавання, аднак на сэрцы па-ранейшаму ляжаў камень цяжкае страты. Я доўга яшчэ стаяў над нізенькім сасновым крыжам, углядаўся ў выразаныя на ім ініцыялы, прозвішча, год нараджэння і год смерці мамы. Яна памерла на пяцьдзесят першым годзе жыцця.

Позірк маёй памяці ненадоўга затрымаўся на труне, ён вярнуў мяне спачатку да апошняе сустрэчы з хворай маці, затым павёў далей і далей — аж у маленства, да найдаўніх уражанняў. Успомніліся мне і зямлянка, якую ў нас называлі на польскі лад схронам, і тая дарога пад зорным небам, па якой калісьці цягнула наш вазок суседская Манголка, што была выпраглася з аглабель, і тыя лясы ды пералескі, куды маці брала мяне з сабою ў грыбы і ягады. Мне захацелася пайсці і паблукаць сцежкамі маленства. Але ўзяло верх другое жаданне — ад'ехаць як найхутчэй і як мага далей ад бацькі. І я сказаў сабе, што вярнуся ў горад. Няхай сабе, як дзікун, не развітаўшыся ні з кім.

«Маня і Віця даруюць, з імі ж неўзабаве буду бачыцца»,— ужо ідучы ў раённы цэнтр (на аўтобус спазніўся), думаў я пра гэтыя свае ўцёкі і пра тое, як учора, вярнуўшыся з пахавання, не сеў разам з усімі за памінальны стол, а згарнуўся на ложку, акрыўся з галавою — нібыта заснуў...

У дарозе яшчэ шмат што ўспаміналася, шмат пра што думалася мне. Гэтым гасцінцам, які злучаў Дзяніскавічы з райцэнтрам, не раз маці ездзіла на базар.

Добра знаёмы быў ён і мне, усе яго пятнаццаць кіламетраў змераў я сваімі нагамі: калі ў Дзяніскавічах утварыўся калгас, часта рана-раненька тэпаў у райцэнтр, каб заняць чаргу да хлебнага магазіна. Пазней ужо ехаў тут аўтобусам на спартыўныя спаборніцтвы, затым — у райком камсамола, а яшчэ пазней, выпускнік сярэдняй школы,— упершыню з чамаданам, упершыню ў вялікі свет...

Цяпер з раённага цэнтра я павінен быў дабірацца ў абласны. Я не стаў чакаць самага зручнага аўтобуса — ён па графіку павінен быў адпраўляцца ўвечары,— а здаволіўся тым, каторы курсіраваў кружной дарогаю — праз дзесяткі вялікіх і малых вёсак — па тэрыторыі ажно чатырох раёнаў. Нібы фурманка, ён валюхаўся на прасёлачных калдобінах, і толькі калі цямнела, вяртаўся да месца прызначэння.

Горад жыў сваім жыццём. Ён купаўся ў электрычным святле, кудысьці спяшаліся людзі і машыны. І ў тых вечаровых агнях, і ў тым бясконцым патоку, і асабліва ў тым, што я ўжо вяртаюся ў горад — бачылася мне вялікая недарэчнасць: там, на радзіме, у сырой зямлі мая маці... І нікому — ні пасажырам, што сядзяць поруч, ні гораду з яго морам святла, вясёлкамі рэклам — няма да гора майго аніякае справы. Вось і заўтра... Над зямлёю ўстане сонца, і ўсё ў белым свеце будзе так, як было да маміпай смерці. І толькі тром чалавекам — Віцю, Мані і мне, будзе маркотна і горка ў гэтым мітуслівым, гэтым неабсяжным свеце. Я глядзеў праз шкло аўтобуса на голыя дрэвы, на апалую і змеценую сям-там у гурбы лістоту, і ўсе мае

гады, пакуль жыла маці, з усімі іх нястачамі і цяжкасцямі, трывогамі і спадзяваннямі, уявіліся мне аднолй суцэльнаю вясною. Што будзе далей, мяне не хвалявала. Зараз я жыў мінулым.

## ДАБРЫНЯ СЯБРОЎ І БАЦЬКАВА МІЛАСЦЬ

Я хадзіў на заняткі ў інстытут. Але часта і не чуў, што гаворыць выкладчык. Міжвольна забываўся на ўсё: у памяці паўставала маці. Уяўляліся яе жывыя вочы, усмешка, спрацаваныя рукі. Здавалася, паедзь дадому, і яна сыдзе з ганка насустрач. Адно цяпер побач з вобразам маці неадступна ішоў крыж. Ён бачыўся мне і ў скрыжаванні сцежак, і ў распасцёртых крылах птушкі, і ў ценю, што падаў ад самалёта на зямлю, і, асабліва выразна, у аконнай раме. О гэтае інтэрнацкае акно! Як доўга не давала яно мне заснуць. Варочаўся і сусед па раскладушцы Міша Тачыла. Яго, звычайна гаваркога і вясёлага, як падмянілі: ён ні пра што не пытаўся і на словах не спагадаў мне. Ні ў інтэрнаце, ні ў інстытуце. Ды і ўся група як згаварылася — ніхто, нават словаблудлівы Міша Носік і прастадушны Сяргей Зайко, не выказваў мне спачування, усе здаваліся абыякавымі. Але калі надышлі неўзабаве Кастрычніцкія святы, мне падарылі туфлі. Схітрылі: камсорг мне іх паднесла не як падарунак ад групы, а нібыта як узнагароду камітэта камсамола за актыўную работу. І я доўгі час быў у тым упэўнены.

Алесь Міляйчук таксама сустрэў мяне з падарун-

кам — купіў кашулю. Ён падышоў да мяне ў калідоры на перапынку паміж лекцыямі.

— Віншую са святам,— сказаў, падаючы лёгкі скрутачак.— Насі здаровы.

Яго вочы глядзелі з-пад акуляраў спагадліва.

— Рукавы, здаецца, не кароткія будуць, адно, ці падыдзе каўнер.

Я збянтэжыўся:

— Навошта гэта?

Па твары Алеся прабегла хмурынка недаўмення, але яму перадалася мая ніякаватасць, і ён абняў мяне рукою за плечы:

— Насі, насі...

У той жа перадсвяточны дзень каля гарадской бібліятэкі я напаткаў куратара, і ён запрасіў мяне дадому.

Мне стала не па сабе, што ўлез у вочы Андрэю Андрэевічу, але ён, мусіць, гэта заўважыў, бо зараз жа пастараўся разбурыць маю няёмкасць:

— Хадзем, хадзем, пабачыш, дзе я жыву.

У кватэры Андрэя Андрэевіча мяне ўразіла бібліятэка. «Столькі кніжак! — з захапленнем падумаў я, калі акінуў позіркам поўныя ад падлогі да столі, на ўсю сцяну, стэлажы ў абодвух сумежных пакоях.— Няўжо ў людзей можа быць столькі кніжак! Гэта ж палавіна гарадской бібліятэкі». Побач з беларускай, рускай і замежнаю класікай стаялі аўтары, якіх я не толькі не ведаў, але пра якіх і не чуў.

Пакуль блукаў я вачыма па кніжных паліцах, Андрэй Андрэевіч накрыў на стол.

— Сядай, перакусім,— сказаў ён, як бы прыслухоўваючыся да мяне, а тады пайшоў яшчэ раз на кухню і прынёс два кілішкі ды невялічкі графінчык з чырванаватым пітвом.

«Віно»,— падумаў я.

Есці страх як хацелася, і я не стаў муляцца. Андрэй Андрэевіч напоўніў прыгожыя — конусам — кілішкі на цыбатых ножках.

— За твае поспехі! — куратар адным глытком апаражніў чарку.

Я выпіў таксама, хоць і не думаў пра поспехі.

За ядою Андрэй Андрэевіч не маўчаў, цікавіўся, якія ў інтэрнаце ўмовы для адпачынку, паціху распытваў пра ўсю групу: чым займаемся пасля лекцый і што ў нас за адносіны. Пры гэтым ён не забываў напамінаць мне, каб еў.

Куратар сядзеў у крэсле насупраць мяне, у белай кашулі наросхрыст. Побач з ім, такім простым і ўважлівым, я міжвольна думаў пра чалавечую дабрыню. Добраю, бясконца цярплівую была маці, і яна для мяне засталася жывою, хоць і памерла. А бацька недзе жыве, ды яго ў мяне няма... Думалася і пра чужых, але такіх блізкіх мне людзей. Ад людской дабрыні, ад таго, што яна ёсць і супрацьстаіць чэрствасці, на душы гэтак пасвятлела, што я адчуў: магу расчуліцца.

У куратара я не заседзеўся.

«Які багаты Андрэй Андрэевіч! Колькі ў яго кніжак! — меркаваў я, вяртаючыся ў інтэрнат, і тут жа зрабіў папраўку: — Не багаты, а шчодры... Мой бацька таксама не бедны, ды, відаць, не купіў ні адной

кніжкі... Выходзіць, можна быць і не багатым, але шчодрым, і наадварот — багатым, ды скупым...»

Між тым у інтэрнаце мяне чакаў сюрпрыз. Як толькі я ўвайшоў у пакой і пачаў распранацца, з ложка падняўся Міша Тачыла і сказаў: — Не распрана-айсся, табе перавод.

Ён падаў мне паштовае паведамленне.

Я здзівіўся, бо хто мог прыслаць мне грошы? Віця — не, ён у Маскве жыў тады з сям'ёй яшчэ на прыватнай кватэры, працаваў адзін, жонка — пасля родаў — глядзела сына. Маня?.. Хоць яна ўжо і выйшла на працу, але ў яе таксама не пірагі вароты падпірана пашлі — сям'я ж... Дый навошта Маня пасылала б па пошце: у адным жа горадзе жывём. Штэмпель на паведамленні стаяў аляпаваты, ён увесь заплыў тушшу, але я здагадаўся, што перавод прыйшоў ад бацькі.

Грошай у маіх кішэнях — як кот наплакаў, хоць і не так даўно атрымаў стыпендыю. І тых, што даслаў мне бацька, хапіла б, сціпла трацячы, надоўга, таму атрымаць іх было спакусліва. Але я пайшоў на пошту і папрасіў, каб перавод вярнулі з маім надпісам: «У грошах не маю патрэбы».

## У ЗДАРОВЫМ ЦЕЛЕ — ЗДАРОВЫ ДУХ

Аднаго разу, калі мы збіраліся ў інстытут на лекцыі, да мяне падышоў Міхась Тачыла.

— Пазыч...— у ягоным позірку на гэты раз не стаяла пытанне, ці багаты я, ён быў упэўнены, што я

нядаўна атрымаў перавод, а калі атрымаў, то яшчэ не мог патраціцца.

— А ў мяне таксама — скразнячок,— вывернуў я пустыя кішэні пінжака.

— Хутка ты развёў,— шчыра здзівіўся Міхась.

— Не развёў,— уздыхнуў я,— адправіў туды, адкуль прыйшлі.

— Як? — не зразумеў ён.

— Проста бацька пераблытаў адрас...

Міхась засмуціўся:

— А я нат не думаў, як у цябе складана...

Нашу размову чуў Ціханоўскі, які, я пазней давэдаўся, хацеў, у сваю чаргу, знайсці падмацаванне ў Тачылы.

Перад стыпендыяй усе мы даўно з'ехалі з далікатэсаў, якімі былі камса, ліверная каўбаса, і пачалі перабівацца з хлеба на ваду. Але я няблага ведаў горад, ягоны рачны порт, таварную станцыю, іх вячэрнія і начныя змены, а таму і паабяцаў Тачылу і Ціханоўскаму:

— Хочаце павесялець — рыхтуйце мускулы. Я вас забяспечу работаю.

— А сябе?..— намагаўся пачуць штосьці канкрэтнае Тачыла.

— Вядома, што і сябе. Пасля лекцый схаджу ў разведку... Ну, як?

— Па-мойму, зэр гут,— сказаў Тачыла, ён апошнім часам усё часцей ужываў гэтыя кароткія нямецкія словы.

Ціханоўскі ў знак згоды толькі кіўнуў галавою.

Работу я знайшоў на ўсю ноч. Згружалі цэмент.

Трэба было яго насыпаць шуфлямі ў тачку і вазіць па дашчаным насціле з вагона ў склад. Я меў звычку да такой працы, таму ўзяўся за тачку. Тачыла і Ціханоўскі працавалі шуфлямі. Насыпалі пару тачак — напылілі, быццам толькі што гарцавала тут конніца. Пачалі чхаць, смяяцца, перакідвацца словамі: як-ніяк, новыя ўражанні...

— Сыпучы, як попел,— гаварыў Тачыла.

— Але цяжкі, як вада,— заўважаў флегматычны Ціханоўскі.

— Маўчыце, бо сядзе на зубы,— папярэджваў я хлопцаў, маючы як нядаўні бетоншчык пэўны вопыт.

Далей працавалі моўчкі. Абодва Міхасі, напоўніўшы тачку, зрэдку высоўваліся на хвіліну з вагона, каб хапнуць лёгкімі чыстага паветра. Рабілі і кароткія перадышкі. Жартавалі тады адзін з аднаго, бо былі падобныя на млынароў. Спецадзенне не выручала: цэментавы пыл паўбіваўся і ў валасы, і за шыю, і ў нос. Пачыналі смылець павекі.

Асаблівай стомы не адчувалася. Толькі ўжо як пад раніцу скончылі, дык гатовы былі зваліцца на снезе. Аднак найбольш размарыла нас у інтэрнаце, калі паўкладваліся спаць.

На лекцыі зусім не пайшлі. Прачнуліся ў другой палове дня. Не без намаганняў падняліся, атрымалі ў канторы грошы. Кожнаму выйшла ледзь не па цэлай «стыпендыі».

Каторы ўжо дзень мы ад'ядаліся ў студэнцкай сталоўцы, бралі па дзве порцыі сардэлек. І ўсё яшчэ ад-

чувалі ў мускулах здаровы боль, асабліва Міхась Ціханоўскі, у яго злёгку нават дрыжалі рукі, калі падносіў да рота лусту хлеба і лыжку. Але Сяргей Зайко шчыра зайздросціў нам і трошкі крыўдаваў, што мы не ўзялі і яго з сабою.

— Куды табе,— жартавалі мы.— На зарадцы сімулюеш, мускулаў не нарошчваеш.

— Во! — ён згінаў у локці руку.— Як у баксёра!

Ціханоўскі сядзеў за сталом бліжэй за ўсіх да Сяргея, ён абхапіў пальцамі Сяргеевы біцэпсы.

— Ого-го! — усміхнуўся.— У здаровым целе, мабыць, здаровы дух...

Нам было весела, і мы паабяцалі Сяргею, што другі раз і яго абавязкова возьмем.

Сяргею пашанцавала, бо другі раз прыгрэў нас не будаўнічы трэст, а трэст сталовых і рэстаранаў. Там мы згружалі з машын цукеркі. Працавалі ўсяго гадзіны дзве. Заробак быў малы, затое цукерак — колькі хочаш. Трапіцца разбітая скрынка — еш, хоць распеnecessary, толькі ў кішэні не бяры. Але і ад той спакусы ўтрымацца было нялёгка. Дзіва што! Ад адной толькі думкі, што ты зможаш пачаставаць дзяўчыну, радавалася душа.

Калі па заснежаных вуліцах вярталіся ў інтэрнат, Міхась Тачыла густым баском цытаваў Яўгенія Еўтушэнку:

Студенту хочется
послушать Скрябина,
и вот полмесяца
живет он скрягою.

Раптам ён павярнуўся да Сяргея Зайко:

— Як там, Сяргейка, далей?

Сяргей асабліва не захапляўся паэзіяй, да таго ж гэты верш толькі што з'явіўся ў друку, і Міхась амаль быў упэўнены ў недасведчанасці Зайко. Але Сяргея нездарма звалі «хадзячай энцыклапедыяй». Ён слова ў слова прадоўжыў верш — і пра тое, што студэнту не падае з неба манна і як выручае Масква-Таварная, даючы работу.

Усю дарогу да інтэрната мы гаманілі, потым кідаліся снежкамі, беглі.

Было весела і амаль бестурботна.

## ПА ЗАДАННЮ РЭДАКЦЫІ

Алесь Міляйчук не хадзіў у заробкі ні на таварную станцыю, ні ў рачны порт, ні ў якія там трэсты, хаця яму таксама не было ад каго чакаць дапамогі, адно ад замужняе сястры мог прывезці на каляды кавалак сала.

Надбаўку да стыпендыі Алесь здабываў не мускуламі, а розумам: друкаваў у газетах свае вершы, артыкулы, заметкі.

Аднойчы ён і мне сказаў:

— Хочаш друкавацца?

— Хацеў бы,— адказаў я стрымана, а сам загарэўся яшчэ незразумелай да канца магчымасцю, прыгадалася невыказная радасць ад першай газетнае публікацыі, калі быў яшчэ школьнікам.

— Хадзем, пазнаёмлю цябе з рэдакцыяй,— паклікаў Міляйчук.

Неўзабаве прыйшлі мы ў рэдакцыю раённай газеты.

З-за стала выйшаў энергічны чорнавалосы чалавек і падаў руку Алесю.

— Знаёмцеся, гэта наш Валодзя Ражэвіч,— павітаўшыся з ім, Алесь кіўнуў на мяне,— я вам расказваў пра яго.

Загадчык і мне падаў руку, сказаў мякка:

— Канаплёў.— Запрасіў нас сесці, сам вярнуўся за свой стол.— Што, хлопцы, «...и пальцы просятся к перу, перо — к бумаге...» — пажартаваў ён, пэўна, спадзеючыся, што мы абодва ведаем крылатыя пушкінскія радкі, пасля зусім сур'ёзна сказаў: — Справа ёсць... Жыхары вёскі Каросцічы, Міляйчук ведае,— Канаплёў зірнуў на Алеся,— засыпаюць рэдакцыю скаргамі на кінаперасоўку. Трэба туды паехаць, разабрацца і даць аб'ектыўны матэрыял... Хто возьмецца? Можа, навічок?..

І Канаплёў і Міляйчук паглядзелі на мяне.

— Бярыся, гэта недалёка,— сказаў Алесь так, нібыта мяне палохала адлегласць.

— Туды тры разы на суткі курсіруе аўтобус,— падтрымаў Алеся Канаплёў.

Я адно папытаўся, колькі для гэтага даецца часу, і калі загадчык аддзела дакляраваў мне цэлы тыдзень, пагадзіўся.

Трапіў на апошні рэйс аўтобуса. Пад вечар разгулялася мяцеліца. Дабіраўся я не без прыгод: да канца

не даехаў — дарогу, што пайшла ад асфальту полем, начыста замяло снегам.

Звечарэла яшчэ ў аўтобусе. Да Кароcціч, паводле слоў маіх некалькіх спадарожнікаў, цётак і дзядзькоў, заставалася вёрст пяць. Дзьмуў парывісты вецер, ажно забівала дых, снег сляпіў вочы. Пажылыя людзі ішлі гэтак павольна, што здавалася, яны коўзаюцца на месцы, і я, каб не спазніцца ў кіно, прыспешыў хаду — пашыбаваў адзін, тым больш што заўсёды хадзіў, як у нас казалі, летка, дый падганяў холад, адзеты быў я не па сезону: ні асенняе паўпалітко, ні тонкія штаны, ні туфлі на гумовым хаду, ні, нарэшце, капронавыя шкарпэткі не грэлі. Ногі ўвесь час патаналі па калені ў снезе, а я ўсё труxаў і трухаў. Неўпрыкметку сагрэўся.

Трохі, аднак, не пашанцавала. Бездараж, цемра і мяцеліца прывялі мяне не ў Каросцічы, а ў суседняе сяло. Адтуль давялося бегчы лішку — ізноў па глыбокім снезе, і я ажно разгарачыўся. Бегучы, хваляваўся, што магу не паспець на пачатак фільма, ды я, аднак, не спазніўся, наадварот, яшчэ давялося пачакаць.

Афіша не падманула. На экран прыйшоў «Чапаеў». Я парадаваўся, бо калі тое было, як глядзеў гэты фільм. Але радасць мая, толькі ўспыхнуўшы, адразу і пагасла — кінамеханік усім сапсаваў настрой: то прападаў гук, то рвалася стужка, то не на сваім месцы ішлі асобныя часткі фільма. Гледачы, асабліва жанкі, не маўчалі, называлі механіка «маханікам», і варонаю, і курыцаю мокраю, і проста — няўмекам. Адна цётка дык ажно ў адчай кінулася:

— І што гэта, божа, на нашу галаваньку звалілася? І дзе ўжо той караспандзент?!

— Які? — здзівілася яе суседка.

— Манька ж палучыла з рэдакцыі пісьмо, што маюць праверыць факты, дык прышлюць караспандзента...

Я слухаў і маўчаў, стараўся запомніць усё, што гавораць людзі і як гавораць. Пасля фільма хацелася падысці да кінамеханіка і пацікавіцца, чаму ў яго не клеіцца справа, але падумаў, што і без гэтага абыдзецца. «Падыдзі,— разважаў я,— дык яшчэ запросіць павячэраць, а то і заначаваць, а пасля, хоць і адмовішся, будзе няёмка крытыкаваць...»

У горад вяртаўся пехатою. Толькі на асфальце падабраў мяне спадарожны грузавік. Шафёр сам спыніўся, паклікаў у кабіну.

Стомлены і шчаслівы, я ўвайшоў у інтэрнат, лёг на раскладушку, і рука сама пацягнулася да тумбачкі — па аловак і блакнот. Над чыстаю старонкай блакнота падумаў і напісаў: «Як кульгаў «Чапаеў» у Каросцічах».

Фельетон мой прызналі ўдалым, яго надрукавалі ў газеце. Канаплёў павіншаваў мяне і параіў трымаць з рэдакцыяй сувязь.

Сваёй радасцю я падзяліўся з Алесем Мілейчуком.

— Куй жалеза, пакуль гарачае,— вучыў Алесь.— Пішы часцей. Спадабаешся — возьмуць на работу.

— А інстытут?

— Не ўцячэ і ён, на завочнае пяройдзеш.

— На завочнае? — захваляваўся я.

— А чаго баяцца,— даводзіў Міляйчук.— Думаеш, мала хлопцаў пайшло на завочнае...

— Але ж не з першага курса.

— Дык цябе пакуль ніхто не цягне. Можна пісаць і вучыцца на стацыянары.

## ГАРЫЗОНТ ПЕРШАЙ СЕСІІ

Няхай сабе ўцягнуўся ты ў лекцыі і семінары, няхай навучыўся ўсюды паспяваць або, наадварот, біць лынды цэлымі днямі, няхай ты ўжо ўмееш эканомна траціць стыпендыю або здатны пусціць яе за тры дні, а потым браць галаву ў рукі і думаць вялікую думу, як выйсці з крызісу,— усё адно, дружа, ты яшчэ не ў поўным сэнсе студэнт, калі не здаў першую экзаменацыйную сесію.

Пачаткам выпрабаванняў у зімовай сесіі быў для нашае групы экзамен па рускай вуснай народнай творчасці. Выкладчыца Яніна Францаўна Бяляўская, як ні ласкава задавалі мы ёй пытанні на кансультацыях, абыходзілася з намі даволі дыпламатычна: хоць і не палохала празмернай патрабавальнасцю, але і не абнадзейвала лёгкім поспехам. Яна адно прызывала «маладых людзей»,— так заўсёды звярталася да нас,— грунтоўна рыхтавацца. Аднак першы курс — не такі ўжо і неабжыты мацярык, і самы свежы вопыт яго асвойвання, падказвала логіка,— у нашых нядаўніх папярэднікаў...

— Здасце, не хвалюйцеся,— супакойваў, а заадно

і падвучваў, як трэба трымацца на экзамене, Алесь Міляйчук.— Толькі смялей адказвайце.

Ля дзвярэй аўдыторыі, дзе адбываліся экзамены, з самага ранку сабралася амаль уся група — не спалася. А смельчаком з хлопцаў выявіў сябе толькі Зайко, які пайшоў у першай «абойме».

Ледзь паспела тая пяцёрка выцягнуць «шчаслівыя» білеты, як нам пачуўся зычны Сяргееў голас. Непрыкметна прачынілі дзверы — так і ёсць: Зайко адказвае без падрыхтоўкі, бо ведаў і красамоўства яму не пазычаць. Некалькі мінут — і Сяргей ажно ззяе ад шчасця: «выдатна»!

— Ух ты! Дзядзечка Зай!..— гэтак жартаўліва ласкава дзяўчаты называюць Сяргея Зайко і просяць, каб паказаў заліковую...

Нібыта з лёгкае Сяргеевай рукі, нашы першакурсніцы выносяць у сваіх заліковых кніжках як не «выдатна», дык «добра». Надыходзіць і наш, «камчаткі», час — трох Міхасёў, Панчука і мой. Ужо Міхась Тачыла і я рыхтуемся адказваць, а пакуль што ля дошкі пацее Ірына Бурачкоўская. Яна ў нас рэкардсменка: у дыктантах дапускае да дваццаці памылак. І хоць мне трэба рабіць сваё, я развесіў вушы, хачу паслухаць Ірын адказ. Але адказу, уласна, няма ніякага. Іра яшчэ сяк-так «ехала», нешта гаварыла, пакуль не ўслухалася Яніна Францаўна, а як толькі яна, экзаменатарка, штосьці ўдакладніла, так і пайшоў воз у адкос...

— Ай, ну толькі што ведала...— скардзіцца на сваю памяць студэнтка.

— Бурачковская, если вы учили — вспомните,— голас Яніны Францаўны строгі.— Былины надо знать.

— Ай, ну...— Іра моршчыць лоб, нібыта сіліцца нешта ўспомніць.— Я ж вучыла...

— Как же вы учили, студентка Бурачковская,— дапякае экзаменатарка,— если вы не знаете, что такое былины.

— Знала я...— Іра стараецца заплакаць, але слёзы нешта не ідуць.— Я вывучу...

— Идите и учите, я вам «неуд» пока не ставлю,— Бяляўская аддае Іры заліковую кніжку.

Бурачкоўская, робячы выгляд, што змахвае рукою слязу, пакідае аўдыторыю.

Яніна Францаўна яшчэ доўга не можа супакоіцца, не можа даўмецца, чаму студэнтка нічога не ведае.

Цяпер на фоне Бурачкоўскай добрую адзнаку зарабіць няцяжка, абы гаварыў упэўнена і па сутнасці. Сваё «хор» Бяляўская ставіць і Тачылу, і мне, пасля і Носіку, і Панчуку, як па інерцыі. Вось толькі Ціханоўскага нешта затрымлівае...

Нарэшце і ён выходзіць. Усе кідаюцца яму насустрач:

— Ну што? Ну як?..

— Вуда, але — крэпкая! — жартуе павесялелы, нягледзячы на тройку, Ціханоўскі.

Цяпер да Яніны Францаўны напярэймы падбягаюць усе тры Ліды — камсорг, прафорг і староста. Яны як законныя «ўлады» групы пачынаюць «ваяваць» за Іру Бурачкоўскую, якая ўжо за гэты час падзубрыла быліны.

— Я обманывать государство не буду,— экзаменатарка здаецца непрыступнаю, як крэпасць.

Але тры Ліды працягваюць штурмаваць:

— Яніна Францаўна, яна разгубілася... Яніна Францаўна, яна ведае... Яна падцягнецца... Ёй трэба стыпендыя...

Канчаецца ўсё ў мажорным ключы: Яніна Францаўна запрашае ў аўдыторыю Ірыну Бурачкоўскую, дае ёй дадатковыя пытанні і выстаўляе здавальняючую адзнаку...

Да другога экзамена Іра ўжо рыхтуецца пад пільным наглядам камсорга, прафорга і старасты. Зайко Сяргей «нашпігоўвае» Ціханоўскага — воля групы.

Другі экзамен здаём на «добра» і «выдатна». Сенсацыя! Ява экзаменацыйнай сесіі становіцца для нас загартоўкаю, вопытам, жывой гісторыяй. Вынікі абяцалі ўсім стыпендыю (з адной тройкаю давалі тады таксама).

Яшчэ мы жылі як у бога за пазухай. На нашым студэнцкім небе пакуль што спакойна спалі перуны псіхалогіі і стараславянскай мовы.

Пачыналіся канікулы. Шчаслівыя дзяўчаты і хлопцы раз'язджаліся па родных кутках, дзе па іх ссумаваліся мамы і таты, сёстры і браты.

Перад ад'ездам да мяне падышлі Тачыла і Ціханоўскі.

— Нікуды не паедзеш? — папытаўся Тачыла.

Я мог паехаць у Маскву да брата, але мяне ўжо вабілі журналісцкія дарогі.

— Застаюся,— адказаў я.

— Будзеш пісаць у газету? — пацікавіўся Тачыла.

— Паспрабую.

— Ну то хай будзе зэр гут,— усміхнуўся ён на развітанне.

— Каб цэлы мех напісаў...— пажадаў Ціханоўскі...

Пад вечар адпраўляўся Надзін аўтобус. Да аўтастанцыі ішлі з ёю па бела-блакітным снезе, па лёгкім марозе. У адной руцэ ў мяне была Надзіна, зусім не цяжкая, сумка, у другой — яе цёплая далонь.

— Будзеш мяне чакаць? — спытала, развітваючыся, Надзя.

— Хіба не знаеш?.. Напішы мне, добра?

— Напішу,— яна ўжо садзілася ў аўтобус,— абавязкова...

— Толькі адразу.

— Добра,— абяцала яна.— І ты мне...

З-пад яе шапачкі выбілася лёгкая пасма. Яна ўзняла руку, і ў гэты час дзверы аўтобуса зачыніліся.

Ад'ехала Надзя, і стала ціха-ціха на зямлі, як на неабжытай планеце.

## НОЧ НА АПУСЦЕЛЫМ ХУТАРЫ

Вечарам я завітаў да сястры. Дома яна была адна, Сяргей пайшоў у садзік па дачку.

— Прыязджаў бацька,— расказвала Маня,— плакаў, скардзіўся на цябе. Гэта праўда, што ты, гэта самае, адмовіўся ад яго помачы?

— Няўжо ж не.

— Ну і дурны ты, чыста дурны,— ганіла мяне сястра.

— Які ўжо ёсць...— сестрыны папрокі я прыняў спакойна, ведаючы, што яна ў глыбіні душы апраўдвае мяне, бо і сама не дужа хіліцца да бацькі.

Яшчэ адну навіну сказала мне сястра: вясною з Забалоцця ў Дзяніскавічы пачнуць ссяляць усе хутары. Мне стала тужліва, і я сказаў:

— Паедзем заўтра ў Забалоцце?

— А што там цяпер рабіць, у пустой, халоднай хаце? — разважыла Маня.— Хіба што выць ад сумоты.

— Пасядзім, памаўчым, паходзім... Пакуль хата стаіць.

— А хто яе без нас разваліць?

— Ну, як знаеце...

— То куды ж нам з Любачкай... зімою? — сястра як бы прасіла прабачэння.

— Тады я з'езджу адзін.

— Зойдзеш на магілку...

— Магла б і не казаць.

— Гэта самае, вазьмі з сабою што ўкусіць,— яна дастала з халадзільніка пруточак каўбасы, адрэзала, пасля ўзяла з кантэйнера ладны кавалак хлеба, загарнула ўсё ў газету, паклала ў сетачку-авоську.— На, паясі.

...У Дзяніскавічы я прыехаў назаўтра пад вечар. Пакуль датрухаў да хутара, пачынала сутоніцца.

Першае, што кінулася мне ў вочы яшчэ здаля — зусім сіратлівы выгляд хаты: на сядзібе не было ўжо хлява. Калі я падышоў бліжэй, то ўбачыў, што і дзве-

ры і вокны загачаны дошкамі. Я ўпусціў авоську. Разгублена, яшчэ не ведаючы, для чаго, пацягнуў за адну, другую, трэцюю дошкі. Зразумеў, што голымі рукамі не адарву. «А навошта адрываць? — прыйшло ў мае думкі.— Ці не вярнуцца ў сяло?.. Яшчэ паспею на гэты ж аўтобус...» Але раптам як нешта найшло. Амаль са злосцю ўхапіўся за калочак, што трымаў прызбу, зламаў яго і, ужо утрапёна, пачаў вызваляць дзверы ад суцэльнага шчыта моцна прыбітых дошак. Адны адрываліся, другія пераламваліся. Аднак дзверы былі зачынены з сярэдзіны. Я абышоў хату. Малое падслепаватае акно, што глядзела на сад і на бровар, цяпер было таксама забіта дошкамі. З неверагоднай лёгкасцю я вызваліў гэтае акно. Здагадка мая апраўдалася: яно было не зашчэпленае.

Я ўлез у хату. Дастаў з кішэні паўпалітка запалкі, чыркнуў адною. У хаце нічога не было — ні лавак, ні табурэтак, ні стала. Я нібыта скамянеў. Было такое адчуванне, быццам толькі што адбыўся страшны выбух, і я не ўпэўнены, ці не аглушыла мяне.

Нарэшце зашчапіў акно, выйшаў у сенцы, адкінуў з дзвярэй засаўку і не без намагання расчыніў дзверы: з ганка іх падпіраў зледзянелы снег.

У сенцах таксама запаліў запалку і ўбачыў, што яны, як і хата, пустыя, адно за недавершанай перагародкаю стаялі жорны і на перагародцы віселі старыя лахманы. Менавіта за іх я зачапіўся думкаю: «Будзе на чым пераспаць». Толькі цяпер выйшаў на ганак, падабраў на снезе сетачку-авоську з харчамі, вярнуўся ў хату. Лямпы нідзе не знайшоў. Нямала нама-

ганняў патрацiў на пошукі сякеры. Намацаў яе, моцна вышчарбленую, у сенцах, за жорнамі. На ганку я паперабіваў дошкі, наадрываў яшчэ з плота штыкецін, нанасіў да прыпечка цэлую гару дроў. Былі яны не зусім сухія, давялося паклапаціцца пра смалістыя трэскі на падпал. Здабыў іх сякераю ў сенцах — з верхняга бервяна недавершанае перагародкі.

Не здымаючы з сябе паўпалітка — у хаце было мала цяплей, як на дварэ,— я распаліў у печы, і стала вачам прыемней. Пакуль у дыме прабівалася полымя, давялося пайсці на двор пашукаць сабе сякое-такое сядзенне. Там, дзе была дрывотня, адкапаў у сумёце калоду, прыкаціў пад хату, унёс і паставіў ля прыпечка.

Калі ўгарэліся дровы, ля ганка сухім, як прысак, снегам памыў рукі, зачыніўся ў хаце, зняў паўпалітко, узяў яго наапашкі. Дастаў з авоські яду, заслаў газетаю прыпечак і сеў тварам да агню.

І найшла на мяне невымоўная скруха. Стала б лягчэй, каб заплакаў, але слёз не было.

Вячэраў цераз сілу. Агонь у печы, нібы маўклівы друг, здымаў з мяне крыху цяжару, які зваліла халодная цішыня апусцелае хаты.

Калі дагарэлі ўсе дровы і па хаце пайшоў цёплы дух, я прынёс з сенцаў лахманы і паслаўся на чарэні.

Лёг у штанах і ў кашулі, акрыўся сваім паўпалітком. У хаце было цёмна і ціха да жудасці — як у магіле. Нішто не перашкаджала думаць пра маці, пра ўсё пражытае. Душу працінала крыўда на бацьку, што ў нас не так, як у людзей. Жыў бы, як усе, памагаў бы

нам — маці не памерла б гэтак заўчасна. Страшна ненармальнымі і дзікімі, часта супярэчлівымі бачыліся мне ўзаемаадносіны з бацькам. Што я ведаю пра яго? Амаль нічога... «Але ці мая ў тым віна? — спрачаўся як бы другі ва мне голас.— Хіба я хацеў не ведаць яго?!.» І ўсё-такі — распытаць бы ў Віці і Мані, які ён, бацька, быў для іх... Чаму я ніколі не пагаварыў з мамаю пра гэта? Не выключана, што і добры. Можа, пайсці заўтра ды папытацца ў Саламоніхі, Адэсіхі, Чушбавых?.. Але што гэта дасць?.. Дзе туляўся бацька столькі гадоў? Чаму так рэдка паказваўся дома? Чаму пасля і зусім перастаў з'яўляцца? Адно знайшоўся, называецца, гаспадар, калі маці памерла. Труну заказаў ды зрабіў крыжа. І то не за так, вунь, хлява ўжо некуды перацягнуў. Хто ведае, мо і на хату купца знайшоў і толькі чакае вясны... Як жа загадаць сэрцу павярнуцца да бацькі, калі чужыя людзі куды раднейшыя за яго?!. Што азначаў той грашовы перавод? На парозе — старасць, а з ёю разам і трывога за дзень заўтрашні?.. А мо падабрэў бацька, таму што памерла маці?.. Дык няўжо яму свет быў цесны пры ёй? Няўжо яна замінала яму, бацьку, любіць сваіх дзяцей?.. Нават быць вольным не замінала, нават аліментаў не плаціў. Як жа доўга мама трывала, ніколі не скардзілася на яго, аж пакуль я сам не зразумеў, што паміж імі не будзе прымірэння і згоды. А мо ў чым была і матчына віна?.. Магчыма нават. Але ўсё адно ён, бацька, не павінен быў так пачужэць...

Ад перажыванняў ляжаў на сэрцы камень, болем сціскала скроні, не прыходзіў сон. Але цяпло, што

ішло ад чарэні, паціху адагравала душу, неўпрыкметку мяняла мне настрой. Светла пачало думацца пра печ — колькі на сваім вяку яна ссушыла жыта і грыбоў, колькі зварыла страў, спякла хлеба, колькі аддала цяпла... Нечакана знайшлося дзіўнае параўнанне: без печы ў хаце вяскоўцу было б горай, чым без каня ў гаспадарцы. Ды і ці ўвогуле можна было б пражыць без яе, калі яна — галоўнае апірышча ў сялянскім побыце: не толькі варыць і сушыць, не толькі абаграе, але яшчэ і лечыць, а часта і замяняе ложак. «Вось і гэтая чарэнь была калісьці ўтульнаю»,— думаў я... Пасля з нетраў памяці прыйшоў невядома чый расказ пра тое, як я калісьці падаў з печы. Малым скаціўся, калі маці ляжала ў больніцы. Адкуль я гэта ведаю?.. А тое, што, калі ўпаў, нават не заплакаў?.. Пэўна, калісьці расказвала маці... Але чаму спатрэбілася столькі часу і такая, а не іншая абстаноўка, каб праявілася ў памяці даўняе, несвядома перажытае імгненне? І чаму яно праяўляецца ўсё ж не да канца: хто ўсё-такі мне сказаў? Маці наўрад, бо і сама яна магла пачуць пра тое толькі з Маніных вуснаў. Значыць, напэўна, Маня... Цяпер і верылася і не верылася, што ў маім маленстве было падзенне з печы, як верылася і не верылася, што былі Маніны і Віцевы казкі і фокусы... Стыхія думак пераносіла мяне з майго мінулага адразу ў будучыню, у горад, які мне даў прытулак,— яна, будучыня, у мяне ўжо нязменна звязвалася з горадам, з вучобаю ў інстытуце і журналісцкімі пошукамі, з сястрою Маняю і любай дзяўчынаю Надзяю, з выкладчыкам Андрэем Андрэевічам, сябрамі — Міхасём

Тачылам і Алесем Мілейчуком,— затым мае думкі вярталі мяне з залітага святлом горада ў апусцелы хутар, у самотную хату, у цёмную зімовую ноч. Пажыўшы няхай сабе і нядоўга ў горадзе,— там на кожным кроку людзі,— тут, на хутары, ужо нязвычна было, што ва ўсе бакі ад хаты — заснежаная зямля, на якой, нібы глухія, стаяць хутары, размешчаныя воддаль адзін ад другога. «Дзіўна, нават брэху суседскіх сабак не чутно,— падумаў я ды запярэчыў: — Якіх сабак? Ветрыха ніколі не абзаводзілася сабакам. А Саламоніха мо дзе збыла свайго, а мо і здох». Успомніліся Воўчык і Рыжык. Упершыню затрывожыўся, ці яны хоць жывыя: бацька ж мог і не ўзяць іх з сабою. А калі не ўзяў, то яшчэ невядома, ці не пазабіваў, каб не здзічэлі ў пошуку ежы і не асуджаны былі на галодную смерць.

Прадметам маіх далейшых невясёлых разважанняў стала пустая хата. Усплыло на думку, што, відаць, такі вось куток быў бы адразу пасля вайны знаходкаю для якіх-небудзь бандытаў: прыходзь хоць на ноч, хоць на дзень — ніхто не ўбачыць... Тут жа здзіўляўся з сваіх меркаванняў: маўляў, прыдумаў, называецца... Каму спатрэбілася б гэткая «раскоша»: гола — хоць шаром пакаці, і холадна — як на Паўночным полюсе. Хіба што — летам... Пасля не без іроніі заўважыў: «Ну, пайшлі далей. Хто там у нас?.. Піраты ў Карыбскім моры? Людаеды на бязлюдным востраве? Коннік без галавы ў прэрыях Мексікі? Марсіяне? Чытаў жа трохі фантастыкі...»

Раптам у начной цішыні нешта даволі выразна за-

бахала ні то за хатаю, ні то на гарышчы. Я напружыў слых: у верхавінах дрэў і за сценамі хаты шумеў вецер. Я зразумеў: мяняецца надвор'е, а на даху, пэўна, адарвала недзе ад латаў бляшаны ліст. Вецер узмацняўся — то парывіста шумеў, то шалёна гойсаў па даху, то жаласна выў у коміне. Я ўлёгся лацвей. Я слухаў стыхію.

...Усё навокал неба — вогненнага колеру, нібыта расплавілася сонца і разлілося над усім белым светам. Я доўга бягу пад гэтым небам, а яму, вогненнаму, усё няма канца. Бягу ў адной каўбойцы і босы па летняй зямлі — то па раллі, то па сенажаці, то па неглыбокай дажджавой вадзе. І хоць бы дзе сустрэлася жывая душа — нідзе нікога, ні нават звера на зямлі, ні птушкі ў небе. Між тым, нягледзячы на незнаёмы ландшафт і на такое агнявое неба, без прывычнага сонца на ім, я не губляю адчуванне напрамку: за спіною ў мяне — поўнач, наперадзе — поўдзень, а таксама адчуванне мэты, няхай сабе трохі і неакрэсленай: недзе паблізу — дарога, і там, на той дарозе, я змагу трапіць ці то на аўтобус, ці то на цягнік. Пастулова мая мэта як бы праясняецца, набывае больш акрэслены характар: аказваецца, я не проста спяшаюся на дарогу, каб паспець на транспарт, а ўцякаю. На небе вось-вось пакажацца нейкая звышмагутная міжкантынентальная ракета, недзе за акіянам яе ўжо выпусцілі, таму і стала такое вогненнае неба,— і я ўцякаю, невядома адкуль ведаючы, што ўсёй гэтай бязлюднай мясціне пагражае радыяцыя ад атамнага зараду; праз нейкі момант я

ўжо ўцякаю, аказваецца, не ад ракеты, не ад пагрозы радыяцыі, а проста ад навальніцы: неўзабаве ўдарыць маланка, і мне трэба адбегчы, вось і бягу, хаця помню, казала калісьці маці, што ў навальніцу нельга бегчы; яшчэ праз імгненне я гэтаксама ратуюся ўцёкамі, але не ад ракеты і не ад маланкі, а ўжо ад роднага бацькі. Гоніцца ён за мною, бы за нешта хоча мне адпомсціць. Такі самы, гладка выбрыты, якім бачыў яго ў дзень смерці мацеры, толькі злосны, у руках трымае нешта, здаецца, сякеру. І вось ён ужо зусім блізка. Я, хоць і на ўсю моц бягу, пачынаю сумнявацца, ці не дагоніць мяне бацька. І дыхаць становіцца цяжка, і ногі не слухаюцца — і абрываецца мой сон.

Па тым, як паскорана б'ецца сэрца, я зразумеў: нешта такое прыснілася... У хаце было цёмна, толькі з боку нічым не заслоненага акенца нясмела прабіваўся золак. Я паднёс да вуха ручны гадзіннік і, пераканаўшыся, што ён не спыніўся, падзавёў яго, дастаў з кішэні паўпалітка запалкі, пацікавіўся, якая гадзіна. Стрэлкі на цыферблаце паказвалі восем раніцы. Я падумаў між іншым, што не ведаю, калі засынаў, а то меў бы дакладную інфармацыю, колькі часу пракантаваўся на чарэні. Вядома было адно — тут я зусім няблага адпачыў. Я мімаволі нават усміхнуўся, успомніўшы Міхася Тачылу і яго любімыя словы «Зэр гут»: «Цікава, ці прамовіў бы Міша гэтыя словы на мулкай чарэні».

Спяшацца не было куды, а печ яшчэ трымала цёплы дух, і я чакаў, пакуль не развіднее. Як ні прыслухоўваўся — голасу ветру не чуў. Успомніўся сон. Па-

вольна, каб чаго не апусціць, быццам гэта мела нейкі сэнс, ішоў я па яго слядах... «Кашмар нейкі, дый гoдзе,— разважыў я.— Але чаго прысніўся бацька? Ды яшчэ такі злосны... А, зрэшты, як кажуць, спіцца, дык і сніцца...»

Падняўся я, калі ў акенцы зусім пасвятлела. Замест зарадкі рабіў дарожкі ў заснежаным двары. Па замеценых маіх учарашніх слядах і па мудрагелістых гурбах пад плотам было відаць, што ноччу крыху пагаспадарыла завея.

Яшчэ з гадзіну блукаў я па няўтульным двары, хадзіў туды-сюды па хаце, зноў па двары, прыпыняўся на месцы клуні, хлява, ля разваленага склепа, ля гародчыка, дзе засохла каліські ялінка і дзе вырасла перанесеная мною з загумення бяроза. Цяпер яна шумела пад кожным парывам ветру, шумеў за хатаю сад, і пад гэты пошум думалася, якое ўсё нетрывалае ў свеце. Толькі час непадуладны разбурэнню. Але заўсёды ў часе і ў прасторы будзе радзіма. Яна ніколі не будзе нязменнаю. І сцежкі тваіх дзяцей непазбежна будуць чымсьці адрознівацца ад тваіх сцежак. Але ніколі не страціць таямнічай прыцягальнай сілы сцежка да роднага парога, да тых мясцін, ад якіх немагчыма адарваць маленства. І ніколі глыбіня чалавечай любові не залежыць ад багацця яе аб'екта. Ну што, здавалася б, для мяне гэты куток, дзе я не ведаў ні дастатку, ні цяпла, дзе няма цяпер анічога, толькі пустая хата. А сэрца маё нязменна паўтарае даўно знаёмае: «Мой родны кут, як ты мне мілы!..» Бо тут прайшлі мае семнаццаць год, тут жыла маці, тут пачатак усіх маіх

дарог. Значыць, мой смутак натуральны і вяртанне на гэтую зямлю будзе бясконцым і натуральным, дакуль будзе са мною памяць...

Да сяла я рушыў напрасткі па снегавой пустыні. Правальваўся па калені ў снезе, насустрач мне дзьмуў марозны вецер. Настабурчаны каўнер паўпалітка слаба затуляў твар ад ветру, я раз-пораз аглядваўся і колькі крокаў ступаў задам напярод. Акідваў позіркам слабы ланцуг хутароў. Так-сяк уяўлялася мне перасяленне Забалоцця. Я не сумняваўся: першым пераселіцца ў сяло Мірон Чушба. Гэтак жа быў упэўнены я, што Ветрыха заўпарціцца. Невырашальнаю праблемаю здавалася мне перасяленне Адэсіхі: што тут перавозіць, калі яшчэ невядома, ці хоць перазімуе хата гэту зіму. «А што будзе з нашаю хатай?» — настойліва прыходзіла мне на думку пытанне. Ні Віця, ні Маня, ні я ў сяле жыць не збіраемся. Але ж і бацька мае прытулак у другім сяле. Значыць, ён прадасць хату, хоць і не жыў у ёй столькі гадоў...

Нездарма кажуць: чым больш чалавек мае, тым больш яму хочацца мець. Няхай сабе мае, няхай. Толькі сэрцу не загадаеш...

Гэтак я дайшоў да цэнтра сяла. А там, у Дзяніскавічах, нечакана сустрэў бацьку. Мы з ім ледзьве не сутыкнуліся на рагу школы: я павярнуў да могілак, у бок аўтобуснага прыпынку, а ён крочыў ад царкоўнае брамкі — відаць, прыязджаў да царквы. Я адразу пазнаў яго, хоць і быў ён увесь схаваны ў кажух. Першае імгненне я разгубіўся: побач жа — бацька, ён, падобна, пазнаў мяне, бо азірнуўся. Прыпыніся я хоць

на хвіліну — і ён, напэўна, вярнуўся б да мяне. Але я не прыпыніўся. Толькі на могілках, ідучы да матчынае магілы, азірнуўся. Следам ён не ішоў.

## СКАРГА

У старым будынку студэнцкага інтэрната стаяла, відаць, звычайная для канікулаў цішыня — амаль такая ж, як там, на хутары, адкуль я толькі што вярнуўся, адно як з-пад зямлі даносілася з цэнтральнай вуліцы прыглушанае адлегласцю гудзенне машын. Аднак гэтая цішыня нікольki не схіляла на марнатраўства — наадварот, яна як бы падкрэслівала, што марна патрачаны час пасля не дагоніш, што нічым не запоўнены дзень ляжа на душу пустым ценем. Мне карцела пісаць у газету. Друкаванае слова працягвала дзейнічаць на мяне магічна. Я ледзьве не трызніў і сваімі яшчэ нястворанымі артыкуламі, фельетонамі, і газетнымі гранкамі, якія пахлі друкарскаю фарбаю, і свежымі нумарамі газет.

Пад канец рабочага дня я завітаў у рэдакцыйны аддзел, які ўзначальваў знаёмы ўжо мне Канаплёў. Ён не толькі не забыў мяне, але і чакаў. Абяцаючы неўзабаве цікавую камандзіроўку, загадчык аддзела агітаваў мяне пісаць кароткія інфармацыі, пасля даручыў апрацоўваць пісьмы рабселькораў, рыхтаваць літаратурную старонку. Упершыню ў жыцці ад мяне патрабавалася меркаваць, наколькі ўдала і пранікнёна выказаны на паперы людскія думкі і пачуцці. Як цяпер дарэчы прыдалася мне цішыня майго інтэрнацкага па-

коя! Вершы і апавяданні пачынаючых паэтаў і празаікаў я то чытаў вачыма, то правяраў на слых, адмерваючы пры гэтым, можа, сотні і тысячы крокаў. І што я адкрыў для сябе: як ні складана даць аб'ектыўную ацэнку чужому твору, у ім усё-такі лягчэй разабрацца, чым у тым, што выйшла з-пад твайго пяра. Прыгадвалася пачутая недзе прымаўка: «У чужым воку ўсякую трэсачку заўважаеш, а ў сваім не бачыш нават бервяна...»

З заданнямі рэдакцыі я спраўляўся, і мяне ўжо чакала камандзіроўка. Сапраўды, цікавая, як і абяцаў Канаплёў. ...Жыве ў палескім гарадку былая настаўніца Зінаіда Язэпаўна Русіновіч. Яна прыкавана да ложка. Гісторыя даўняя і хвалюючая: у драматычным лёсе жанчыны вінавата вайна. Зінаіда Язэпаўна была падпольшчыцай і сувязной партызанскага атрада. Ведаючы нямецкую мову, смелая і кемлівая, яна ўмела пусціць туман у вочы нават самай пільнай нямецкай варце, калі трэба было тэрмінова выйсці на сувязь з партызанамі. Аднак, незадоўга да вызвалення Беларусі, яна трапіла ў рукі гестапа. Допыты, катаванні, сырая, халодная камера... Падпольшчыца нікога не выдала фашыстам. Цаною свайго здароўя. Ёй пагражала варожая пятля. Ад смерці яе выратавала імклівае наступленне Савецкай Арміі.

Гэта паведамілі школьнікі. У сваім кароткім пісьме Зінаіду Язэпаўну Русіновіч яны называлі сястрой Паўкі Карчагіна.

Пазнаёміўшы мяне з тым пісьмом, Канаплёў сказаў:

— Трэба будзе зрабіць добры нарыс.

Я ўзрадаваўся, што мне даручаецца такое заданне. Толькі як мог загадчык рэдакцыі сказаць гэтак холадна: «зрабіць нарыс»! Зрабіць нешта можна рукамі. А нарыс пра чалавека ствараецца розумам і сэрцам...

Я пачынаў завочна ўжывацца ў лёс Зінаіды Язэпаўны Русіновіч. Адчуваў, што пра яе пісаць буду адным духам. Куды б ні ішоў, што б ні рабіў, я спыняўся на думцы — хачу ў камандзіроўку. З галавы не выходзіла і трывога: як дакрануцца душой да подзвігу, каб якім-небудзь недарэчным пытаннем, словам не прычыніць болю чалавеку мужнага і, напэўна, уражлівага сэрца.

За дзень да камандзіроўкі я сустрэў нечакана ў горадзе Алеся Мілейчука.

— Нехта з нас тэлепат,— жартаваў Алесь.— Я ж ішоў да цябе.

— Дык хадзем,— запрасіў я таварыша да сябе ў госці.

— Я зайду вечарам, а зараз ты схадзі да Калайчыца, ён хацеў цябе бачыць.

Аляксандр Трыфанавіч Калайчыц, рэдактар абласной газеты, быў чалавек шчыры. Прывітаўшы мяне ў сваім кабінеце, ён адразу пачаў размову па сутнасці.

— Твой бацька прыслаў нам пісьмо,— сказаў ён, правёўшы рукою па сваіх негустых валасах, і яны зноў рассыпаліся на звыклы прабор.— Скардзіцца на цябе.

Пры гэтых словах рэдактар узяў на стале і падаў мне канверт, з якога выглядваў складзены ў дзве

столкі ліст. Я стаў чытаць — і мяне як агнём апякло. Апякла нечаканасць такога ліста ад бацькі і сорам за яго. Ён, бацька, сапраўды скардзіўся на мяне. Што гэта была за скарга? Не скажу, каб злосная, не. На аркушы паперы са школьнага сшытка апавядалася элементарна проста: ён, бацька, маўляў, стары і слабы, стаў непатрэбны сыну...

Пакуль я чытаў пісьмо, рэдактар, відаць, сачыў за выразам майго твару.

— Гэта праўда? — папытаўся ён, калі я адвёў вочы ад ліста.

— І праўда, і няпраўда,— сказаў я.

Такі адказ насцярожыў рэдактара, але, калі я расказаў усё, што ведаў пра бацьку, ён паверыў мне.

— Хочаш, мы яго як след размалюем на ўсю вобласць?

— Ай, не трэба,— махнуў я рукой.

Ішоў я з рэдакцыі ў інтэрнат і разважаў пра тое, як складана дзецям судзіць свайго бацьку, але як, мабыць, страшна вінаватаму бацьку іменна гэтага суда. Мой бацька не выпадкова напісаў скаргу: ён адчувае сябе падсудным на судзе, дзе хочацца хоць чыёй падтрымкі, хоць якой спагады, каб лягчэйшаю здавалася віна.

# ЗМЕСТ

Водгулле . . . . . . . . . . . 3

## Частка першая

Найдаўнія ўражанні . . . . . . . . . . . . . 10
Навошта сабакам сена?.. . . . . . . . . . . 13
Пярэдадзень першага хлеба . . . . . . . . . 16
Замір'е . . . . . . . . . . . . . . . . . 19
Я чакаю брата . . . . . . . . . . . . . . 23
Ура: Віця прыехаў! . . . . . . . . . . . . 30
Туды, дзе «неба да зямлі прыбіта»... . . . . . . 33
У страха вочы вялікія . . . . . . . . . . . 35
На вячорках . . . . . . . . . . . . . . . 39
Перад Новым годам . . . . . . . . . . . . 44
Сапраўдная жабрачка . . . . . . . . . . . 49
Звычайныя радасці . . . . . . . . . . . . 53
Вясною . . . . . . . . . . . . . . . . . 56
Пытанне, якое паўторыцца . . . . . . . . . 58
Вялікі дзень . . . . . . . . . . . . . . . 61
Ветрыха . . . . . . . . . . . . . . . . . 64
Стрэмка . . . . . . . . . . . . . . . . . 67
Школа . . . . . . . . . . . . . . . . . 73
Пад вечар . . . . . . . . . . . . . . . . 80
Пакваліўся на чужое . . . . . . . . . . . 83
Заінелая кладка . . . . . . . . . . . . . 85
Роднае слова . . . . . . . . . . . . . . 88
Крыху гісторыі . . . . . . . . . . . . . 90
Аб'явіўся бацька . . . . . . . . . . . . 92
Навіны, перамены . . . . . . . . . . . . 96
Алюмініевыя ножыкі і драўляныя шаблі . . . 102

Рэха паншчыны . . . . . . . . . . . . . . . 111
Іван Іванавіч і ўрок малявання . . . . . . . 117
Захапленне . . . . . . . . . . . . . . . . . 119
За царскія грошы — кіно . . . . . . . . . . . 120
«Бярозка» на сцэне . . . . . . . . . . . . . 124
Белыя-белыя воблакі . . . . . . . . . . . . 126
Толікаў парашут . . . . . . . . . . . . . . 131
Неспакойны год . . . . . . . . . . . . . . . 138
Бацькавы падарункі . . . . . . . . . . . . . 142
Спроба . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 145
Магія друкаванага слова . . . . . . . . . . 147
У завіруху . . . . . . . . . . . . . . . . . 151
У бяскорміцы . . . . . . . . . . . . . . . . 154
Пасведчанне . . . . . . . . . . . . . . . . 157
Бяда . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 160
На калгасным полі . . . . . . . . . . . . . 162
Горкае расчараванне . . . . . . . . . . . . 168
Раніца выйшла з туману . . . . . . . . . . . 173

## Частка другая

Ад роднай хаты... . . . . . . . . . . . . . 176
«Сацыяльнае становішча — рабочы» . . . . . . 188
Маладыя гады... . . . . . . . . . . . . . . 196
Траўма . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 203
Блуканні, выбар мэты, экзамены . . . . . . . 212
Незвычайны сон . . . . . . . . . . . . . . . 221
Знаёмства . . . . . . . . . . . . . . . . . 224
З'яўленне Афрадзіты . . . . . . . . . . . . 229
Самая чорная вестка . . . . . . . . . . . . 234
Дабрыня сяброў і бацькава міласць . . . . . 239
У здаровым целе — здаровы дух . . . . . . . 242
Па заданню рэдакцыі . . . . . . . . . . . . 246
Гарызонт першай сесіі . . . . . . . . . . . 250
Ноч на апусцелым хутары . . . . . . . . . . 254
Скарга . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 265

Жуковіч В.

Ж 86 Як адна вясна...: Аповесць [Для сярэдн. і ст. школ. узросту/ [Маст. В. Бароўка].— Мн.: Маст. літ., 1980.— 272 с.

У пер.: 50 к.

Мама... Нават самыя ўзнёслыя і самыя дакладныя словы не могуць выказаць усёй паўнаты пачуццяў, якія абуджае ў табе найраднейшы вобраз. Хто сагрэў цябе сваім сэрцам? Мама. Хто адкрыў табе свет, поўны хараства і таямніц? Мама. Хто яшчэ ўмее так, як яна, ціха тужыць у адзіноце, чакаючы дзяцей, радавацца ім, аддаваць апошняе, дараваць за няўвагу?.. І як бы ні пасталеў чалавек, і як бы далёка ні адышоў ад родных мясцін, яна застаецца тою ж матуляю — добрай, чулаю, ласкаваю. Не выпадкова галоўнаму герою гэтай аповесці Валодзю Ражэвічу ўсе ягоныя гады, пакуль жыла маці, хаця былі і цяжкасці, трывогі і нястачы, уяўляюцца як адна вясна.

Ж $\frac{70803—207}{М 302(05)—80}$ 146—80

ББК 84 Бел 7
Бел 2

Василий Алексеевич Жукович

СЛОВНО ОДНА ВЕСНА...

Повесть

Для среднего
и старшего школьного возраста

Минск, издательство «Мастацкая літаратура»
На белорусском языке

Рэдактары В. Д. Рудава, Н. І. Семашкевіч
Мастак В. М. Бароўка
Мастацкі рэдактар В. І. Кліменка
Тэхнічны рэдактар Т. М. Сокал
Карэктары Л. М. Вайцяшэня, Т. М. Собалева

ІБ № 589

Здадзена ў набор 06.06.80. Падп. да друку 30.10.80. АТ 05234
Фармат 70×108¹/₃₂. Папера друк. № 1. Гарнітура школьная.
Высокі друк. Ум. друк. арк. 11,90. Ул.-выд. арк. 10,03. Тыраж
27 000 экз. Зак. 752. Цана 50 к.

Выдавецтва «Мастацкая літаратура» Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. 220600, Мінск, Паркавая магістраль, 11. Надрукавана з набору паліграфкамбіната імя Я. Коласа. 220005, Мінск, Чырвоная, 23 у друкарні імя Ф. Скарыны выдавецтва «Навука і тэхніка». 220600. Мінск, Ленінскі праспект, 68. Зак. 2140.